БЕЛАРУСЬ
літаратурная

ВЯЛЬНІРУЧЫНА ЛІТАРАТУРНАЯ

ВАСІЛЬКОВАЕ ПОЛЕ АЙЧЫНЫ

84(4Бел)
В19

БЕЛАРУСЬ
літаратурная

ВАСІЛЬКОВАЕ ПОЛЕ АЙЧЫНЫ

БЯЛЫНІЧЧЫНА ЛІТАРАТУРНАЯ

Паэзія, проза, публіцыстыка

АМ 1230681
ЦСДПЬ
г.Мінска

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2020

УДК [821.161.3+821.161.1(476)]-822
ББК 84(4Беи)я43
В19

Серыя заснавана ў 2003 годзе

Укладанне *Міхаіла Карпечанкі*

Для старэйшага школьнага ўзросту

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе
і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

АБ ПВС г. Минск

ISBN 978-985-02-2007-3

© Карпечанка М. А., укладанне, 2020
© Афармленне. УП «Мастацкая літаратура», 2020

А свет прыгожы і бязмежны...

Бялыніччына — багаты на таленты рэгіён. Асабліва ярка гэта выражана ў вуснай народнай творчасці, у якой проста россыпы іскрыстых выразных сродкаў, захапляльная вобразнасць выяўлення жыцця. Пераконваюць у гэтым запісы песень каляндарнага і сямейнага цыклаў, пазаабрадавыя песні і дзіцячы фальклор. Уражваюць паэтычнасцю зімовыя, калядныя, шчадроўскія песні, карагоды і гульні («У майго татулькі двор пад гарою», «А калядачкі, нашы нежанькі», «А калядныя бліны ладныя», «Сівы конь бяжыць» і інш.). Такой жа паэтычнай зіхотнасцю вызначаюцца песні і карагоды вясенне-летняга цыкла, жніўныя і асеннія.

Пры ўсёй напружанасці ў працы людзі знаходзілі моманты для адпачынку, весялосці, асабліва тады, калі заканчваліся палявыя работы, і ўраджай даваў падставы не вельмі турбавацца пра кавалак хлеба на стале. Тады адбываліся вяселлі, як сапраўдныя тэатральныя прадстаўленні, з рознымі жартоўнымі песнямі і пра свата, і сваху, і пра маладога, якія потым выконваліся і асобна («Была ў мужа прыгожа жонка», «Ох, і ў лузе, ў лузе», «Шэсць дзён малаціла» і інш.). Таму фальклор назаўсёды застаўся вечнай крыніцай для мастакоў і паэтаў, празаікаў і драматургаў.

На жаль, гісторыя не захавала сведчанняў пра даўні літаратурны працэс на Бялыніччыне ў яе сучасных межах. Архівы даносяць толькі звесткі пра пачатак XX стагоддзя, пра новы перыяд у гісторыі грамадства. Вядома, што ў гэты час пісаў апавяданні народны мастак В. К. Бялыніцкі-Біруля, тварылі па-польску Зянон Фіш, па-руску Васіль Жудро. Усё ж вызначальнымі ў гэтым плане сталі 1920-я гады. Менавіта тады з'явіліся першыя рэальныя прадстаўнікі літаратуры ў гэтым рэгіёне. Хоць прыналежнасць некаторых з іх менавіта да гэтай мясцовасці пакуль не даказана.

Па некаторых ускосных даных можна меркаваць, што Янка Шаірка – з Бялыніччыны. У 1927–1928 гг. ён апублікаваў каля дзясятка вершаў, у асноўным маладняцка-задзірыстага характару. І назвы вершаў адпаведныя: «Малады я пайшоў», «Вясновы заклік» і г. д.

Малады, я пайшоў на прадвесне.
Акунуся ў блакітную шыр.
Для жыцця маладога – увесь я,
Колькі шчасця ў юнацкай душы.

Трыццатыя гады былі малаплённымі для літаратуры наогул. Таму і Бялыніччына не выдзяляецца з агульнага шэрагу. Тут нават наступіў спад у параўнанні з папярэднім часам. У раённай газеце «Чырвоны калектывіст» (орган Бялыніцкага РК КП(б)Б і РВК, выходзіў з 1931 года) не надрукавана ніводнага твора мясцовага аўтара. Праўда, не ўсе нумары захаваліся.

Першым значным прадстаўніком мастацкай творчасці з Бялыніччыны быў Янка Шарахоўскі, які прайшоў характэрны для моладзі 1920–1930 гадоў шлях: вучоба ў Магілёўскім педтэхнікуме, Ленінградскім гісторыка-лінгвістычным інстытуце, у аспірантуры пры Мінскім інстытуце імя А. М. Горкага, вайна. Яго літаратурная творчасць пачыналася з літаратурна-крытычных рэцэнзій. Вайна таксама адзначылася ў лёсе пісьменніка сваімі трагічнымі варункамі. Але лёс быў літасцівым да яго, і пасля цяжкіх раненняў ён вярнуўся да службы, стаў журналістам. У пасляваенны час працаваў на многіх кіруючых пасадах, але заўсёды заставаўся творцам. У другой палове 1940-х ён актыўна выступаў у жанры прозы. Большасць апавяданняў пісьменніка прысвечана падзеям вайны. Пры гэтым празаік не захапляўся батальнымі сцэнамі – яго больш цікавіла праяўленне душэўнага стану («Пісьмо»), узаемаадносіны вяскоўцаў і народных мсціўцаў («Здарэнне»), у цэлым вяртанне чалавека пасля жудаснай вайны да мірнай працы. Цікавыя творы напісаў Я. Шарахоўскі для дзяцей. У гэтых творах ён выявіў добрае веданне іх псіхалогіі. Пазней поўнасцю аддаўся літаратуразнаўчай практыцы. Напісаў манаграфіі «Янка Купала» (1962), «Пясняр народных дум» (1970 – дакастрычніцкі перыяд, 1976 – савецкі перыяд), у якіх упершыню ўвёў у навуковы ўжытак многа звестак з жыцця і творчасці Янкі Купалы, паказаў значэнне творчасці народнага паэта для Беларусі. Нягледзячы на некаторыя ідэалагічныя перагрымкі манаграфіі і сёння карыстаюцца попытам.

Традыцыйна кожны рэгіён мае паэтычныя маякі. На Бялыніччыне агульны тон літаратурнага працэсу вызначалі не толькі мясцовыя ўраджэнцы, але і тыя, хто на ўсё жыццё звязаў свой лёс з гэтым краем. Вядома, у паэтычным рознагалоссі заўважныя і яркія лідары, якія задаюць адпаведны тон, прымушаюць усіх астатніх не зрывацца на фальшывыя галасы, чуйна ўслухоўвацца ў народнае слова. А ў паэтаў сваё ўзвышанае ўспрыманне рэчаіснасці. У адрозненне ад шараговага

жыхара, яны па-свойму і глыбей бачаць тыя працэсы, што яднаюць або раздзяляюць грамадства. Такімі відавочнымі асобамі з'яўляліся Віктар Хаўратовіч, Алесь Мельнікаў, Рыгор Яўсеў, іх маладзейшыя калегі па паэтычным цэху Віктар Кунцэвіч, Змітрок Марозаў, які працяглы час працаваў на Бялыніччыне; сваю паэтычную дзялянку паспяхова распрацоўваюць Васіль Дзеравяшка і Ала Войлакава і многія іншыя, хто толькі спрабуе свой паэтычны голас.

У вершах А. Мельнікаў паэтызуе родны край, яго героіку і трагедыю. У канцы васьмідзясятых і ў дзевяностыя гады ў яго творах адлюстравалася чарнобыльская трагедыя ва ўсіх яе наступствах для чалавека. Паэтызацыя роднага краю, памкненне да каранёў, адчуванне ўдзячнасці бацькоўскай хаце і вёсцы, якая прывучыла да працы, дала першыя ўрокі чалавечай дабрачыннасці, асновы гуманізму – матывы большасці яго вершаў.

Як спецыяліст у радыялогіі, А. Мельнікаў добра ведаў, што прынёс чарнобыльскі вецер. Як грамадзянін, ён гаварыў пра гэта адкрыта, што вельмі не падабалася тагачасным начальнікам; пра гэтую трагедыю ён пісаў і ў вершах, пра панішчаныя родныя мясціны многіх людзей, у тым ліку і А. Пысіна («...у пысінскім краі, у Высокім Барку // Стронцый ды цэзій у баравіку...»), што толькі моцная прывязанасць да краю, да сваіх людзей ды вера ў лепшае дае магчымасць людзям выжыць.

Паэзія А. Мельнікава моцна ўздзейнічае на пачуцці чалавека, прымушае яго чуйна рэагаваць на ўсе праявы часу і супраціўляцца негатыўным наступствам.

Шчырым песняром рэгіёна стаў В. Хаўратовіч. Першы зборнік яго яшчэ паспеў блаславіць у друк Аляксей Пысін, напісаўшы ўступны артыкул «Добрай дарогі». Адносна першага знаёмства з паэзіяй В. Хаўратовіча лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы пісаў: «Вершы спадабаліся. Не было ў іх вонкава-падкрэсленага, звычайныя рыфмы, памеры, звыклая суцішаная інтанацыя. Але ў традыцыйнай песеннай плыні адчувалася жыццёвая ўстойлівасць,– паэтычнае слова жывілася і набірала сілу з родных крыніц, было пазначана зведаным, перажытым. Паўставалі, высветліваліся штрыхі біяграфіі і характару аўтара. Маленства, абпаленае вайной, ранняе далучэнне да працы і жыццёвых турбот, імкненне зрабіць свет прыгажэйшым».

А. Пысін вызначыў галоўныя якасці паэзіі В. Хаўратовіча. Сапраўды, паэт выражае свае найлепшыя пачуцці да роднага краю, малой радзімы, гэтая любоў пашыраецца на ўсю Беларусь. Для паэта Радзіма – гэта ўсё, што яго акружае.

У паэзіі В. Хаўратовіча адлюстраваны многія праявы жыцця: ад першых дзіцячых успрыняццяў трагічнай рэчаіснасці вайны («Быў і я ў хвілінах ад Хатыні»), удзячнасці старэйшаму пакаленню, што адстаяла свабоду на франтавых палях («Кійком ён кратае штодзень», «Грукочуць мыліцы па бруку», «Песні салдата», «Высокі поўдзень» і

інш.), пасляваеннай рэчаіснасці («Дзеці вайны») да праяў сучаснасці, услаўлення велічы стваральнай працы («Рыштаванні», «Нябёс блакітныя паляны»), вечнага пачуцця кахання («Не помню, што тады казала», «Ты бегла», «Былі спатканні, быццам святы...»). З часам майстэрства паэта ўдасканальвалася, узмацнілася вобразнасць выяўлення рэчаіснасці, паглыбілася філасафічнасць твораў.

Тэматычна блізкай з'яўляецца і паэзія В. Дзеравяшкі, бо яго вершы прысвечаны ў асноўным працаўнікам палёў, спрадвечным хлебаробам, на працы якіх уласна і трымаецца дабрабыт дзяржавы. У вершах нібы знітавана ў адно і мінулае, даволі даўняе і бліжэйшае, звязанае з героікай і трагедыяй мінулай вайны, сучаснасць, якая пры ўсёй яе складанасці дае падставы для аптымізму («Бялынічы», «Зімовае», «Шчодрасць» і інш.).

У агульную літаратурную панараму рэгіёна добра ўпісаліся і вершы Міхася Радоўскага, у якіх ён імкнецца выразіць імклівасць часу, зменлівасць настрою чалавека. Пэўным лірызмам і жаноцкай пяшчотнасцю вызначаюцца вершы А. Войлакавай, асабліва там, дзе паэтызуецца дзіцячы свет, паказваецца любоў да маці і Радзімы.

У агульнай плыні паэзіі Магілёўшчыны вылучаецца і паэтычны голас прадстаўніка Бялыннічыны В. Кунцэвіча. Яго паэзія прасякнута любоўю да роднага краю, трывогай за лёс народа. У ёй адбіліся ўсе павевы трывожнай эпохі. Але паэзія В. Кунцэвіча аптымістычная, нягледзячы на адчуванне горычы ад многіх непаладак, бюракратычнай неразбярыхі. У ёй – прасветленая ўпэўненасць у дасягненні народам пастаўленай мэты. У інтымнай лірыцы паэта традыцыйна ўзвышаецца вечнае пачуццё, далікатнасць у адносінах, шчырасць і даверлівасць. Разам з тым услаўленне прыгажосці вонкавай і душэўнай грунтуецца на філасофскай ісціне бясконцасці жыцця, на веры ў яго прадаўжэнні ў нашчадках. І гэта зноў жа пераплятаецца з грамадскім настроем, адчуваннем складаных паваротаў у жыццёвых калізіях.

У гэтым плане бачыцца і творчасць З. Марозава, які даволі працяглы час працаваў на Бялыніччыне, спачатку галоўным аграномам у калгасе, а пасля – на грамадскай рабоце. У яго таксама большасць вершаў прысвечана клопатам пра зямлю, думкай пра спрадвечных хлебаробаў, пра вершнасць традыцый у сялянскіх справах, роздумам над прычынамі паступовага знікнення вёскі як асновы заўсёднага беларускага ўкладу жыцця, трывогай за будучыню ў выніку чарнобыльскай бяды. Гэтыя матывы праходзяць праз многія зборнікі паэта, створаныя менавіта ў яго бялыніцкі перыяд («Пад бусліным небам», «Хлеб і памяць», «Хлебны верасень» і інш.).

Паэзія З. Марозава перадае неспакой душы адданага працаўніка, вобразна раскрывае свет сучасніка, знітаванне мінулага з сучаснасцю з поглядам у будучыню на аснове моцных нацыянальных каранёў беларускага народа. Таму яго лірычны герой – чалавек актыўны, не сузіральнік, а актыўны стваральнік, хоць часам ён адчувае сябе абойдзеным лёсам на нашай прыгожай зямлі. Ды галоўнае жаданне

паэта, выказанае ў вершах, «каб стала сімвалам свабоды мая святая Беларусь».

Варта адзначыць, што менавіта на Бялыніччыне З. Марозаў стаў абжываць класічныя жанры паэзіі. У яго ёсць шэраг цудоўных трыялетаў, якія прасякнуты глыбокімі пачуццямі, а не толькі перадаюць знешнюю складанасць формы, што нярэдка здараецца ў тых, хто ўпершыню бярэцца за яе. Ён таксама з'яўляецца аўтарам звыш дзясятка вянкоў санетаў («Сад», «Наканаванне» і інш.) і ўжо зусім унікальнай з'явы — вянка вянкоў санетаў «Апакаліпсіс душы». Далёка ад родных мясцін стаў вядомы паэт, ураджэнец Бялыніччыны Вячаслаў Казакевіч. Не парывае сувязі з Беларуссю і слынны паэт Расійскага саюза пісьменнікаў Ігар Шклярэўскі. Новыя тэмы і бачанне рэчаіснасці ўнёс у літаратурны працэс і рускамоўны паэт Леанід Сідараў, які вярнуўся ў родныя мясціны пасля доўгіх рамантычных вандровак па прасторах Сібіры.

Значным мастацкім здабыткам рэгіёна трэба лічыць і наяўнасць паэтычнага жанру гумару і сатыры, які стаў вызначальным у творчасці Р. Яўсеева. Аўтар не замахваўся на недазволеныя тэмы — пісаў так, як тады патрабавалася: высмейваў хапуг, прыстасаванцаў, гультаёў («Спецыяліст», «Наш начальнік»), марнатраўцаў, п'яніц («Лявонава заслуга», «Звадкі»), пустаслоўе, філасофствaванне на пустым месцы («Цімох пад антонаўкай»). Галоўнае з напісанага Р. Яўсеевым трывала ўвайшло ў мастацкі набытак не толькі рэгіёна, але і ў цэлым у рэспубліканскі літаратурны працэс. Многія творы не страцілі актуальнасці і сёння, а ў той час, калі друкаваліся ў «Вожыку», мелі надзвычайны рэзананс. Асабліва дзейсным аргументам былі яго вершаваныя фельетоны, калі гора-кіраўнікі маглі пазнаць сябе ў героях твора «Свой трактар», а псеўдадарадцы рознага маштабу з раённых і вышэйшых устаноў усім бачыліся ў паэтычным роспаведзе «Юшка», і ў многіх іншых творах гэтага жанру даставалася розным прайдзісветам ад улады. На жаль, негатыўныя з'явы надзвычай жывучыя, таму маюць права на існаванне і шматлікія творы, накіраваныя на іх выкрыццё.

Жанр сатыры і гумару паспяхова развіваюць і празаікі Мікола Падабед, Міхась Карпечанка, Васіль Найдзін. Яны таксама трымаюць руку на пульсе часу, кожны па-свойму высвечвае недарэчнае ў жыцці. М. Падабед для твораў выбірае сітуацыі, у якія трапляюць героі па ўласнай недасведчанасці, абыякавасці, і тут аўтар больш арыентуецца на знешнія праявы ў паводзінах людзей. Яму ўдаецца ствараць камічныя сітуацыі, у якіх найбольш праяўляецца сутнасць яго герояў («Пясцовае футра», «Аплявуха для прафілактыкі», «Круць-верць» і інш.). У М. Карпечанкі трохі іншы падыход у разгортванні камічных сітуацый: ён больш акцэнтуе ўвагу на ўнутрана-псіхалагічным стане падвопытнага персанажа. Ён быццам вывучае, даследуе ўчынкі людзей і назірае за іх здольнасцямі выходзіць з крызіснага стану. Вельмі часта назіраецца такое, калі чалавек ва ўсіх бачыць адны недахопы, няўменне жыць, а за сабой таго ж самага не заўважае, таму часам

і трывае ў недарэчнае становішча («Дзеду, ты — гальш...»), або з найдрыгі такімі інвага лішчыць («Свядомасць падвяла»). У гумарыстычных апавяданнях В. Найдзіна таксама імкнецца засяродзіць увагу на шматлікіх недарэчнасцях, што трапляюцца ў жыцці. Адпойчы Кандрат Крапіва сказаў, што ў той пасядзёнасці яму хацелася тое-сёе палепшыць. Гэткую ж мэту, няйначай, ставіць перад сабой і В. Найдзін. У першых кнігах у поле зроку гумарыста трапляюць гультаі, прыстасавацы, хадзеі, усе тыя, хто гоніцца за доўгім рублём, не надта ўмяшаючы свае ўчынкі з народнай маралдю. Пісьменнік звяртае ўвагу на тое, што вельмі часта чалавеку перашкаджаюць жыць звычайныя дробязі, нейкія невядома адкуль набытыя звычкі або вялікае жаданне адрозніваціца ад іншых. Дастаецца і тым, хто абыякава адносіцца да грамадскай уласнасці, хто не ўмее наладзіць свой дабрабыт («Хоць какой касі», «Чулі мы байкі» і інш.).

З часам мянялася тэматыка яго твораў, спосаб адлюстравання і расстаноўкі акцэнтаў. Праўда, і ў кнігах «Сустрэнемся ў Барселоне», «Кветкі кактуса» яшчэ заўважаецца пэўная абачлівасць, жаданне абысці вострыя пытанні, засяродзіць увагу толькі на этычна-маральных праблемах. Хоць кнігі выдадзены на пачатку 1990-х, але ўсе творы напісаны пераважна ў васьмідзясятыя гады. Некаторыя апавяданні і гумарэскі друкаваліся ў папярэдніх зборніках. Для новага выдання аўтар іх перапрацаваў, надаўшы ім больш вастрыні і актуальнасці. У полі зроку пісьменніка аказваюцца розныя дзялкі, аматары падладкавацца пад сітуацыю перабудовы, знайсці і тут сваю выгаду. Пісьменнік даволі лагодна пасмейваецца з тых, хто імкнецца выкупіць нешта незвычайнае, імпартнае, такое, каб у іншых не было.

Час звычайна ўплывае на ўсе падзеі, нешта падсвечвае ў новых умовах, на што раней не звярталася ўвага, актуалізуе праблемы, якія на папярэднім этапе здаваліся дробязнымі і не вартымі ўвагі, што пацвярджаецца кнігамі В. Найдзіна «Матрошкі з малаткамі», «Анюціны вочкі», «Мільён руж».

Але не толькі сатыра і гумар вызначаюць сутнасць бялыніцкай прозы. Узровень яе вызначаецца паспяховым асваеннем гісторыка-сацыяльных і бытавых пластоў жыцця з дастаткова пераканальным паказам псіхалагічнага стану чалавека, глыбокім выяўленнем яго пачуццяў і перажыванняў, адэкватнай рэакцыі на ўсе працэсы, якія адбываюцца вакол яго ці ў якія ўключаны і сам герой. Важнае значэнне тут мае і асваенне разнастайных эпічных жанравых мадыфікацый. Вось па якіх крытэрыях неабходна ацэньваць прозу гэтага рэгіёна, бо для гэтага ёсць усе падставы: у набытку — істотныя эпічныя творы розных жанравых мадыфікацый. І асабліва паказальна ў гэтым плане тое, што ўсё гэта створана сіламі мясцовых аўтараў. Тут, мусіць, спрацоўвае той вечны закон накаплення і пераходу з адной якасці ў іншую. Запас жыццёвых назіранняў даў падставы М. Падабеду для спробы стварыць у аповесці «Іду на сустрэчу з навальніцай» вобраз сапраўднага кіраўніка гаспадаркі ў дзяржаве жорсткага эканамічнага

планавання, якое часта на нішто зводзіла ролю кіраўнікоў гэтых гаспадарак выгворцаў. Толькі моцныя валявыя натуры змаглі ў такіх сітуацыях процістаяць супраць неабдуманых і часта не прымальных экспамічных прапаноў, якія і абвяшчаліся толькі для таго, каб больш прыгожа выглядаць перад вышэйшым начальствам. Галоўны герой аповесці Васіль Васільевіч Калінкін якраз і з'яўляецца такой асобай, што не адступае ад прынцыпаў. На жаль, пісьменнік не паказвае, як герою ўдаецца выходзіць з такіх канфліктных сітуацый.

У полі зроку прозы Бялыніцкіны чалавек у грозных перыпетыях XX стагоддзя, асабліва праяўляецца яго безабаронасць у сферы аховы правоў і недатыкальнасці асобы. Менавіта на такіх аспектах засяроджвае ўвагу М. Карпечанка. Для многіх сённяшніх грамадзян трагедыя 1930-х гадоў стала гісторыяй, няхай сабе і крывавай, а разам з тым і нейкай пяпэўнай, бо на працягу больш за паўсотню гадоў дзяржава сарамліва ўстойвала гэтыя злачынствы. Тое, што раскрылася ў 1990-я, стала для грамадства шакіруючым, бо з цяжкасцю ўспрымаліся звычайным чалавекам пачварныя формы генацыду. Таму сапраўдным душэўным болем прасякнуты старонкі дакументальна-публіцыстычнай кнігі М. Карпечанкі «На скрыжаванні болю і надзеі».

Недалёкае мінулае пасляхова асвойваецца празаікамі, якія імкнуцца да новага асэнсавання праўды пра тыя падзеі, у тым ліку і пра вайну, пра якую, здавалася б, сказана ўсё. Аднак з адыходам у гісторыю гэтай з'явы з'яўляецца неабходнасць акцэнтаваць увагу на асобных яе аспектах, асабліва на тым, дзе ў агульнай народнай трагедыі з незвычайнай яскравасцю праяўлялася бесчалавечнасць прадстаўнікоў жорсткай ідэалагічнай дзяржаўнай сістэмы (аповесці «Дзэрцір», «Нярускі», «Бутэлька» М. Карпечанкі). У традыцыях добрай рэалістычнай прозы ў іх сцвярджаецца і годнасць чалавека, менавіта прыстойнасць большасці, якая процівастаўляецца розным адшчапенцам, якія тады ў выгоднай для іх грамадскай атмасферы імкнуцца накапіць для сябе палітычны, а часцей за ўсё — «барахольны» капітал.

Вядома, літаратура не павінна зацыкліваццa на праблемах мінулага, няхай сабе і надзвычай важнага для абуджэння самасвядомасці грамадзян. Сучаснасць патрабуе да сябе не меншай увагі, бо менавіта тут вырашаюцца тыя пытанні, што былі калісьці вельмі балючымі. Будучыня якраз патрабуе не паўтараць трагічных памылак, а гэта магчыма толькі пры здаровым актыўным грамадстве. Таму і сучаснасць ва ўсіх яе праявах становіцца прадметам пільнай увагі празаікаў. Пісьменнікаў стала больш цікавіць экзістэнцыяльнасць сітуацый, незалежна ад таго, ці гэта твор з міфалагічнай асновай («Перуноў Дуб з Крывяліцкага бору» М. Карпечанкі), ці прыгоды сучасніка ў замежжы («Скрынічны ключ» Ю. Несцярэнкі), бо іх цікавіць сама сутнасць духоўнасці ў чалавеку, той асновы, якая гарантуе цэласнасць асобы. Такая схільнасць да пранікнення ў сутнасць з'явы вызначае перспектыўнасць пошуку.

2 Зак 2368

Варта засяродаць увагу на самым актуальным жанры літаратуры, які Максім Гарэцкі лічыў галоўным, бо менавіта праз тэатр ёсць магчымасць паказаць чалавеку, хто ён ёсць. Таму надзённай з'яўляецца выдадзеная М. Карпечанкам на пачатку гэтага стагоддзя кніга драматычных твораў «Дачка волі», у якую ўвайшлі аднаіменная гістарычная драма, п'есы «Дождж на дваіх», «Канвеер». Акрамя таго, ім напісаны і паставлены Народным тэатрам Магілёва п'есы «Першы пацалунак», «На парозе блакітнай вясны», «І ёй хацелася жыць».

У гістарычнай драме «Дачка волі» пісьменнік раскрыў адну з драматычных дзеяў нашай гісторыі, якім даў сваю трактоўку. Як вядома, Рагнеду гваллам узяў замуж Уладзімір, забіўшы ўсю яе радню. Рагнеда гэтага дараваць не магла, і ўжо праз нейкі час, меўшы многа дзяцей, у тым ліку першынца, сына-падлетка, выпашыла адпомсціць кату. Забойства не здзейснілася, але Уладзімір чамусьці, як сведчаць летапісы, не пакараў яе смерцю, а выселіў з Кіева. У летапісах зазначана, што гэтаму перашкодзіў сын, заступіўшыся за маці.

У літаратуры ёсць шмат версій гэтай падзеі. Кожны літаратар браў нейкі адзін эпізод з гэтай даўняй гісторыі. М. Карпечанка засяродзіў увагу менавіта на патрыятычных матывах. Застаўшыся ў няволі, Рагнеда-Гарыслава не скарылася, думала пра незалежную Полаччыну, трымала сувязь з землякамі, якія таксама не скарыліся. Пісьменніку ўдалося стварыць яркія вобразы, велічныя постаці, якія не згінаюцца пад ударамі лёсу, гінуць, але не здаюцца. Такі патрыёт палачанін, які хаваецца пад псеўданімам замежнага госця Адзімахта, і многія іншыя.

Заваяваўшы сілаю Полаччыну, пры дапамозе наёмнікаў, Уладзімір не змог скарыць палачан, крывічоў, і пісьменнік сцвярджае, што перамагла Рагнеда, бо яна вырасціла сына-патрыёта Ізяслава, які ўрэшце адрадзіў дынастыю Рагвалодавічаў.

Гістарычны аспект набылі сталінскія рэпрэсіі, сатанінскія вакханаліі таго часу. Іх пісьменнік узнаўляе ў драме «Канвеер», творы пра ўзлёт духу маладога таленавітага юнака Юркі Сухадольца і яго сяброўкі Алены Пшанічнай, маральнае і фізічнае падзенне былога настаўніка, а потым следчага Маразевіча. Такія людзі, як Маразевіч, без моцнага жыццёвага стрыжня. Паставіўшы мэту любымі сродкамі выслужыцца, зрабіць кар'еру, Маразевіч забівае ў сабе рэшткі чалавечнасці, ім пачынае кіраваць страх, як і ўсімі тымі, хто прадаў душу д'яблу.

Літаратурны працэс на Бялыніччыне развіваецца, у яго будуць уліваццa новыя творчыя асобы. Такім чынам, усё яшчэ наперадзе.

Яраслаў Клімуць,
кандыдат філалагічных навук

Пачынальнікі

2* Зак 2368

Зянон (Зянон-Леанард) Фіш (Тадэвуш Падаліца) (1820—1870)

Зянон Фіш — унікальная з'ява славянскай літаратуры

Расхінаючы літаратуразнаўчае кустоўе, якім параслі згадкі пра XIX стагоддзе, не-не, дый натрапіш на камень-успамін. Засмечаная пісьмовая «цагліна» часам не змяшчае ніякіх пазнак. Аднак пратрэш яе, і ўжо можна класці ў мур беларускага дома. Іншаземныя ж «цагліны» часам выкідваюць. Між тым, яны таксама некалі мацавалі наша шматнацыянальнае супольнае жыццё. У гэтых адносінах асоба пісьменніка Зянона Фіша з'яўляецца менавіта такой цэментуючай культуру палякаў, украінцаў ды беларусаў таксама, бо менавіта на нашай зямлі нарадзіўся гэты адораны талентам і вядомы ў свой час літаратар.

Зянон Фіш пісаў у XIX стагоддзі на польскай мове і пераважна пра Украіну, таму сучаснаму чытачу ён невядомы. Але ад гэтага

значнасць яго творчасці для беларусаў не змяншаецца. Узяць хоць бы яго спрэчку з рускім публіцыстам, членам-карэспандэнтам імпе-ратарскай Пецярбургскай акадэміі навук Мікалаем Кастамаравым. Абодва выступілі на старонках друкаваных выданняў у 1860 годзе. Кастамараў у даволі з'едлівай форме высмейваў прагу літаратараў Маларасіі (Украіны) да сваёй гісторыі і сцвярджаў, што, як пакуты, так і герояў мінуўшчыны не варта пераносіць у сучаснасць. Маўляў, мы зараз іншыя, і калі нашы продкі ў чымсьці памыляліся, то гэта іх памылкі, мы такіх учынкаў не рабілі б. Таму пакінем мінуўшчыну продкам. На што Фіш адказаў наступнае: «Дзе няма павагі да бацькоў, там няма месца любові да дзяцей...» Цалкам жа дыскусія з боку М. Кастамарава зводзілася да таго, што ў Расійскай імперыі простаму ўкраінцу жывецца лепш, чым у колішняй Рэчы Паспалітай. Яго апанент, абапіраючыся на палажэнні Літоўскага Статута, даказваў адваротнае. Па сутнасці, размова ўжо ў той час ішла пра права нацый на самавызначэнне. Адказ Фіша Кастамараву заняў чатыры вялікія газетныя паласы і можа лічыцца ўзорам для палемістаў, якія ў спрэчках з расійскімі гісторыкамі стаяць на нацыянальных беларускіх пазіцыях.

Варта асобна адзначыць і выключнасць літаратурных твораў Зянона Фіша. Не сакрэт, што сучасныя беларускія літаратуразнаўцы скептычна ставяцца да творчасці сваіх землякоў, якія ў XIX стагоддзі пісалі на польскай мове. Адам Міцкевіч – вялікае выключэнне. Скажам, творчасць паэта Антона Гарэцкага вярнулася да нас зусім нядаўна, а многія ж імёны і зараз яшчэ ў забыцці.

Мікалай Гогаль стаў класікам рускай літаратуры, хоць пісаў пра тое ж, што і Фіш на польскай,– пра Украіну, яе звычаі, яе народ. М. Гогаль асцерагаўся, што інакш як на рускай не здолее паказаць свой талент. Мова, прыгажосць пабудовы сказаў і літаратурныя асаблівасці раскрыцця сюжэта захоплівалі яго. Ён стаў бы знакамітым незалежна ад тэматыкі сваіх твораў. Фіш жа, выдатна знаёмы з гогалеўскімі шэдэўрамі, уступаючы класіку ў таленце, імкнуўся якраз да адваротнага: заглыблення ў тэму і паказу характараў і вобразаў без літаратурнага глянцу. Яго героі размаўляюць па-простаму, па-ўкраінску, так, як было ў жыцці... але на польскай мове. Хто большы ўкраінец, Гогаль ці Фіш,– пытанне спрэчнае. Адказ на яго ляжыць у плоскасці нацыянальнага самавызначэння творцы. Для беларускай літаратуры гэта актуальна і сёння: пісаць на беларускай мове і заставацца забытым Фішам, альбо тыя ж рэчы падаць па-руску і стаць Гогалем. Заўважу, што і Гогаль, і Фіш зрабілі свой важкі ўнёсак у стварэнне ўкраінскай літаратуры.

Польскамоўныя ўкраінскія шуканні Фіша маглі быць вядомыя і тагачаснай дэмакратычнай беларускай эліце (паэтам Ігнату Легатовічу і Адаму Пянькевічу, мастаку Шэмешу, кампазітару Станіславу Манюшку і г. д.), якая гуртавалася вакол слыннага адраджэнца *беларускай* мовы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Звестак пра літаратурнага бунтара Зянона Фіша не шмат. Грунтоўнай працай пра яго жыццё і творчасць можна лічыць вялікі артыкул польскага даследчыка ўкраінскага паходжання Леанарда Савінскага (1831–1887), які друкаваўся ў шасці нумарах часопіса «Ḱosy» («Каласы») у 1878 годзе. Савінскі выдатна валодаў пяром, меў выдадзеныя творы, удзельнічаў у паўстанні (на гэтую тэму пазней напісаў драму «На Украіне»), а ў 1862 годзе быў сасланы ў глыб Расіі. Сучаснікі аддавалі належнае яго літаратуразнаўчым ведам і крытычным артыкулам. Дастаткова сказаць, што ён пераклаў на польскую мову «Гайдамакаў» Тараса Шаўчэнкі (творчасць якога вельмі паважаў), але не прамінуў пры гэтым крытычна выказацца адносна твора.

Чым быў выкліканы зварот Савінскага да біяграфіі і творчай скарбонкі Зянона Фіша, сёння цяжка сказаць. Мажліва, данінай памяці сябру, які быў ужо ў іншым свеце? Артыкул у «Каласах» насычаны цеплынёй, якую звычайна выказваюць добра знаёмаму аднадумцу-паплечніку.

Савінскі даследаваў творчасць Фіша і падкрэсліў яе значэнне для ўкраінскай і польскамоўнай літаратуры. Аднак беларуская эліта таго часу, шляхта, таксама карысталася польскай мовай. Таму нацыянальныя вызначэнні Фіша як пісьменніка, яго даніна павагі нявольнай Украіне, безумоўна, уплывалі і на тагачаснага беларускага чытача, не давалі згаснуць яго нацыянальнай свядомасці.

Артыкул Леанарда Савінскага скарочана падаецца ў перакладзе з польскай мовы.

Віктар Хурсік

Зянон Фіш (Тадэвуш Падаліца)

Літаратурна-біяграфічны нарыс

Бацька Зянона, Цімафей (*Tymoteusz*) Фіш, а дакладней – *Фіс*, быў родам з Кракава. Чалавек вучоны, лінгвіст, ён некалькі гадоў быў прафесарам у Вене; што да маральных якасцей – праведны і пакорлівы. Завязаўшы ў Кракаве знаёмства з багатым літоўскім (лічы – беларускім) панам Пацэем, быў пакліканы ім у Варшаву, прыняў у кіраванне яго палескія маёнткі і пасяліўся ў Выслаку пад Радамыслем[1] на паўночнай Кіеўшчыне. Гэта быў першы кантакт чужога прышэльца з украінскай шляхтай, з якой некалькі гадоў пазней яго больш цесна злучылі сямейныя сувязі – яго жонкай стала Марыя Вяржбіцкая, дачка мясцовага памешчыка-арандатара. Неўзабаве Цімафей *Фіс* пераехаў у Беларусь і, атрымаўшы пасаду кіраўніка маёнткаў Агінскіх, асеў у Бялынічах, якія славіліся цудоўным абразом Багародзіцы. Тут, уласна, у маі 1821 года і нарадзіўся Зянон Леанард Тадэвуш Фіш[2].

Аднак змены, якія адбыліся ў адносінах да маёнткаў Агінскіх, прымусілі сям'ю Зянона назаўсёды развітацца з Беларуссю і зноў на нейкі час шукаць прытулку на кіеўскім Палессі. Аселі яны ў вёсцы Качэраў пад Радамыслем, дзе займелі ўласны ўчастак і дзе малалетні Зянон пачаў вучыцца ў Забалацці, у панісёнчыку нейкага Кучынскага, з якім праз трыццаць пяць гадоў пазней спаткаўся ў Францыі, пра што ёсць згадка ў «Лістах з падарожжа»[3]. На шчасце, бясплодныя палескія ваколіцы не надоўга затрымалі гэтую сям'ю ў сябе. Для

---

[1] Радамышль (Радамысль) – зараз раённы цэнтр Жытомірскай вобласці Украіны.

[2] У 1843 годзе Зянон, адшукваючы пацвярджэнне свайго шляхецкага паходжання ў пецярбургскай Герольдыі, дадаў да свайго першапачатковага прозвішча літару z. Нядобразычлівы да яго Генрык Ржэвускі з гэтай прычыны склаў зласлівы каламбур:

«Dawniej w nucie pół-tonem
dzisiaj w wodze z ogonem».
(«Раней паўтонавая нота,
сягоння – галава з хвастом».)

Fis – з польскай мовы – дыез – нотны знак, які павышае ноту на паўтона, fisza – важная, уплывовая асоба. Відавочна, Зянон дадаткам адной літары захацеў павысіць значнасць свайго прозвішча. Але Генрык яго «прызямліў», бо калі прачытаць Fis, як Fiś (на канцы «с» – мяккае), то з польскай гэта азначае: быць вар'ятам – галавой з хвастом.

[3] «Лісты з падарожжа» («*Listy z podróży*») – трохтомнік замалёвак Фіша з падарожжаў па краінах Еўропы. Выдадзены ў Вільні на польскай мове ў 1859 годзе.

будучага мастака Украіны была патрэба ў больш маляўнічым змесце народнага жыцця, большай славе. Неўзабаве лёс пасцярыў сям'і будучага Падаліцы[1], быццам свядома меў яго на ўвазе. У Чаркаскім павеце, на супрацьлеглым канцы карэннай Украіны, ішоў пад падзел крэдытораў маёнтак Прусы Тарноўскіх, — адна з найбагацейшых і найпрыгажэйшых вёсак колішняга Смілянскага княства. Бацька Зяпона, пакліканы да кіравання галоўнай часткай падзелу, сам прыдбаў там невялікі ўчастак і такім чынам заклаў уласнае пастаяннае гняздо для сваёй сям'і. Участак гэты, павялічаны пазнейшым прыкупам зямлі і сямейнымі ўкладаннямі самога Зяпона, вырас з часам і стаў шляхецкай сядзібай.

На вучобу Зяпона німат не траціліся. Яго школьнае навучанне скончылася даволі хутка. Адкалі яго, праўда, у школу нейкага Дамброўскага ў мястэчку Каменка[2], каб падрыхтаваў да другога класа дзяржаўнай школы, але тая школа неўзабаве закрылася. Таксама нядоўга Фіш атрымліваў адукацыю ў пансіянаце Віленція ў Златаполі (*Złotopole*)[3]. На трынаццатым годзе жыцця яго адтуль забралі, і ён пастаянна знаходзіўся дома.

Галоўным уладальнікам надзеленых Прусаў быў маршалак Мацэвіч, які трымаў тут сваю канцылярыю. Яе сакратар выкладаў сынам маршалка элементарныя пачаткі, а мовы — немец Рэдар (*Reder*). Скончылася гэта, праўда, пачаткамі геаграфіі і французскай мовы. У чатырнаццаць гадоў адукацыя была цалкам скончана, і Зяпон, вольны, як птах, усёй душой аддаўся суцэльнаму прыгажосці вясковага жыцця. «Што вы зараз думаеце пра мяне, мае вяльможныя чытачы,— казаў сам у адным з фрагментаў сваіх успамінаў,— што вось рантам той, хто асмеліўся так смела частаваць вас біяграфіяй свайго ўласнага жыцця, не толькі нічога не мае за сабой, што б яго ўчынак апраўдаць магло, але не быў нават ва ўніверсітэце... Што казаць!.. Не скончыў нават гімназіі, не рашаў па [школьнай] дошцы геаметрычных заданняў, не вывучаў маралі! Ах, праўда, праўда! Якое меркаванне чакаць ад вас... Тое ж самае мне казалі і бацькі, і гэта не дзесяць разоў! Памятаю, казалі, калі абляпаны гразю вяртаўся ў сакавіку ад вады, што шумела ў равах, на якой пускаў паперовыя караблікі; казалі, калі задыхаўшыся, лавіў хрушчоў каля дома,— казалі! Ах, казалі! Але што ж нічога не дапамагала. «Яны сваё, а я — сваё»,— як казаў Княжнін. Але і забаўляцца ў той час было люба! Калі б мог хто запэўніць, што і сёння яшчэ здолею хоць хвілінку так забавіцца,— о, далібог!

[1] Падаліца — псеўданім, які ўзяў сабе Зяпон Фіш (пра гэта гл. далей у тэксце).
[2] Каменка (укр. *Кам'янка*) — зараз раённы цэнтр Чаркаскай вобласці Украіны.
[3] Златаполь (да 1787 г. — Гуляйполь) — былы горад Чаркаскай вобласці. У 1959 годзе далучаны да горада Новаміргарад.

адкінуў бы нават гэтую пісаніну і паляцеў бы, паляцеў!.. Дзіўна, калі ўсе скардзяцца на марнатраўства ў маладосці, я адзін успамінаю яе некалі, легчы на левадзе[1] да гары пузам і цэлую гадзіну глядзець на воблакі, што плывуць па сапфіравым; альбо, як некалі бывала, збегчы ад пільных вачэй эканома, пасці ў жытні загон і ляцець, плысці са свістам, з шума, як лодка, па раскалыханых, залатых хвалях каласоў».

З самага дзяцінства найвыразнейшай рысай Зянона была гарачая любоў да прыроды і Украіны. На абуджэнне і развіццё гэтых пачуццяў найбольшы ўплыў аказаў стары эканом пан Валента, чалавек просты, арыгінальны, добры, з'яднаны душой з простым людам, але сапраўдны багацей у краіне паданняў. Гэты чалавек, як вынікае з прызнанняў самога Падаліцы, адыграў не апошнюю ролю ў эстэтычным выхаванні здольнага і ўражлівага хлопца. Гэта ён, возячы Зянона з сабой па хутарах, пасеках і палях далучаў яго да прыроды і абуджаў замілаванне вясковым жыццём, а сваімі апавяданнямі пра колішнія прыгоды непадалёк ад такіх мясцін, як Чэгрынь (*Czehrin*), Чаркасы, Субаты, Хмяльніцкі, Лебядзінскія лясы і злавеснай памяці Матруненскі кляштар, распаляў фантазію хлопца адносна нядаўняй, але беззваротна зніклай мінуўшчыны. Уплыў пана Валенты не меў ніякай канкурэнцыі. Пра маці Зянона тут не можа ісці і гаворкі. Бацька ж асіраціў яго рана, трагічна загінуў. Пасля той катастрофы любоў Зянона да прыроды яшчэ больш памацнела. Яму найбольш падабаліся адасобленыя ад людзей зацішныя мясціны, дзе можна было паразважаць і хвілінку адпачыць. Такіх месцаў было нямала над берагамі прыгожай Тасьміны[2]; лясы, сады, крыніцы, хутары, дубровы, недаступныя астравы, звязаныя з успамінамі бацькоў,— усё тое дзіўна саграваала душу гэтай казацка-шляхетнай натуры. У яго галаве снавалі тысячы думак-летуценняў на фоне рэальных здарэнняў, што адбываліся некалі ў гэтых мясцінах, Зянон паволі гадаваў у сваім паэтычным уяўленні жамчужыны-творы такой цудоўнай празрыстасці, як «Нестар Пісанка» і «Зося Жыткевіч».

Аднак не заўсёды сваволя і раскоша вясковага жыцця займалі дзіцячае сэрца Зянона. Ён горача любіў і кніжкі. Як сам успамінаў, чытаць і пісаць для яго было гэтак жа, як бегаць, страляць з лука, лавіць вараб'ёў і г. д. У гэты час у яго з'явілася жаданне пісаць вер-

[1] Левада — (греч. *λιβάδιον* — вада, вадаём, поле, паша) — зямельнае ўгоддзе, абгароджаны ці абкапаны луг ці паша, прысядзібны ўчастак зямлі з сенакосам, агародам і садам ці іншымі дрэвамі.

[2] Тасьміна (пол. *Taśmina, Taśmin*) — рака на Украіне, правы прыток Дняпра, упадае ў яго ў Крамянчугскім вадасховішчы.

Пт 1230681
ЦСДПЬ
г.Мінска

ны, жаданне не прыглушанае, а такое ж неабходнае, як выдаленне
ямоў. Забаўнае апавяданне пра гэтую «хваробу» можна адшукаць у
артыкуле «Пара абразкоў, пара думак, успаміны Тадэвуша Падаліцы»
(«Athenaeum» за 1844 год, т. V). «...На шчасце і для мяне, і для вас,— кажа
ён,— усе гэтыя геніяльныя творы былі выкарыстаны на аклейку акон і
велікодных пірагоў ад чаго, прынаймней, сучаснікі мелі бясспрэчную
карысць. Але самым дзіўным у іх было тое, што яны неслі на сабе ад-
метнасць малявання. Калі прачытаў творы Карпінскага[2], то два меся-
цы пісаў і я сабе нешта накшталт сялянак, але паколькі мне не хапала
Юстыны, то завязаў раман з паннай Каралінай, якая жыла недалёка
за мастком і да якой я заўсёды мог звярнуцца з апошнімі вершамі, у
выніку мае папяровыя пачуцці, на колькі памятаю, змякчалі яе сэр-
ца, але ўсё скончылася нічым. Гэта гаворыць аб тым, што меў я тады
не больш за пятнаццаць гадоў... Потым трапіў мне ў рукі Трамбецкі[3],
паўгода ляжаў на маім століку, вывучыў усяго на памяць, а шаноўнай
яго фізіяноміі намаляваў найменш чатыры дзясяткі экзэмпляраў. Гэты
зноў перарабіў мяне па-свойму. Высокія оды паліліся патокам. Калі
не хапала зместу, то браў гісторыйкі з розных кніжак і перарабляў
іх на вершы *a la Trembecki*. Такім чынам перабраў усіх пісьменнікаў
станіславаўскай эпохі. Паколькі дурных заўсёды хапае, знайшліся такія
і ў той час, яны пакланяліся маім паэтычным здольнасцям, між тым і
зараз гатовы прысягнуць, што не ведаў тады, што такое паэзія... Але
найлепшым, самым змястоўным іх суддзёй быў эконам маіх бацькоў.
Калі бывала паўгадзіны чытаў яму нейкую оду ці баладу і, нарэшце,
пытаўся з трыўмфальнай мінай на твары: «Ну, што? Як мысліш, пане
Валента? Дрэнна, можа?» Ён адказваў звычайна на ўкраінскай мове:
«Так собі. Воно то гарно, нечога казаты, але як бы на мою думку, то
не хотів бы я ійсты з тей працы хліба. У нас, пане, в Каневі, шчэ
то як я быв школьніком, то быў такі разумны дыректор, шчо страх!
Бувало, як напішэ для якого там скубента повіншоване на Новы Рік
альбо на яке свято, то так батькі слухають, аж трясутся! Ну, тай што б
вы сказалі? Почав потем піты, оженівся з мучіжкой, тай і він, і наукі
йго пішлы марно. О, те вірші, віді пан, вешч дуже паскудна! Лучшэ
пойсть до войска, альбо до суду та там служыты, то пан ей богу будэ
чоловіком».

«Атэнэум» («*Athenaeum. Pismo Poświęcone Historii, Literaturze, Sztukom, Krytyce itd.*») — віленскі навукова-літаратурны часопіс, які выходзіў у 1841 – 1851 гадах.

[2] Францішак Карпінскі (1741–1825) — польскі паэт, адзін з пачынальнікаў польскага сентыменталізму.

[3] Станіслаў Трамбецкі (1739–1812) — польскі паэт эпохі Асветы, сакратар караля Станіслава Аўгуста.

Але, прынамсі, адну з гэтых моладзёвых спроб напаткаў гонар, пры які аўтар, на шчасце, ці няшчасце сваё, не ведаў. Меўшы ледзьве шаснаццаць гадоў, напісаў Фіш драму пад загалоўкам «Канашэвіч у Бягодзе» і паслаў яе ўціхую Іпаліту Скімбаровічу[1] ў Варшаву. Пра лёс гэтага твора доўга нічога не ведаў. Толькі праз дзесяць гадоў даведаўся, што Скімбаровіч надрукаваў яго і ў часопісе, які ў той час выдаваў, і асобным экзэмплярам. Казаў: «Калі б той экзэмпляр у свой час трапіў да мяне, якім бы шчаслівым я быў! Напісаў драму, яе надрукавалі і я... а пра тое нічога не ведаў! У мяне скралі маё шчасце!»

Не будзем засяроджвацца над уплывам, які зрабіла на ўяўленні маладога Зянона паэзія Залескага[2] і Гашчынскага[3], што расквітнелі з лона той самай краіны, удзячнасць да якой лілася з яго душы з непераўзыдзеным зачараваннем. Чытаў з задавальненнем раманы Вальтэра Скота ў перакладзе Дмахоўскага[4], а з газет — «Тыднёвік Пецярбургскі» (*«Tygodnik Petersburski»*)[5].

Недалёка ад Прусаў у сваім маёнтку Аляксандраўка жыў Міхал Грабоўскі[6], і маці знакамітага пісьменніка ахвотна давала маладому хлопцу кніжкі з бібліятэкі сына. *«Tygodnik»* амаль у кожным месяцы публікаваў яго артыкул. Бясспрэчна, што, акрамя паэтаў украінскай школы, найбольшы ўплыў на Фіша зрабіў Грабоўскі, па тэорыі — яго «Літаратура і крытыка», а ў яе выкарыстанні — «Калішчызна» і «Станіца Гуляйпольская». Аповесці Фіша «Тарасава ноч», змешчаная ў *«Athenaeum»* Крашэўскага[7], выразна нагадвае пяро Грабоўскага; толькі мае больш жыцця і каларыту праўдзівасці, больш даследаванняў пры-

---

[1] Іпаліт Скімбаровіч (1815–1880) — польскі пісьменнік, публіцыст, рэдактар некалькіх часопісаў. Папячыцель Музея старажытнасці Варшаўскага ўніверсітэта.

[2] Вацлаў Міхал Залескі (1799–1849) — польскі фалькларыст, паэт, пісьменнік, літаратурны крытык, грамадскі дзеяч.

[3] Севярын Гашчынскі (1801–1876) — польскі грамадскі дзеяч, рэвалюцыянер, пісьменнік і паэт польскага рамантызму.

[4] Францішак Салезы Дмахоўскі (1801–1871) — польскі пісьменнік, паэт, перакладчык, літаратурны крытык, сатырык і выдавец.

[5] *«Tygodnik Petersburski»* — палітыка-літаратурнае перыядычнае выданне на польскай мове, якое выходзіла ў Санкт-Пецярбургу ў 1830–1858 гадах пад рэдакцыяй Юзафа Эманюэля Пржацлаўскага і Францішка Гераніма Малеўскага. На старонках газеты асуджалася Лістападаўскае паўстанне 1831 года, і ў выніку ўжо ў 1832 годзе *«Tygodnik Petersburski»* стаў афіцыйнай урадавай расійскай газетай Царства Польскага.

[6] Міхал Грабоўскі (1804–1863) — польскі пісьменнік, публіцыст і літаратурны крытык.

[7] Юзаф Ігнацы Крашэўскі (1812–1887) — польскі пісьменнік, публіцыст, выдавец. Адрозніваўся незвычайнай пладавітасцю — літаратурная спадчына складае каля 600 тамоў раманаў і аповесцей, паэтычных і драматычных твораў, а таксама работ па гісторыі, этнаграфіі, фалькларыстыцы, падарожжавых нарысаў, публіцыстычных і літаратурна-крытычных артыкулаў.

роды, якую Фіш ведаў лепей за Грабоўскага, бо быў з ёй у безупынных і блізкіх стасунках.

Каля 1840 года Фіш пачаў і сам пісаць у «*Tygodnik*» лёгкія артыкулы, якія адразу праявілі дар маладога аўтара — прымячаць. І сапраўды, ён заўсёды ўмеў заўважыць пераважна камічны бок жыцця тых, хто быў перад яго вачамі, а потым маляваў іх наўпрост з незвычайным досціпам. Ездзіў з Мацэвічам, да маршалкаўскай канцылярыі якога прыпісаўся, на кантракты і шляхецкія выбары ў Кіеў, на ляту лавіў заўважаныя вострыя жарты, досціпы, замалёўваў забаўныя фігуры і абразкі, якія штогод змяшчаў у «*Tygodniku*» пад загалоўкам «Рысы кантрактаў». Тут было шмат камізму, нямала іроніі і сапраўднага гумару. Пасля кожных кіеўскіх кантрактаў чытачы з нецярплівасцю чакалі артыкул Фіша. Але як выглядае аўтар, ніхто не ведаў. Пазней абразкі з кантрактаў з'явіліся ў 1-м томе «Звязды» («*Gwiazda*») ў форме невялічкіх аповесцей пад назвай «Профілі», апошні раз кіеўская «Звязда» змясціла «Рысы» ў 1849 годзе. Шчырая простая вясковая шляхта, якая шукала пацвярджэнне сваёй годнасці і давала сябе неміласэрна ашукваць пленіпатэнтам геральдычных спраў, недавучаная моладзь, што займалася марнатраўствам, былі звычайным прадметам абразкоў Фіша. Яго эканамы, да якіх меў асаблівую прыхільнасць,— гэта цудоўныя, жывыя тыпы, а яўрэі па-сапраўднаму камічныя. Былі сярод літаратараў тыя, хто гарбаціўся над лістом у супрацоўніцтве з самавукам, які не толькі школы не скончыў, а нават і не распачынаў адукацыю. Неадкладна папярэджвалі пра той факт рэдакцыю «*Tygodnika*». На шчасце, рэдактар ведаў пра гэта і не вельмі дбаў пра тое, хто піша, а як піша. Не зважаючы на нядобразычлівасць калег, Фіш пачаў пісаць крытычныя артыкулы. Лёгка ўявіць, што артыкулы гэтыя былі слабыя, аўтар не заўсёды разумеў сам сябе, але праўду разумеў добра. Так, напрыклад, у тыя першыя часы сваёй літаратурнай дзейнасці, змясціў у «*Tygodniku*» артыкул «Аб апрацоўцы простанародных паданняў», у якім рэкамендуе а ні *in crudo*[1] не далучаць да паэзіі народныя паданні, не перарабляць іх, а цікавіцца геніем народа і ствараць у яго духу. Гэты артыкул у «*Tygodniku*» выклікаў палеміку, пра яго пісалі Грабоўскі і Крашэўскі. Варта адзначыць, што Фіш не належаў да прыхільнікаў народнай літаратуры. У адной з яго старых нататак адшукаўся выразны след абыякавасці да народных паданняў. Ён пісаў: «Досыць іх назбіраў, у тры разы болей прачытаў, шмат сустракаў іх у нашай літаратуры — ці ўзлезлых *in crudo* ў дзёгцевых ботах на вялікавую паперу, ці паголеных і прычасаных згодна з капрызам выпадковага літаратурнага цырульніка і пабаўленых, перш за ўсё, забабон

[1] in crudo (*лац.*) — у сырым выглядзе.

і моды, якая панавала немалы час і распаўсюджвалася на ўсе гэтыя творы. Нарэшце пераканаўся, што гэтыя расхваленыя цуды, гэтая паэзія, гэтае іх уяўленне – гэта ўсё і карысна, і неабходна для нацыянальнага пісьменніка, але адносна, калі бяром іх з брудных рук простага народа. Бо калі прызнаць, што прыгожае, згодна з народным разуменнем, павінна быць прыгожым і для нас, то гэта значыла б зняважыць, зганіць тую вялікую працу, тыя векавыя даследаванні, якімі нас узбагаціла чалавечая цывілізацыя. Праўда, нашы плыні бывалі рознымі, часта памылковымі ці зваротнымі і вымушана вярталіся да крыніц, але не для таго каб ля іх застацца, а каб удакладніць імкненні, каб глянуць на рэчы спачатку, ахапіць вокам становішча спраў і зноў быць на чале, каб крокам гамераўскіх герояў з паходняй розуму ствараць новую дарогу да святыні прыгажосці і праўды...

Часта так думаў, калі мне станавіліся косткай у горле ўсе тыя сухія маленькія аповесці, усе тыя простанародныя песенькі, якімі нас частавалі літаратары ў розных штогодніках і калектыўных лістах. Сабраныя і выдадзеныя асобна, яны маюць бясспрэчную вартасць для літаратара, для кожнага даследчыка нацыянальнасці, могуць быць скарбам для нейкага нашага Вальтэра Скота, як сталі імі для Гашчынскага, для Богдана, але падаваць іх як мастацтва, як прыгожую мадэль для спажывання чытачам, гэта значыць баламуціць іх, бегчы назад, а не весці наперад. Лепш за ўсё бесстаронна прымаць любыя прыкметы розуму простага народа, не казаць загадзя, што гэта непамутнелы брыльянт ці, наадварот, толькі само балота. Нескажоны густ дапільнуе прыгажосці, а простае – адкіне. Іх паданні, іх песні ёсць тыя дарогі, ёсць тыя кропкі, што робяць бачным вялікі краявід, які адкрывае перад вамі незнаёмае дагэтуль месца; але, жадаючы выявіць іх у мастацтве, варта браць ад іх жа колеры і канцэпцыі». Думка, можа, і няёмка выказана, але праўдзіва.

Калі непрыязнасць старэйшых літаратараў пачала рабіць «*Tygodnik*» усё больш недаступным для Фіша, ён пачаў утойваць сваё аўтарства, падпісваў свае артыкулы змененым подпісам, у прыватнасці літарамі *Z.L.*– Зянон Леанард. Нарэшце, калі Грабоўскі ў пісьме да Галавінскага з нагоды надрукавання «Ночы Тараса» накінуўся на невядомага аўтара, што няпрошана з'явіўся ў літаратуры і ў сваёй аповесці скажае гісторыю Украіны, Фіш канчаткова ўзяў псеўданім Тадэвуш Падаліца[1]. Разам з ім ён здабыў сабе вялікую папулярнасць. У яго не

[1] На Украіне падаліцай, ці зернем падалічным, называюць сцябло жыта альбо пшаніцы, якое ўзышло на ніве з натрусянага зерня пераспелых каласоў. Пышная ўкраінская зямля не раз дае добры ўраджай з гэтага выпадковага пасеву. Пісьменніцкі талент Фіша таксама раскрыўся самастойна, без ніякай дапамогі, дзякуючы доблесці яго духу. Таму даў сам сабе вельмі трапны псеўданім.

хапіла адвагі парваць з «*Tygodnikam*». Супрацоўнікі гэтага выдання Пржэцлаўскі[1], Галавінскі[2], Грабоўскі, Ржэвускі[3], Штырмер[4] выклікалі ў ім захапленне і пакланенне. Любыя іх творы, што бачылі свет, у перыяд сваёй дзейнасці ён прымаў з вялікім даверам: яны для яго былі аўтарытэтамі. Ці мог ён адносіцца да іх крытычна? Ці мог ён ведаць іх аднабаковасць? Самастойнасці меркаванняў мы толькі пазней навучыліся з твораў Лібельта[5], з «Хаваны» («*Chowanna*») і «Мысліні» («*Myślini*») Трэнтоўскага. Прывучаў нас да яе Крашэўскі сваімі артыкуламі, надрукаванымі ці то ў «Tygodniku», ці то асобна, як, напрыклад, «Літаратуразнаўства» («*Studya literackie*»). З 1837 года Крашэўскі быў галоўнай апорай «*Tygodnika*». Да таго часу гэты часопіс зарабляў перакладамі з французскай, змяшчаў нават цэлыя раздзелы з «*Notre Dame de Paris*» Віктора Гюго, вакол якога потым падняла шум «Літаратура і крытыка» Міхала Грабоўскага. З часу прыходу ў «*Tygodnik*» Крашэўскага літаратурна-крытычная частка ў гэтым часопісе была распрацавана вельмі старанна.

. . . . . .

Калі [Генрык] Ржэвускі надрукаваў першы том сваіх «Мешанін» пад псеўданімам Яраш Бейла, Фіш у «*Tygodniku*» змясціў пахвалу гэтаму твору. У гэты раз ён крочыў у нагу з Міхалам Грабоўскім. У пастскрыптуме да артыкула «Пара думак, пара абразкоў» распавёў, што ад часу прачытання «Фрэнафага»[7] Штырмера не можа інакш уявіць сабе розум, як толькі ў сціплым фраку Мефістофеля.

---

[1] Пржэцлаўскі (*Przecławski*) Юзаф Эмануэль (1799–1879) – пісьменнік, рэдактар і публіцыст, перакладчык, расійскі чыноўнік, з 1822 года звязаны з Пецярбургам. Сябра Адама Міцкевіча.

[2] Галавінскі (*Ignacy Hołowiński*) (1807–1855) – польскі рыма-каталіцкі святар, мітрапаліт, архіепіскап Магілёўскі ў 1851–1855 гадах, прафесар Кіеўскага ўніверсітэта, потым Акадэміі духавенства ў Пецярбургу, пісьменнік і перакладчык.

[3] Ржэвускі (*Henryk Rzewuski*) (1791–1866) – польскі празаік і публіцыст, масон, расійскі граф.

[4] Штырмер (*Ludwik Sztyrmer, Людвиг Штюрмер*) (1809–1886) – польскі празаік і літаратуразнаўца, генерал-лейтэнант расійскай арміі.

[5] Лібельт (*Karol Libelt*) (1807–1875) – польскі філосаф, пісьменнік і грамадскі дзеяч.

[6] Кніга «*Mieszaniny obyczajowe*» (1841–1843).

[7] У аповесці «Фрэнафаг і фрэналесты» («*Frenofagiusz i Frenolesty*») (1843) яе герой, літаратар, які трапіў у варшаўскі шпіталь манахаў-баніфратараў, што працаваў як бальніца для вар'ятаў, заўважае, што гэты шпіталь з'яўляецца каралеўствам таямнічага Фрэнафага, пажыральніка чалавечых глуздоў, і яго слуг фрэналестаў – не менш таямнічых істот, што імкнуцца любымі спосабамі пазбавіць людзей розуму.

У такім настроі Фіш з'явіўся ў Пецярбургу, куды яго паслаў багаты дядзька Вяржбіцкі, каб дапільнаваць нейкую справу, а яго самога паклікала патрэба выражэння геральдычнай справы. У тыя часы кожны шляхціц імкнуўся перш за ўсё адшукаць пацвярджэнне сваёй шляхецкай годнасці ў Герольдыі, служыў за званне нават у (апошнім) чатырнаццатым класе, абы не стаць аднадворцам[1] і не пайсці ў рэкруты. Гэтае пытанне было самым галоўным. Каб завалодаць патрэбнымі дакументамі аддавалі апошні грош з каліты. «Пайду з кіем і торбай,— казала засцянковая шляхта,— абы толькі памерці шляхціцам». Камісію, якая выдавала пасведчанні, называлі легітымарняй, быццам гэта была фабрыка па вырабе шляхецтва. На гэтым фоне Фіш стварыў нямала дасціпных сцэн і абразкоў. Ён сам служыў дзеля рангу ў канцылярыі маршалка, але яшчэ не быў узаконены. У канцылярыі спасцігнуў права, напісанне расійскіх урадавых папер і мог давесці справу. Дзядзька даў яму грашовую дапамогу на жыццё ў Пецярбургу, сам жа, паколькі было неабходна здабыць шляхецтва, бо атрыманне шляхецтва абяцала добры заробак, вырашыў запісацца на службу ў сталіцы і гэтым здабыць сабе становішча ў будучыні. Лічыў, што прафесія літаратара надасць яго асобе пэўнае значэнне і зробіць яму пратэкцыю. Пржэцлаўскі, Францішак Малеўскі, палкоўнік Штырмер, якія пісаў у «*Tygodnik*» пад псеўданімам Герваза Бомбы, маглі дапамагчы яму паступіць на дзяржаўную службу. Ксёндз Галавінскі быў там рэктарам Духоўнай акадэміі. Калі б яму ўдалося адшукаць іх апеку, са сваімі здольнасцямі сіганув бы высока і мог марыць пра вялікую будучыню. Так яму, прынамсі, з далёкай вёскі здавалася. Але зблізку ўсё аказалася іначай. Сціплы правінцыяльны літаратар у вачах сталічных карыфеяў быў ледзь прыкметным замухрышкам.

Жыццё ў Пецярбургу на працягу некалькіх гадоў паўплывала на выхаванне і маральную пазіцыю Фіша. Не марнуючы часу, ён вучыўся. Разнастайныя і дужа даступныя скарбы букіністаў, чытальняў, публічных бібліятэк, стасункі з літаратарамі, вандроўка ў Фінляндыю, якую апяваў у санетах,— усё гэта павялічыла запас яго «падалічных» ведаў. Вялікай дапамогай яму былі расійскія часопісы: «*Библиотека для чтения*» Сянкоўскага[2], «*Отечественные записки*» і «*Современник*», якія

[1] Калі шляхціц не мог дакументамі пацвердзіць сваё былое шляхецтва, ён пераводзіўся ў стан аднадворцаў — людзей пазбаўленых гэтага гонару і залежных ад яго паслаблення́ў і льгот. Ён станавіўся звычайным непрыгонным селянінам з усімі яго абавязкамі перад дзяржавай.

[2] Сянкоўскі (*Сенковский Осип-Юлиан Иванович*) (1800–1858) — рускі і польскі даследчык Усходу, паліглот, пісьменнік, рэдактар. Заснавальнік першага рускага савага «тоўстага часопіса» «*Библиотека для чтения*».

хваліў у лістах да Бенедыкта Даленгі (Якуба Юркевіча)[1], будучага рэдактара «*Gwiazdy*», шкадуючы, што польская літаратура не мела нічога падобнага. Яго таксама заханіў Бялінскі – самы здольны з тагачасных расійскіх крытыкаў. Наймення карысным аказаўся ўплыў сталіцы на маральны стан Фіша. У лісце да Даленгі за 3 сакавіка 1845 года ён пісаў: «Ты не паверыш таму, як моцна я змяніўся. Сціплы вясковы хлопец, які любіў ручаі і салаўёў, што меў сімпатыю да Месяца і бясконцых, як кінуць вокам, стэпаў, які жыў у садах і на хутарах сваёй роднай Украіны, стаў халодным да чараў прыроды, эгаістычным, абыякавым. Што мне сёння да аблокаў, да шэпату лісця, да спеву птушак!.. Смешна, па-дзіцячы – здрада! А гэта ж сталасць чалавечага сэрца!

Вер жа цяпер у каханне, у спагаду. Ці ажыву я зноў, калі вярнуся?.. Але прырода бярэ сваё. Пачуццям заўсёды патрэбна сілкаванне. Няма вод і гаёў – затое ёсць пышныя салоны і балі, няма салаўёў, але ёсць італьянская опера, няма каня, стрэльбы і хартоў, затое маюцца шпацыры па Неўскім праспекце. Якое чароўнае відовішча! Бачыш сам, што ёсць да чаго прывыкнуць, ёсць з чаго выбіраць. Што гэта ўсё іншай прыроды і іншага смаку – тое праўда, аднак хутка прывыкаеш да гэтай перамены».

Яму не пераставаў падабацца «*Tygodnik*». У адным з лістоў пісаў: «Блізка ведаю Штырмера, выдаўца (Пжэцлаўскага), ксяндза *Г.* і іншых. Бываю на літаратурных вечарынах...»

У той жа час Фіша апанавала ідэя друкавання ўласнага органа, які павінен быў стаць настолькі апазіцыйным выданнем, наколькі вымагала б таго спрэчнасць поглядаў, але ніколі – зборнікам спрэчак і нешляхетных сварак. Сімвалам яго павінна была стаць свабода перакананняў, задачай – усебаковая крытыка. З пэўнага часу такая думка ўпэўнена прарастала ў большай часткі грамадства, таму была надзённай. Фіш падзяліўся ёю з Даленгам. Пасля доўгіх нарад пастанавілі выдаваць у Пецярбургу калектыўны зборнік пад назвай «*Gwiazda*» («Зорка»). Даход ад яе павінен быў накіроўвацца на адбудову касцёла ў Нямеччыне ў Літве. Гэта вельмі карысна паўплывала на падпіску. Пачалася апрацоўка тысяч артыкулаў. Прымалі, што Бог паслаў, хто што меў пад рукой. Праглі ўласнага часопіса, а калі справа дайшла

[1] Якуб Юркевіч (1808–1875) – пісьменнік, вядомы пад псеўданімам Бенедыкт Даленга (*Dólęga Benedykt*); жыў у Кіеве, дзе ў прамежак з 1847 па 1849 год выдаваў і рэдагаваў 4 тамы літаратурна-крытычнага зборніка пад назвай «*Gwiazda*». Акрамя таго, яго пяру належаць: невялікае даследаванне па гамеапатыі, вольны пераклад драмы Пушкіна «Моцарт і Сальеры», надрукаваны ў зборніку «*Niezabudka*» пад назвай «*Ofiara zazdrości*», і некалькі дробных паэтычных твораў у тым жа зборніку.

да яго, аказалася, што няма той ідэі ці сілы, для праяўлення якіх ён быў бы патрэбны. Фіш меў гатовую невялічкую аповесць «Профілі» і некалькі вершаў, Даленга таксама меў нешта з паэзіі, пераклады з расійскай і французскай – і гэта ўсё. Прыгожы ўступны верш даслаў Дэ Перт (*De Perthes*)[1], далі артыкулы Кажынскі[2], Ржэвускі, Крашэўскі і іншыя, але кніжка налічвала ўсяго толькі 246 старонак. Новы выдавец запрашаў да супольнай працы ў Пецярбургу ксяндза Галавінскага, Пржэцлаўскага, Штырмера – без выніку, тыя не захацелі прыніжацца.

У гэтым месцы будзе дарэчы нагадаць пра лёс выдання, якое пакінула след у тагачасным настроі думак і ў свой час выклікала вялікі гоман, у прыватнасці на захадзе імперыі. «*Gwiazda*», жыццё якой даў Фіш, налічыла ўсяго чатыры выпускі да пары, калі ўпала ў выніку антыпатыі тых, чыё самалюбаванне сур'ёзна зачапіла. Першы том рабіўся спехам, без ніякай кіруючай думкі, без ніякага кірунку. Праблемныя артыкулы склалі вельмі нявінны вінегрэт. Аднак, нягледзячы на гэта, кнігу прынялі з запалам. Усе адчулі ў ёй пульс жыцця, электрычная іскра якога аббегла шырокія колы. Дзе толькі «*Gwiazda*» не была прачытана! Яе падпісчыкі былі рассеяны ад Омска да самых глухіх куткоў Палесся і Жмудзі, ад скал Фінляндыі да цяснін Каўказа. І толькі ў самім Каралеўстве [Польскім] першы том «*Gwiazdy*» быў невядомы. Скімбаровіч адшукаў яго на Валыні і змясціў пра яго значна паперчаны артыкул у «Навуковым аглядзе» («*Przegląd Naukowy*»). Ён пісаў, што «*Gwiazda*» абяцае новае жыццё ў пісьменніцтве, што абуджае [польскую] літаратуру ад летаргічнага сну, у які яе адправілі «старыя графаманы». Але гэта было занадта. Рэдактар «*Tygodnika*» бязлітасна паздзекаваўся з «*Gwiazdy*», але выклікаць Фіша на дасціпнае слоўка было рэччу вельмі небяспечнай: кулі яго былі вострыя і трапныя.

Другі і два наступныя выпускі «*Gwiazdy*» выйшлі ўжо ў Кіеве пад рэдакцыяй Бенедыкта Даленгі.

Пазней Падаліца прыступіў да свайго галоўнага твора «Апавяданні і краявіды» («*Opowiadania i Krajobrazy*»). Гэта былі накіды з яго вандровак па Украіне. Ён штохвілінна ўспамінаў аб гісторыі і постацях мінуўшчыны. Мінуўшчына і сучаснасць Украіны, яе эканамічны стан і звычаі, чароўныя відарысы роднага кутка, па-мастацку апрацава-

[1] Дэ Перт (фр. *Jacques Boucher de Crèvecœur de Perthes*) (1788–1868) – французскі даследчык прыроды, які стаяў ля вытокаў навуковай археалогіі. Аўтар вершаў, фельетонаў, апавяданняў і ўспамінаў.

[2] Кажынскі – (пол. *Każyński Wiktor*) (1812–1867) – кампазітар, дырыжор і публіцыст. Ураджэнец Вільні. У 1842–1867 гадах жыў у Пецярбургу.

ныя народныя паданні склалі змест гэтага рознакаляровага і вельмі забаўнага твора. Але сапраўднымі жамчужынамі ў гэтай мазаіцы сталі два аповеды: «Зося Жыткевіч» («*Zosia zytkiewiczówa*») і «Нестар Пісанка» («*Nestor Pisanka*»)[1].

Фіш не дапушчаў шляхетнага кахання паміж сялянскімі дзецьмі і дзівіўся, адкуль яго пачарпнулі польскія паэты і пісьменнікі Залескі, Гашчынскі, Чайкоўскі[2]. У канцы няўдала меркаваў, што ўзорамі для паэтаў-украінаманаў (так іх называў) мусілі быць пакаёўкі!.. Хаця ўжо тады ведаў і цудоўную «Марусю» Аснавяненкі, і «Катаржыну» Шаўчэнкі, і «Наймічку» гэтага ж паэта – цудоўныя, чыста народныя і ва ўсялякім выпадку, не дворныя тыпы. Падаліца не любіў прастакоў; у гэтых адносінах ён быў, наадварот, моцным шляхціцам, і гэтая рыса ўплывала на кірунак яго творчасці. Сяляне служылі яму натуршчыкамі для ўрокаў партрэтнага малявання альбо як фігуры, прыдатныя для ажыўлення краявідаў.

У польскай літаратуры Падаліца – з'ява арыгінальная. Ён першы прамовіў у сваіх украінскіх сачыненнях па-польску не ўяўнай, не ідэальнай, а сапраўднай, звычайнай мовай паўсядзённага ўжытку. Да яго толькі Міхал Грабоўскі даваў нам адчуць нешта падобнае.

Фіш, больш папулярны за аўтара «Станіцы» («*Stanica*») і «Калішчызны» («*Koliszczyzna*»), смела ступіў на шлях рэалізму і назаўсёды адышоў ад літаратуры тых манерыстаў, пра якіх пісаў Міцкевіч: «Украінцы як селі на Багдана, дык едуць і пакрыкваюць: «Гоп-гоп, цуп-цуп», і, нарэшце, мяне разгневалі. Чаму, чорт пабяры, ім новае ў галаву не прыходзіць?..» Таму Падаліца, уласна, падаў цалкам новае.

Што тычыцца самастойнасці Падаліцы, як аўтара «Апавяданняў і краявідаў», то яна не абсалютная. Гарачае пачуццё, якое плыло з яго сэрца і шырыла грудзі – любоў прыроды – несумненна, дае яму самастойнасць у выяўленні і пазіцыю як пейзажыста ў літаратуры, аднак, з другога боку, у маляванні разнастайных постацей і абразкоў з народнага жыцця ў яго творах ёсць відавочнае захапленне поглядамі маларускіх пісьменнікаў Аснаваненскага і Гогаля. Фіш, скажам так, прадракаў згаданым аўтарам украіншчыну на польскай мове. Яго сачыненні былі звяном, якое злучала дзве роднасныя літаратуры. Аднак ні ў якім разе тут не можа ісці гаворкі пра наўмыснае перайманне. Фіш вельмі сур'ёзна займаўся расійскай і маларускай пісьменнасцю. Адсюль побач са шматлікімі поглядамі, што складалі сферу паняццяў

[1] Пазней гэтыя аповеды пабачылі свет і на рускай мове.

[2] Міхал Чайкоўскі (1804–1886) – актывіст незалежнасці (удзельнік паўстання 1831–1832 гг.), пісьменнік і паэт, які належыць да ўкраінскай школы польскага рамантызму. Пазней заклікаў да прымірэння з Расіяй і да аб'яднання ўсіх славян пад скіпетрам Аляксандра II, але ніякага ўплыву ва Украіне яму дасягнуць не ўдалося.

выключна польскіх, ён засвоіў сабе нямала замежных моўных формаў. Яго польская нячыстая і няправільная. Незвычайны па сваім часе розгалас адшукаў сабе Фіш і як публіцыст. Асабліва праславіла яго палеміка з Кастамаравым, Іванішавым і Юзэфовічам. Аднак быў ён пры гэтым ні мысліцель, ні глыбокі палітык, які б на пэўным гісторыясофскім альбо маральным прынцыпе ўмеў прааналізаваць няшчасці і зрабіць з іх трапныя высновы. Ён быў спрытным і чуйным даследчыкам грамадскай думкі, тэндэнцый, якія пераважалі ў той час, і хутка станавіўся іх клапатлівым прадстаўніком. Незвычайная даступнасць думкі, свабода і лёгкае слова, густа прыпраўленае соллю, і перш за ўсё, жыццёвая важкасць закранутых пытанняў — гэта, а не што іншае, было падставай вялікай папулярнасці Фіша, як публіцыста. Дадавалі яму папулярнасці і артыкулы эканамічнага зместу, напоўненыя здаровымі гаспадарчымі разважаннямі і веданнем прадмета. Галоўнай іх тэмай каля 1860 года было цукраварства ва Украіне.

Такой была пахвальная і з многіх поглядаў выключна ўнікальная літаратурная дзейнасць бялыніцкага ўраджэнца Зянона Фіша.

Леанард Савінскі

Пераклад з польскай Віктара Хурсіка

Фінляндыя

Гляджу, Фінляндыя, на велічныя скалы,
Што, як даспехі, засланілі тваё цела,
І думаю: ты зведала часы вялікай славы
І заставалася твая душа заўсёды светлай.

Ты пражыла ў змаганні тысячы гадоў
З суровым морам, што крушыла берагі-
парогі,

З паўночным лютым ветрам, што гатоў
Трымаць цябе ў палоне снежным да знямогі.

Ты паўставала волатам супроць любой
няволі,

Лепш за яе лічыла змрок магілы
І меч трымала моцнаю рукой.

І так было заўжды. Нікому і ніколі
Не здолець знак парушыць годнасці тваёй
Ні з памяці, ні з вобліку, ні з сілы.

1845 г., Хельсінгфорс

Ноч на моры

Поўня ўзнеслася высока над морам
І лямпаю ў храме прастору нібыта
Ззяе ў асветленай частцы блакіту,
Краі апісаўшы рубінавым колам.

У гэтай прасторы, як зрок дастаць можа,
Спыніцца няма на чым стомленым вокам.
Ужо не адрозніш: дзе неба, дзе мора.
Шукай, карабель, шлях між вод і аблокаў!

Бязмежжа прастору! Я ім як спавіты,
Калі мая думка палётам арліным
Яго перавысіць вялізнасць жадае.

Ды дух мой мацнейшы! Бязмежжа мінае,
Ірве яго путы – ляціць да Радзімы,
Дзе дорага ўсё мне, дзе ўсё не забыта!

6 ліпеня 1845 г., на Балтыйскім моры

Разбіты карабель

Мінаем карабля разбітага парэшткі.
Спякотны поўдзень. І марскія воды
Зачараваннем ціхай сонечнай пагоды
Нібы скрываюць, хто ў бядзе той вінаваты.

З грудзьмі і крыламі, разбітымі аб скалы,
Ён, як арол, падстрэлены ляжыць.
І цудам уцалелы ветразь ледзь дрыжыць
Над тым, што стала зараз непатрэбным хламам.

Так, думаецца, і жыццёвая віхура
Пачуцці і надзеі чалавека разбівае,
Чаруючы красой перад сканаццем,

І гіне ён, акінуўшы вачыма свет свядома!
О, калі лёс мяне падобны напаткае,
Хачу загінуць у змаганні з бурай!

7 ліпеня 1845 г. на Балтыйскім моры

Пераклад з польскай мовы
Алы Войлакавай

Адказ пану Кастамараву

Дыскусійны артыкул, скарочаны варыянт

...Пан Кастамараў... называе прыгнечанне люду сістэматычным і гаворыць нам, як крычыць несправядлівасць мясцовай юрысдыкцыяй, якую кожны ўласнік мог мець паводле права ў сваіх уладаннях і караць падданых нават смерцю. Гэта пярэчанне паходзіць ужо не з трымання погляду, а наўпрост з няведання польскага права і інстытутаў, інакш бы не ганьбіў шаноўны прафесар таго, што варта найбольшай пахвалы. Ніводная канстытуцыя, ніводная рэдакцыя літоўскага Статута, які быў найбольш абавязковым у рускіх землях, не пакідае без пакарання такой віны, як адабранне жыцця (другая рэдакцыя Статута значна павялічыла памер штрафу за забойства, а трэцяя (1588), апроч платы, без розніцы класаў, карае за галаву галавой). Праўдзіва ж, пакаранне смерцю нідзе не даручаецца самім абывацелям, а толькі выключна праз суд.

Некалькі падарожнікаў-чужаземцаў памылкова скіравалі агульную ўвагу сцвярджэннем, што быццам бы ў Польшчы шляхце не забараняласяя забіць чалавека простага паходжання.

З гэтага меркавання адзін знакаміты знаўца нашых правоў і мінуўшчыны робіць наступную слушную заўвагу: «Тое тлумачэнне беспакаранасці забойства прыдумала шляхта сама сабе,– кажа ён.– Прававодства не дапускала яго без пакарання. Шляхціц, які забіў шляхціца, сядзеў у астрогу і плаціў, а калі забіў селяніна, караўся толькі аплатай. Гэтую невялікую ці нават мізэрную плату права лічыла за кару, пакараннем за злачынства. Але мова простай шляхты, якая

прыпавала права свайго жыцця і смерці над ніжэйшымі, прыняла да той гарачай высновы, якую паўтарылі чужаземцы».

1) Але, апрача пязгоды, адкажам пану Кастамараву, што поль ка права мела апеку над простымі людзьмі і, што яму, пэўна, падаецца дзіўным, нават абмежаванне простага чалавека шляхта не накладала сваёй уласнай адвольнасці і ўсё-такі, каб не выйсці за дазволеныя межы, умацоўвала гэта правам. Належыць яшчэ і тое прыняць да ведама, што агульнае імя простага чалавека, якое мы прывыклі надаваць цалкам класу сялянства, не ахоплівала ўсёй вясковай абшчыны і мела вельмі шматлікія выключэнні для разнастайных саслоўяў, вядомых у праве пад назваю баяраў панцырных, путных, свабодных людзей прышлых, вольных і г. д. Нават земляробы, падданы люд, падзяляўся на дзве галіны, а прыгонныя, паводле першай рэдакцыі Статута, мелі чатыры градацыі.

2) Інвентары з XVI стагоддзя.

3) Люстрацыі.

Яны пераконваюць нас у відавочным уплыве гэтых градацый на колькасць і якасць павіннасцяў, якія дзякуючы ім адбываліся. Само сабой зразумела, што мяшчане карысталіся яшчэ больш шырокімі прывілеямі, у прыватнасці ў гарадах, якія кіраваліся магдэбургскім правам, сваімі прэрагатывамі маглі стаяць нароўні са шляхтай.

4) Кепска чытаў пан Кастамараў Volumina legum[1]*, калі кажа нам, што не знайшоў там аніводнага закона, які апекаваў бы клас простага люду. Няхай перачытае яе ўважлівей і знойдзе там артыкулы, якія ахоўваюць мужыка ад пабояў і гвалтаў, ад уціску і, які перавышае межы закона аброку, вызваляючы нават ад паслушэнства і падданства ў такіх выпадках; знойдзе пералік работ і іх рэгуляванне, а таксама палажэнні аб адміністрацыйным пакаранні шляхты за прыгнёт, нялюдскае абыходжанне ці перавышэнне ўлады.

Падобныя ж юрыдычныя нормы адшукае досыць падрабязна выкладзенымі і ў літоўскім Статуце.

5) Што да прыватных судоў, то памыліўся шаноўны прафесар у іх значэнні. Гэта, без сумнення, найпрыгажэйшы помнік адмаўлення на карысць людзей судовай над імі ўлады. Яны мелі на мэце не дагадзіць панскаму самавольству, а наадварот, вымераць справядлівасць, мінуючы пана.

Кромер так апісвае іх: «Апрача паноў, старастаў і радцаў, людзі маюць у гарадах, мястэчках і вёсках сваё судаводства. У вёсках трымае

[1] Volumina legum, старажытны звод законаў Рэчы Паспалітай а 1347-га па 1780-е, укладзены па ініцыятыве епіскапа Язэпа Залускага (1732–1782), – *лаўрэата перакладчыка.*

ўладу пажыццёвы войт, які кліча на суд, з'яўляецца абаронцам вольнасці і судзіць асабіста ці цераз свайго заступніка, які называецца судовым войтам, супольна з некалькімі іншымі вяскоўцамі, якія завуцца лаўнікамі».

6) Ва Украіне злачыннасць і парушэнні права, якія пагражаюць грамадскай бяспецы, разглядалі ў публічных судах, а розныя іншыя злачынствы — у прыватных судах.

Справы па рабаўніцтве належалі да каралеўскіх судоў, пакідаючы толькі пану права прыязджаць у суд і бараніць там свайго чалавека. Літоўскі Статут (IV, 14) прадпісвае прыватным судам цалкам выконваць рашэнні каралеўскіх.

Пераклад з польскай мовы
Віктара Хурсіка

Васіль Жудро

(1849—1917)

«Тайну пахарь совершает...»

Сярод прадстаўнікоў рознамоўнай культуры Бялыніччыны XIX – пачатку XX ст., якія сваёй апантанай дзейнасцю ўнеслі значны ўклад у духоўную скарбонку рэгіёна, адмысловае месца і важная роля належаць Васілю Жудро.

Рускі па нацыянальнасці, светапоглядзе, праваслаўны па веравызнанні, ён логікай уласных паводзін, скіраваных адмыслова на пабудову туташняга маральна-этычнага, духоўна-культурнага кантэксту, супастаўляльны ў пэўнай меры з выбітным прадстаўніком мясцовага каталіцтва, што актыўна дзеяў у Бялынічах, знешне параўнальны, вядома, у пэўнай ступені з настаяцелем бялыніцкага кармеліцкага кляштара канонікам Люцыянам Гадлеўскім. Ядналі, набліжаючы адно да аднаго, як цяпер сказалі б, іх грамадзянскія пазіцыі, жаданне ўплываць на жыццё месцічаў, імкненне далучыць апошніх да той культуры, яскравымі прадстаўнікамі якой з'яўляліся самі.

Люцыян Гадлеўскі дзеіў у кантэксце польскай культуры, пры гэтым не ўтойваў сваёй прыязнасці і да беларускай, аб чым сведчаць ягоныя добрыя і працяглыя стасункі з нешматлікімі на той час пісьменнікамі, якія не цураліся ў сваёй творчасці і роднага, матчынага слова. Сімпатызаваў канонік і нацыянальна-вызваленчаму руху. Але ж ён таксама свядома садзейнічаў і паланізацыі жыхароў бялыніцкага краю, якія, у сваю чаргу, падвяргаліся жорсткай русіфікацыі.

Іераманах Васіль Жудро, ідучы па слядах памерлага ўжо Люцыяна Гадлеўскага, служачы ў адным і тым жа храме (у красавіку 1876 г. кармеліцкія касцёл і кляштар былі перахрышчаны ў Раства-Багародзіцкую царкву, пры якой крыху пазней пачаў дзейнічаць другакласны мужчынскі манастыр), скарыстоўваў яго досвед, але ўжо дзеля таго, каб зрабіць туташні люд праваслаўным па веры, рускім — па самасвядомасці, нямым і глухім у адносінах да роднай мовы.

Гэта была барацьба расійскай і польскай ідэалогій на Бялыніччыне. У аснове той барацьбы палягала палітыка русіфікацыі, з аднаго боку, і паланізацыі — з другога. На жаль, тут не знайшлося ані моцна зарыентаванага нацыянальнага асяродку, ані актыўнай нацыянальна свядомай асобы. Пры такой расстаноўцы сіл гэтая барацьба за ўплывы магла б аказаць пэўнае садзейнічанне ўзнікненню, развіццю і станаўленню мясцовага нацыянальнага грамадска-культурнага руху.

Васіль Жудро з'яўляўся на Бялыніччыне яскравым выразнікам курсу поўнай асіміляцыі, русіфікацыі мясцовага насельніцтва. На гэтай платформе ўгрунтоўвалася яго філасофія, светапогляд, якія і прадвызначалі грамадзянскую пазіцыю, што выражалася ў прафесійнай дзейнасці, паэтычнай творчасці, краязнаўчых занятках.

Васіль Жудро па волі лёсу аказаўся першым, вядома, не па значнасці, паэтам на бялыніцкай зямлі і адным з першых актыўных мясцовых краязнаўцаў. Патрапіў Жудро ў Бялынічы на службу ў манастыр пры Раства-Багародзіцкай царкве, у якім выконваў абавязкі іераманаха. Адначасова выкладаў у прыманастырскай двухкласнай царкоўнапрыходскай школцы. У аглядных справаздачах Магілёўскага епархіяльнага вучылішчнага савета, напрыклад, неаднаразова адзначалася высокае педагагічнае майстэрства манаха, яго тактоўнасць, любоў да дзяцей.

Дбаў іераманах Васіль і пра душы дарослых. Ён разумеў сілу ўздзеяння друкаванага слова, магчымасць яго рабіць уплыў на вялікую аўдыторыю. Таму імкнуўся свае найбольш важныя, найбольш значныя павучэнні распаўсюджваць праз друкаванне іх асобнымі брашурамі. У Магілёўскай губернскай друкарні былі набраны і афармлены ў такія невялікія брашуркі наступныя павучэнні манаха з Бялынічаў, прамоўленыя ім у дзень ушанавання Казанскай іконы Божай Маці, у нядзелю Ваій, на пяты тыдзень вялікага посту, у нядзелю пра сляпога,

3. Зак. 2368

у нядзелю 16-ю на пяцідзясятніцу, пры наведванні іконы Бялыніцкай Божай Маці Аршанскага Богаяўленскага манастыра і іншыя. Ён таксама склаў падручнік для вучняў двухкласных царкоўнапрыходскіх школ «Уроки Закона Божия, или краткое понятие о богослужении, святом храме, священных вещах и лицах», пераказаў змест кнігі «Ефиры».

Васіль Жудро быў, безумоўна, асобай дапытлівай, творчай, і яго ная творчасць праяўлялася ва ўсіх справах, да якіх меў уласнае дачы ненне: царкоўная дзейнасць, мясцовая гісторыя, паэзія, настаўніцтва, журналістыка.

За восем гадоў знаходжання ў Бялынічах (1905—1913) іераманах Васіль выдаў 15 кніг і брашур.

Галоўным кірункам сваіх краязнаўчых пошукаў ён выбраў царкоўную гісторыю і найперш — гісторыю праваслаўнай царквы на Бялыніччыне. Абапіраючыся на даследаванне папярэдніка, гістарычны нарыс Фёдара Андрэевіча Жудро «Белыничский Рождество-Богородицкий монастырь», асноўную ўвагу ён звярнуў на гісторыю з'яўлення ў Бялынічах цудатворнай іконы Маці Божай Бялыніцкай. Яго брашура «Белыничская чудотворная икона Божией Матери» вытрымала за сем гадоў (1905—1912 гг) шэсць перавыданняў. У 1905 г. выдадзена, а ў 1912 г. перавыдадзена яшчэ адно невялікае даследаванне Васіля Жудро, прысвечанае ягонай улюбёнай тэме,— брашура «Белыничский монастырь и чудотворная в нем икона», на старонках якой сцісла падаецца гісторыя Бялыніцкага манастыра. Гэтыя творы паслужылі падмуркам да больш глыбокага і грунтоўнага даследавання Васіля Жудро, якім з'яўляецца ягоная кніга ў дзвюх частках «Белыничский Рождество-Богородицкий монастырь».

На старонках гэтага даследавання падаецца разгорнутая гісторыя Бялыніцкай праваслаўнай бажніцы, у якую быў перахрышчаны кармеліцкі касцёл Успення Маці Боскай, сцісла пераказваецца гісторыя 44-гадовага супрацьстаяння католікаў і праваслаўных за храм і цудадзейны абраз Маці Божай Бялыніцкай, у якое былі ўцягнуты не толькі вернікі Бялыніччыны, але і магілёўскае і санкт-пецярбургскае духавенства, шматлікія свецкія чыноўнікі. Непасрэдным вынікам барацьбы гэтых роднасных канфесій стала перамога праваслаўных, якім храм і цудадзейная ікона, што зберагалася ў ім, былі перададзены не паводле архіўных дакументаў, а зыходзячы з таго «влияния, какое костел сей со времени основания своего до ныне имел на православное русское население Могилевской, Минской и Витебской губерний».

У кнізе «Белыничский Рождество-Богородицкий монастырь» аўтар яе, нягледзячы на сцісласць выкладання гістарычнага матэрыялу, імкнецца да пэўнай сістэматызацыі звестак, уключае ў кантэкст свайго даследавання шматлікія дакументы, што захоўваліся ў архіве Магілёўскай духоўнай кансісторыі.

Паэтычную спадчыну Васіля Жудро складаюць тры зборнікі рускамоўных вершаў.

Першая кніга ягонай паэзіі датуецца 1909 г. Яна пабачыла свет у Магілёўскай губернскай друкарні і называлася «Стихотворения иеромонаха Василия Жудро». Даве астатнія з гэткімі ж самымі назвамі прыйшлі да чытача ў адным, 1912 г., але выдадзены былі ў розных друкарнях — Магілёўскай губернскай і прыватнай Аршанскай, якую трымаў Левін. Праўда, на вокладцы аршанскага зборніка вершаў пазначана, што аўтарам іх з'яўляецца Уладзімір Васільевіч Жудро. Аднак паасобныя вершы з гэтай кніжкі сустракаюцца і на старонках як першага зборніка, так і таго, што пабачыў свет адначасова ў Магілёўскай губернскай друкарні. Такім чынам, калі гэта не памылка друку, то нішто іншае, як сапраўднае імя і імя па бацьку творцы.

Характэрнай рысай кампазіцыйнай пабудовы ўсіх трох паэтычных кніг з'яўляецца тое, што пачынаюцца яны вершаванымі малітвамі аўтара, у якіх вар'іруецца тэма спрадвечнай грахоўнасці чалавека, просьба да Бога праяўляць літасць да людзей і аказваць ім дапамогу ды садзейнічанне ў іхніх справах. Шмат увагі паэт надаваў і напісанню вершаў на вядомыя рэлігійныя сюжэты. Гэты пласт яго твораў набліжаецца па гучанні і сэнсава да медытацыйнай лірыкі; яны здольныя абудзіць у душы чытачоў суперажыванне, выклікаць адпаведны эмацыянальны стан. Праўда, нярэдка сярод гэтых вершаў сустракаюцца і творы з радкамі аголенай публіцыстычнай скіраванасці, у якіх аўтар звяртае ўвагу на пэўныя сацыяльныя з'явы, спрабуе выйсці на філасофскія абагульненні. «Згубленая невіноўнасць ніколі ўжо болей не вяртаецца». Гэты тэзіс Васіль Жудро часта выкарыстоўваў, выступаючы супраць прастытуцыі, сутэнёрства, разбэшчанасці.

Мабыць, паэт-святар ставіў сабе за мэту папярэдзіць людзей, паказаць, да якіх наступстваў можа прывесці іх грэбаванне мараллю, правіламі прыстойнасці.

Гнеўныя паэтычныя радкі іераманах адрасуе і тым, хто адвярнуўся ад рэлігіі, забыўся на Бога. Да слова сказаць, адгукнуўся ён з маленькіх Бялынічаў і на падзею, агучаную з усіх амбонаў Расійскай імперыі,— адлучэнне Льва Талстога ад царквы. Гэты яго верш паблажліва называецца «Николаич Лев Толстой».

Зрэшты, паэтычная спадчына Васіля Жудро вызначаецца не гэтай вершаванай публіцыстыкай. Ён уважліва прыглядаецца да навакольнага жыцця, жыцця простага чалавека — месціча, селяніна, рыбака. Паэтызуючы працу наогул, літаратар засяроджвае ўвагу на цяжкай долі, напрыклад, хлебароба. З вялікім замілаваннем Жудро распавядае (верш «Труженик») пра дбайнага селяніна, які, не пакладаючы рук сваіх, шчыруе круглы год: «А придет к себе домой // Черствый хлеб ест с солью, // И с холодною водой // Да с сердечной болью».

3*. Зак. 2368

У іншым вершы «Снеговою пеленою все покрыто...» — ён паказвае нарадасны малюнак штодзённага жыцця селяніна. Эмацыянальная ўзрушанасць твора дасягаецца праз супастаўленне прыгажосці прыроды і сялянскай долі.

Аналіз вершаў Васіля Жудро, у якіх адлюстроўваецца жыццё простага народа, і асабліва сялянства, з яго паўсядзённымі клопатамі, турботамі і марамі, сведчыць, што бялыніцкі паэт плённа выкарыстоўваў адпаведную традыцыю і паэтычныя прыёмы Мікалая Някрасава.

Важнае месца ў творчасці Жудро займала і тэма мастацтва, паэта і паэзіі. Найбольш яскрава яна раскрываецца ў такіх творах, як байцы «Соловей и кот», «На гроб Пушкину», «Поэту», «Ответ поэта»...

У паэтычнай спадчыне іераманаха Васіля нярэдка сустракаецца прыродаапісальная лірыка — эмацыянальна-гуллівая, падсвечаная мяккай журбой і ледзь улоўнай тугой.

Схільнасць Васіля Жудро да гісторыі адбілася і на яго паэтычнай творчасці. Напрыклад, першы зборнік яго паэзіі адкрываецца вершам «Святыни Киева», які мае падзагаловак «Впечатления пилигрима».

У ім аўтар робіць даволі працяглую экскурсію ў гісторыю, апявае Кіева-Пячэрскую лаўру, паэтызуе былінны Дняпро — «Свидетель строгий и безмолвный деяний русской старины».

Магчыма, з Кіевам, Украінай Васіля Жудро паядноўвала нешта значна большае, чым цалкам зразумелае захапленне. Гэтай краіне прысвечана некалькі вершаў, і сярод іх такія надзвычай паэтычныя, далікатна эмацыянальныя, дынамічныя, як «Ночь на Украине», «Лавра». На ўкраінскай мове Васіль Жудро напісаў верш «Нема щасця, нема й долі»... Да слова сказаць, адзін верш у зборніку, што быў выдадзены ў 1909 годзе, складзены і на польскай мове.

І толькі дарэмна шукаць яго беларускамоўныя вершы.

Міхась Карпечанка

Душе

Время мчится скоротечно,
Летит быстро, как стрела.
Что ж, душа, живешь беспечно?
Рассмотри свои дела!

Время встать тебе, проснись,
Сном унылым почто спишь?

Иль суда ты не боишься?
Что, погрязши в грех, лежишь?

Что ты скажешь в оправданье
Пред престолом судии?
После смерти покаянья
Нет... себя тогда вини.

Осень

По садам во всей деревне
Обнажились все деревья;
И поля – поопустели,
К югу птицы улетели.
Улетели в теплы страны,
По утрам стоят туманы.
Желты листья ветер носит,
Мелкий дождичек моросит.
Резкий ветер завывает,
Много тучек нагоняет.
Наступает уж и стужа,
Хоть в дворе – сплошная лужа.
У крестьян одна забота:
В их гумнах кипит работа,–
Просушивши, рожь молотят
И друг дружку прихохотят
Верным взмахом бить цепами
По снопам, идя рядами.
И потом все жито веют,
Для муки же рожь подсеют.
Собирают всю мякину,
Чтоб кормить свою скотину.
Яровую же солому
Всю на корм привозят к дому.
Бабам, девкам есть работа,
И у них – своя забота:
Досмотреть свою скотину
И напрясть-соткать холстину,
Все в хозяйстве пригодится,
В печь взглянуть – как борщ варится,
То помыть иль справить,
В школу же детей отправить,
Чтобы грамоте умели,
Божий страх в сердцах имели.

* * *

Счастья люди все желают
И гоняются за ним.
Но нигде не обретают –
Улетает, словно дым.

Всюду ищут, а не знают,
Где скрывается оно...
Не смотри, что все желают –
Знай, нашли б уже давно.

Счастье же искать далеко
Нет нужды, оно при нас:
Внутрь взгляни душевным оком –
И найдешь его тотчас.

Счастье в сердце обитает,
Если совесть в нем чиста.
И мгновенно улетает –
В чьей душе нечистота.

* * *

Смотри, пшеничное зерно
Лежит оно само одно.
Посей в землю – оно сгниет
И колос вновь зерно дает.

Так человек, когда умрет,
То плоть его в земле сгниет.
С делами ж новыми опять
Воскреснут все на суд предстать.

* * *

Посмотри на сирот,
Что стоят у ворот.
В них душа еле держится в теле.
Бедных ты приласкай
И покушать им дай –
Они, чай, много дней уж не ели.
В них печаль без конца,
Нет родного отца.
Да и мать занесли на кладбище.
А к тому ж дом сгорел –
Как пожар свирепел,
Осталось там одно пепелище.
Кто ж сирот приютит,
От нужды защитит?
Кто насущный им даст кусок хлеба?
Помоги ж им теперь –
И в награду, поверь,
Ты получишь сторицей у Неба.

На скрыжалях імклівых гадоў

НАТАЛЛЯ

БАТРАКОВА

Яблоки

Отрывок из романа «Миг бесконечности»

— Добры вечар! Як пачуваецеся?

Среди ставшего привычным попискивания медицинских приборов Катя расслышала новые звуки и размежила веки.

«Сон,— заторможенно попыталась она осознать реальность.— Мова? Здесь? Бред!»

За два дня нахождения в клинике она и русскую-то речь слышала дважды: от сербки, определявшей ее в стационар, которую понимала лишь на уровне контакта, и от готовившей ее к операции медсестры. Женщина обладала явно выраженным прибалтийским акцентом и была скупа на слова, но говорила свободно.

Затуманенное сознание выхватило в полумраке палаты фигуру в синей униформе, сфокусировавшись, идентифицировало мужчину, внимательно смотревшего на мониторы над кроватью.

— Усё цудоўненька! — меж тем пробормотал он.

— ...Вы кто? — пытаясь придать резкость изображению, близоруко сощурилась Катя.

— Доктор,— ответили ей.— Олег. А вы...— Он бросил взгляд на один из мониторов.— Екатерина? Очень приятно.

Разговаривать, не различая лица и мимики собеседника, было некомфортно.

— Где мои очки? — забеспокоилась она.

— Вот, держите,— протянул очки мужчина и уточнил: — Вы ведь из Минска?

— Из Минска,— кивнула она, наконец-то рассмотрев собеседника.

Высокий, плотный молодой человек, с ежиком коротко остриженных светлых волос, с серыми глазами, обрамленными густыми выгоревшими ресницами, пухлыми губами.

«Лицо доброе»,— подумала она.

Поймав изучающий взгляд, Олег улыбнулся.

— А я тоже минчанин! — сообщил он и не менее радостно добавил: — Третий год здесь работаю и впервые разговариваю с землячкой! Заступил на дежурство, просмотрел список больных и первым делом к вам побежал. Как себя чувствуете? Что-то беспокоит? — спросил он, став серьезным.

— Ничего,— прислушалась к себе Катя.

— Разрешите, я посмотрю,— попросил он и, не дожидаясь ответа, откинул одеяло. Бережными движениями слегка помял живот, снял край лейкопластыря, прикрывавшего послеоперационный шов, приклеил его на место и снова прикрыл больную одеялом.

«Ничего не говорит о ребенке,— болезненно поморщилась Катя.— Надо спросить... Боже, как страшно!»

— Болит? — тут же отреагировал доктор.

— Скорее ноет,— успокоила она.— Терпимо.

— Понятно.— Он что-то пометил на планшете.— Вы, наверное, хотите знать, как ваша дочь? — словно услышал он ее немой вопрос.

— Да,— выдавила Катя мигом пересохшими губами.

Внутри все сжалось, скукожилось, на что один из мониторов тут же отреагировал тревожным попискиванием.

— А вот так нельзя! — предостерег доктор.— Ваша задача после кесарева — как можно быстрее встать на ноги: вам еще ухаживать за ребенком! Насколько я знаю, операции прошли успешно: и у вас, и у девочки,— ободряюще улыбнулся Олег.

— А как она сейчас? Вы могли бы узнать? — с мольбой в голосе произнесла Катя.

— Конечно. Сейчас к вам зайдет медсестра, сделает необходимые процедуры, за это время я завершу обход и свяжусь с дежурным неонатологом в детской реанимации.

4. Зак. 2368

— Я буду ждать...— прошептала Катя и «поплыла» обратно в полудрему.

Иногда размыкая веки, она напряженно щурилась, следя за мельканием цифр в углу монитора, и снова впадала в забытье. Но при этом слух обостренно реагировал на малейший шум в коридоре.

Наконец открылась дверь, в палату кто-то вошел. Распахнув веки, Катя попыталась рассмотреть размытую фигуру. Скрипнула табуретка, фигура стала ниже и ближе.

«Олег!» — обрадовалась она, узнав доктора, и тут же заволновалась: в данную минуту самым главным в мире было состояние ее новорожденной и тут же прооперированной дочери.

— Все в порядке,— успокоил Олег, коснувшись ее ладони.— Ваша дочь — еще тот боец: состояние стабильное. Вам надо отдыхать. Спите.

— Подождите! — ухватила она доктора за руку.— Не уходите! Как вы считаете: каковы наши шансы? — отрывисто спросила Катя.— Говорите все как есть,— придала она голосу твердости.— Я ко всему готова. Пожалуйста.

— Ну, если так...— опустил он голову.— Вы уже знаете, что с такой множественной врожденной патологией дети живут от силы час-два. А ваш ребенок...— сверился он по часам на мониторе.— Вас в девять утра оперировали? После сложнейшей операции на крохотном сердечке прошло более пятнадцати часов, и время теперь — наш союзник. У профессора Сандина золотые руки. Все должно быть хорошо, надо верить! — ободряюще сжал он ее пальцы.

— Я верю,— улыбнулась Катя, на глазах показались слезы.— С первого дня беременности верила, что бы мне ни говорили, что бы ни советовали, как ни убеждали!

— Догадываюсь, через что вам пришлось пройти,— понимающе кивнул доктор.— И что еще придется преодолеть.

— Я знаю — две операции. Но я дала слово: мой ребенок выздоровеет, будет жить нормальной жизнью. Чего бы мне это ни стоило.

Олег поднял голову, заглянул ей в глаза.

— Я всегда преклонялся перед силой материнского инстинкта и такими женщинами, как вы. Уверен, что у вас все получится... Знаете, я ведь тоже инвалид детства, и моя мама точно так когда-то дала слово: мол, сделаю все, чтобы он выздоровел! И вот результат...— Доктор показал на себя и расплылся в добродушной улыбке.

— Вы?! Вы — инвалид детства? — расширила глаза Катя.— Где мои очки?

— Держите,— протянул он очки.— Я астматик. С младенчества — по больницам, на капельницах да на гормонах. И все время рядом была мама, боялась на минуту одного оставить. «Хлюпик», «мамень-

кин сынок», «заучка» — чего только я не наслушался! — усмехнулся он.— Как сейчас помню: ребята во дворе будто заведенные носятся, а я несколько шагов пробежать не могу — сразу кашель, одышка. И, куда ни возьмись, мама с баллончиком: если и выпускала во двор — а мы на втором этаже жили, то всегда держала окна открытыми, чтобы слышать мой кашель. Так что я больше дружил дома с книгами.

Катя надела очки и с любопытством принялась изучать доктора: широкие плечи, мужские крепкие ладони, мускулистая шея, которую не мог замаскировать воротник-стойка униформы.

— Не верится,— сообразив, что так пристально разглядывать человека неприлично, смущенно отвела взгляд.

— А я и сам не верю,— снова расплылся в улыбке Олег.— Прошлым летом приезжал в отпуск, разыскал двоих ребят с того двора. Надо было видеть их изумленные лица!.. Они ведь долго не понимали, почему я — не такой, как все. Однажды взяли меня на «слабо» и подбили за яблоками слазить в заброшенный сад. Мы тогда на Чкалова жили, рядом как раз начали застраивать район Могилевской-Воронянского. Людей выселили, частные подворья снесли, а сады выкорчевать не успели — яблони, груши, сливы! И год урожайный выдался — фрукты гроздьями висели, дразнил... Мы, дети каменных джунглей, такого бесхозного изобилия в жизни не видели. Набрали огромные пакеты яблок, а я нести вызвался. Хотелось стать своим для ребят. Ну, мальчишка, словом,— усмехнулся он.— И вдруг сторож со стройки выскочил: как рявкнул — все врассыпную. А я-то с яблоками — не могу добычу бросить, бегу, волоку пакеты. Стал задыхаться. Хлоп по карманам — баллончика нет: во двор-то ненадолго вышел, на приступ не рассчитывал. Пацаны собрались — меня нет. Не испугались, вернулись обратно, а я на земле валяюсь, уже синеть стал. Побежали к сторожу, тот «скорую» вызвал... А спустя пару дней приехали пацаны ко мне в больницу и привезли те самые яблоки: брось они меня тогда — помер бы в кустах.

— Молодцы ребята,— похвалила Катя.

— А то! У нас двор вроде как и спокойный был, но хулиганья вокруг хватало: девяностая школа рядом, о ней ого-го какая слава ходила! Но я в первой учился. Так вот, пока не переехали с мамой, больше никто меня во дворе не задирал. Уважали.

— А я знаю, где девяностая школа. И где первая, знаю,— обрадовалась Катя.— Я дважды жила в том районе: сначала студенткой квартиру снимала, а после — по семейным обстоятельствам. В доме между аптекой и хлебным.

— Неужели? — искренне удивился Олег.— В этом доме до сих пор живет моя первая любовь! Детская, на три года старше, Татьяной зовут. Не знакомы?

4* Зак. 2368

– Нет. Я там недолго жила, пару месяцев... А почему вы переехали? Такой район замечательный, зеленый, тихий!

– Отец с мамой развелись: не выдержал он моих болезней. Бабушка к тому времени одна жила, вот мы к ней и перебрались на Якуба Коласа,– поделился Олег.– Окна квартиры прямо на трамвайные пути выходили. Я, когда в мединституте учился, часто за книгами по ночам засиживался, с первым трамваем спать укладывался. До сих пор стук колес по рельсам снится. Но друзьями я на новом месте не обзавелся...

Ностальгически улыбнувшись, Олег посмотрел на монитор.

– Ну вот и замечательно: давление нормализовалось, сердечко ровно стучит,– констатировал он.– Самая надежная анестезия – приятные воспоминания! Спите. А мне пора.

– У меня сейчас вообще ничего не болит. Как только о Минске заговорили, сразу отпустило... Олег, не уходите. Пожалуйста, побудьте со мной еще недолго. С вами – как-то спокойнее,– попросила Катя.

– Ну хорошо, пять минут у меня еще есть,– сверил он время по часам на мониторе.– Только я дверь в коридор открою, чтобы слышать...

– ...А как вашей маме удалось...– Катя пыталась сформулировать волнующий ее вопрос.

– ...вытащить меня из болезни? Верила, как и вы, хотя руки порой опускались. На трех работах вертелась, деньги откладывала, чтобы на лето нас с бабушкой в Крым отправить. Там мне и в самом деле становилось легче, но стоило вернуться – приступы повторялись. К каким только врачам она меня ни возила, какие только методики ни опробовала – ничего не помогало. Пока один доктор не рекомендовал подводное плавание: мол, не надо убегать от проблемы – надо идти ей навстречу. А в моем случае главное – правильно дышать и не паниковать. Так что мама, как ни берегла свое чадо от простуд, решилась отвести меня во Дворец водного спорта. От отчаяния, наверное. Но буквально через пару месяцев случилось чудо: приступы почти прекратились. Правда, с медицинской справкой возникали сложности: меня ведь уже в инвалиды записали, какое плавание? – улыбнулся он.– Вот такая история... Еще годик здесь подучусь – и домой,– неожиданно добавил он.

– Как домой? – удивилась Катя.– Вы серьезно?

– Серьезней некуда,– подтвердил Олег.– Хотя после того как отработал распределение в одной нашей больнице и получил грант на учебу за рубежом, был уверен, что уезжаю навсегда. Маму хотел со временем перевезти, и поначалу ради этой благой цели сил не жалел: учился, работал, язык совершенствовал, во всякие юридические тонкости вдавался. Жил по графику: поспал – и за работу.

– А давно вы здесь?

– Скоро три года.

– Странно...

Катя задумалась: человека, который хотел вернуться на родину и честно в этом признавался, за два месяца жизни в Германии она встретила впервые.

– И почему передумали? Расскажите, для меня это важно.

– Стоите перед выбором? – предположил Олег.– Не уверен, поможет ли вам мой рассказ: каждый свой путь сам выбирает... Хорошо. Понимаете, раньше мне казалось, что ностальгию люди просто выдумали – от лени, от безделья, от желания как-то себя оправдать... Ну, как бы вам объяснить...– попытался он подыскать правильные слова.– Мне тут недавно земляки книгу дали почитать: «Территория души». Слышали?

– Да,– неуверенно кивнула Катя, пытаясь припомнить сюжет давно прочитанного романа.

– Очень правильное понятие – «территория души». С одной стороны, ну какая может быть территория у души? Если, конечно, не считать тело, в котором она живет. А на самом деле такая территория есть: место, где ей хорошо, комфортно, где царит умиротворение, покой... Весной мне надо было принять окончательное решение: остаюсь или возвращаюсь? Никак не мог определиться и на нервах все пошло не так: на работе перестало ладиться, грипп подхватил. Слег с высокой температурой, впадал в забытье. И преследовали одни и те же видения: первая любовь, мама, ребята во дворе и те самые яблоки... Не поверите, но я даже их запах чувствовал! Так могли пахнуть только те яблоки, из детства! – воодушевленно уточнил он.– Очнулся и сразу решил: возвращаюсь! И так легко, радостно стало на душе... Понял, что убегал от самого себя, старался не слышать, как мается душа, жил умом, а не сердцем. Стоило определиться – сразу стал выздоравливать. Дела наладились. Поставил новую цель – стать со временем таким же детским кардиохирургом, как профессор Сандина. Ну, чтобы таким, как вы, не пришлось лететь за помощью в другую страну,– пояснил он.– Мову пачаў вывучаць... Мабыць, за мяжой найбольш востра паўстае пытанне: хто ты ёсць насамрэч?

– А как ваши друзья отнеслись к такому решению?

– Вы имеете в виду тех, кто здесь работает? – уточнил Олег.– Тут мы, как правило, не друзья, а конкуренты в борьбе за место под солнцем,– усмехнулся Олег.– И это нормально: стимулирует... Думаю, некоторые из них обрадовались.

– А те, кто не обрадовался?

– Те считают мое решение ошибочным. Только я думаю иначе. Эмиграция – жестокая штука: здесь по ночам каждому снятся свои

яблоки. Рано или поздно наступает момент истины, но изменить что-то уже невозможно: работа, семья, дети. Страшно. И возраст, опять же. «Яблоки» — это и есть ностальгия. Иногда она переходит в хроническую форму, как болезнь. Многие эмигранты спят и видят, как бы вернуться на родину, но не все могут в этом признаться даже себе. Так и чахнут при полном внешнем благополучии.

— Вы уверены? — озадачилась Катя.

За время жизни в Германии такое она слышала впервые. Конечно, в русскоязычном кругу частыми были рассказы о родине — где кто родился, вырос, учился. Но особенной грусти в этих разговорах она не уловила. Или дело в чем-то другом?

— Уверен,— кивнул Олег.— Вот давайте возьмем пример из жизни растений. Хорошо известно, что пересадить большое дерево, чтобы оно прижилось, практически невозможно. Разве что с огромным комом земли, сохраняя корни в благоприятной среде. И пересаживать желательно в подобную же среду обитания: береза никогда не приживется в пустыне среди кактусов. Люди — как деревья: эмигрируя, они должны выдрать себя с большим «комом земли». Если безжалостно отсечь корни — могут не прижиться, а если и приживутся, то все равно не будут такими, какими могли бы вырасти на родине,— пышными, красивыми. Разве что в оранжерее...

— А вот здесь я с вами не соглашусь,— все еще раздумывая о своем новом окружении, перебила Катя.— Многие здесь продолжают цвести и пахнуть. Во всяком случае, я пока только таких встречала.

— Вы здесь недолго и наблюдаете за видимой частью айсберга,— многозначительно произнес Олег.— Поначалу и мне так казалось... Вот только прежней питательной силы даже пересаженному с «комом земли» дереву хватает ненадолго — от силы несколько лет. И если к тому времени не образовались новые корешки и не пошли новые ростки — начинается процесс увядания.

— Новые ростки, я так понимаю, дети?

— Да. Но здесь кроется другая беда: когда они вырастут, это будут уже гибриды. Потому что изменилась среда обитания. Не исключено, что через несколько поколений они окончательно потеряют родительские черты. Но я хочу, чтобы мое продолжение сохранилось... как вид, что ли. Эволюционировало — да. Но при этом не потеряло идентификационный код или, того хуже, не превратилось в перекати-поле.

— А вы философ, Олег,— переваривая монолог доктора, уважительно заметила Катя.

— Я не философ, я практик: знаю, что в итоге пересиливает — сознание или подсознание... Вот давайте проведем эксперимент. Закройте глаза.— Катя послушно опустила ресницы.— А теперь быстро

вспомните самое главное, что осталось дома: люди, самые яркие впечатления, ассоциации... Раз, два, три... Стоп! – скомандовал он.– Рассказывайте, что видели?

– ...Вади...– начала женщина, но тут же осеклась.– Любимый человек,– поправила она себя,– отец... И два клена за забором: один желтый, другой красный,– подняла она удивленный взгляд.

– Вот! Что и требовалось доказать! У вас тоже есть свои «яблоки»! И корни ваши остались там... Так что я не философ...– повторил он, усмехнувшись.– Философом по образованию была мама, но ради меня бросила науку и пошла мыть подъезды. Я вас познакомлю, если хотите.

– Хочу! Я очень даже хочу познакомиться с женщиной, вырастившей такого чудесного сына!.. Вот только не знаю, когда я вернусь в Минск.

– Не переживайте. Мне понятно, что вас здесь держит. Пока не разрешится главный вопрос – вы будете ни здесь, ни там... Но вы вернетесь,– убежденно произнес Олег.– ...Однако я засиделся.– Доктор решительно поднялся с табуретки.– Спите, я загляну к вам утром... Да, забыл сказать: ваш муж звонил, справлялся о состоянии,– вспомнил он уже в дверях.

– Спасибо. Но он мне не муж,– внесла ясность Катя и покраснела: Генриха в своем мимолетном воспоминании она не видела. Даже стыдно стало: он столько сделал для нее и Марты! – Подождите секунду! – попыталась она снова задержать доктора.– Я смогу завтра увидеть дочь? Вы мне поможете?

Коснувшись дверной ручки, Олег остановился:

– Постараюсь,– что-то обдумав, пообещал он.– Спокойной ночи!

– Спокойной... Спасибо за ликбез из жизни растений! – добавила она вдогонку.

«А ведь он прав: сколько людей уехало из страны, сколько пытается прижиться на чужой земле... Многие уже без корней... И иногда обрубали их осознанно, в надежде, что так будет проще... Удивительный молодой человек,– закрыла она глаза.– И он прав: я вернусь... Мы вернемся...» – с улыбкой подумала Катя, медленно погружаясь в сон...

А навстречу, расставив ручонки и заливисто хохоча, уже бежала подросшая дочь. За ней с любовью и нежностью наблюдали двое мужчин, а за их спинами, шелестя листвой, раскачивались два клена – красный и желтый...

Вячаслаў Казакевіч

* * *

В небе туча плывет нехорошая...
Мать с постели встает тяжело,
закрывает розетки галошами,
чтобы молнией дом не сожгло.

В темной комнате пахнет больницей.
Гром гремит... И с тоской слышу я:
«Это все на своей колеснице
разъезжает по небу Илья!»

Скачет близко огромная лошадь...
Села мама на край простыни
и с надеждой глядит на галошу,
что спасет от пророка Ильи.

Одуванчики

В сторонке от поселка дачного
живет старуха вместе с кошкой.
И десять тысяч одуванчиков
молчат у низкого окошка.

Стоит изба над самым озером,
на днях ее снесут бульдозером.
Но знают птицы и зверье,
что есть защита у нее.

За дом, за кошку на диванчике,
за бабку, что устала жить,
все десять тысяч одуванчиков
готовы головы сложить.

Семья

Поселок городского типа.
К забору притулилась липа.
Под липой — шаткая скамья,
на ней сидит моя семья.

Отец с трескучей сигаретой,
мать с могилевскою газетой,
сестра с тетрадкою для нот
и толстый безучастный кот.

Кругом растет трава сырая,
сверкают звезды в вышине...
И я бы сел на лавку с краю,
но не осталось места мне.

Марсиане

А в Белыничах моих
Наблюдали этим летом
Залетевшую на миг
Марсианскую ракету!

Говорят, что проплыла
Над сапожною артелью
И горели три окна
На ее хвостатом теле.

«Это зрительный обман,—
Отвечали из газеты,—
Не бывает марсиан,
Ведь на Марсе жизни нету».

Но выходит в палисад
Ефросинья Полевая
И глазеет в небеса,
А цветы не поливает.

Возле ведер и корыт
В полинялом сарафане
В небеса она глядит:
«Прилетайте, марсиане!»

* * *

Кирпичная дорожка,
открытая калитка.
Еще совсем немножко...
Ползи, ползи, улитка!

Уже прохладу стелет
тебе навстречу сад,
и сочные растенья
об отдыхе шумят.

А в синеве высокой
уже навис каблук,
который ненароком
тебя раздавит вдруг.

Міхась Карпечанка

Разганяйлавы будні

Урывак з рамана «Карчоўскія прыгоды Баніфацыя»

Сяргей Разганяйла ад прыроды валодаў надзвычай рэдкім сярод людзей талентам. Ён мог па-майстэрску падрабляць галасы — жаночыя, мужчынскія, хрыпатыя ад бунту гармонаў хлапечыя і звонкія дзявочыя, пісклявыя дзіцячыя... Гэта была ягоная самая вялікая таямніца, якую хаваў за дзевяццю пячаткамі, за дзесяццю замкамі і за столькімі ж дзвярыма. І ёсць чаму асцерагацца ўчастковаму: крый божа, дазнаюцца людзі — кожны адразу ж лютым ворагам стане. А літасць, раскошна седзячы на коміне, будзе толькі нахабна пасміхацца ды раз'юшваць далей гняўлівы натоўп.

Сяргей вучыўся ў школе так сабе. Дрэнна, адным словам. Не даваўся яму ніводзін прадмет. Не па сілах яму былі дакладныя і гуманітарныя навукі! Хіба што толькі па фізкультуры чацвёркі меў. Дзякуючы фізруку, які быў суседам.

Асабліва даўся ў знакі матэматык, ён жа і завуч, і яго класны кіраўнік. Не на адну пару валёнак той апантаны паслядоўнік Піфагора павыскубаў валасоў з беднай Сяргеевай галавы. Цярпець матэматыка ўжо не было сіл. Каб хоць неяк насаліць настаўнікам, у восьмым класе юны Разганяйла пачаў гора перакрыўляць іхнія галасы і аднойчы зразумеў, што яму гэта добра ўдаецца. А самае важнае, датумкаў ён, гэтая ці не адзіная адшуканая ў сябе здольнасць можа стаць выдатнейшай зброяй для яго помсты.

Першага «парадаваў» сваім талентам, канешне ж, нялюбага матэматыка.

Той, як і ўсе вясковыя педагогі тады, гадаваў свіней. Па трое парсюкоў кожны год: двух – на мяса-сала для сям'і, а трэцяга на грошы мяняў.

Была ранняя восень, яшчэ не ўсе вяскоўцы паспелі бульбу выкапаць на гародах. А свіней біць карчоўцы пачыналі толькі ў лістападзе – калі бялюткі сняжок выпадзе ды крышачку падмарозіць зямліцу. У матэматыкавым хлеўчуку, як заўсёды, тры пятакі рохкалі: салам наліваліся, мясам завязваліся. А тут ягоная цешча яшчэ нейкіх дужа пародзістых кабанчыка і свіначку на развод падкінула. Матэматыкава жонка вельмі ўжо задзірыста, знайшоўшы вольныя вушы, расхвальвала свой нечаканы набытак. Доўтія, казала, захліпаючыся ад шчасця, як лава, свінні вырастуць, і дужа ядушчыя.

– Кабанчыка,– хвалілася,– лягчаць не будзем. Няхай на пародзісты прыплод годзікі два-тры папрацуе.

Карчоўцы ажно ў чаргу на набыццё ненароджаных яшчэ парасятак пазапісаліся. Некаторыя нават і задатак паўносілі. Для ўласнага гарантаванага заспакаення.

Гэта сёння амаль кожны карчовец сам свяжуе свінчо, якое вырасціў на падворку. А ў тыя часы, калі Сяргейка Разганяйла мучыўся ў школе, у вёсцы жылі трое мужчын, якіх клікалі адымаць у свіней іхнія душы. Адзін меў дзедава ружжо і страляў кабаноў і свінак, а двое, рабы Восіп і лысы Зенька, абыходзіліся самаробнымі вастрадзюбымі швайкамі.

Калі першай ахвярай свайго таленту Сяргей выбраў ненавіснага матэматыка, то другой стаў Зенька. З-за Юлькі, ягонай дачкі-школьніцы. Дужа ганарлівай дзеўка расла, занадта пераборлівай станавілася. Сяргей разы тры-чатыры, а, можа, і цэлых пяць, у поцемках клубнай веранды прыціснуў быў Юльку да сцяны. Яму дужа спадабалася, чаго нельга сказаць пра дзеўку. Мабыць, у юнай вясковай красапеты іншыя віды былі. Скончыліся Сяргеевы заляцанні тым, што атрымаў ад старэйшага Юльчынага брата ў сківіцу. У якасці канкрэтнага, першага і апошняга, папярэджання. На вялікім перапынку ў школе, пры хлопцах і дзяўчатах. Ім смех, пацеха, а Разганяйла тыдзень толькі супам

і харчаваўся. Каханне памерла імгненна, затое нарадзілася крыўда. Вялікая. Хлапчукоўская. Сэрца патрабавала лютай помсты і толькі ёй гарэла.

Улучыўшы момант, калі на ферме ў чырвоным кутку нікога не было, апроч заўсёднага рою настырных тлустых мух, Сяргей патэлефанаваў Зеньку і голасам матэматыка папрасіў яго заўтра закалоць трох свіней і двух пародзістых парасятак.

На шчырую няўцямнасць вопытнага свінабоя паважліва адказаў, па-гаспадарску:

– Ды жраць перасталі. Непакоюся, шаноўны, каб хоць не паздыхалі! Гора-бяда будзе.

І папрасіў:

– Ты толькі на самым світанні прыйдзі, Зянон Усцінавіч. У хату не заходзь, кіруйся адразу ж у хлеў і рабі сваю справу. Спадзяюся, што піску і віскату не будзе. У маёй Пятроўны, разумееш, у гэты час наступае самы далікатны сон. З шасці пятнаццаці да сямі нуль-нуль раніцы яе ні ў якім разе нельга трывожыць.

А заколеш – тады й зазірні, шаноўны. Па чарчыне возьмем. Ну, бывай, дружа!

Зенька сваё слова стрымаў. Аніводзін з пяці лычоў нават моцна рохкнуць не паспеў. Вось што значыць сапраўдны майстра!

А сёмай гадзіне, як стала вядома карчоўцам крышачку пазней, спрытны свінабой смела пашкрэбаўся ў абабітыя бляхай дзверы матэматыкавай хаты. Але яго не пусцілі! Дзверы расчыніліся, можа, хвілін праз пятнаццаць. І толькі пасля таго, як узлаваны Зенька здагадаўся моцна грукнуць швайкай па аконнай шыбіне.

– Кешкаецеся доўга, паважаны,– нязлосна папракнуў ён педагога.– Дамаўляліся ж! А дадзенае слова абавязкова трэба трымаць!

Матэматык запытальна вылупіў на свінабоя заспаныя вочы:

– Дазвольце пацікавіцца: аб чым гэта мы дамаўляліся, Зянон Усцінавіч?

– Як гэта, аб чым? Зрабіў, як і абяцаў,– з гонарам за сваё ўмельства бадзёра адрапартаваў Зенька.– Аніводзін не піскнуў і не рохкнуў нават. І ўсе пяцёра, як папрасілі, ужо ў двары ляжаць. У адзін такі роўненькі радочак.

– Хто гэта, усе пяцёра? – яшчэ больш здзівіўся матэматык. І ў яго сэрца востра кальнула, быццам швайка ўвайшла, прадчуванне непапраўнай страты.

– Дзве свінні, кабан ды двое парасятак. Пародзістымі маглі стаць. Ага! Азалаціліся б... Толькі, на жаль, Усявышні не па вашым, шаноўны, хаценні на гэты раз карты патасаваў.

– А чаго яны там ляжаць? – дрыжачым ужо голасам удакладніў настаўнік.

Дык жа ўчора самі напрасілі, каб закалоў! Усіх. Пяцярых. Жраць, калі, нерасталі зусім. Баяліся, каб не паздыхалі...— пачаў, у сваю чаргу, адзіўляцца і адначасова апраўдвацца свінабой.— Можа, гэта самае... Увечары лішнюю кроплю ўзялі, дык сёння нічога не помніце?

Спалатнелы настаўнік, як быў у трусах і майцы, кінуўся на гаспадарчы двор, які аддзяляў ад хаты высокі і шчыльны плот. Следам нехаця, як на допыт злоўлены на гарачым злачынца, паплёўся і Зенька.

— А Божачкі! А што ж ты, душагуб, нарабіў?! — стрымліваючы сябе апошнімі намаганнямі сілы волі, па-бабску застагнаў матэматык над цёплымі яшчэ трыма свіннямі і двума парсючкамі.— Хто цябе прасіў? Ты што — здурнеў? Я ў суд падам!.. Я, ведаеш!..

— У мяне сведкі ёсць,— смела пайшоў у наступ Зенька.— Учора ўвечары ў маёй хаце мы толькі селі ў «дурня» пагуляць, карты ўжо раздалі. А тут і тэлефон зазваніў. Вы прасілі... Усе чулі... Паздзіўляліся. Вы яшчэ і ўмову мне паставілі: каб свінні не вішчэлі, не рохкалі моцна, як калоць іх буду. У Пятроўны (перадражніў) «з шасці пятнаццаці да сямі нуль-нуль раніцы самы далікатны сон наступае!..» Вось і ўважу просьбу!.. Вось і зрабі добрую справу...

Як на тое, на гвалт прыбегла Пятроўна.

— Воўк? — імгненна ацаніўшы маштаб страты, хрыплым голасам запыталася яна. І змоўкла.

— Двухногі,— удакладніў матэматык і кіўком пастрыжанай галавы паказаў на разгубленага Зеньку.— Вунь ён... Стаіць... Лыбіцца...

Пасля Пятроўна тры дні не магла слова з сябе выціснуць. Аніякага. Маўчала і толькі плакала. Потым прыязджалі міліцыянеры, следчыя, старшыня сельсавета з дэпутатам прыходзілі. Мужыкі, якія гулялі ў карты, у адзін голас пераконвалі іх, што матэматык сам прасіў Зеньку ўхайдохаць яго свіней. З парасяткамі. Яны самі гэта чулі і пад прысягай гатовы пацвердзіць, што так і было насамрэч.

— Містыка! Цёмная справа,— зрабілі заключэнне правяральшчыкі і катэгарычна параілі педагогу забраць заяву на свінабоя, якую той паспеў падаць у міліцыю, частку свініны пакінуць сабе, а рэшту здаць у нарыхтоўчую кантору. І настойліва парэкамендавалі ўсім карчоўцам проста забыцца на гэтае здарэнне, як на дурны сон.

Забудзешся тут! Анягож! Матэматык, асабліва яго Пятроўна, варагавалі з Зенькам пяць гадоў. Сем'ямі насы варочалі адно ад аднаго, на другі бок вуліцы пераходзілі, каб толькі не сустрэцца. Ну і, канешне ж, не віталіся. Вядома, абменьваліся праклёнамі і самымі рознымі нядобрымі пажаданнямі. А Сярожка Разганяйла ўпотайкі задаволена паціраў рукі і ціха млеў ад шчасця, бо займеў з гэтай помсты яшчэ і нечаканую для сябе выгаду: матэматык пакінуў яго ў абсалютным спакоі, перанакіраваўшы ўсю сваю неўтаймоўную злосць на Зенькаву Юльку і траіх яе бугаістых братоў.

Былі і яшчэ выпадкі...

Праўда, Сяргей стараўся асабліва не злоўжываць сваім талентам. Прымяняў яго толькі ў крайняй сітуацыі, калі моцна даставалі і ўжо не ставала яго пакорлівасці цярпець знявагі ды пераносіць крыўды. Найчасцей жа дурыўся, проста весяліўся.

Ажаніўшыся, здаралася, выключна дзеля ўласнай пацехі і падтрымання таленту ў тонусе, схаваецца дзе-небудзь на сваім падворку і давай сварыцца жончыным голасам з якой-небудзь суседкай. І тая не распазнавала. Здаралася, па тыдні каторая з іх дзьмулася, спецыяльна не загаворвала з Разганяйлавай Клаўдзіяй ці то дэманстратыўна адмоўчвалася, калі тая спрабавала зачапіць яе словам. Клава не магла даць рады: які сабака перабег паміж імі дарогу?

У апошнія гады ўчастковы інспектар міліцыі ўдала карыстаўся сваім умельствам падчас прамых тэлефонных ліній, якія чамусьці вельмі часта праводзіліся з гарантыяй ананімнасці. Капітан замыкаўся ў сваім апорным пункце, упэўнена накручваў тэлефонны дыск, каб набраць нумар, абвешчаны на першай старонцы масцішчанскай раённай газеты, і голасам якой-небудзь бабулькі-пенсіянеркі прасіў адзначыць і заахвоціць «нашага ўчастковага міліцыянера Сяргея Рыгоравіча Разганяйлу. Гэта не чалавек, а сапраўдны кавалак золата. Не спіць, не адпачывае, кожны дзень і ноч вартуе спакой і набытае гадамі цяжкай працы дабро сваіх аднавяскоўцаў». На тым канцы проваду борздзенька абяцалі пры першай жа магчымасці абавязкова заахвоціць прэміяй такога выдатнага работніка. Праўда, Разганяйла яшчэ да сёння так і не атрымаў з абяцанага ніводнага рубліка. Хоць дакладна ведаў, што такіх мажлівасцей у яго начальства было мноства. Але на гэта ён асабліва не крыўдзіўся. Трошкі, можа, толькі злаваў. Грошай яму і без прэміі хапае. Хутчэй, патрэбны былі спакой ці нейтралітэт з боку таго самага яго непасрэднага кіраўніцтва. Абы не чапала, каб не кусала, не тыцкала кожны раз на нарадах у яго бок пальцамі. Толькі, здаралася, калі вып'е добра, тады глыбока схаваная ў душы злосць раз'юшанай кобрай часам і выпаўзала вонкі. У такія вось моманты Разганяйла гняўліва трос гірай-кулаком і абяцаў толькі аднаму яму вядомым асобам:

– Адальюцца вам мае грошыкі і патрапаныя нервы!

Калі ж хто з сябрукоў ці карчоўцаў спрабавалі ўдакладніць, на чый адрас сыплюцца пагрозы, капітан неахвотна і з цяжкасцю варочаў у роце лянівым языком:

– Жыву, як той жолуд на дубе: не ведаю, якім ветрам садзьме і якая свіння з'есць. Запомніце: самыя гадкія – нашы, масцішчанскія! Адны мудазвоны і ніводнага чалавека! Ім абы пакусаць, абы паслюнявіць... Мабыць, лягчэй тады жывецца!

Праўда, удакладняць прозвішчы тых мудазвонаў ніхто не спяшаўся, нібыта і так яны ўсім былі добра вядомыя.

* * *

Дома Сяргей Разганяйла смачна праглынуў ажно дзве міскі наварыстага баршчу з ладным кусам салёнага сала і добрай порцыяй свежага часнаку. Лежачы на скураной канапцы, ляніва корпаўся ў сваіх службовых паперах. І раптам высветліў, што за месяц, які ўжо сыходзіць апошнімі днямі, ён не склаў яшчэ ніводнага адміністрацыйнага пратакола. У вачах яго непасрэднага начальства гэта ясна азначала толькі адно: участковы інспектар не выявіў ніякага правапарушэння. А такое ў прынцыпе быць не можа! Колькасць пратаколаў з'яўлялася самым важным канкрэтным доказам таго, што міліцыянер, скажам, не гуляў, а працаваў. І чым больш іх складзена, тым напружаней высільваўся ён на сваёй службе. Значыць, не мінаваць чарговага разносу і праведнага гневу начальства. А яно ўжо, што рэальна адчуваў Разганяйла спінай і ўсімі астатнімі ўнутранымі органамі і часткамі свайго цела, на яго свае зубкі дужа вострыць, свае кіпцюрочкі востранька наточвае.

Свята міру няўмольна заканчалася. Начальніцкі бок збіраў сілы і сродкі для нанясення па капітану трапнага балючага ўдару. А тут яшчэ і з гусямі зусім непрыгожая гісторыя атрымалася.

Старая Панкраціха напісала заяву на імя начальніка масцішчанскага райаддзела міліцыі, што нехта з карчоўцаў скраў яе дванаццаць гусей з трынаццатым гусаком-трохгодкам. Паперу, вядома ж, зарэгістравалі і накіравалі для разбіральніцтва ўчастковаму. Разганяйла прафесійна разважыў, што такі вялікі статак патаемна выкрасці проста немагчыма. Таму супакоіў старую і сябе тым, што галодная птушка, мабыць, збегла ў недалёкае Бярозавае балота, а насыціўшыся там, абавязкова вернецца ў двор.

Панкраціха тыдзень спакойна чакала вяртанне сваёй прапажы. Ды ейных гусей з гусаком-трохгодкам як не было, так і не было. Не вярнуліся з балота. Тады жанчына зноў паскардзілася начальніку над усімі масцішчанскімі міліцыянерамі, напісаўшы ў заяве, што яго гультаяваты падначалены ў Карчах зусім нічога не робіць, каб выявіць злодзея і вярнуць ёй скрадзенае. І пісьмова выказала здагадку: Разганяйла, мабыць, проста па знаёмстве пакрывае злачынцу. Ад чаго, мусіць, і сам мае добрую матэрыяльную выгаду.

Што тут пачалося! Як замітусіліся!

— У балота, кажаш, гусі збеглі? — коршунам накінуўся на ўчастковага начальнік райаддзела міліцыі.— А ты іх там шукаў?

— Шукаў,— не міргнуўшы вокам, нахабна зманіў Разганяйла.— Два разы хадзіў. Днём і позна ўвечары. Клікаў іх. Ды так, што ледзь голас свой не страціў! Толькі ведаеце, таварыш падпалкоўнік, адны жабы і адгукваліся. Добра схаваліся, паразіты! А што ім, бедным тым гусям, рабіць, таварыш падпалкоўнік? У Панкраціхі яны вечна галоднымі

хадзілі. Як незадаволеныя арабы на мітынгу, з рання да вечара на ўсе Карчы гагаталі! А ў Бярозавым балоце лафа ім зараз: пастаянны корм побач з дзюбай і вады цэлае мора! Жыві ды радуйся: сапраўдны курорт!

– Капітан! Толькі мне не пудры мазгі! – раззлаваўся начальнік.– Ведаю, як ты працуеш! Не хадзіў ты на балота!

– Хадзіў! Ажно два разы,– непахісна гнуў сваю лінію ўчастковы.

– А выніку няма!

– Будзе вынік,– раптам павесялеў Разганяйла.

Начальнік строгім бацькоўскім позіркам балюча працяў падначаленага.

– Калі яго загадаеш чакаць?

– Увесну,– знайшоў што сказаць участковы.– Вясной будуць гусі!

– Чаму толькі вясной, а не сёння ці заўтра?

– Я, таварыш падпалкоўнік, па гэтай справе цэлае следства правёў,– бессаромна маніў-выкручваўся Разганяйла.– Панкрацішыны гусі, гэта самае, у вырай паляцелі...

– У які яшчэ вырай? – раз'юшанай кобрай узвіўся над службовым сталом гаспадар кабінета.– Свойскія гусі, і ў вырай? Ты альбо п'яны, альбо зусім з глузду з'ехаў!

– Кажу вам, што цэлае следства правёў,– не здаваўся і Разганяйла.– Знаёмыя паляўнічыя гаварылі, што здараюцца такія вось нетыповыя, можна сказаць, анамальныя, выпадкі. І птушка, аказваецца, можа дзейнічаць нестандартна, крэатыўна!

– Тлумач. Слухаю і маўчу!

– Акурат над Панкрацішыным падворкам пралятаў клін дзікіх гусей. Ну, гэта значыць, у вырай яны ляцелі. Гагатнулі з неба, а гэтыя адгагатнуліся ім з зямлі. Ну і з'ядналіся. Родныя ж па крыві...

– Крадзеж гусей зарэгістраваны ў пачатку жніўня. Гэта лета,– падпалкоўнік наважыўся зараз жа вывесці капітана на чыстую ваду.– А пералётныя птушкі восенню ў вырай адлятаюць.

– То быў, таварыш падпалкоўнік, мусіць, ранні вывадак,– паспяшаўся ўдакладніць участковы.– Дый зіма, мабыць, хутка наступіць і дужа суровай будзе. Ёсць такая народная прыкмета. Бо той дзікі гусіны клінок, што звёў Панкрацішыных, зусім нізенька ляцеў над самымі хатамі. Так мне карчоўцы сказалі.

Начальнік задумаўся. Мабыць, разважаў, шукаючы важкія контраргументы.

– Увесну вернуцца, кажаш? – запытаўся ён.– Адкуль такая ўпэўненасць, капітан?

– Дык гэта самае, той клінок і вяртацца з выраю будзе праз Карчы, таварыш падпалкоўнік. Акурат над Панкрацішыным падворкам праляціць. Як і зараз ляцеў. У кожнага выраю свая дарога.

– А як іх на зямлю апусціць? Як у хлеў залучыць?

– Дык Панкраціха клікаць будзе! Яны пазнаюць яе голас і сядуць, як маленькія, на свой родны падворак. Толькі на харч для іх няхай не паскупіцца. Я папярэдзіў ужо яе аб гэтым.

Размова скончылася тым, што Разганяйла атрымаў самы суровы загад прадоўжыць следства, аператыўна знайсці скрадзеных гусей і злодзея. Альбо дакладна высветліць іншыя аб'ектыўныя прычыны знікнення чарады свойскай птушкі і навукова іх абгрунтаваць. Да пачатку верасня, які імкліва набліжаўся. Але гусей не было. Як і падазроных у крадзяжы. Быццам і яны разам з дванаццацю гусямі і трынаццатым гусаком-трохгодкам у цёплы вырай падаліся.

Уладзімір Кароль

Родные названия

Маковка... «Красивая деревня»,— говорили те, кто впервые видел ее. Прямая улица, окаймленная аллеей из берез, кленов, лип, ясеней, верб. Приусадебные участки утопают в зелени садов, в окна заглядывают ветки сирени, черемухи, в палисадниках — яркие пятна цветов. Особенно красиво здесь весной, когда кроны яблонь, груш и других плодовых деревьев распускают бело-розовые бутоны. Смотришь со стороны, особенно с возвышенных мест, на деревню — глаз не оторвать, такая красотища... Как ожерельем, окаймляет деревню сосновый бор, подступающий к ней с южной стороны. Заслоняет лесной массив деревню и с остальных трех направлений: севера, востока, запада. Раньше на обоих концах деревенской улицы на ночь по-хозяйски закрывались ворота.

...Первые годы на новой земле маковчане особенно много трудились. Шаг за шагом лес и кустарники уступали место полям. Новые участки для пахоты получали новые названия.

Так, часть поля, расположенного на юго-западе от деревни и примыкающего к землям крестьян соседней деревни Глубокий Брод, носило название Замостье (т. е. поле за мостом). К западу от Замостья раскинулось обширное поле, из-за множества дубов названное Дубовкой. Помню оставшихся после вырубки десяток могучих старых великанов-красавцев. Это поле примыкало к сенокосному угодью, носящему название Рубленки. Дальше, за Рубленками, располагался лесной массив Старина.

В Дубовке находился небольшой участок лесных зарослей. Земля, примыкающая к ним, называлась Паликами. В стороне от них красовался островок из старых медноствольных сосен. Особенно красочно они смотрелись в созревающей ржи. Ну, прямо картина художника Ивана Шишкина «Рожь»!

Девятого мая сорок пятого года мы с двоюродной сестрой Реней известили односельчан, которые возле этого «шишкинского» уголка сажали картошку, о Победе. Приходится сожалеть, что этих сосен сегодня нет, как нет и могучих красавцев-дубов. А вместо былой красоты стали в ряд железобетонные мачты высоковольтной линии электропередач.

В один из приездов в родные края я шел по шляху в Замочулье. Остановился и окинул Дубовку печальным взглядом. Не узнать с детства памятное поле. Словно раздели его... Пролегло оно до самой деревни Глубокий Брод, соединившись с Замостьем. Вырубили полоску леса, разделяющего эти поля. Осушили балку с ручьем, как и бывшие Рубленки. Заросло сплошной стеной сосняка и поле Макавье, и Пиркова гора. Да и вместо лесного массива Старина остался жалкий островок былого векового леса. А ведь Рубленки и часть Старины были сильно заболочены. Они питали водой окрестные поля, здесь был исток речки Мануш. Не трогали это благодатное место мои односельчане, не нарушали равновесие природы. Они не знали лозунга, что «нельзя ждать милостей от природы, а взять их у нее – наша задача». Они поклонялись и дружили с природой. Они были крестьянами, любившими свою землю, свои поля.

Односельчане

Пройдем па улице Маковки с запада на восток и познакомимся с жителями, живущими в домах по нечетной ее стороне.

Итак, первый дом Семена Захаровича Дыбаля. У него была большая семья. Пять дочерей: Лида, Ольга, Евгения, Софья, Анна и сын

Федор. Хорошо помню главу семейства, его вторую жену Ксению (первая жена, Арина, умерла), дочерей Анну и Лиду.

Лидия Семеновна Мороз (урожденная Дыбаль) жила после войны в старом доме родного брата отца – Прокопа Захаровича. У него было две дочери – Реня и Анна. Муж ее не вернулся с войны домой, завел другую семью в Москве. Младшая дочь Лидии Семеновны Анна после седьмого класса уехала к отцу и жила в его новой семье. Ее старшая сестра Реня вышла замуж в родной деревне за Николая Горелика.

Очень тяжело жилось Лидии Семеновне в послевоенные годы, одна поднимала детей. Налоги были большие, а в колхозе оценивали труд так называемыми «пустопорожними» трудоднями. Спасал большой сад. Сумела построить для семьи новый дом. Когда разбирали старый сарай Прокопа Захаровича, нашли несколько бутылок с плотно набитыми старыми деньгами. Помню красивые ассигнации достоинством в 100 рублей с портретами Петра Великого и Екатерины II. Трудился Прокоп Захарович, копил деньги для детей... Напомним цену тех денег. Так, между 1907 и 1915 годами корова стоила 5–7 рублей.

Досталось и Семену Захаровичу. Был он большим тружеником. Помню, как уже в пожилом возрасте он заготавливал дрова, огораживал сад, а хозяйственные постройки целой стеной из бревен обнес.

А вот дом, который принадлежал семейству Николая Антоновича Брилевского. Хозяин его на всю округу был известен как механик-самоучка. Мог починить любую швейную машинку, двигатель лесопилки, часы... Много лет работал кузнецом.

После смерти брата Михаила Николай Антонович женился на его жене Ольге Константиновне (урожденной Липай). Кроме дочери от первого брака Серафимы у них были еще две – Надежда и Нина. Обе закончили медучилище и долгие годы трудились медсестрами.

Далее были постройки Иосифа Ивановича Матеши. Его я не помню, а вот жену, учительницу Анну Ивановну Брилевскую, и ее сына Эдуарда хорошо знал. С Эдуардом дружил, часто встречались и в дни отпуска в родной деревне, и в Ленинграде. К сожалению, еще в полном расцвете сил он трагически погиб во время службы в Московской артиллерийской академии. Прекрасный был товарищ, талантливый офицер, подполковник. Его мать, потрясенная гибелью единственного сына, безвременно угасла.

...Большой дом Николая Егоровича Жуковского вмещал не только большую его семью – здесь часто собиралась на вечерки молодежь. В семье Николая Егоровича все дети были музыкантами. Семейный оркестр состоял из гармони, цимбал, скрипки, бубна. Единственным, кто не участвовал в семейном оркестре, была жена главы семьи Евдокия Федоровна, которую я хорошо помню. Одна из ее внучек рассказала мне, что дедушка и бабушка родом из Березинского района.

Более памятен мне сын Николая Егоровича Иван Николаевич, золотых дел мастер. А мастерил он на всю округу гармошки. Сам прекрасно играл не только на них, но и на цимбалах. Его брата Данилу, офицера, участника Великой Отечественной войны, видел только один раз. Женой Ивана Николаевича была дочь священника Таисия Михайловна (урожденная Долгополова). У них был сын Владимир (служил офицером) и четыре дочери – Нина, Галя, Люба и Лида.

...Почти вплотную со старым домом Ивана Константиновича Липая был дом Кондратия Григорьевича Высевко и его жены Ирины Яковлевны. В книге «Память. Белыничский район» указано: «Высевко Кондратий Григорьевич, родился в 1899 году, крестьянин. Приговорен в 1938 году к высшей мере наказания. Реабилитирован в 1989 г.».

Ирина Яковлевна растила сына Николая и двух дочерей – Эмилию и Галину. Николай после десятилетки окончил учительские курсы, был учителем начальных классов. В 1941 году он был призван в армию. Помню, как в июне 1945 года почтальон принес похоронку в дом матери. В похоронке указывалось, что ее сын погиб 21 июня в городе Глейвиц. Горе пришло в семью... Душераздирающий плач Гали и сегодня помнится мне. Ее мать упала без памяти, возле нее суетилась старшая дочь Эмилия... Какой страшной ценой досталась нашей стране Победа! Двадцать односельчан не вернулись с войны.

Переселенцы

В 1939 году с хуторов, которые располагались между мельницей и лесным болотистым массивом Рудье, переселилось в Маковку шесть семей. Их дома продолжили деревенскую улицу в восточную сторону. Справа, с восточной стороны, по соседству с домом моего дяди Семена Кондратьевича, поселилась семья Ивана Алексеевича Игнатовича и его жены Федоры. Это была многодетная семья: пять дочерей (Нина, Галя, Надя, Зина, Люда) и три сына (Виктор, Владимир, Александр). В этом доме жил брат Ивана Алексеевича – Макар Алексеевич, фронтовик.

А вот доживал в этом доме один из троих сыновей – Виктор, друг моего детства.

Соседом этого когда-то большого семейства была семья Филиппа Кармазина. Его семья переехала в другой район, а в доме поселилась семья Мины Максимовича Игнатовича. В годы войны Мина Максимович сражался в одном из партизанских отрядов. 11 сентября 1943 года во время штурма вражеского белыничского гарнизона он погиб.

Продолжил улицу дом Петра Тарасовича Маненка. Очень хорошая была семья. Ее хозяин, как и его родственник Иван Иванович Поддубский, были мобилизованы в июне 1941 года. В победном 1945-м они возвратились в свои семьи. Оба в разное время работали на мельнице.

Ивана Ивановича я очень уважал. О таких в народе говорят, что и мухи не обидит. А вот на фронте на них Россия держалась. На себе тащил с товарищами 45-миллиметровую пушку вслед за наступающей цепью. Был тяжело ранен. Вернулся с двумя медалями: «За взятие Варшавы» и «За победу над Германией». Спустя годы был награжден орденом Отечественной войны.

Четную сторону улицы в восточном направлении продолжила семья священника Михаила Долгополова, а следующий дом принадлежал семье Бориса Абрамовича Горелика. Эту семью хорошо помню. Не знал только старшего сына, танкиста Ивана Борисовича, погибшего в августе 1944 года. А ведь войну начал он с 22 июня 1941 года...

Последний дом на четной стороне улицы принадлежал семье Царенок – Даниилу и его жене Надежде. Младшего их сына Николая хорошо помню. В детстве дружил с ним. Очень хороший, скромный был товарищ.

Плач одинокого журавля

Весенним днем, в одно из моих посещений малой родины, я навестил живущего в соседней деревне Замочулье своего школьного друга Ивана Ольшевского. Засиделись мы с ним до вечерних сумерек, оставил он меня заночевать. Рано утром, на зорьке, вышел я во двор. На востоке небо озарялось багряными всполохами. Ночные сумерки постепенно уползали к дальней опушке лесного массива. Я стал осматриваться. Везде стояла первозданная тишина. Просыпались лесные птахи, робко пробуя свой певчий голос. И среди этого нестройного птичьего оркестра внезапно вклинился плач. Именно плач, по-другому нельзя выразиться. Доносился он со стороны выгоров, небольшого болотца, заросшего кустарником, за которым располагался «мертвый» поселок из нескольких жилых домов. Улица и дворы буйно заросли крапивой, бурьяном. И вот из этого «кладбища умерших домов» раздавался клич одинокого журавля. На высоких ногах, словно на ходулях, по-хозяйски обходил он заброшенные дворы и издавал печальный клич, похожий на плач человека. О чем был этот печальный клич? Возможно, он оплакивал людей, которые когда-то

населяли поселок, а возможно, во время перелета из далеких краев потерял свою подругу... То и другое было тоскливо видеть и слышать. Я долго молча стоял в то раннее утро, погруженный в мысли о невозвратном прошлом, которые заронил в мою душу своим плачем одинокий журавль...

Вядомыя і невядомыя старонкі вайны

У маёй літаратурнай творчасці многа старонак прысвечана тэме Вялікай Айчыннай вайны, партызанскаму руху і барацьбе падпольшчыкаў. Мая дзіцячая памяць захавала яркія эпізоды аб тых суровых днях і начах варожай акупацыі, вызвалення роднай Макаўкі і навакольных паселішчаў.

Вайна ўвайшла ў маю вёску раптоўна і без адзінага стрэлу.

Было гэта спякотным летнім днём, дакладней 5 ліпеня трагічнага сорак першага года. У гэты дзень мы са старэйшым братам Даніілам і яго аднагодкамі пасвілі коней на адной з палянак Лагчыны, якая знаходзілася непадалёку ад вёскі.

І вось недзе ў сярэдзіне дня хлопцы раптам устрывожыліся, распталі коней і на іх памчаліся ў глыбіню лесу. Аказваецца, яны заўважылі немцаў.

— Ідзі дамоў,— сказаў мне брат і знік у лясным гушчары. Я выйшаў на ўзлесак і зніякавеў: паміж лесам і вёскай суцэльнай плынню рухалася зялёна-шэрая маса нямецкіх салдат. У вясковую вуліцу ўлівалася калона пешых салдат, за якой сунуліся па дарозе велічэзныя павозкі-фуры, грузавікі, матацыклы.

Моцны страх ахапіў мяне. Я павярнуў у лес і пачаў прабірацца да сваёй хаты. Не даходзячы да Кацярынінскага шляху, завярнуў да возера і пайшоў уздоўж яго берага, затым — паўз рэчку... Нарэшце дабраўся да сцежкі, што вяла да нашага дома.

Сцяжынка прывяла мяне на лужок, за якім пачыналіся агароды з хатамі. Увесь ён быў заняты палаткамі, каля якіх сядзелі ці ляжалі салдаты. Набраўшыся смеласці, прабег каля фашыстаў і апынуўся на двары свайго сябра Віктара, які дзелавіта разглядваў павозку-фуру.

Дома былі маці і дзядуля. Бацька адсутнічаў. Маці напаўголаса сказала мне: тату хацелі арыштаваць за яго словы, выказаныя ў адрас немцаў, якія размясціліся ў нашым доме, што Масквы ім не заваяваць. Магчыма, тыя не зразумелі сэнс яго слоў, але выраз бацькавага твару ў той момант чужынцам вельмі не спадабаўся. На шчасце, усё абышлося.

Дні тры знаходзіліся нямецкія салдаты ў нашай вёсцы і яе наваколлі. За гэты час, здавалася, само паветра набрыняла спецыфічным нямецкім пахам. Незнаёмая мова, пах пораху і бензіну, грукат падкаваных ботаў, громкія размовы і рогат, бляск зброі і касак прыгнятальна ўздзейнічалі на ўсіх вяскоўцаў.

Перад сваім адыходам немцы зладзілі відовішча. У шырокім месцы вуліцы, каля дома Сіняўскіх, духавы аркестр выконваў бравурныя маршы. Калі загучалі гукі вальса, некалькі кавалерыстаў, рухаючыся адзін за адным па крузе ў такт мелодыі, эфектна прагарцавалі.

Мяркую, гэтым яны ўздымалі свой баявы дух і дэманстравалі жыхарам вёскі, што іхні пераможны марш прадаўжаецца.

Неўзабаве ў вёсцы з'явіліся акружэнцы. У Макаўцы з іх засталося каля пяці чалавек. Некага прытулілі адзінокія жанчыны, хтосьці жыў у сем'ях, дапамагаючы па гаспадарцы. Запомніўся мне вясёлы лейтэнант, які назваўся Іванам па прозвішчы Дракін.

Жыццё быццам замерла. З фронту, што пагрукатаў на ўсход, ніякіх звестак не паступала. Бліжэй да зімы ўзніклі чуткі аб з'яўленні ў навакольных лясах партызан. Расказвалася і аб парашутыстах, закінутых сюды з Масквы для арганізацыі супраціўлення акупацыйнаму рэжыму.

На пачатку 1980-х гадоў я пачаў збіраць матэрыял аб зараджэнні ў нашым раёне партызанскага руху. Яшчэ былі жывыя многія ўдзельнікі гэтага патрыятычнага супраціву, многае захавалася і ў маёй памяці пра тыя дні. Асабліва мяне зацікавіў лёс вядомага ў нашай мясцовасці доктара, сябра нашай сям'і, Сцяпана Усцінавіча Семукова, які адным з першых уступіў у партызанскі атрад, што ўвайшоў у гісторыю як 121-ы полк імя Асмана Касаева. У выніку пошуку інфармацыі аб зараджэнні і станаўленні партызанскага атрада, пераўтворанага пазней у полк, удалося сабраць многа ўспамінаў былых партызан і кіраўнікоў гэтага славутага злучэння народных мсціўцаў. Шмат цікавых матэрыялаў перадала мне ўдава Сцяпана Семукова Ганна Амосаўна.

У маім архіве зберагаюцца пісьмы Ганны Амосавай. Вось адзін з лістоў, напісаны 27 жніўня 1982 года: «...У першыя дні вайны плынню ішлі бежанцы з ахопленага полымем Мінска. Загадчыкі дзіцячых садкоў вялі сваіх выхаванцаў. Адпачыўшы пару дзён, спяшаліся на ўсход. І так дзень за днём ішлі бежанцы. Усіх мы кармілі, усім аказвалі дапамогу...

У пачатку ліпеня пачалі заходзіць у бальніцу (Падзевіцкую,— *У. К.*) невялікімі групамі байцы і камандзіры. Адпачыўшы некалькі гадзін, яны накіроўваліся да лініі фронту. А 12 ліпеня два лейтэнанты прывезлі ў бальніцу 26 параненых байцоў, разгрузілі іх і адразу ж паехалі. Я і чатыры медсястры размясцілі параненых у палатах, накармілі, далі паспаць некалькі гадзін, а затым пачалі апрацоўваць раны і мяняць павязкі. Адзін з байцоў ва ўзросце 35 гадоў меў цяжкае раненне: асколкам снарада быў раздроблены тазасцегнавы сустаў.

5 Зак 2368

Гэта было вельмі цяжка. Як ён мог гэта пераносіць? У нас не прасыхалі вочы ад слёз...

Пачала аглядаць руку байца гадоў дваццаці пяці. Здымаю хусцінку з яго левай рукі... Божа, нават у вачах пацямнела! Да локця рука чорнага колеру... Гангрэна. Што рабіць? Два дні не магла асмеліцца. Трэба ампутаваць. А я такую аперацыю не рабіла. Патлумачыла гэта байцу, які быў згодны на ампутацыю. І я рашылася. Дзесяць дзён потым назірала аперыраваную руку байца – усё было добра і не выклікала апасенняў. Неўзабаве ён пайшоў на ўсход. Падзякаваў, узяў мой адрас. На развітанне сказаў:

– Сястрычка, калі буду жывы, абавязкова напішу пісьмо.

Паступова акрэплыя параненыя адпраўляліся да лініі фронту, у бальнічных палатах засталіся адзінаццаць байцоў, якія не маглі яшчэ самастойна хадзіць. Неўзабаве на трох машынах прыехалі немцы і забралі параненых. Перакладчык заявіў:

– Не хвалюйцеся, мы адвязем іх у Беразіно, там будзе прадоўжана іх лячэнне.

Яшчэ нейкі час наша бальніца функцыянавала. Мы аказвалі дапамогу насельніцтву, наведаліся да нас і партызаны...».

Ганна Амосаўна з сынамі Вячаславам і Леанідам яшчэ нейкі час жыла ў Падзевічах, але пагроза арышту за сувязь з партызанамі прымусіла вярнуцца яе ў родны Кудзін.

...Аднак вярнуся да матэрыялаў, якія з'явіліся стрыжнем у далейшым пошуку вядомых і невядомых старонак гераічнай барацьбы партызан і падпольшчыкаў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Усё пачалося з архіўнай даведкі. Аднойчы, калі праглядаў зборнік «Зараджэнне і развіццё партызанскага руху ў першы перыяд вайны ў Беларусі», маю ўвагу прыцягнула знаёмае з дзяцінства прозвішча – Семукоў. Ці не той гэта Семукоў – урач Падзевіцкай сельскай бальніцы, пра якога з вялікай павагай згадвае старэйшае пакаленне? Зімой і летам, ноччу і днём спяшаўся ён дапамагчы хворым. Яго ўрачэбнае майстэрства і любоў да людзей рабілі сваю справу. У маёй дзіцячай памяці выразна захавалася: ляжу на аперацыйным стале і гляджу ў акно. Мясцовы ўрач Сцяпан Семукоў «чаруе» над маёй паламанай нагой. Трэба аддаць належнае: «чараваў» ён прафесійна! Сёння я нават не ведаю, левую ці правую маю нагу ён тады схаваў у гіпс.

Я пачаў пошук. У выніку ўдалося сабраць нямала ўспамінаў былых партызан 121-га палка, а таксама тых, хто добра ведаў Сцяпана Усціновіча.

...У які ўжо раз, з хваляваннем чытаю сабраны ў папцы матэрыял. «27 ліпеня 1942 года,– паведамляецца ў адным з дакументаў, што зберагаецца ў архіўных фондах партызанскага руху Беларусі,– вялікая нямецкая часць акружыла атрад, які знаходзіўся ў лесе каля вёскі

Шчэгліцы Магілёўскага раёна. Атрад прыняў бой, з якога не вярнуліся яго камандзір і некалькі партызан. Гэтыя таварышы загінулі па-геройску, змагаючыся да апошняга патрона, не шкадуючы свайго жыцця для абароны Радзімы».

Сярод партызан, якія загінулі, быў і Сцяпан Усцінавіч Семукоў.

А яго барацьба за Радзіму пачыналася яшчэ на грамадзянскай вайне. Ганна Амосаўна ўспамінала: «Сцяпан нарадзіўся 14 ліпеня 1898 года ў сялянскай сям'і ў вёсцы Пільшычы. Сям'я была вялікая, дружная і працавітая, усімі паважаная. Сцяпан з дзяцінства імкнуўся да ведаў. Асабліва цікавіла яго медыцына. Але ці мог аб гэтым тады ён марыць? Каб атрымаць медыцынскую адукацыю, неабходна мець вялікія грошы. А дзе іх узяць беднай сялянскай сям'і? Толькі ў 1918 годзе мара Сцяпана здзейснілася. Ён стаў студэнтам Магілёўскага медтэхнікума. У яго сценах і адбылося наша знаёмства, там жа мы і пабраліся шлюбам.

На трэцім годзе нашай вучобы Чырвоная Армія адбівала апошні паход Антанты. Чырвоныя палкі Заходняга фронту, прарваўшы абарону польскіх войск на Бярэзіне, хуткім маршам рухаліся на захад. Нас, студэнтаў-медыкаў апошняга курса, па распараджэнні камандавання Заходняга фронту накіравалі ў франтавыя шпіталі. Я са Сцяпанам апынулася ў палявым шпіталі, які размяшчаўся ў Горках.

Сярод нашай групы Сцяпан неяк адразу вызначыўся. З павагай да яго ставіліся старэйшыя спецыялісты, якія прайшлі нялёгкі шлях Першай сусветнай вайны. Нароўні з імі ён аперыраваў цяжкапараненых чырвонаармейцаў, праяўляючы пры гэтым вялікае майстэрства. Вопытныя спецыялісты прадказвалі Сцяпану добрую будучыню на медыцынскай ніве».

Прамінула некалькі гадоў, і само жыццё пацвердзіла гэтае прадбачанне. Прывяду некалькі сведчанняў, напісаных у розныя гады лаканічнай ваеннай мовай. «Таварыш Семукоў,— гаворыцца ў адным з іх, датаваных 1925 годам,— у сапёрным батальёне знаходзіўся на пасадзе лекпама (памочніка ўрача,— *У. К.*). За час знаходжання тав. Семукоў праявіў сябе як адказны справе работнік, які добрасумленна адносіўся да сваіх службовых абавязкаў. Лічу (пісаў камбат,— *У. К.*), што тав. Семукоў і на грамадзянскай працы будзе не менш карысным і патрэбным работнікам, таму і ўдастоены рэкамендацыі для паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову». Яшчэ ў адным сведчанні — выпіска з загада па 5-м стралковым корпусе ад 12 верасня 1927 года — адзначана: «Старшаму лекпаму пятага асобнага сапёрнага батальёна тав. Семукову Сцяпану Усцінавічу за санітарны стан і аптэчную справу на адпаведнай вышыні аб'яўляю падзяку».

Загадам ад 7 кастрычніка 1927 года старшы ўрач Сцяпан Семукоў быў звольнены з арміі ў доўгатэрміновы адпачынак, паколькі лічыцца студэнтам медыцынскага факультэта Белдзяржуніверсітэта. У гэтай

5* Зак. 2368

маёй папцы з матэрыяламі захоўваецца і копія даведкі аб заканчэнні Сцяпанам Усцінавічам 15 мая 1931 года ўніверсітэта і прысваенні яму звання «ўрач».

«Пасля заканчэння ўніверсітэта,– успамінала Ганна Амосаўна,– Сцяпана накіравалі на работу ў Віцебскую вобласць, дзе ён працаваў да лютага 1933 года. З гэтага часу і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён узначальваў медперсанал Падзевіцкай бальніцы».

У 1940 годзе за дасягнутыя поспехі ў лячэбнай справе калектыў Падзевіцкай бальніцы быў прэміраваны легкавым аўтамабілем. Такую высокую прэмію ў тыя гады цяжка было нават уявіць. Безумоўна, галоўнае ў гэтым – ацэнка дзейнасці ўрача, які ўзначальваў калектыў.

Наступіла 22 чэрвеня 1941 года. Чорнай датай увайшоў у гісторыю нашай Айчыны гэты самы доўгі ў годзе дзень.

– Ужо на другі дзень вайны Сцяпан добраахвотна з'явіўся ў райваенкамат,– расказвала мне Ганна Амосаўна і паказала пасведчанне аб тым, што 23 чэрвеня 1941 года ваенурач 3-га ранга С. У. Семукоў накіраваны ў распараджэнне камандзіра 121-й стралковай дывізіі.

Пасля выхаду з варожага акружэння 28 снежня ён вярнуўся дахаты.

– Праз два дні,– прыгадвала яго ўдава,– усе ў вёсцы ўжо ведалі аб вяртанні доктара. А неўзабаве пастукаліся ў акно. Прыйшлі партызаны. Разам з імі быў і адзін з сувязных з нашай вёскі. Адбылася размова. Камандаванне партызанскага атрада, які ўзначальваў Міхаіл Абрамаў, рэкамендавала Семукову зноў стаць на чале калектыву Падзевіцкай бальніцы, увайсці ў давер да акупацыйнай улады. І калі гэтая задума ажыццявіцца, тады Семукоў, які будзе наведваць Бялынічы, каб узяць медыкаменты, а таксама і па іншых службовых справах, стане надзейна забяспечваць партызан не толькі неабходнымі лекамі, але і важнымі звесткамі аб варожых гарнізонах. Сцяпан Усцінавіч пагадзіўся, і з гэтай ночы ў яго зноўку пачалося баявое жыццё.

Акупанты з кожным днём узмацнялі назіранне за паводзінамі ваенурача Семукова. І партызаны вырашылі не рызыкаваць патрэбным ім чалавекам: 3 сакавіка 1942 года Сцяпан Усцінавіч пайшоў у партызанскі атрад.

Успаміны Ганны Амосаўны дапаўняе былы партызан Максім Белахвостаў: «Неўзабаве пасля вяртання з акружэння Сцяпан Семукоў зайшоў да мяне. Я тады па заданні партызан працаваў бурмістрам Вугольшчынскай воласці. Мы добра ведалі адзін аднаго, таму адкрыта пагутарылі.

З'яўляючыся партызанскім урачом, Семукоў не толькі аказваў народным мсціўцам меддапамогу, але і прымаў непасрэдны ўдзел у баявых аперацыях па разгроме варожых гарнізонаў Бялыніцкага і Магілёўскага раёнаў».

Захаваліся рукапісныя ўспаміны разведчыка 121-га палка Івана Барбарчыка. Іван Іосіфавіч пералічвае шэраг баявых аперацый па разгроме нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў у паселішчах Гарадзішчанскай воласці, а таксама ў Падзевіцкай, Запольскай, Каліноўскай, Аксенькавіцкай і інш. Апісаў Іван Барбарчыкі і апошні бой Сцяпана Семукова, што адбыўся 27 ліпеня 1942 года на ўзлеску каля вёскі Шчэгліцы.

...Збіраючы матэрыял пра Сцяпана Усцінавіча, я ўстанавіў сувязь з многімі яго баявымі сябрамі па 121-м партызанскім палку. Яны многае мне паведамілі аб сваім баявым шляху і, канечне ж, аб сваім доктару. З пісьма былога намесніка камандзіра 121-га палка падпалкоўніка Кірыла Мацярынкі: «Сцяпана Усцінавіча я ведаў з вясны 1942 года. Ён прыходзіў да нас у лагер і аказваў дапамогу параненым, а затым увайшоў у склад атрада ў якасці ўрача і байца. Гэта быў гераічны чалавек, патрыёт роднай зямлі і высокапрафесійны медыцынскі спецыяліст».

А вось успаміны іншага баявога таварыша Семукова, былога камісара партызанскага палка Івана Іванова. Расказваючы аб баі каля вёскі Шчэгліцы, ён адзначае: «У гэтым баі загінулі сем нашых таварышаў. Страта Сцяпана Усцінавіча для партызан была вялікім ударам. Ён быў не толькі баявым таварышам, але і рэдкім спецыялістам...»

Прывяду радкі з ліста былога камандзіра атрада народных мсціўцаў Барыса Гараніна: «У групе з сямі партызан знаходзіўся і Сцяпан Усцінавіч Семукоў. Яе заўважылі немцы. Пачаўся няроўны бой. Загінулі яны як героі. Да апошняга патрона змагаліся».

Напярэдадні Шчэгліцкага бою партызанскі атрад Абрамава паспяхова разграміў варожы гарнізон у вёсцы Пясчанка, што непадалёку ад Магілёва. Зрабіўшы шматкіламетровы марш, атрад размясціўся на адпачынак у лесе паблізу Шчэгліцы. Суткі, праведзеныя без сну, зрабілі сваю справу. Партызаны заснулі, і толькі вартавыя пільна ўглядаліся ў начную цямрэчу. Як стала пазней вядома, навёў фашыстаў на народных мсціўцаў адзін з мясцовых паліцаяў.

Ноч праляцела імгненна. У лес прабіліся першыя промні сонца. І ў гэты ж момант на дарозе раптоўна з'явіліся дзве машыны, з кузавоў якіх пасыпаліся на зямлю нямецкія салдаты. Партызанскія вартавыя паднялі трывогу. Размясціўшыся ланцугом, народныя мсціўцы занялі абарону. Група на чале з камандзірам атрада, у якую ўваходзіў Сцяпан Семукоў, заняла ўчастак на ўзлеску, які межаваў з жытнім полем. Немцы ланцугом пачалі акружаць пазіцыі партызан. З даносу паліцая яны ведалі, што ў народных мсціўцаў мала боепрыпасаў.

Падпусціўшы фашыстаў як мага бліжэй, партызаны адкрылі па іх агонь. Немцы залеглі, у траве заблішчалі іхнія каскі. Яны паўзком набліжаліся да партызан, намерваючыся паланіць іх. Неўзабаве прыехалі яшчэ некалькі машын з карнікамі. Адмовіўшыся ад сваёй перша-

пачатковай задумы, немцы таксама адкрылі агонь. Бой разгараўся. Партызанскія кулі прыціскалі ворагаў да зямлі, не дазвалялі ім рухацца наперад. Тады немцы, каб зайсці партызанам у тыл, сталі акружаць іх левы фланг. Наступіў крытычны момант бою. Вораг усё цясней сціскаў сваё кальцо вакол невялікай групы народных мсціўцаў, у якіх да таго ж скончыліся боепрыпасы.

У гэты вырашальны момант камандзір атрада аддаў загад: «Усім адыходзіць у лес, адрывацца ад немцаў!» Прыкрываць адход народных мсціўцаў засталася група начале з камандзірам атрада. Знаходзячыся на зручнай пазіцыі, яна адсекла карнікаў і ўступіла з імі ў бой.

Між тым, у партызан засталося толькі па абойме патронаў. Група пачала адыходзіць у жыта.

«У апошнім сутыкненні,– паведамляецца ў партызанскім данясенні,– загінуў камандзір атрада Міхаіл Ігнатавіч Абрамаў, партызаны Аляксандр Лукіч Гукаў, Рыгор Астахавіч Дашкевіч, Сцяпан Усцінавіч Семукоў, Лукаш Тычаленка і дзве сувязныя – Марыя Ігнатаўна Цумарава і Марыя Рыгораўна Кавалёва.

Гэтыя таварышы загінулі па-геройску, змагаючыся з ворагам да апошняга патрона...»

Прайшлі гады. У 1954 годзе астанкі загінулых партызан былі перапахаваны ў брацкіх магілах у вёсцы Княжыцы.

З нагоды 20-годдзя перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй высока адзначаны подзвіг магілёўскіх партызан і падпольшчыкаў. 2 ліпеня 1965 года на старонках газеты «Магілёўская праўда» быў апублікаваны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні медалямі «За адвагу» партызан і падпольшчыкаў, якія дзейнічалі ў Беларусі ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны. У спісе ўзнагароджаных пералічаны і прозвішчы загінулай групы Абрамава, і сярод іх – прозвішча Сцяпана Семукова.

Радзіма высока ацаніла заслугі гэтых людзей, а народная памяць пра іх жыве...

Віктар Кунцэвіч

Жураўлі

Будзе лапік зямлі –
Будзе хлеб і да хлеба,
А гукнуць жураўлі –
Азірнёмся на неба.
Куды можа пазваць
Гэты плач жураўліны?
Трэба сеяць, і жаць,
І сустрэць Асяніны.
Нас зямля, як магніт,
Неадступна трымае –
З жураўлямі ў блакіт
Смутак хай адлятае.
Ды ў палоне зімы
Змоўкне плач над палямі,
Прыйдзе дзень – станем мы
Назаўжды жураўлямі.

Маё сэрца

Форму сэрца свайго
Не ўбачыць мне вокам —
Адчуваю яго
У сабе і высока,
Там, дзе зоркі і Бог,
Там, дзе сонца і хмары,
Дзе шляхі без дарог,
Дзе схаваліся мары.
Я у сённяшнім дні
Абазначыў выснову:
Маё сэрца — магніт,
Да таго ж адмысловы,
Што усё да сябе
Прыцягальна прымае
І ў жыццёвай сяўбе
Навакол рассявае.
Можа, гэта і ёсць
Той асноўны вянец,
Да якога прывёў
Усявышні Тварэц?

Храм

(У вёсцы Княжыцы Магілёўскага раёна)

Пустыя вачніцы
Забытага храма
Жывуць таямніцай...
А ў зале —
Груд хламу,
Нібыта тут пустку
Таўшчэзныя сцены
Схавалі.
Акустыка ж —
Чуйная, «спеўная»,
Вятрыска уранні
Да храма вярнуўся,

На гніль-рыштаваннях
Заснуў.
Азірнуўся
На храм я з пагорка –
Класічная веліч...
Было шмат гаворкі
Пра веру і вечнасць...
Цярпліва чакае
Нямая званіца.
І моляць, гукаюць
Пустыя вачніцы...

Зімовым ранкам

У шэрым змроку стогнуць дрэвы,
Дрыжаць азяблыя галіны.
У царстве Снежнай Каралевы
Нямала белай павуціны.
Гарыць крывавая дзянніца,
Але няма у ёй пагрозы,
І ранак цінькае сініцай
За рэчкай, дзе чарнеюць лозы.
Марозны дзень,
Што нарадзіўся,
Ідзе па гурбах важкім крокам.
Ён праз густы туман прабіўся
Сівым, знясіленым прарокам:
Твой час настаў,
Ты маеш права
Палохаць пеклам,
Цешыць раем.
А я памру на росных травах,
І ветрык слёзы хай збірае.

6. Зак. 2368

* * *

А Друць-рака цячэ
Спакойна, самавіта.
Становіцца мяльчэй —
Стамілася нібыта.
Узгорак, мо курган,
На беразе яе —
Стаю на ім. Чарга
Аблок сівых плыве.
Стаялі яны тут:
Мой прадзед, дзед і тата...
Сказаў бацькоўскі кут:
«Здабыткам стануць страты».
Люструюцца ў вадзе
Калматыя аблокі.
Куды нас Бог вядзе?
Чаму дае ўрокі?
Ляціць за небасхіл
Плач — покліч жураўліны.
Ля страчаных магіл
Гараць кусты каліны.
А Друць-рака цячэ —
Не трэба ёй прынук.
І прыйдзе час яшчэ:
Тут будзе мой унук.

Чырвоны Бор

А ранак сонца піў нагбом —
І разлівалася яно
На вёску, рэчку, поплаў, бор...
Знікалі ў небе здані сноў.
У гэты цуд я узіраўся
Здзіўленне стала наталеннем.
Я больш адчуў, чым здагадаўся,
Чаму з мінулых пакаленняў
Маё сяло, Чырвоны Бор,
Названа гэтак маляўніча:

Думаць вершы

Алесю Пісьмянкову

А думка ў слова апранецца,
І слова ляжа на паперу.
Патрэбна жыць, пакуль жывецца,
Любіць і спадзявацца, верыць.
Душа не можа заблудзіцца,
Бо нараджаецца са зрокам.
Як ёй на верны шлях узбіцца,
Жыцця навучаць нас ўрокі.
Хвіліны... Хтосьці іх прыдумаў,
Каб ёмка вызначыць бясчассе —
Без іх хады у свеце тлумным
Цяжэй было б шукаць нам шчасце.
Дзень адыходзіць. Змрок гусцее.
Навокал ціша і спакой.
Хто думаць вершамі умее,
Таго крануўся Бог рукой.

Оскар Курганов

(1907—1997)

Мать

Эту трагическую историю рассказали мне в Уваровке. Отступление фашистов из Подмосковья открывает все новые и новые страницы их кровавой летописи. Здесь, в Уваровке, за Можайском, в холодные ноябрьские дни 1941 года оккупанты замучили и умертвили женщину-партизанку Александру Мартыновну Дрейман и ее новорожденного сына. Она ушла в лес, в отряд, в дождливую ветреную ночь, когда на уваровской площади перед школой уже стояли вражеские танки, а вражеские автомобили двигались к Бородину и Можайску,— то было тревожное время наступления фашистов на Москву.

Теперь никто не может припомнить, звали ли Александру Мартыновну в партизанский отряд. За оврагом, у палатки, все увидели эту уже не молодую женщину в ватной тужурке, в больших сапогах и темной косынке. Как человек, привыкший с детских лет к непрестанному

труду, она сразу спросила у командира отряда Семена Хлебутина, что делать. Он усмехнулся и ответил: «Будь хозяйкой нашей...»

Александра Мартыновна засучила рукава тужурки, принесла из спадающего по камням ручья котел воды и с той минуты вошла в привычный жизненный ритм: сушила в землянке над камельком сапоги партизанам, возвратившимся с разведки, помогала повару варить обед, чистила оружие, убирала в палатке. И днем, и ночью трудилась Александра Мартыновна, и все в отряде стали для нее родными, близкими, она их в шутку называла «дети мои», хотя в лесу жили и пожилые люди. И ее они называли самым теплым словом — мать.

Отряд уже действовал вторую неделю. Выпал снег, земля, затвердевшая и кочковатая, сровнялась, смолк птичий говор в лесу, но не стихали ни выстрелы, ни пулеметная дробь, отдаленная и сухая, как треск палки по частоколу. В отряд приносили автоматы, каски, шинели, патроны — партизаны нападали на обозы, уничтожали фашистских карателей, бродивших по селам. Комиссар отряда Павел Фомин готовил людей к крупным операциям.

Враг подтягивал танковые дивизии для нового наступления на Москву. Фомин решил взорвать мост на магистрали и задержать движение вражеских колонн. Нужен был опытный разведчик, знавший все тропы и дорожки в лесу: не по просекам, а по густым зарослям следовало вынести мины к мосту. Тогда в поход попросилась Александра Мартыновна. Она ведь знает Уваровские леса, как свой дом, как село Поречье, где выросла. В этих лесах не раз ходили они целыми днями, собирая грибы, ягоды, лозу для корзин. Здесь, вблизи Уварова, вместе со своей матерью Александра Мартыновна батрачила у помещика, потом, после революции, училась в сельской школе. В последнее время была председателем Ерышовского сельского Совета. Как же ей не знать все тропинки и тайные дорожки в Уваровских лесах?

Ночью на магистрали был взорван мост, когда на нем находились танки и автомобили с пехотой. К утру вернулись в лес партизаны, усталые, шумливые, проголодавшиеся. Только Александра Мартыновна забилась в уголок в землянке, пролежала весь день под тулупом, вздрагивая от холода, бледная и задумчивая. Дважды к ней подходил комиссар отряда Павел Фомин. Но она куталась в тулуп и притворялась спящей. На рассвете она встала, согрела воду, убрала в палатке, надела ватную тужурку и простилась с партизанами.

— Не могу оставаться,— сказала она Фомину,— нет сил моих. А обузой быть не хочу. Горько мне, но ухожу...

Никто не знал истинных причин ее ухода. Лишь к вечеру повар поведал всем, что Александра Мартыновна ждет ребенка. Она все время ходила в тулупе, боялась, что, заметив, о ней станут заботиться.

В разведке она три раза садилась отдыхать, а партизаны ее ждали. А разве время теперь с детьми в отряде возиться?

Повар умолк, и грохот взрывов напомнил о страшной битве, которая идет на полях, на дорогах, в лесах. Очередной разведке был дан наказ – найти в городе Уварове Александру Мартыновну, окружить ее заботой, поберечь от врагов. Но найти ее уже не удалось, а неделю спустя в отряде узнали, что Александру Мартыновну, связанную, привезли в немецкую комендатуру, в большую каменную новую школу.

С той минуты отряд ничего не мог о ней узнать, она исчезла. Лишь на десятый день плотник Ефрем Цыганков, отец партизана, видел, как на рассвете два немецких солдата тащили по снегу чей-то окровавленный труп, и, когда бросали его под лед озера, Цыганков узнал Александру Мартыновну Дрейман.

Как попала она к немцам, через какие пытки прошла, что стало с ее новорожденным сыном? Никто об этом не знал в Уварове. И лишь теперь из рассказов местных жителей – Анны Минаевой, Анны Гусляковой, Евдокии Каленовой, Ефрема Цыганкова, видевших, как вели и пытали Александру Мартыновну, из бесед с теми, кто сидел вместе с ней в сарае в типографском дворе и избежал казни, и, наконец, из допроса переводчика немецкого коменданта города Уварова Ильинского, который пойман нашими войсками,– лишь теперь мы можем восстановить мученический предсмертный путь матери-партизанки.

Она пришла в город ночью, поселилась в домике, где был врач. Он посоветовал лежать, не выходить на улицу. Александра Мартыновна подсчитала запас консервов и колбасы, который ей дали в отряде. Три дня она лежала, а на четвертый день в домик постучали. Александра Мартыновна выглянула в окно: у крыльца полукругом стояли фашистские солдаты. Она накинула теплый платок и открыла двери. Ворвался маленький толстый фашист, ударил ее, она закачалась, но два солдата подхватили, связали руки и повели к сарайчику на типографском дворе.

Там оказалось много знакомых. Они стояли, плотно прижавшись друг к другу: сидеть не разрешали, да и едва ли было это возможно в такой тесноте. Александра Мартыновна продвинулась к стенке, руки, завязанные за спиной, отекли, но она молчала. Ночью ее вызвали на допрос. Солдат привел ее к немецкому коменданту города Уварова капитану Хаазе. На допросе присутствовал переводчик Ильинский. Хаазе сказал: «Сядьте!» Александра Мартыновна продвинулась к столу и спокойным голосом произнесла:

– Дайте мне родить... Мне осталось еще три дня... Потом убивайте!

Хаазе посмотрел на нее, рассмеялся, приказал солдатам раздеть ее. Она попыталась сопротивляться, но кто-то тяжелым кованым

сапогом ударил ее, она упала. Александру Мартыновну подняли, но сесть не разрешили. Хаазе сказал:

— Во имя вашего ребенка скажите нам, где находится партизанский отряд? Мы знаем, что вы оттуда.

Она помолчала мгновение и ответила:

— Я ничего не знаю и ничего не скажу. Вам удалось меня словить, стало быть, мне суждено погибать. А про отряд я ничего не скажу, сколько ни пытайте.

Хаазе еще спросил: коммунистка ли она? Александра Мартыновна покачала головой: нет.

Потом комендант предложил ей пройти по улицам города и указать дома, где живут ее знакомые. Она пойдет босая и нагая, только в платке, но чем больше укажет домов, тем чаще будет греться.

Два солдата вели ее по ночному городу, морозный ветер обжигал ее тело, она куталась в платок, но шла молчаливая, завязав узелком распустившиеся светлые волосы. Ноги ее, босые и отекшие, ступали по утоптанному снегу. Под утро она вернулась к коменданту, солдат доложил, что женщина не нашла ни одного знакомого дома. Ее вернули в сарай, и все расступились: ее вид заставил всех содрогнуться. Она посинела, при свете восходящего дня даже в этом полутемном сарае можно было различить ее постаревшее и осунувшееся лицо. Она попыталась лечь на пальто, кем-то отданное ей, но солдат, сопровождаемый тем же переводчиком, всех вывел из сарая, оставив только Александру Мартыновну. Ей же лежать не разрешил: стоять, только стоять!

Три дня пробыла она в сарае одна, полуголая, без воды и пищи. Никто не знает ни ее мыслей, ни мук, ни страданий. Только один раз к ней тайком пришла колхозница Евдокия Каленова с куском хлеба и супом. Она постучала в стенку сарая и услышала глухой стон. Каленова заплакала, ее поймали, отобрали хлеб и суп, избили.

Александру Мартыновну после этого вновь привели к коменданту. Она уже не могла двигаться от истощения и болей. Хаазе опять спросил:

— Где партизанский отряд? Это вы взорвали мост?

Александра Мартыновна посмотрела на коменданта долгим взглядом, словно соображая, о чем у нее допытываются. Потом сказала:

— Да, я — во всем я виновная...

Больше она ничего не произнесла, впала в беспамятство. Анна Гуслякова, которая проходила мимо комендатуры, услышала чьи-то крики. Приблизившись к окну, она увидела, как двое солдат били шомполами лежавшую Александру Мартыновну. В ту же ночь начались родовые схватки, ее отвели в сарай, бросили на холодные доски. Всю ночь в домах, прилегающих к типографскому двору, слышали крики

и стоны женщины. Но под страхом смертной казни запрещалось выходить во двору. И никто не мог помочь ей. Она родила сына, прямо его снегом, пробившимся в щели сарая, и потеряла сознание.

Она очнулась в комендатуре. Ее сняли и какой-то грязный хлыщ Хаазе сказал ей:

— Ваш сын будет жить только в том случае, если вы скажете, где отряд.

Александра Мартыновна поднялась, посмотрела на них широко раскрытыми глазами и прошептала:

— Дите пощадите... Он ни в чем не повинен...

Ее ударили штыком, она умолкла, застонала и вдруг закричала:

— Не залить вам кровью земли нашей! Погубите сына, у меня полный лес сыновей, весь отряд!

Ее вновь ударили, ноги ее подкосились. Хаазе начал бить ее сапогом. Но муки ее еще не окончились.

Александре Мартыновне предложили пойти в лес и указать путь дорогу, ведущую к партизанам. Она поднялась, накинула сапоги и пальто. Она не могла двигаться, и ее усадили в сани. Ефрем Цыганков видел, как Александра Мартыновна повела врагов на восток, а отряд размещался в лесу, к западу от города. К ночи она вернулась, вернее, ее провезли по улицам города, избитую и окровавленную. В комендатуре ей показали мертвого сына. Она заплакала, впервые за все дни своих страданий.

Ее вывели на крыльцо школы, где помещалась комендатура. Там стояли люди — их разгоняли. Александра Мартыновна вытерла слезы, будто они могли ее уличить в слабости, и произнесла скороговоркой, торопясь:

— Не склоняйте головы перед зверьем, придет час нашей победы. Прощайте, родные мои...

Ее толкнули прикладом, она соскользнула в снег, но опять поднялась, босая, измученная, истерзанная палачами. И ее голос вновь возник в вечерней тьме:

— Матери, родные, слышите ли вы меня?! Я смерть принимаю, сына своего не пощадила, но правды своей не выдала. Слышите ли меня, матери?!

Но фашисты всех разогнали, а Александру Мартыновну затащили во двор, кололи штыками, били, снова кололи.

И никогда не смоется в памяти народа образ матери, чья любовь к земле своей оказалась сильнее даже ее материнских чувств.

Вечная и бессмертная слава ей!

Уваровка, Московской области, 1942 г.

От Днепра до Буга «Царица побед»

В ту напряженную ночь, когда наши войска огнем и штурмом распахнули ворота в Барановичи, открывающие им пути в Белосток и Брест,— в ту же ночь они устремились на юг и запад. Они уже овладели городом Слоним и приблизились к Волковыску. На Пинском направлении они прошли по лесам и болотам к городу Лунинец, переправившись через реку Припять. Есть какие-то неисчерпаемые силы, которые дают возможность наступать на третьей неделе в том же темпе, как и на первой, и эти силы определяются не цифрами, не обилием танков, пушек и бомбардировщиков, а характером нашей армии. В жизни армии, как и ее солдат, есть такие дни, когда испытываются все ее душевные, нравственные и технические силы, дни, которые требуют концентрации и напряжения ума, воли, опыта, выносливости,— всего, что дано природой и приобретено в тяжких походах. Это — дни наступления. А такое стремительное, оказавшееся вне пределов наших обычных представлений о войне, такое грандиозное наступление, какое мне приходится наблюдать на 1-м Белорусском фронте,— требует еще и тройных условий — и умственных, и технических, и душевных.

Я уже в свое время упоминал в своих корреспонденциях о так называемой начальной фазе этого наступления. Она завершилась разгромом вражеской армии, ее отборных и натренированных дивизий и корпусов; армии, в которой были и танки, и орудия, и автоматы, и снаряды, были штабы с продуманными планами обороны, укрепления с высокой инженерной техникой, уже давно подготовленные рубежи — на берегах рек и под землей, были, наконец, генералы с весьма обширной свитой, которым казалось, что они знают все тайны современной войны. И все это подверглось разгрому, а армия с ее генералами и штабами обратилась в толпу беспомощных и оборванных пленников, постыдно умоляющих о пощаде. Это случилось уже на четвертый день битвы, и я не хочу возвращаться к этой начальной фазе нашего наступления — она уже теперь в прошлом и принадлежит лишь истории. Но в те дни июня 1944 года, когда наши танки, артиллерия, конница и пехота нарушили страшную тайну направления главного удара и, разгромив вражеские дивизии и корпуса, вышли на оперативный простор,— именно в те дни наша армия вступила в полосу величайших испытаний.

Утром танки генерала Панова и казаки генерала Плиева начали свой легендарный рейд на запад. Они захватывали узлы дорог, давили огневые гнезда, прорывали оборону, с боями шли все дальше по

белорусской земле, разрубая огромным огненным ножом еще уцелевшие артерии вражеского военного организма. В точно установленном тактическом узле наши танки, артиллерия, конница поворачивали на север, став в одну ночь острым смертельным мечом, занесенным над основными вражескими коммуникациями. Это уже была крупная победа, но завершить и закрепить ее должны были наши пехотинцы, а они двигались сюда пешком. И не по дорогам, а по полям и лесам, проселкам и тропинкам, болотам и лугам. Иных путей у них не было, или, вернее, это был их извечный, не раз испытанный путь. Они шли в знойные июльские дни, обливаясь потом, отдыхая лишь перед вечером, когда над землей плывет мрак, еще не прорезанный лунными лучами. Они дрались с врагом у переправ, очищали от вражеских автоматчиков леса, изгоняли их из сел и деревень, вступали в битву с вражескими танками, подавляли огонь артиллерии и шли на запад, где их ждала победа. Да, это шла по белорусской земле не «царица полей», как называют пехоту, а «царица победы», и только выцветшие от солнца и пота гимнастерки да потрескавшиеся от пыли ботинки напоминали всем о проделанном пути. С вещевыми мешками, с грузом патронов и гранат, грузной переваливающейся походкой далеких путников двигались батальоны и полки генералов Батова и Лучинского, закрепляясь на освобожденной ими земле, закрепляясь на ней на веки вечные.

Мне довелось побывать в батальоне капитана Ефима Макарова, который был введен в дело лишь на третий день наступления; оставив позади себя вражеские дивизии, зажатые в «котле»,— он ушел на запад. Батальон этот проделал огромный путь: очищал леса за Бобруйском, гатил болота узкими жердочками к северу от Слуцка, дрался с врагом у Немана, отбивал контратаки танков на подступах к Барановичам и ушел к дороге на Слоним. В этом батальоне были люди, прошедшие пешком от Сталинграда до Орла, потом от Орла до Киева, а теперь от Жлобина до Слонима. Здесь были саперы младшего лейтенанта Василия Постникова, и автоматчики лейтенанта Кузьмы Федорова, и разведчики Николая Перфильева. Все они должны были идти впереди батальона. Находить и обезвреживать «немую смерть», спрятавшуюся под землей или в колее дороги,— Постников может даже в моменты самой большой усталости посвящать в тайны и премудрости противопехотной мины. Прощупывать пути, прочесывать кусты, захватывать перекрестки дорог, проникать в села, еще занятые врагом, идти всю войну бок о бок со смертью и уметь вовремя перешагнуть через нее. Это все были люди, увлеченные своим воинским делом, не замечающие за собой ни героизма, ни мужества, не придающие значения тому, что мы бы назвали подвигом. Так благородный человек не видит в своих поступках ничего благородного — это сущность его натуры.

Я застал батальон в молодом ельнике. Был предвечерний час. Люди только что поужинали, легли на траву и уснули. Еще дымилась кухня, но повар уже спал, положив голову на большую опрокинутую миску. Дремали и вестовые, привязав к ноге автоматы. Только Ефим Макаров бродил по ельнику и присматривался к лицам своих солдат — смогут ли они подняться в полночь, когда и был намечен выход к новому рубежу. Подул ветерок, и полил дождь. Макаров ушел к шалашу; но в лесу никто не проснулся — так велика была человеческая усталость. Но в полночь Макарову пришлось лишь произнести одно слово «вперед», и, переданное по всему ельнику, оно подняло людей, и все вдруг ожило, забегало, зашумело. Кто-то засмеялся над промокшим другом, и смехом заполнился весь ельник — в этот поздний и трудный час у людей была потребность посмеяться, пошутить, из всего своего напряженного пути они вспоминали лишь смешное. Мог ли кто-нибудь подумать, что эти воины прошли сотни километров по лесам и болотам, с боями, под непрерывным огнем?

Той же ночью они подошли к реке Щара у деревни Кабаки — в этом месте река широкая, многоводная, глубокая, но все же им нужно было переправиться. Они сколотили плот из жердей и под разрывами артиллерийских снарядов, которыми встречал их враг, поплыли на западный берег. Еще до рассвета был захвачен там плацдарм. Саперы навели переправу, и вскоре артиллерия, танки и конница двинулись вдоль берега — с севера на юг к городу Слоним. Город расположен на том берегу — и прежде чем пробиваться к его улицам, нужно было завоевать обрывистый западный берег реки Щара. Все это делалось с величайшим спокойствием, которое отличает умелых людей, не замечавших ни усталости, ни страха.

В штабах, где продумывались и предусматривались все детали наступления, было опасение, что пехота не будет поспевать за молниеносным и стремительным движением танков и конницы, и это казалось естественным. Но «царица полей» никого не задерживала, она появлялась в тот час, когда борьба у крупных узлов сопротивления врага приобретала ожесточенный характер. Так было у Столбцов, в боях за Барановичи и у Слонима. Наша пехота взвалила на свои могучие плечи тяжкое бремя и несла с горделивой верой в победу от Бобруйска до Слонима, а теперь и дальше — на запад. Да, были дни, когда казалось, что наступил предел человеческой усталости. Люди падали, но тут же вновь поднимались, переползали по болотам, а потом шли по лугам с почерневшими от копоти и грязи лицами. Знойный день сушил их гимнастерки, чтобы через час наполнить их влагой пота. Наши воины снимали и на ходу выкручивали свою одежду, и капли, падавшие на раскаленный песок, напоминали людям о трудном пути. Но сами пехотинцы будто не чувствовали своей усталости.

В дни этого грандиозного наступления войск маршала Рокоссовского наша армия выдержала одно из величайших испытаний – на крепость и выносливость. Здесь проявились и воинская наука, и восстановление, и внутренняя собранность всего армейского организма, сцементированного походами и кровью, закаленного под Сталинградом, под Орлом, на белорусской земле.

Но для того чтобы победа плыла над белорусской землей с теми же темпами теперь, как в первую неделю наступления, нужно вовремя людей накормить, дать снаряды для орудий, бензин для танков, мины для минометов, бомбы для самолетов. И двинулись в великий поход наши армейские тылы. На колесах оказались наши базы снабжения, которые питали и питают ненасытное чрево битвы боеприпасами всех видов и назначений, делают это порой под вражеским огнем, стремясь четкостью и организацией сравняться с теми, кто наносит удар за ударом врагу. На автомашинах оказались хлебозаводы, целые стада коров, мука и крупа, масло и сахар. И всюду – где бы ни оказывались наши войска – появлялись повозочные с ящиками патронов и снарядов, ползли повара со своими термосами – будто ими двигала какая-то невидимая рука. То был триумф наших штабов – там оказались мастера своего дела во всех областях военного искусства.

Они не только вели в бой большие войсковые массы, но и обеспечивали их всем необходимым. И это-то – высокая душевная сила наших солдат и творческая предусмотрительность наших офицеров – дает возможность и войскам наступать в должном темпе, быть хозяином на поле битвы, а не рабом обстоятельств, возникающих на их пути.

За последние дни бои здесь развернулись на двух узлах дорог – у Слонима и Лунинца. Судьба города Слоним была решена в тот предрассветный час, когда наша артиллерия, пехота и конница переправились через реку Щара у деревни Кабаки. Пехота генералов Батова и Лучинского повернула на юг и вышла к сплетению дорог, не отдыхая после переправы,– днем она уже дралась в городе, отвоевывая улицу за улицей.

Путь же к городу Лунинец был еще более трудным. Войскам генерала Белова пришлось идти по болотам Полесья, порой проваливаясь в грязь, подтаскивая пушки и автомашины на руках. Те узкие полоски земли, которые пролегают между болотами и озерами, враг заминировал, и всюду делались проходы нашими саперами. И на этом труднейшем театре военных действий войска генерала Белова, главным образом его пехота, наносили удары по вражеским войскам, и болота поглощали тысячи фашистов, которые уже не могли уйти. Природа, которая, казалось, оберегала их в дни обороны, теперь обрушила на них свое возмездие. На узких речках возводились переправы – воины двигались там с боями, под артиллерийским обстрелом, переползая

болотные топи, обходя поймы и озера, пробираясь к победе тяжелым, извилистым путем.

У реки Припять наша пехота встретилась с моряками Днепровской военной флотилии. Она зашла на своих быстрых судах в тыл врага, десанты захватили дороги и плацдармы на берегу Припяти. Моряки переправили пехотинцев со всей их техникой через Припять и поддерживали эту искусную и умно задуманную операцию мощным артиллерийским огнем. Они подготовили и дороги для движения войск генерала Белова, отбив их у врага и заставив его идти по болотам, где уже подстерегал смертельный огонь наших батарей.

Таким образом, пинские болота усилиями и волей пехотинцев и моряков превратились в арену грозного побоища. И хоть люди сами шли по пояс в грязи и воде, не знали ни отдыха ни сна, гатили непроходимые топи и переплывали через речки, но удары их были сокрушительные.

Враг бросил орудия и автомашины и попытался уйти к узлу дорог — в Лунинец. Но в город уже ворвались наши воины — отсюда им был открыт путь к Пинску.

И вновь вездесущая пехота несла на своих могучих плечах победу, оказавшись неутомимой даже в этих девственных местах, где день похода равен подвигу.

В маленьком блиндаже я нашел капитана, который только что вернулся с поля битвы — он склонился над картой и задремал. Потом, очнувшись, вышел из блиндажа и лег на траву.

— За день,— сказал он,— мы прошли тридцать километров. Вы понимаете, что это такое? Это ведь не первый день, а третья неделя — вы же видели, какой там ад. В этом все дело... Мы все опасались, что и пехота не будет поспевать и тылы застрянут, да и связь надо поддерживать... Управлять боем... Но теперь все уже рассеялось — наши солдаты оказались богатырями... Они выдержали все испытания!

Капитана вызвали к телефону, и он спустился в блиндаж. В темнеющем лесу слышался шелест листвы и далекий звук канонады. Наши войска дрались уже на путях к Белостоку и Бресту.

1-й Белорусский фронт, 1944 г., июль.

Змітрок Марозаў

Анкета паходжання

Я з вёскі,
Я – свойскі,
Язбоўскі,
Сялянскі,
Славянскі,
Зямны,
Ад плуга,
Ад лугу,
Дзе туга
Даваўся мне ўкос.
Я – з вайны.
Маланкамі мечаны,
Вечнасць
Узняў я на плечы свае...
Я з вёскі,
Я – свойскі,
Язбоўскі...
Адсюль і трывогі мае.

* * *

Нашу ў сабе я свет і антысвет,
Дабро і зло, крык слова і зняменне,
Мой прашчур у пятнаццатым калене
Маёй крывёй выслухвае Сусвет.
Там, сярод зор, напэўна, ёсць мая,
Адзіная адвеку зорка долі,
Яна маё сілкуе біяполе,
І не сабе, а ёй належу я.
Таму і не гадаю на жыццё,
Я смерць усёй істотай не прымаю,
Бо продкаў дух штодзённа адчуваю
Цераз траву, карэнне і лісцё.

Салавецкая балада

Пралятаў селянін над палыннай зямлёй,
Невядома адкуль ён ляцеў,
Апусціўся ля хаткі трухлявай сваёй,
Бы ў дзяцінстве, на прызбе прысеў.

Разгарнуў хатулёк ён і бохан дастаў,
З часнаком сала скрыль, агуркі.
Чарку поўную горкай наліў, пагукаў:
«Я вярнуўся! Выходзьце, бацькі!»

«На пагосце яны, прашаптала трава,—
Голад быў — пакасіў паўсяла».
«Ну а дзеці? А жонка? Яна ці жыва?»
«Жонка з дзецьмі кудысьці сышла».

«Ну а ўнукі? А ўнукі?..»
«Вяртаўся адзін,
Ды яго не прызнала зямля...»
Памінальную чарку дапіў селянін
За свой род і за долю сялян.

* * *

Мне Богам дадзена Радзіма.
І адабраць яе ў мяне
Пад страхам смерці немагчыма
Тым, хто жыруе на мане.
Мне Богам дадзена Радзіма.
І я заручаны душой
З яе азёрнымі вачыма,
З яе жытнёвай цішынёй.
Мне Богам дадзена Радзіма...
Зноў, як замову, паўтару:
«Мне без яе жыць немагчыма,
Без Беларусі я памру».

* * *

Мы будзем жыць! Мінуць нягоды.
У чулых сэрцах адбаліць
Боль і трагедыя народа...
Мы будзем жыць! Мы будзем жыць!

Мы будзем жыць!
Засеем гоні
Дабром, што будзе ўсім свяціць,
А злыдняў прэч з вачэй прагонім!
Мы будзем жыць! Мы будзем жыць!

Мы будзем жыць!
Хрыстовы дзеці...
Нас не прадаць і не купіць.
Прызналі нас у белым свеце...
Мы будзем жыць! Мы будзем жыць!

Мы будзем жыць!
Беларусіна
Ніхто не здолее скарыць!
Што б ні было, табе, Айчына,
Даю зарок: «Мы будзем жыць!»

* * *

Хаты. Жытняя палоска.
А далей – шаша, шаша...
Паміж горадам і вёскай
Разрываецца душа.

Кліча бацькаў клён самотны,
Гарадскі, гаркавы дым...
Нібы жораў пералётны,
Б'юся я між дзвюх радзім.

Калі ж вырай жураўліны
Забярэ мяне з сабой,
Сэрца гораду пакіну,
А душу – зямлі сваёй.

* * *

Аляксандры, Марылі, Домны –
Сінь вачэй і пяшчота рук.
Беларусі маёй мадонны,
Мовай вольнаю гавару.

Цемрай ночы вам зрок калолі,
Не хапала вам днём святла,
Ды ніколі ў жыццёвым полі
Вы не сеялі зерне зла.

Падраслі непрыкметна ўнукі,
Кожны ў хаце жаданы госць...
Я цалую бабулі рукі –
Пазірае мне ў твар маладосць.

* * *

Жыццё не раз мяне ламала,
Перш, чым выснову змог адкрыць:
Быць беларусам – гэтак мала,
Каб за народ свой гаварыць.

Люблю палёў світальных цішу.
Ды калі грымне землятрус,
Я і на пласе не прыніжу
Святога слова – беларус.

* * *

Андрэю Цяўлоўскаму

Сад забыты.
Спляліся галіны яблынь, груш...
Анікога наўкол.
Каркне вечарам воран былінны –
Смачна чмякнецца яблык на дол.
Быццам звон, скаланецца планета,
Зоркі ў небе начным затрымцяць...
Слёзы яблынь – антоны, ранеты...
Тут няма больш каму іх падняць.
«Дзе ж вы, людзі?!» – бязмоўе гукаю.
Ды чакаю адказу дарма...
На антонаўку я наступаю,
Як на міну...
Мяне больш няма.

* * *

Сіні-сіні сон асін,
Белы-белы сум бяроз.
Ты адна і я адзін,
І не трэба слоў і слёз.

Помніш, як я мілаваў,
Як твае разгадваў сны.

Ты кахала, я кахаў
У абдоймах збажыны.

Жураўлёў журлівы клін
Ласку лета ўдаль панёс...
Сіні-сіні сон асін,
Белы-белы сум бяроз.

* * *

Калі размаўляюць вочы,
Заўсёды нямеюць словы.
І часам адзіны позірк
Каштуе паэмы цэлай.

Таму са сваёй каханай
Заўжды гавару вачамі,
А попел жывых пачуццяў
Нямой аддаю паперы.

Бялынічане

Я шлях пачынаў ад калыскі,
З былінной лясной стараны,
Дзе ў кожным сяле абеліскі
Стаяць напамінам вайны,

Дзе граюць палі збажыною,
Пад ветрам хвалюецца лён...
Люблю цябе шчырай душою,
Мой песенны, светлы раён.

Табе, як матулі і бацьку,
Нясу я задумы свае,
Усё ў нас з табой па-сваяцку:
І песні, і хлеб на стале.

* * *

Хутка восень. Бярозы лістотай пяюць
Нам журлівую песню разлукі,
Каб ты ведала, як я хачу прыгарнуць
Да шчакі твае белыя рукі.

Я хачу да тваіх прытуліцца грудзей
І заплакаць ад шчасця і болю...
Каб ты ведала, колькі жыццёвых завей
Нам яшчэ давядзецца адолець.

Я гляджу ў твае вочы — і бачу сябе,
Пацалункамі іх апякаю...
Каб ты ведала, як я кахаю цябе,
Каб ты ведала, як я кахаю...

* * *

Міколу Падабеду

Мелюць веку жудасныя жорны
Зерне праўды ў хіжую ману...
Прыляціць за мною воран чорны,
Ноччу крыллем грукне па акну.

Падымуся, хуценька збяруся,
Балазе, даўно я рэчы склаў,
І нікольні госцю не здзіўлюся,
Бо даўно-даўным яго чакаў.

Ён мяне падыме над зямлёю,
Дзюбай вочы выклюе мае,
Вырве сэрца з гордаю душою
І аб скалы цела разаб'е.

* * *

Старшыні СВК «Калгас "Радзіма"»
Бялыніцкага раёна А. М. Ланацентаву

Пасеяна д'яблам распаду насенне,
Гудзе, нібы мора, народаў сям'я...
Ды ёсць на зямлі для мяне, як збавенне,
Радзіма, Радзіна, Рабіна мая.

Там жыта з вятрамі гуляе-гамоніць,
Там сонца купаецца ў росных гаях.
Як сына, мяне там чакае і помніць
Радзіма, Радзіна, Рабіна мая.

Калі ж давядзецца, знямогламу, ўпасці,
Калі адгару да крывіначкі я,
Няхай закалыша мой сон, быццам маці,
Радзіма, Радзіна, Рабіна мая.

Паэт

Светлай памяці Аляксея Пысіна

Занадта многа вершатворцаў...
Ды быў усё ж адзін пясняр,
Ён у зялёным пачаткоўцу
Імкнуўся ўбачыць дзіўны дар.
Па людных вулках Магілёва
Ён крочыў ціха раніцой,
Душой адбеленае слова,
Жывой свяцілася слязой.
І ажывала ў нашых сэрцах
Радкамі светлага дабра...
Адплыў паэт, а ў вечнасць льецца
Яго вячэрняя зара.

Храм

Я збудаваў свой храм са слоў прыгожых,
Нібы з цаглін, апаленых агнём...
Было ў тым храме сэрцу гэтак гожа
Завейнай ноччу, навальнічным днём.

Свае пачуцці, мары і памкненні
За сцены храма я не адпускаў,
А слухаў толькі музыку натхнення.
На мітусню ж увагі не звяртаў.

Але аднойчы ноччу Шляхам Млечным
Сышоў, як прывід, старац да мяне.
«Твой храм – турма, а ты ў ім –
вязень вечны.–
Пачуў я ціхі голас, як у сне.–
Зямлі ты зрокся, чалавеча мілы,
Не чуеш стогнаў гоняў і бароў.
Каму касіць? Каму араць? З магілаў
Ты не падымеш песняй плугароў».

Быў гэты вырак, як пад сэрца ножык,
Як перуновы стрэл сярод зімы...
Я зруйнаваў свой храм са слоў прыгожых
І разараў пад жыта дол нямы.

Рунець яму ціхмяным днём асеннім,
Шаптацца жыту з ветрам веснавым...
Мае ж пачуцці, мроі і памкненні
Над ім паплачуць дожджыкам жывым.

Санет маці

Матуля, колькі весняга святла
Тваё імя святое навявае!..
Ты для палёту крылы мне дала,
Таму душа так хораша спявае.

Век немалы па-людску пражыла.
Цябе ўжо праўнук весела гукае.
Хай не спаткае ён людскога зла,
Аб каранях сваіх не забывае.

Як свята, стрэча кожная з табой.
Вядзе тады душа з тваёй душой
Адным нам зразумелую бяседу.

Я напісаў багата розных кніг.
Ды без вачэй і цёплых рук тваіх
Я б хараства зямлі сваёй не зведаў.

Аляксандр Мельнікаў

(1936—1999)

* * *

Спасибо, жизнь, что я рожден
Под этим небом вечным.
Что я омыт его дождем,
Его звездой отмечен,
Что жаворонком я опет
С высот, залитых солнцем,
Что не один еще рассвет
В мое окно плеснется.
Спасибо, жизнь, что мне дала
На той земле начало,
Где правда силу обрела,
Где песни пел Купала.
Где нет достойнее наград,
Чем жить ее заботой,
Где не один еще закат
Отпраздную работой.

Герб і сцяг горада Бялынічы

Ікона Маці Божай Бялыніцкай

Першамайскі мітынг у Бялынічах, 1925 год

Легендарны лётчык Герой Савецкага Саюза Мікалай Кітаеў

Кіраўнік Бялыніцкага райвыканкама Васіль Захаранка віншуе старшыню Бялыніцкага СВК «Калгас "Радзіма"» Аляксандра Лапацентава з чарговай узнагародай – ордэнам Айчыны II ступені.

У школьным музеі СШ № 1 імя М. І. Пашкоўскага: пісьменнікі Мікола Падабед, Змітрок Марозаў, Міхась Карпечанка, настаўніца Данута Клопава.

Ля мемарыяльнага знака на месцы Галоўчынскай бітвы 1708 года

Пісьменнікі Міхась Карпечанка, Мікола Падабед, Раіса Баравікова, Віка Трэнас



Панарама Бялынічаў

Алея славы СВК «Калгас "Радзіма"»

Аграгарадок Вішоў

Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі У. Пракапцоў ля памятнага знака на месцы былога фальварка Крынкі, дзе ў 1872 годзе нарадзіўся В. К. Бялыніцкі-Біруля.

Беларускія мастакі і пісьменнік Віктар Карамазаў — на паклон да В. К. Бялыніцкага-Бірулі. Крынкі, 2015 год

Вітольд Каэтанавіч Бялыніцкі-Біруля
(1872—1957)

Заслужаны работнік культуры Беларусі Валянцін Ермаловіч чытае вершы магілёўскіх паэтаў у Бялыніцкім раённым мастацкім музеі імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі, 2002 год.

Прэм'ера спектакля па п'есе М. Карпечанкі «Канвеер»

Заслужаны работнік культуры Беларусі Валянцін Ермаловіч у вобразе (спектакль па п'есе Андрэя Макаёнка ў пастаноўцы Бялыніцкага народнага тэатра юнага гледача, 1980-я гады).

Намеснік старшыні Савета Міністраў БССР,
ураджэнец вёскі Галоўчын Міхаіл Севярнёў падчас паездкі ў Індыю.
У цэнтры — пісьменнік Янка Брыль, 1970-я гады.

Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі механізатар СВК «Калгас "Радзіма"» Мікалай Дарэчкін з дачкой і ўнучкай

Вядомы гарманіст і калекцыянер Міхаіл Слізкі падчас аднаго з канцэртаў у родных Бялынічах разам з мясцовым гарманістам Пятром Кудраўцом

Бяроза з капішча багіні Мажаны, якая дапамагае жанчынам стаць маці.

Капішча багіні Мажаны паблізу вёскі Заазер'е



Заслужаны работнік культуры Беларусі артыст Уладзімір Рагаўцоў і сёння захоўвае афішу свайго дэбюту ў Бялынічах.

Прыгожа танцуюць бялыніцкія дзяўчаты.

Супрацоўнікі і няштатныя карэспандэнты райгазеты «Зара над Друццю», 1980-я гады.

Бялынічане на экскурсіі ў Полацку

Знакаміты футбаліст БАТЭ Аляксандр Паўлаў, ураджэнец Бялынічаў,
з вялікім задавальненнем дзеліцца сакрэтамі прафесійнага майстэрства з юнымі землякамі.

Галоўная вуліца аграгарадка Натальеўск Чэрвеньскага раёна названа ў гонар
славутай зямлячкі — Героя Сацыялістычнай Працы Г. Цэдрык.

* * *

Вот и родимая изба.
Стоит, согрета снежным пухом.
Над ней кирпичная труба –
Избы обветренное ухо.
Из-под стрехи, как из-под век,
Окошек сонные глазенки.
О, жизнь моя!
Мы свой разбег
От этой начали избенки.
Нас не один носил поток,
Но как бы ни менялись русла,
Мы гордо помним – наш исток
В криничном крае белорусском.

Ручная мельница

Жернова свое отслужили,
У порога их положили,
Положили друг возле друга
Два остывших каменных круга.
Только мама,
Нечаянно вроде,
Не ступает по ним,
Обходит.
Долго-долго она не решалась,
Будто ноги обжечь боялась
Тем огнем,
Что своими руками
По ночам зажигала в камне.

Эта рана
Не скоро
Станет рубцом.
Умер Коля,
Коля Рубцов.

Мы друг друга не знали.
Русский глагол
В переполненном зале
Неожиданно свел.

Там впервые услышал:
– Я ж не Пушкин,
Другой...
Стало небо повыше
И Нева голубой.

Там впервые увидел,
Никому не сказал:
В непонятной обиде
Горели глаза.

Он глядел по-отцовски
На мир, на ребят.
В лес войду –
По-рубцовски
Сосны шумят.

Баллада о Беседи

Памяти Аркадия Кулешова

Когда к последнему причалу
Несли его февральским днем,
Родная Беседь не кричала —
Безмолвно билась подо льдом.

Над нею женщина стояла,
Шептала строки земляка,
Слезы внезапной не сдержала —
И вскрылась зимняя река.

Но медлила, боясь, наверно,
До океанской течь волны.
Хотя в утрате неизменной
Ни капельки ее вины.

Чайка

Ты волнуйся, море, ты волнуйся,
Наливайся солнцем и ветрами;
В синем жите, как на Беларуси,
Ходят жнеи с белыми серпами.

И не плачут жнеи, не рыдают,
И поют легко и деловито.
Молчаливо хлеба ожидают.
От людей. У них дозрело жито.

Крошки, принесенные на берег,
Исчезают с криками и молча.
Надо мною свет платочков белых...
Может, здесь и матери платочек.

7* Зак 2308

На другом берегу

Зыбкий огонь костра
В сумерках светится снова
На той стороне Днепра,
На той стороне Могилева.

Кто-то вчерашний опять
К роще ольховой вышел.
Стану я с берега звать —
Пламя взметнется выше.

Лодка на хитром замке,
Цепи лежат, как змеи,
Вода холодна в реке,
А я летать не умею.

К дому пойду,
Но меня
Настигнут давние звуки —
Тихо ржанье коня
На подкове излуки.

...И снова увижу во сне
Отца молодого,
Живого.
Откуда он знает, что мне
Так хочется доброго слова?

Васіль Найдзін

Анюціны вочкі

Калі вясной прыгравала сонейка і толькі пад яблынямі бялелі апошнія астраўкі снегу, стары Макар любіў стаяць у садзе. Там, высока ў небе, ужо спявалі жаваранкі. Ды і іншыя птушкі — кожная на сваёй мове — віталі надыход вясны. Але іх Макар не чуў. Ён быў глухаватым. Але ведаў, што не маўчаць птушкі. Вясной кожная птаха хоча засведчыць, што яна перазімавала, прыляцела з чужыны і зараз побач з вамі.

Рознагалосся і дзівос у прыродзе хапае. Хто горлам дае сігнал радасці альбо бяды, хто справай здзіўляе. З надыходам вясны ў кожнай жывой істоты новыя, а ўвогуле вечныя клопаты: трэба шукаць-будаваць жытло, здабываць ежу, працягваць свой род.

Пра гэта можна думаць-разважаць гадзіну, дзве...

Непадалёку ад вёскі быў лес. Там ужо высыпалі і першыя кветкі — пралескі. Неўзабаве і ў лесе, і ўсё навакол зазелянее, заквітнее. Можна тады выбраць сонечны дзень і прайсціся па знаёмых мясцінах.

З кожным годам Макар усё радзей наведваў лес. І прычынай быў не толькі ўзрост. Не ўсё там яму падабалася.

Хмызняк надта ўжо хутка пачаў браць у палон дрэвы, якім патрэбны прастор і святло. Куды ні зірні — новыя сцежкі-дарожкі, аб'езды. Шмат дзе колы не толькі легкавікоў, але і сучаснай магутнай тэхнікі збузавалі зямлю. У дадатак — кучкі, а то і горы смецця, бляшанкі, бутэлькі...

— Такія вось «кветкі» зараз у нашым лесе,— дакладваў ён сваёй Анюце.— І сасонку з дуплом, дзе жыў дзяцел, спілавалі... Не пайду больш туды.

— Я табе кветак у агародчыку насаджу,— казала яму жонка.— Якіх хочаш... Можна і на заваліцы — мае бацькі так рабілі. Але ж ты іх заўсёды касіць збіраешся. Глядзі ўжо на сваіх птушак...

Кветкі сапраўды цікавілі Макара мала. А вось пра птушак, пра сакрэты іхняга жыцця ён мог гаварыць бясконца. З зяцем, унукам... Аднойчы нават сур'ёзна паспрачаўся з суседам. Кожнай вясной той пахваляўся: «Вунь, глядзіце, мае шпакі прыляцелі. Тыя самыя... Вярнуліся з далёкіх краёў — і адразу ў сваё жытло. Нырк у дзірку — і там ужо адпачываюць, мілуюцца. Шпак са сваёй шпачыхай... Малайцы! Поспехаў вам у гэтай справе...»

— Што ты балабоніш?! — не вытрымаў Макар.— «Мае шпакі... Адразу да мяне...»

— А чые ж яны? І летась жылі, і пазалетась. Упадабалі мае шпакоўні, і надалей будуць у іх пладзіцца, нікому сваё жытло не саступяць.

— Павінен табе сказаць,— удакладняў Макар,— пасля доўгай дарогі ў іх быў працяглы «сход» на сухой бярозе, што ля студні. Шмат разоў і ў лясок лёталі, я назіраў. Магчыма, ежу шукалі. Падмацаваўшыся, зноўку «засядалі». Правады абляпілі, вырашалі, куды каму засяляцца, з кім жыць...

Доказы ў Габруся былі менш важкімі. Але ён усё роўна заставаўся пры сваёй думцы: не чужакі занялі яго шпакоўні. У двух доміках жывуць адны і тыя ж птушкі.

— Няўжо ты думаеш, што твае шпакі прыватызавалі жытло, якое, па птушыных правілах, можа заняць кожны?..

— У іх царстве парадку і справядлівасці больш. Ой, больш...

— Чым у каго? — паставіў пытанне рубам Макар.

— Сам ведаеш,— па-філасофску закручваў размову Габрусь: — Не такія ўжо, відаць, дрэнныя, іх птушыныя парадкі. Абыходзяцца без дакументаў, подпісаў, пячатак. Усё вырашаюць па згодзе, без гвалту — летась тут жылі, таму і сёлета маем права. І ніхто не каркне, не паляціць са скаргай да высокага птушынага начальства...

— О-о, які яшчэ гвалт узнімаюць! Каркаюць так, што гулу самалёта не чуваць.

— Варон ты на ўвазе маеш? — У Габруся ўжо дрыжаў не толькі голас, але і рукі.— Ты што, за птушак іх лічаш?.. Во розуму ў чалавека! Ну, сусед! З гарматы страляй — не пачуе, а на небе па гуку самалёты шукае... А шпакі мае былі і маімі будуць...

І ў гэтай, і ў іншых размовах ды справах не было ў суседаў узаемаразумення. Хацелася чалавечага кантакту, ды неяк не атрымлівалася.

У Макара круцілася ў галаве нават думка агульнымі намаганнямі злавіць шпака з яго шпачыхай, завязаць на іх нагах шаўковыя ніткі — лепш чырвоныя —і праз год, па новай вясне, праясніць сітуацыю. Ды з Габрусём кашы не зварыш. Усё ён і так ведае, усё разумее. Вучоны дужа... Сем класаў школы ледзь адолеў. У восьмы не ўзялі...

Аднаму ж брацца за гэтую справу — лавіць шпакоў — нельга. Засмяюць. Хаця каму тут ужо смяяцца... Ходзяць па вёсцы некалькі п'яных аблэвухаў, у доўг грошы просяць. За бутэльку гарэлкі яны маглі б усіх шпакоў пералавіць. Але звязвацца... «Не трэба ў птушынае жыццё глыбока ўлазіць!» — не прамінуў выказаць Макар думку, да якой прыйшоў, і жонцы.

Тая ведала, што ад яе патрабуецца: «Няхай жывуць, гадуюцца... І суседскія, і нашы. Чарвякоў і мошак для ўсіх хопіць». Гаспадар давяршаў: «Каб не птушкі — усяму ўраджаю быў бы гамон! І пчолы вельмі патрэбны...»

— Ой, пра пчол не трэба,— жаласліва паглядзела на мужа Анюта і, павярнуўшы галаву ў адзін бок, потым у другі, пакратала шыю.

— А пра птушак можна...

Прылёту шпакоў Макар заўсёды чакаў з нецярплівасцю.

У такую пару года старога Макара больш чым што іншае цікавілі сад і агарод.

Агародам быў той жа сад. Гадамі расла тут бульба, раней і буракі садзілі. Пад дрэвамі вялікага ўраджаю не збярэш — цень. Ды ім шмат зараз і не трэба. Палова агарода апошнія гады наогул засявалася травой. Гэтай справай ужо займаўся зяць. Касіў, сушыў... Потым прыязджаў на грузавой машыне і забіраў духмянае сена. Куды і каму яго вазіў Цімафей — старых не цікавіла. Рабіў там з сенам нейкі бартар...

Зяць з іх Вікай — адзінай дачкой — таксама мелі ўласную драўляную хаціну ў райцэнтры. На ўскрайку гарадка, праўда, але затое з ладным зямельным надзелам. На гэтую справу пайшлі ўсе зберажэнні — бацькі асноўныя расходы ўзялі на сябе. Перад тым, як купіць, доўга думалі, раіліся. Самі з сабой, са сватамі. І не прагадалі. Калі ў чарговы раз рухнуў рубель — усе ім зайздросцілі. Нават былыя гаспадары злаваліся: маўляў, абдурылі іх.

«Пры чым тут мы?!» — казала без усялякай злосці Анюта. А Макар нават даваў параду іншым: «Не тыя зараз часы, каб зберажэннямі сябе цешыць. Завялася капейчына — у справу яе! Калі не дом, абнову

якую-небудзь сабе купіце — боты, шапку, ватоўку. Восень з зімой усё роўна прыйдуць... А лепш — машыну. Пральную ці наогул легкавік. Калі вы там доўга складвалі ў панчоху... Пра сваіх дзяцей, унукаў мы ў першую чаргу павінны клапаціцца. У птушак вучыцца трэба...»

Здаецца, усё ў дачкі з зяцем ладзілася — і з жытлом, і з работай. А што іх пакінулі — старыя не крыўдавалі: жыццё ёсць жыццё. Выбарам Вікі яны былі задаволены: зяць не толькі абдымаў-мілаваў яе пры родзічах, але і паважаў, падтрымліваў ва ўсіх справах, якіх у працавітых людзей — мільён.

Выкройвалі яны часіну, каб і старых з падарункамі праведаць, чым-небудзь дапамагчы. Асаблівая была радасць, калі прыязджаў унук. З ахвоткай ён ужо мог падрамантаваць і загарадку, якую-небудзь рэч, любіў паліць на кастры абрэзанае з яблынь сучча, ускопваў вясной — разам з усімі — зямлю для град...

Асноўным месцам для работ у іх быў агародчык: невялікі ўчастак зямлі, з трох бакоў абнесены высокім плотам. Агародчык — так яны і звалі яго са старой — падыходзіў ушчыльную да глухой сцяны хаты. Гэта было самым цёплым месцам. Для град лепшага і не прыдумаеш.

Яшчэ задоўга да таго, як сад апранаўся ў лісцейка, а потым — у квецень, Макар строіў планы. У сваім садзе ён абыходзіўся без старой. А ў агародчыку — заўсёды клікаў яе:

— Сёлета тут будзем садзіць агуркі!

Анюта не пярэчыла: глядзела на мужа, потым акідвала позіркам месца, на якое паказваў галоўны ў яе жыцці «камандзір».

— Пасаджу, пасаджу... Яшчэ ж не пара. Ты сам сто разоў перайначыш,— не гаварыла, а ўжо крычала яна.

У такія моманты старэйшы Габрусь — суседзі мелі прозвішча Габрусёвы — бурчэў, стоячы ля самой мяжы:

— Усіх птушак распудзяць, гарлапаны! Бедныя мае шпакі...

— А гэтае месца — пад памідоры!

— Няхай сабе памідоры... Указчык! — не маўчала і старая.— Рабіць табе няма чаго. Схадзіў бы лепш у магазін. Можа, хлеб свежы прывезлі.

— І хлеб, і да хлеба,— удакладніў Габрусь, хоць пра гэта ніхто яго не прасіў.— Гарэлку, віно згружалі, сам бачыў... Вунь, пабеглі ўжо хлопцы. Вечарам будзе на нашай вуліцы шоу. З феерверкамі... А пад раніцу — салют! Шкада мне птушак...

Макар жа гнуў сваё:

— На краю той грады — толькі моркву!..

— А хрэна не хочаце?..— Габрусь ніяк не мог калісьці прамокламі, а пасля высушанымі запалкамі прыкурыць чарговую цыгарку.— У нас хрэн папёр — бульбіну няма куды ўваткнуць. Палова агарода ім

зарасла. Узялі б на расаду... Хрэн, кажуць, зараз у цане. Зяць ваш і на бартар пусціць можа – з сенам жа напрактыкаваўся.

– Самі спажывайце.

– Ды нашым жа сынам і нявесткам усё да лямпулі – ніякага хрэна ім не трэба. Ні бульбы, ні морквы...

– Дзякуем! З гарчыцай сала смачнейшае,– папраўляючы на галаве хустку, адказала суседу Анюта. І на гэтым не спынілася: – А птушкі, дарэчы, таксама не любяць дым і нікацін. Хутка яны адсюль зусім зматаюцца...

* * *

Надыходзіў час, і Макар браўся за рыдлёўку. Спачатку раскідваў раўнамерна гной, які загадзя куплялі ў суседзяў і прывозілі зяць з унукам. Тут без іх дапамогі ўжо не абысціся.

Гаспадар каманды аддаваў далікатна:

– Можаце і ўскапаць. Астатняе – зраблю сам.

А пракладваць дарожкі, абабіваць рыдлёўкай краі град ён не дазваляў нікому. І ўсё атрымлівалася роўна, прыгожа.

– Во як трэба!

– Зрабіў і добра,– нават нягледзячы ў яго бок, прыгаворвала жонка.

Але Макар, паказваючы рыдлёўкай на сцежкі-дарожкі паміж градак, працягваў тлумачыць. Дакладней – пераконваць:

– Калі глыбокія зрабіць – вада ў дождж збірацца будзе. А ў спякоту – усё абсыплецца. Вы б мне нарабілі...

Тым цёплым веснавым днём, абапершыся на граблі, даваў апошнія ўказанні:

– Тут во – цыбулю!

– Блізка ж да плота. Цень...

– Дзе ты бачыла той цень? Садзі тутака...

Анюта ведала: варта зрабіць не так, як вырашыў «галоўнакамандуючы», бяды не абярэшся. Папрокаў хопіць на паўгода. Макара яна не баялася. Ён не быў злым чалавекам. Але любіў, каб слухаліся яго і ва ўсім пагаджаліся. Калі ж яна, не параіўшыся, садзіла дзе-небудзь кветкі – наогул быў гвалт. Апошнім часам, праўда, усё неяк абыходзілася. Безумоўна, дзякуючы яе вытрымцы. «А-а, няхай так і будзе, як сказаў мой Макарка. Яго не перайначыш,– думала яна.–Падыдзе і гэтае месца. Усюды павінна быць прыгожа...».

Але ў тую вясну старая праявіла ініцыятыву.

Яшчэ не сышоў снег, папрасіла Макара прынесці ў хату вялізны таз зямлі – восенню сама яго напоўніла. Стары прынёс, мяркуючы –

8. Зак. 2368

пад памідоры. Але прыгадаўшы, што расадай мала хто зараз займае-ца, усе набываюць парніковую, падазрона спытаў:

— Што ты будзеш садзіць?

— Гэта мая справа,— адказала старая і ўсміхнулася.— Усё ты хочаш ведаць...

Недачуўшы, Макар паціснуў плячамі і больш не задаваў пытанняў. Да таго моманту, пакуль не зрабіў грады. Заўважыўшы, што жонка не слухае яго ўказанняў, насцярожыўся.

— Ты толькі пасадзі мне, што не трэба!

— Пайшоў бы лепш у сад,— падняла галаву Анюта.— Шпакоў ліч-ыць... калі рабіць няма чаго.

Застаўшыся адна, прынесла з дому таз з нейкімі ўсходамі і акурат-на растыкала іх на самай прыгожай градцы, ля каліткі.

Цяпер не праходзіла і дня, каб Макар не спытаў:

— Што ты мне тут пасадзіла?

Старая маўчала.

— Што ні кажы — як аб сценку гарох! Па-свойму яны ўсё робяць, аграномы-акадэмікі. Хутка я разбяруся...

Аднойчы Макар ціхенька ўзяў у хаце акуляры, выйшаў у агарод-чык, пастаяў крыху, падумаў, а пасля схіліўся над градкай. Жоўтым ад тытунёвага дыму пальцам выкалупаў адну расліну, падняў яе і доўга разглядваў. Нічога не зразумеўшы, уваткнуў зноў у зямлю.

— Назло ўсё робіць. От, народ...

— Макарка, абед цябе даўно чакае. Усё там астыла.

— Хутка ўсе мы астынем... Не паспееш паснедаць — ужо ў яе абед. А пасля абеду, па законе Архімеда... даём храпака! І не руш мяне, ка-мандзірша...

* * *

З райцэнтра пазванілі дзеці. Маўляў, у панядзелак раніцай бацька павінен быць у доктара. Вырашыцца пытанне з яго катарактай — ра-біць аперацыю ці не. Цімафей прыедзе па яго ў нядзелю. Магчыма, адразу дадуць накіраванне ў абласную ці рэспубліканскую бальніцу.

— Не трэба мне ніякая аперацыя! — дрыготкім голасам заявіў Ма-кар.— Зусім сляпым зробяць.

— Ты ж даў згоду! Даўно абгаварылі, вырашылі,— нагадала жон-ка.— Трэба быць сур'ёзным чалавекам. Гэтую аперацыю, кажуць, зараз робяць хутка, надзейна. І галоўнае — не на двух, а спачатку на адным воку...

— Добра! Няхай прыязджае Ціма,— здаўся нарэшце Макар.— А дачцэ скажы, каб не ехала. Супраціўляцца не буду, сам у машыну сяду.

Гачыце нажы, дактары-лекары! Чарговага слянога і глухога «арла» прывезлі...

Анюта ўсплёснула рукамі:

— Во... Ледзь не забылася: дзеці падарунак чарговы табе зрабіць хочуць — з дапамогай спецыялістаў заадно падбяруць слыхавы апарат. Павесіш тую слухаўку-цацку на вуха, уключыш, і будзеш усё чуць — радыё, тое, што я кажу. Няма ўжо больш сіл крычаць.

— Ды я і так усё разумею, калі гляджу на цябе. Па вуснах чытаю. А з Габрусём размаўляць — пустая справа. Толькі ці вытрымаюць мае старыя вушы? Грамаў на сто, відаць, той апарат пацягне. Столькі ж сёння трэба мне і выпіць. Дзе ты схавала бутэльку? Інакш не засну...

* * *

Цімафей з сынам прыехалі ў нядзелю раніцай. Выканалі значны фронт работ, як любіў гаварыць Макар. Анюта тым часам рыхтавала неабходныя рэчы мужу для бальніцы.

Пасля абеду, перад ад'ездам, Макар павёў зяця з унукам у агародчык. Паказваючы на адну з градак, спытаў:

— Паглядзіце... Што яна тут мне пасадзіла?

— Кветкі нейкія... Пупышкі ўжо паказваюцца,— асабліва не ўглядаючыся, пракрычаў на вуха цесцю Цімафей і пацягнуў злёгку яго за рукаў.— Трэба ехаць, Навумавіч. А тут зацвіце без вас.

* * *

Пасля ўдалай аперацыі Макар некалькі дзён яшчэ гасцяваў у дачкі з зяцем. Усё ў іхнім доме прыгожа, утульна — слоў няма. Гарадское жыццё! І сад-агарод пад вокнамі. Але ў іх свая сям'я, а ў яго з Анютай — сваё гняздоўе, вясковае, роднае. Магнітам туды цягне. Хацелася не ехаць, а ляцець дамоў. І ён угаварыў зяця завезці яго ў вёску не чакаючы выхадных.

— Воля ваша,— шчыра ўздыхнуў зяць. А дачка дадала: — Нотны ты, тата!

— Што паробіш, дачушка... Але ўсё роўна адпусціце. Звыкла там мне, добра... І маці, ведаю, чакае-не дачакаецца. У чатыры рукі мы шмат чаго карыснага яшчэ зробім.

Неўзабаве легкавік Цімафея каціў па асфальтаванай, а потым па вясковай, з калдобінамі, дарозе.

Да цямна Макар быў ужо ў сценах роднай хаты.

8* Зак 2368

— Я цябе вельмі чакала...— на вачах Анюты паказаліся слёзы радасці.

Якімі словамі сустракае яго жонка, ён зразумеў па губах. А калі зяць дапамог прыстасаваць да вуха слыхавы апарат, у адказ сказаў:

— Я таксама дамоў рваўся. Будзем далей жыць... Во цуд! Сам сябе чую. І ўсё бачу...

— А ты баяўся...

— Не хацелася нагружаць дактароў. Ведаеш, якія зараз да іх чэргі. Усім захацелася жыць да ста гадоў. А мне хопіць і дзевяноста дзевяці...

* * *

Наступнай раніцай, як толькі развіднела, Макар быў ужо ў садзе. Доўга аглядаў дрэвы: шмат завязі на яблынях, грушах. Па ўсім бачна — парадуюць сёлета ўраджаем і слівы, вішні.

— Зноўку паўстане праблема — куды падзець...— уздыхнуў Макар.

Але хутка да яго вярнуўся цудоўны настрой. Шпакі былі тамсі прычынай. Яны ваўсю займаліся сваімі справамі: падляталі да шпакоўні, трымаючы нешта ў дзюбцы, заляталі ўнутр, доўга там не затрымліваліся, а потым зноў адпраўляліся на пошук ежы.

Прыгледзеўся да адной шпакоўні, другой... Сцэнарый аднолькавы: ён корміць яе. А чаму б не падмяніць шпачыху? Пасядзеў бы з гадзіну сам на яйках, няхай бы прагулялася сяброўка... Відаць, баіцца, каб не патрушчыў... Нічога, хутка яны абое пачнуць наперагонкі карміць сваіх дзетак-птушанят, немаведама як распазнаючы, каму чарга прымаць ежу. Ва ўсіх дзюбачкі разяўлены, усе цягнуцца, просяць — дай-дай... Ды каб паболей, пасмачней!

Ну, усё як у людзей: вялікая лыжка, не пустая, канешне, патрэбна ў першую чаргу. Усім! А там ужо дэталі, дробязі. Галоўнае — паболей у рот...

Дзе той хвалько Габрусь? Яго шпакі, маўляў, разумнейшыя: па чарзе і на яйках сядзяць, і дзеткі парадак ведаюць — запар ніхто не каўтане два чарвякі, апярэдзіўшы сястру ці брата...

Шпачыныя праблемы адышлі на задні план, калі Макар зайшоў у агародчык. Усё тут зазелянела, пашло ў рост.

— Так я і ведаў... Ля самага ўвахода пасадзіла.

Градка была ўсыпана кветкамі. Дзіўнымі такімі... Уверсе два вялікія пялёсткі рожкамі тырчаць, а ўнізе — яшчэ адзін. Быццам бы язык. Жоўтыя языкі, фіялетавыя, сінія...

— Бачылі вы?! Язык мне паказваюць,— казаў сам сабе стары, аглядваючы градку.— Абдурылі, значыць. Выкарысталі момант.

Не сцярпеў і ў хаце:

— Лепш бы агуркоў больш пасадзіла... Зямлю шкадаваць трэба, як раней шкадавалі.

— Хопіць з нас тых агуркоў. І буракоў, і морквы... У дзяцей сваіх удосталь, суседзяў кожны год угаворваем, каб узялі. Дарма... Ганарлівыя, адмаўляюцца.

— Няхай хрэн вырошчваюць. Сабе і на продаж... Яго садзіць і даглядаць не трэба. Лезе вунь і да нас ва ўсе шчыліны. Не бяда, сцерпім! — Макар не любіў весці доўгія размовы пра дробязі. Тым больш пра суседскі хрэн, дзядоўнік ля плота. Ён умеў разважаць і глабальна:

— Во, дажылі! Нічога нікому не трэба. Усё ва ўсіх ёсць, а нындзяць: мала за работу плацяць, усё дарагое, не можам назапасіць валюты, каб да мора злётаць. На сланах, вярблюдах пакатацца. Ці наогул — на дэльфінах, бо на «мерседэсах» надакучыла ездзіць. Мулка дужа...

Анюта, як заўсёды, рабіла спробу перавесці размову на мірны лад:

— Нікога не трэба асуджаць, нікому не трэба зайздросціць — жыццё зараз такое, сучаснае. Гэта мы век пражылі і мала чаго бачылі. Акрамя шпакоў і агарода. І ў першую чаргу спяшаліся на поле калгаснае. Так нас вучылі, нам загадвалі.

— Затое дурноты менш тамака...— Макар пастукаў кулаком па сваёй лысай галаве. Ды перастараўся — з вуха зляцеў слыхавы апарат.

— А божухна! Разбіў, відаць...

— Усё нармальна! Не гарыць, вады не баіцца. Ціма казаў, хоць пад танк кідай. Трывалы корпус скляпалі, ведаюць, якія мы вароны.

— Шпак ты стары, а не варона.

— Вярзеш...

— І ўнучаку нашаму вельмі падабаецца, калі я яго шпачком называю.

— Даліся табе шпакі! Вясной і восенню над нашай хатай і жураўлі, і гусі лётаюць... Строем! Ніколі не саб'юцца з курсу. Во заклала прырода-матухна ім у мазгі праграму... Ёсць, значыць, розум, кумекаюць. А мы часцяком зусім не думаем...

— Чаму гэта не думаем?

— Скажы, мая ты думалка, каго хвалюе тое, што заўтра ўся гэтая прыгажосць і гармонія можа ляснуцца?

— Ты пра што гэта, дзед?

— З надвор'ем чула, што на нашым шарыку робіцца? Наўрад ці абыдзецца ў гэтым стагоддзі без катаклізму. На сонцы — магнітныя буры! Адна за адной... Там залье, тут спякота. І раптам на галаву снег. Нават у Афрыцы, Аўстраліі. Па тэлевізары нядаўна паказвалі, як па снезе скакалі аслупянелыя, здзіўленыя белым, але халодным покрывам кенгуру са сваімі кенгурунятамі...

— Не зялі мне галаву такімі навінамі.

– Вось табе і «не зялі». Шмат дзе войны бушуюць – з-за багацця, прасторы. А мы што – галаву ў пясок?

– У снег лепей... Ды зямлі ўсім хопіць, не хвалюйся.– Анюта пачала супакойваць мужа, які разышоўся не на жарт.

– Ты маеш на ўвазе два метры на метр кожнаму?

– І гэта – таксама.

– Дарэчы, і на гэтую сумную справу ўжо не хапае зямелькі. Даражэе і даражэе яна – няма дзе разагнацца. Менш, значыць, кветак садзіць будзем...– Макар аж зарагатаў.– Добра, няхай растуць, тыркайце. Ператворым усю зямлю ў кветнік. Сваю, чужую. Каб усім хапіла. І кветак, і ўсяго астатняга...

* * *

Той вясной Анюта пастаралася, як ніколі. Кветкі дружна цвілі ўсё лета. І не толькі ў агародчыку. Нават прызбу, а заадно знізу і хату апляла настурцыя.

– Ну ты даеш, мама! – усміхалася Віка.

– Атрымала дазвол, не хвалюйся. Была ў нас сур'ёзная размова з бацькам пра зямельку. Зямліца-матухна – гэта ўсё...

– Ой, не трэба, мама!

– Ды я пра тое, што не па навуцы сёлета я кветкі садзіла, не па «генеральным» яго плане, прызнаю. Але ж прыгожа, праўда!

– Вельмі...

Надышла восень.

Зяць, як і ў мінулыя гады, камусьці збыў добра высушаную траву – цудоўнае атрымалася сена. Шкада, не сабе пайшло на карысць – даўно няма ў іх кароўкі. На ўсю вёску іх засталіся ўсяго тры... Агульнымі намаганнямі выкапалі бульбу. Здзівілі сваімі памерамі гарбузы. Апалі з яблынь апошнія яблыкі. Пад кожным дрэвам іх было – не прайсці. Збірай, выбірай... Ды каму браць? Ва ўсіх усё ёсць.

У агародчыку засталося крыху буракоў, морквы і некалькі качаноў капусты.

Убіраючы апошні ўраджай, стары Макар час ад часу разгінаў спіну і глядзеў у неба. Ён выразна бачыў у халоднай сіняве строй птушак, якія ляцелі ў вырай. «Малайцы,– разважаў ён.– Заўсёды ведаюць, куды і як ляцець, ніколі не саб'юцца з курсу. А вось людзі не заўсёды з іх бяруць прыклад. Таму часцяком калёсы, машыны, паязды ляцяць у канаву. Рыхтуй ружы і цюльпаны – на ўспамін пра жыццё зямное, непаўторнае і прыгожае...»

– А кветкі свае ўбіраць будзеш? – без аніякай падкавыркі запытаў Макар.

— А як жа! Абавязкова ўпарадкую,— разагнула спіну і Анюта.— Толькі не сёння. Навошта спяшацца? У суботу дзеці абяцалі прыехаць. Няхай і яны палюбуюцца гэтай прыгажосцю. Маімі «вочкамі»...

— Нашымі! — завяршыў размову наконт кветак Макар.— Угаварылі, абдурылі, куды падзенешся... Тут і без кветак работы шмат. За ўсім не ўсочыш.

«Жык-жык...» — хадзіў нож у спрытных руках жонкі, абразаючы бацвінне з буракоў.

На чарзе была морква. Але ў той дзень Анюта не паспела з ёй разабрацца — зрабілася дрэнна. Пайшла ў хату па валідол, там і засталася. З ложка не ўзнялася і назаўтра.

— Папраўляйся, у агародзе я ўсё сам дараблю,— заспакойваў яе Макар. Прынёс і паклаў на столік, што стаяў ля ложка, усё, што прасіла Анюта і раіла па тэлефоне дачка.

Доўга хадзіў па садзе, зайшоў у агародчык. Выкурыў некалькі цыгарак — не бачыць старая, інакш бы атрымаў на арэхі...

У яго зусім прапаў настрой, калі назаўтра пасля абеду да хаты пад'ехаў легкавік зяця, а за ім — «хуткая».

Доктар з дачкой заспяшаліся ў хату...

Як і меркаваў Макар, жонку павезлі ў бальніцу.

А праз тыдзень ён застаўся адзін.

Колькі ўсяго ўзгадалася яму пасля страшэннай весткі! Горка было і балюча. Не вернеш... Не пачуеш... Не скажа больш ніводнага слова табе. Ніколі!.. Ну як гэта? Адразу...

— Прабач, Анюта. Калі што не так... З майго боку было...

Дзень і моманты развітання праходзілі быццам у сумна-туманным сне. Успаміны і імгненні былога іх сумеснага жыцця неяк перамешваліся, перапляталіся, і нельга было спыніцца, засяродзіцца на нечым адным. Усё было дарагім, блізкім і непаўторным. І ўсё гэта — насуперак яго волі — павольна аддалялася, кудысьці адыходзіла. Потым зноў выплывала...

— Адпачывай... Спі, мая Анютка...

* * *

Макар яшчэ быў моцным для сваіх гадоў. На ўгаворы дачкі з зяцем ехаць да іх — хоць бы на зімовы перыяд — адказваў: «Ну навошта вам лішнія клопаты? Я ж яшчэ на нагах. І печка спраўна грэе, дроў вунь гадоў на пяць назапашана, магазін побач. Куды мне ехаць? Тут мне лепш...»

— Ну, глядзі, тата,— уздыхала дачка.

— Будзем глядзець, ёсць зараз чым. У мяне ж адно вока — як у маладога. Трэба толькі дамовіцца, калі мне чакаць ад вас тэлефоннага

званка. Ля апарата пасяджу. А другі, слыхавы, на вуха павешу. Добра, што ў чалавека два вокі, два вухі ...

— А нос адзін,— удакладніў унук.

— Гэта каб у людзей было менш магчымасцей соўгаць гэты апарат-нюхалку туды, куды не просяць. Уяўляеш, Максімка: у чалавека — дзве дзюбкі. Адна спераду, другая — ззаду.

— Там не трэба,— унук разумеў, што дзядуля спрабуе, як і раней, жартаваць. Але ім усім было не да жартаў, не да смеху.

Максім разам з бацькамі няспешна займаў месца ў легкавіку, махаў рукамі. Маўляў, трымайся, дзядуля. А мы — паехалі...

Макар доўга яшчэ стаяў на вуліцы, потым хадзіў па двары, заходзіў у сад. Рабіў ён гэта і раніцай, днём і вечарам. Глыбокай восенню і зімой у садзе і агародчыку не вельмі цікава. Іншая справа — вясной. Яе вельмі чакаў Макар. Уяўляў, як птушкі зноў прыляцяць, усё пачне расці, цвісці...

Неўпрыкмет і новая вясна надышла. І ўсё пайшло па-ранейшаму.

Не мог толькі Макар звыкнуцца з галоўным: ніхто яго цяпер не клікаў снедаць, абедаць і вячэраць. Ён строіў планы наконт агарода, толькі пра іх не было каму расказваць. Наогул атрымлівалася: садзі, што хочаш і дзе пажадаеш. Поўная табе свабода.

Дачка з зяцем давалі парады, гатовы былі ў любы момант прыехаць, дапамагчы. Але хто тады за гарадскім участкам глядзець будзе? Гэта ў пенсіянераў пасля нядзелі зноў выхадныя. А тым, хто працуе,— цягнуць трэба асноўную жыццёвую лямку, раз-пораз паглядаючы на гадзіннік. І выкройваць час на вырашэнне асабістых спраў. Быццам гэтыя справы — дробязь, не такія яны важнецкія.

Бульбу садзілі, як калісьці казала Анюта, «разам, усім калгасам». У другі выхадны накінуліся на грады.

— Што не паспелі, я дараблю,— даводзіў дзецям Макар.— Пакуль не сцямнела, імчыце дамоў. Такі зараз рух, тысячы машын! Не газуй дужа, Ціма. Цішэй едзеш, далей будзеш. І жыць, і руляваць...

— Ну што ты, тата?

— Шчаслівай дарогі!..

* * *

Непадалёку ад мяжы корпаўся ў сваім агародзе Габрусь. Даклыпаўшы са свайго боку да плота, махнуў рукой Макару:

— Падышоў бы, сусед...

Макар неўзабаве таксама наблізіўся да плота.

Прывіталіся. Перакінуліся словам-другім. Размова не клеілася.

— Слухай, Макар! Колькі гэта жывуць шпакі?

— Гадоў пяць... Калі пашанцуе, можа, і больш... У іх жа няма дарог, слупоў, сустрэчнага транспарту. На любой хуткасці імчы куды хочаш, не трапіш у аварыю. Сцеражыся толькі варон і ястрабаў. А першы воораг птушак — каршун.

— Я не пра гэта,— не гаварыў, а ўжо крычаў Габрусь.— Цікава ведаць, бацькоўскае жытло дзеці іхнія заняць могуць ці не?

— Гэта ў якім сэнсе?

— Ну, калі старым кірдык! Каршун ці ястраб іх цап-царап, а маладым, значыць, тады лафа — можна ўмомант палепшыць жыллёвыя ўмовы. Пустая ж шпакоўня.

Макар нарэшце зразумеў, пра што кажа сусед:

— У нас з гэтай справай больш парадку.

— А ў мяне няма яснасці.

— Раней жа была, я памятаю.

Нельга было зразумець, жартуе сусед ці сапраўды заклапоціўся пытаннямі спадчыны.

— Калі што-небудзь такое — крый божа! — здарыцца, дзецям усё застаецца ў першую чаргу. У нас вось адна дачка — ніякіх, здаецца, праблем не прадбачыцца.

— А ў мяне ж трое! — Габрусь пыхкаў цыгаркай, як паравоз.— Лепш стругаў, чым ты. Не ленаваўся.

— Цяпер вось мазгуй-думай, каб усё па справядлівасці, без крыўды. Тут парады даваць цяжка, спадчына — справа далікатная. Жыллёвыя пытанні ва ўсіх на першым плане... Шкада, новую шпакоўню сёлета не зрабіў. Хто, калі не мы, дапаможа бедным птушкам? Ну, я пайшоў, ёсць справы...

— А што ты там тыркаеш?

— Кветкі саджу. Анюціны... Вочкі яе...

— З глузду з'ехаў Макарка,— прабурчаў Габрусь, бо ведаў, не пачуе стары. А гучна дадаў: — Марозік, кажуць, сёння ноччу будзе.

— Вунь на той градцы саджу...

— Я ж пра замаразак.

— Мая баба іх любіла... Кветкі гэтыя...

Адняўшы руку ад плота, Макар павярнуўся і пайшоў між дзвюх градак, кранаючы ботамі іх роўныя, прыбітыя рыдлёўкай, бакі. Ля краю адной спыніўся, зручней паклаў старую цырату, стаў на калені. І чыстым бокам рукі выцер слёзы...

Юрый Несцярэнка

Адно пытанне

Той тэлефон я яшчэ доўга не мог адраманставаць. Падклейваў яго, замотваў ізаляцыйнай стужкай. У ім нешта ўвесь час адыходзіла, ён то званіў, то не званіў. Вядома, што ў гэтых маіх пакутах лягчэй за ўсё абвінаваціць амерыканцаў. Але ці правільна тое было б з майго боку?

Неяк у суботу ўвечары патэлефанавала сястра. Сказала, што прыходзіў Мікола Малусевіч з нейкім пісьмом з Амерыкі. Быццам у Каліфорніі адшукаліся ягоныя сваякі, якія ў бліжэйшыя дні будуць тэлефанаваць, і што, маўляў, спатрэбіцца мая дапамога. Назаўтра з раніцы Мікола павінен сам зайсці і падрабязна ўсё расказаць. Я не стаў удакладняць дэталяў, паклаў трубку і выйшаў на двор, разважаючы пра непрадказальнасць вясковага жыцця і часам пра незвычайную ролю ў ім мясцовага настаўніка.

Мікола аб'явіўся назаўтра толькі ў другой палове дня (пазней я выпадкова даведаўся, што ён ужо два дні хадзіў па знаёмых і частаваўся

гарэлкай, карыстаючыся ўсеагульнай цікавасцю да таямнічага пісьма). Я сустрэў яго ў калідоры, калі збіраўся выйсці на двор. Крыва ўсміхаючыся, абдаючы перагарам, ён палез быў абдымацца, але, зірнуўшы мне ў вочы, перадумаў і мітусліва пачаў корпацца ў кішэнях. «Зараз, Кастусь, зараз...» — мармытаў ён сам сабе, пляскаючы далонямі па фуфайцы і штанах. Ён выглядаў гадоў на дзесяць старэйшым, хоць мы былі амаль што равеснікі. Некалі Мікола скончыў ваеннае тэхнічнае вучылішча, але сяброўства са спіртным дужа паўплывала на ягоную кар'еру і асабістае жыццё. Ён прыехаў на радзіму з апошняга месца службы без сям'і, без звання, без грамадзянскай спецыяльнасці.

Нарэшце Мікола дастаў зацёрты, пакамечаны ліст паперы з кішэні штаноў, а аднекуль з-за пазухі — канверт, разарваны па ўсіх швах.

«Глядзі, Кастусь,— усхвалявана пачаў тыкаць Мікола ў надпісы «Malusevich» і «California», і, паступова павышаючы голас, амаль што крычаць.— Гэта маё, разумееш? Маё прозвішча! Бяры, чытай пісьмо!»

Пісьмо было напісана на дрэннай рускай мове. Там-сям праскоквалі беларускія словы. Пісаў родны брат Міколавага дзеда. Ён радаваўся, што адшукаў сваякоў, коратка распавядаў пра сваіх сыноў: старэйшы быў доктар, малодшы — рок-музыкант. На момант напісання пісьма малодшы сын-музыка быў на гастролях — выступаў у Японіі.

На апошні факт Мікола асабліва націснуў, ведаючы пра маё захапленне рок-музыкай. Ён выхапіў пісьмо з рук і дрыготкім голасам пракаментаваў: «У Японіі! Ты разумееш? Са сваім уласным гуртом!» Ён ляпаў мяне па плячы, піхаў у грудзі, махаў перад вачыма паперай і шчыра не разумеў, чаму ж і я так экспрэсіўна не падзяляю ягонага захаплення. Яго ўласны выгляд запэўніваў у тым, што я павінен скакаць, прысядаць і таксама ляпаць яго па плячах.

«Ты не зразумеў, Кастусь! Глядзі — «Malusevich», «California»! А ён, мой дзядзька, на гастролях! У Японіі!» Я далікатна перачытаў пісьмо яшчэ раз і, адчуваючы сябе крыху вінаватым, ветліва спытаў, што патрабуецца ад мяне.

Мікола адхіснуўся ад мяне, як ад пякучага полымя, і, акругліўшы вочы, ціха прасіпеў: «Кастусь...» Ён зрабіў вялікую паўзу, павольна споўз спінай па вушаку дзвярэй, прысеў, апусціў нечакана ацяжэлую галаву. Потым страпянуўся, паглядзеў на мяне тужлівымі вачыма бяздомнага сабакі і спытаў: «Кастусь, што мне ім сказаць?»

Я без ценю сумнення адказаў, упэўнены ў логіцы сваіх слоў, што размаўляць з імі можна пра ўсё. Хваляванца тут няма чаго — пра што, маўляў, запытаюць, пра тое і кажы. Час ужо, дзякуй богу, даўно змяніўся. Зразумела, трэба падтрымаць іхнюю цікавасць да нашага жыцця: прапанаваць часцей тэлефанаваць, прыехаць у госці.

Мікола глядзеў на мяне не міргаючы. Мне здалося, ягоныя вочы напоўніліся мудрым разуменнем таго, што адбывалася. Як быццам

нейкі першабытны імпульс адкрыў яму сутнасць гэтай таямніцы — ба бальнага аб'яднання славянскіх душ у сусветным маштабе. Ён абап вусны і, зачаравана гледзячы мне ў вочы, прашаптаў: «Кастусь, ты м зразумей, яны ж там... А я тут... Разумееш? Што ж я ім скажу?»

Толькі пазней, узгадваючы сустрэчу з Міколам, я падумаў, што с своеасаблівы кульмінацыйны момант Міколавага маналогу наступа час, калі я павінен быў паліць яму чарку. Але, як і ўласціва ўзнёсла ідыёту-інтэлектуалу, не ўважліваму да мясцовых умоўнасцей, я пав і не падумаў пра нешта такое, у думках заняты варыянтамі адказу на пісьмо і тэмай магчымай размовы з амерыканцамі па тэлефоне. Сам разважанні я сістэматызаваў і добрасумленна прадставіў Міколаваў увазе.

Той, быццам я нічога толькі што не казаў яму, падняўся з парога і спытаў: «Кастусь, а як жа я буду з імі... Яны ж у Амерыцы... ШТО мне ім казаць?»

Магчыма, нейкі псіхалагічны бар'ер — калі межы яго ўласнага сусвету рэзка пашырыліся да маштабаў планеты — не даваў яму спакою. «Можа, і так»,— думаў я ў той момант... Але тое, што Мікола нават не звярнуў увагі на маю прамову, вядома ж, закранула. Паўтарацца я не стаў. Я ўвогуле нічога не адказаў, калі ўбачыў, што размова не атрымліваецца. З канчаткова сапсаваным настроем я падумаў, што Мікола нарэшце развітаецца са мной. Але той думаў трошкі інакш. Паварушыў перасохлымі вуснамі, трагічна гледзячы некуды паўзверх маіх вачэй, і зноў узяўся за сваё: «Кастусь, а што я ім скажу?..»

Напэўна, ужо нават я здагадаўся расцаніць гэтае пытанне як вытанчаны здзек хітрага п'яніцы, таму што пасля майго адказу ў калідор выглянула жонка і запыталася: «У вас усё добра?» Я, можа, нават крыху рэзкавата, прапанаваў ёй зачыніць дзверы і, павярнуўшыся да Міколы, паспрабаваў падвесці вынік нашае размовы, апошні раз растлумачыўшы, што калі яму спатрэбіцца мая дапамога — я заўсёды гатовы! Толькі мне патрэбна ведаць, што трэба рабіць ДАКЛАДНА!

Мікола доўга глядзеў мне ў твар, потым нізка апусціў галаву і стаў пляскаць па кішэнях. Ён выцягнуў абрыўкі канверта ды напалову разарванае пісьмо і пачаў паказваць зразумелыя яму фразы на англійскай мове і зачытваць асобныя фразы на рускай. Я сціснуў зубы і, спрабуючы захаваць стрыманасць, перапыніў яго і пераказаў усё пісьмо ад пачатку да канца. Ён вытрымаў паўзу і шэптам спытаўся: «Кастусь, пра што я буду з імі размаўляць?»

Памятаю вельмі цьмяна, як у парыве шаленства я выштурхаў гэтага беднага чалавека на вуліцу, як ён агаломшана глядзеў на мяне і мармытаў нешта накшталт: «Добра, добра...У чацвер... Размова... Ты будзеш побач... Толькі пра што...» Са страшэнным грукатам перад ягоным носам зачыніліся дзверы.

Назаўтра з раніцы Мікола патэлефанаваў: «Кастусь, прабач алкаша! Бязглуздзіцу нёс – п'яны быў! Гаварыў сам не разумеў што. Ты ж ведаеш – гарэлка сваю справу робіць...» Я адказаў, што ўсё нармальна, што я і сам пагарачыўся і што не трэба было мне так груба размаўляць з чалавекам, які выпіў, хай сабе і крыху лішняга. Увесь наш дагавор застаецца ў сіле – чым змагу, заўсёды дапамагу. «Кастусь, яны ж у чацвер будуць тэлефанаваць? » – нечакана запытаўся Мікола. Я чамусьці разгубіўся, адказаў зацвярджальна і не прадугледзеў наступнага пытання. Можна сказаць, зусім не падрыхтаваўся да яго. А Мікола памаўчаў крыху і спытаўся: «...Кастусь, пра што я з імі буду гаварыць?»

Каб вы не падумалі, што я нейкі вар'ят і з гэтай нагоды разбіў той тэлефон, павінен растлумачыць, што ён проста зваліўся з паліцы. Можа быць, я няўдала ці неяк рэзка павярнуўся ці адышоў – хто яго ведае? А пра Міколавых амерыканцаў я так больш нічога і не чуў, бо тэлефон не працаваў некалькі дзён, пакуль яго не адрамантавалі. А ў хуткім часе я ўвогуле змяніў месца працы і жыхарства.

Я пару разоў бачыў Міколу пасля таго памятнага выпадку, аднак быў ён у такім стане, што заставалася толькі рабіць выснову: у амерыканскіх сваякоў з цягам часу павінна назбірацца ўсё больш і больш пытанняў да майго земляка. Але якое пытанне было найважнейшым для самога Міколы, ведаў толькі ён адзін.

Рок-каранацыя пад знакам 223L

Мы дамовіліся сустрэцца каля музычнай крамы, дзе я працаваў. У прызначаны час я ўбачыў доўгага худога чалавека з ускудлачанымі валасамі. Здавалася, яго вопратка выглядала крыху пакамечанай. Рухаўся ён неяк нервова, гаварыў гучна, рэзкімі фразамі, нечакана пачынаў смяяцца, пераскокваючы ў сваёй размове з тэмы на тэму. Але я не надта здзіўляўся. Зразумела, што ў асяроддзі творчых людзей хапае экстравагантных асоб. А перада мной быў не хто іншы, як Вітаўт Мартыненка, адзін з аўтараў легендарных у гісторыі айчыннай альтэрнатыўнай музыкі кніжак «Праз прызму рок-музыкі» і «222 альбомы беларускага року». Першая выйшла ў Амерыцы напрыканцы васьмідзясятых. Кажуць, што польскія студэнты да сённяшняга часу пішуць дыпломныя працы па культуралогіі Усходняй Еўропы на падставе гэтага выдання, карыстаючыся як першакрыніцай. Другая кніга выйшла амаль праз дваццаць год і ўяўляе сабой сапраўдную энцыклапедыю беларускамоўных груп і выканаўцаў.

Я перадаў Вітаўту свой альбом на рэцэнзію. Ён сказаў, што чуў некаторыя песні і ўражанні ў яго станоўчыя. А потым нечакана дадаў: «А класна атрымалася, калі вы выйшлі на сцэну «Рок-каранацыі» ў майках з надпісам "223"...».

Я адразу не зразумеў, пра што гаворка, у тым сэнсе, што мой суразмоўца звяртаў увагу на нейкія лічбы на вопратцы. Мы сапраўды ўдзельнічалі ў штогадовым мерапрыемстве пад такой назвай. Гэта было адмысловае падвядзенне вынікаў за мінулы год, у якім вылучаліся лепшыя творчыя асобы ў розных намінацыях. Дарэчы, Вітаўт быў там адзначаны як лепшы рок-журналіст за кнігу «222 альбомы беларускага року». Але я ўсё ж быў упэўнены, што наша група ў такіх майках не выступала.

Праз пэўны час да мяне дайшло, якая выдатная ідэя хавалася за наступнай лічбай, што ідзе за 222. Я па-добраму пазайздросціў нейкім, як я сабе ўявіў, маладым музыкам, якія, напяліўшы майкі з надпісам «223», прапанавалі такім чынам сваю творчасць на першае месца сярод будучых лепшых беларускіх рок-альбомаў у новым томе гісторыі айчыннай рок-музыкі. І з якімі Вітаўт нас пэўна пераблытаў. Але я не паспеў яго перапыніць і адмовіцца ад ганаровай місіі, што ўскладаў на нас тытулаваны журналіст – размова насіла даволі неўпарадкаваны характар, і тэмы вельмі хутка змяніліся.

Мы абмеркавалі шмат цікавых пытанняў, і раптам мой суразмоўца з захапленнем зноў выдаў: «Але ж вы малайцы! Гэта ж трэба так прыдумаць! Прыемна, прыемна...». Я ўжо дакладна вырашыў расставіць усе кропкі над «і», набраў паветра ў лёгкія, але менавіта ў гэты момант у Вітаўта зазваніў тэлефон. Ён пачаў нешта вельмі эмацыянальна пацвярджаць, потым адсунуў тэлефон ад вуха і прашаптаў: «Плясанаў звоніць!», пасля, прытрымліваючы трубку плячом, працягнуў мне руку на развітанне і накіраваўся ў бок метро. Я застаўся стаяць адзін – у разгубленасці падсумоўваць вынікі сустрэчы.

Мне ўсё ж было вельмі цікава, з кім мог пераблытаць нас спадар Вітаўт. Але павінен быў прайсці пэўны час, пакуль не высветліліся падрабязнасці.

Мінула шмат месяцаў пасля нашай сустрэчы, і аднойчы, шукаючы нейкі відэазапіс з уласных выступленняў, я наткнуўся на некалькі дыскаў з надпісамі «Грыфаманія», «Рок-каранацыя», «Канцэрт у "Катакомбах"» ды нешта яшчэ. На ўсе гэтыя мерапрыемствы мы разам з маімі калегамі-музыкантамі ездзілі з маленькага мястэчка, дзе я жыў у той час. Калі ўключыў першы дыск, здзіўленню майму не было межаў – наш басіст Сяргей з каменным выразам твару «калбасіў» з усёй моцы па струнах, а над яго пяціструнным інструментам, на ўзроўні грудзей горда зіхацелі лічбы 223. Я перагледзеў астатнія дыскі – вынік быў той жа: на ўсіх канцэртах лічба 223 дамінавала.

Потым на вочы трапіў кадр, дзе Сяргей здымае гітару, і тут я натуральна не ўтрымаўся ад смеху. У мяне нават пацяклі слёзы ад дзіўнай метамарфозы, якую я толькі зараз заўважыў. На самой справе наш басіст вельмі часта апранаў тэніску, з тых, на якіх адпаведна модзе свайго часу актуальна было размяшчаць розныя індустрыяльныя надпісы. У яго на грудзях вялікімі трафарэтнымі літарамі, якімі звычайна пазначаюць кантэйнеры ў якім-небудзь порце, было напісана 223L. Калі ён вешаў сабе на шыю бас, то тоўсты скураны рэмень цалкам закрываў лацінскую літару. На сцэне Сяргей стаяў крыху ззаду, і, зразумела, я не мог гэтага бачыць. А калі мы знаходзіліся побач недзе ў грымёрцы ці толькі выходзілі на сцэну, трымаючы гітары ў руках, надпіс успрымаўся ўсяго толькі як модны дызайнерскі элемент.

Дзякуй табе, Сярожа, што недзе на рэчавым рынку, ці на сваёй працы, у эксперыментальным мэблевым цэху, ці ў яшчэ ў якім неверагодным месцы ты знайшоў гэтую выдатную тэніску! Гэта ж менавіта яна зрабіла цудоўнае пераўтварэнне ў свядомасці знакамітага журналіста ды пасунула яго да ідэі другога тома сваёй грунтоўнай працы!

Чыё імя будзе адкрываць гэты том і, адпаведна, займаць ганаровае месца — яшчэ невядома. Але цалкам зразумела, што надпіс 223L, які зараз ужо мае права быць культавым, мусіць увогуле стаць сімвалам нашага часу — часу новых імёнаў «Рок-каранацыі» ды эпохі сэкандхэнду.

Апошні шанц выйсці ў людзі

Так час ад часу здараецца — ты едзеш у Ленінград на провады сябра ў армію. Бывае яшчэ — былая твая сяброўка стала яго нявестай. Нічога дзіўнага, што праз яе вы і пазнаёміліся і цяпер называеце адзін аднаго сябрамі.

Сітуацыя складаецца так (звычайна бліжэй да поўначы), што ў інтэрнаце на Васільеўскім востраве прызыўніку трэба пабыць сам-на-сам з яго каханай прыкладна да раніцы. Усё ж такі апошняя ноч, і дзяўчыне няёмка дзяліць яе на траіх. Ну, у сэнсе сядзець за сталом да світанку і піць утраіх каву. Таму, як сапраўдны джэнтльмен, крыху хістаючыся, ты проста выходзіш у раннекрасавіцкую ноч з думкамі: «Дзе наша не прападала...» І трываеш гадзіны дзве. Трэба ведаць, што такое клімат на беразе Фінскага заліва на пачатку вясны. Словы «страшэнны холад» ці «наймацнейшы вецер» і блізка не перададуць незабыўныя ўражанні.

У вялізным гатэлі побач з пірсам не гарыць ніводнае акно. Гэта надае месцу выгляд мёртвай планеты. Ты проста «рубішся» на хаду, пакуль ідзеш на другі бок гатэля, туды, дзе плешчуць хвалі. Прысесці ці прылегчы немагчыма, таму што бетон настыў так, што зрабіўшы спробу прымасціцца дзе-небудзь, даводзіцца падскокваць, быццам абліўшыся кіпенем.

Ахоўнік на судне, з аўтаматам і ў кажуху да пятак, утойвае ўсмешку і крычыць зверху з трапа: «Не-не, брат, у нас нельга пераначаваць...» Алкаголь ужо амаль выветрыўся, ты згарбаціўся, брыдзеш да паркінга, уціскаючы галаву ў плечы – нібыта гэта сапраўды дапаможа сагрэцца. Ды бог з імі, хай глядзяць з вокнаў гатэля ў гадзіны тры-чатыры ночы, як ты хапаешся за ручкі і спрабуеш адчыніць якое-небудзь аўто. І што? А тое, што раптам заднія дзверцы трэцяга па ліку аўтамабіля адчыняюцца! І ты ўвальваешся ў салон і ўвогуле не клапоцішся ўжо ні пра што. Трэба толькі зачыніць выратавальныя дзверцы, і ўсе твае беды застаюцца дзесьці далёка. Спаць... Не спаць!.. Толькі хвіліначку... Не, пятнаццаць...

Недзе ўверсе, над галавой, звіняць званочкі трамваяў, сігналяць машыны, шыпяць дзвярыма на прыпынках тралейбусы. Асцярожна прыўзняўшыся, ты разумееш, што зараз прыкладна гадзін шэсць-сем, мяркуючы па ранішняй актыўнасці ленінградцаў. Трэба хуценька і незаўважна пакідаць месца выратавання. Дзякуй, машынка, дай бог табе добрага гаспадара! «Будьте добры, не скажете, который час?» Да ваенкамата яшчэ дзве гадзіны. Спаць хочацца неверагодна. Выйсце адно – сесці ў нейкі тралейбус. Піцерскія тралейбусы на той момант падаюцца чамусьці вельмі ўтульнымі. Праспаць у адным з іх да канцавога прыпынку і ў той жа час вярнуцца да месца, дзе заходзіў,– ідэя не самая горшая.

Заняўшы адзіночнае месца ля акна, ты спрабуеш заснуць. Спробы дзеляцца на кавалачкі: першы прыпынак, другі, трэці... Недзе на пятым ты ў паўзабыцці бачыш праз шкло, як у салон заходзіць Ірка Т., твая зямлячка па невялікім беларускім мястэчку.

Спрасонку раптам падаецца, што сустракацца з ёй нельга ні ў якім выпадку. У свядомасці ў адно імгненне праносіцца, што Ірка на восем гадоў старэйшая за цябе, што кожны раз, прыязджаючы дадому, яна цэлымі днямі сядзіць на працы ў сваёй сяброўкі Ленкі, працоўны стол якой стаіць побач са сталом тваёй мамы. Ірка ў захапленні ад Мікалаеўны, так яна заве маму, і ўвогуле Ірка з Ленкай дастаткова дарослыя цёці, каб ім давяраць: ім ажно па дваццаць пяць гадоў.

Сустрэцца з Іркай – гэта значыць рассакрэціць усю нелегальнасць цяперашняй паездкі. А давялося звальваць з заняткаў, неяк дамаўляцца са старастам групы, каб не пісаць заяву дэкану. А гэта ж не блізкі свет – амаль што тысяча кіламетраў. А трэба яшчэ вяртацца... Усё

прапяпае ў галаве за секунду, і ты асцярожна абыходзіш Ірку ззаду, каб не прыцягнуць яе ўвагі, і хуценька спрабуеш выскачыць з тралейбуса, пакуль не зачыніліся дзверы.

Але ж дзверы такія нахабныя — зачыняюцца, калі ты апынуўся якраз на апошняй прыступцы! Ты ўсё ж выскокваеш, з ляскатам і грукатам, амаль што на ходу. Пехта з культурных піцерскіх пасажыраў, каб дапамагчы табе, крычыць: «Водитель!..» Кіроўца ціснe на тормаз, увесь тралейбус паварочвае галовы ў твой бок. Зразумела, Ірка таксама! Не пазнаць цябе, нават са спіны, немагчыма. Як заўсёды некалькі апошніх гадоў — твае доўгія русыя валасы спрабуюць дацягнуцца да джынсаў «Levi's». Як звычайна — ці гэта халоднае лета, ці любы месяц зімы — ты не здымаеш з плячэй карычневай скураной летнай курткі. Падарунак бацьку ад знаёмага афіцэра ваенна-паветраных сіл — эксклюзіўная рэч. Фігура, хада, пастава? Не ведаю дакладна якім чынам, але неяк так адбываецца — прадстаўнікі аднаго полу па гэтых самых прыкметах беспамылкова ідэнтыфікуюць прадстаўнікоў полу супрацьлеглага...

У ваенкамат ты паспяваеш і сябра праводзіш як належыць. Пазней высветліцца, што ён патрапіў на афганскую мяжу (пасля арміі, дарэчы, яны ажэняцца з той самай сяброўкай з інтэрната, у іх атрымаецца выдатная сям'я).

А ты праз пару месяцаў развітваешся са сваёй змрочнай шэрай правінцыяльнай навучальнай установай і падаеш дакументы на падрыхтоўчыя курсы ў светлую сталічную ВНУ. Такое час ад часу таксама адбываецца.

Калі-некалі яшчэ здараецца, быццам бы нешта такое надыходзіць, нешта з табой адбываецца — і ты цэлы месяц займаешся, не адрываючы галавы ад падручнікаў. Напрыклад, перачытваеш палову школьнай праграмы па літаратуры, да якой не дакранаўся апошніх гадоў пяць-шэсць.

Трэба адзначыць у гэтым ланцугу выпадковасцей, што заняткі на курсах вядуць найцікавейшыя людзі і ты проста заўсёды знаходзішся ў стане лёгкага шоку — ад таго, як яны нечакана і нестандартна падаюць вучэбны матэрыял. Усё, што адбываецца, проста непараўнальна з тваім папярэднім студэнцкім досведам! Гэта будзе гучаць пафасна, але ты ніколі ў жыцці не хацеў так вучыцца (скажам шчыра, што ў школе ты не напісаў ніводнага сачынення — няма чым ганарыцца, але так ёсць — першае ў жыцці было напісана на ўступным экзамене пасля вышэйзгаданых курсаў).

І вось ты прыязджаеш дадому на пару дзён, што пасля заканчэння курсаў даюцца на падрыхтоўку да экзаменаў. І нечакана на цябе абрынаецца моцны бацькоўскі гнеў. Ты ўвогуле не разумееш, пра што гаворка, калі мама пачынае галасіць: «Мы яму дапамагаем, мы яго на

вучобу накіравалі, а ён, такі-растакі, усе грошы траціць, каб па піцерах раз'язджаць...»

Ты, стаміўшыся шукаць логіку,— а старыя не хочуць слухаць ні тваіх пытанняў, ні тваіх адказаў,— выстаўляеш бацькоў вар'ятамі (няхай прабачаць яны за тое непаразуменне) і з нялёгкім сэрцам едзеш назад да Менска.

Такое здараецца — ты проста не можаш ведаць (паколькі сапраўды быў вельмі заняты сваімі новымі справамі), што ў самы адказны, можна сказаць, пераломны момант твайго лёсу з Піцера ў чарговы адпачынак прыехала Ірка Т. Зразумела, яна днямі сядзіць на працы ў сваёй сяброўкі Ленкі і распавядае байкі з паўночнай сталіцы імперыі. Яны з Ленкай увесь час хіхікаюць, і між іншым Ірка раптам аднойчы ўзгадвае: «Ой, Мікалаеўна, забылася вам сказаць, я ж сына вашага нядаўна ў Піцеры бачыла...» Тут у Іркі бразнулася на падлогу сумачка, і яны з Ленкай пачынаюць рагатаць і збіраць рэчы па падлозе. А мама са збялелым тварам выходзіць на калідор. На вачах у яе слёзы. І дату, халера, калі ты на самой справе быў у тым Піцеры, на жаль, Ірка ўжо не ўдакладніць. Бо пакуль вернецца мама, хаваючы заплаканыя вочы, Ленка з Іркай ужо збягуць на абед...

Дык вось, калі-небудзь так здараецца — ты выходзіш ноччу пагуляць па Ленінградзе (увогуле, не з-за сяброўкі, як камусьці магло падацца,— проста самому захацелася прайсціся па набярэжнай), у стане, блізкім да абмаражэння (амаль што не заўважыў — так сабе крышку прахалодна), ты спіш у чужой машыне на заднім сядзенні замест утульнага інтэрнатаўскага ложка (звычайны спосаб адпачынку беларусаў у Ленінградзе). Потым едзеш у тралейбусе, нумар якога не ведаеш, выпадкова сустракаеш знаёмую (іх у любым горадзе, на адлегласці тысяча кіламетраў, колькі заўгодна), але гаварыць з ёй не дужа хочацца, і ты выходзіш на невядомым прыпынку. Нейкім цудам ты ўчасна трапляеш да ваенкамата, каб выканаць сваю місію і праводзіць, у рэшце рэшт, прызыўніка ў армію.

Толькі мама пра гэта не ведае, і амаль што праз паўгода вецер прыносіць ёй няпэўную інфармацыю. А ў мамы такая праца — перажываць за дзяцей і плакаць.

— Ну і пры чым тут апошні шанц? — пытаецца хтосьці з мамінай работы.

«Ды амаль што ні пры чым»,— думаеш ты. Так здараецца, што былая сяброўка пазнаёміла са сваім жаніхом (які прыехаў да яе ў госці з Піцера пад Новы год) менавіта падчас выступлення гурта «Апошні шанц», дзе ты спяваеш і іграеш на гітары.

Мікола Падабед

Іду на сустрэчу з навальніцай

Урывак з аповесці

1

Васіль Васільевіч Калінкін не мог заснуць, хоць ужо даўно ў бальнічнай палаце выключылі святло і стаяла начная цішыня. На сэрцы было трывожна. Яго душу вельмі кранула ўчарашняя сустрэча з жонкай – любай русавалосай Алёнай, з якой амаль сорак гадоў пражылі душа ў душу. У апошні час яна крыху сутулілася, а вочы памутнелі ад слёз. І не без падставы. За апошнія тры гады Васю зрабілі дзве складаныя аперацыі. А хвароба ўсё не адступала, прычапілася, як смала да цела. Таму, каб захаваць жыццё, ён згадзіўся на трэцюю аперацыю – ампутаваць левую нагу. Праўда, даў згоду не адразу. У размове з урачамі неаднойчы чуў слова «ампутацыя», ад якога мурашкі бегалі па спіне. Нават страшна было падумаць: як ён вернецца інвалідам у Васількі? Якое цяжкае гора прынясе жонцы, дзецям і

блізкім людзям! А ці зможа працаваць? Чым такое жыццё – лепш смерць... Але тут жа адганяў ад сябе трывожныя думкі і цвёрдым голасам сам сабе гаварыў: «Трэба жыць! Жыць! Жыць!» Алёна вельмі перажывала, непакоілася за мужа. І як заставалася адна, давала слязам волю, намагалася заглушыць імі боль у сваім сэрцы. А пры сустрэчы з Васілём яна ласкава ўсміхалася, пяшчотна гладзіла мяккай рукой па ягонай шчацэ: маўляў, не хвалюйся, родненькі, усё будзе добра. А ўчора не стрывала – расплакалася. Ад гэтых слёз Васілю стала не па сабе. Ён доўга ўгаворваў яе супакоіцца, а калі гэта не дапамагло, прытуліў да сябе і расчулена зашаптаў:

– Перастань, мая радасць, перастань. Чаго зайшлася, як дзіця? Я ж хутка папраўлюся. Праз месяц буду дома.

Гэтыя словы сагрэлі і абнадзеілі Алёніну душу. Яна куточкамі вуснаў усміхнулася, моцна пацалавала мужа. Ад усяго гэтага на сэрцы ў Васіля стала лёгка-лёгка...

2

У той вераснёўскі вечар Васіль ўбачыў Алёну ў калгасным клубе, куды разам з сябрамі-аднакурснікамі прыйшлі на пагулянку. Яна была апранута ў белую блузку на гузіках і кароткую спадніцу. Трошкі хударлявы твар з акуратным носам, русыя валасы ў хвосцік сабраныя. Як зачараваны, любаваўся дзяўчынай. Яму падабалася, як Алёнка лёгка кружылася ў танцах, як з сяброўкамі спявалі песні і як заліваліся звонкім смехам.

Алёну ён ведаў даўно: вучыліся на адным курсе. Амаль кожны дзень сустракаліся на занятках. Яшчэ на першым курсе пакінуў вока на прыгажуню. З кожным днём Васіль адчуваў, што нейкая нябачная, таямнічая сіла цягнула да Алёнкі і што без яе не можа далей жыць. А вось прызнацца ў каханні не хапала смеласці.

Зайгралі вальс. Васіль запрасіў дзяўчыну на танец. Тая з радасцю прыняла прапанову.

– Алёнка, я хачу, каб гэты танец ніколі не канчаўся,– ціха сказаў Васіль сваёй аднакурсніцы, якая, як і ён, прыехала дапамагаць калгасу выкапаць бульбу.

– А чаму?

– Мне так добра з табою!

– І мне таксама...

У клубе было душна. Таму Васіль са сваёй партнёршай выйшлі на свежае паветра. Сталі пад кашлатыя ліпы. А калі скончыліся танцы, ён правёў яе дахаты, куды часова пасялілі студэнтаў.

Назаўтра адвячоркам яны зноў сустрэліся ля клуба.

– Я сёння не хачу на танцы,– заявіла Алёнка.– Давай лепш пагуляем, палюбуемся тутэйшымі мясцінамі.

Спачатку ішлі па вуліцы моўчкі, а потым пачалі расказваць цікавыя гісторыі са свайго жыцця. Васіль адчуў, што яго спадарожніца апавядае яму шчыра і адкрыта, як роднаму чалавеку, якому давярае ўсё – нібыта адкрывае дзверцы сваёй душы. Ён з усмешкаю, лагоднай і зычлівай, крадкам пазіраў на гаваркую аднакурсніцу і ўсё больш пераконваўся, што гэтая дзяўчына – для яго, а ён – для яе. І ў думках зазначыў: «Трэба дзейнічаць больш рашуча і настойліва – інакш правароню гэтую прыгажуню.»

Назаўтра адвячоркам яны зноў сустрэліся ля клуба.

Было ўжо за поўнач, а развітвацца не хацелася. А калі спыніліся каля густога куста бэзу, што рос каля хаты, дзе жыла Алёна, Васіль нясмела ўзяў дзяўчыну за руку, а потым абняў за трапяткую і гнуткую талію і далікатна прамовіў:

– Алёна, выходзь за мяне замуж.

– Ты што? – здзівілася яна.– Ні з таго, ні з сяго – і замуж? Яшчэ што прыдумаў! Не-е-е... Два разы правёў – і давай пажэнімся. Нават ніводнага разу не пацалаваліся. Вось дзівак... А вучоба як? Мы ж толькі на трэцім курсе... Але ты нос не вешай – я добра падумаю...

Васіль падхапіў Алёнку на рукі і закружыўся з ёю вакол куста бэзу, абсыпаючы яе гарачымі пацалункамі. Здавалася, што ў гэтыя хвіліны прыціх вецер-свавольнік, яшчэ ярчэй пачалі свяціць зоркі-ліхтары з неба: нібы і яны радаваліся шчасцю двух маладых людзей. Праз два месяцы ў рэстаране «Аўрора» амаль усім курсам акадэміі згулялі вяселле згодна з народнымі традыцыямі. Вясёлае, шумнае...

3

Калгасны клуб быў запоўнены. Сюды прыйшлі і старыя, і малыя. Усе ведалі, што будуць выбіраць новага старшыню, таму дружна сабраліся на агульны сход. Пасля выступлення другога сакратара райкама партыі Пятра Пацешкіна калгаснікі актыўна бралі слова. Яны ўсхвалявана гаварылі пра недахопы, што меліся ў калгасе. І ў адзін голас заявілі:

– Нам такі старшыня не патрэбны!.. Не можа арганізаваць людзей і павесці за сабою... Больш глядзіць у чарку, чым на гаспадарку.

– А каго б вы хацелі? – пацікавіўся Пётр Пятровіч.– Мо ў вас ёсць свой чалавек? Калі ласка, называйце кандыдатуру.

Усе маўчалі, як вады ў рот набраўшы.

— Ну, калі ў вас няма, то бюро райкама партыі рэкамендуе [illegible] ць старшынёю калгаса «Новае жыццё» Васіля Калінкіна,— прапанаваў Пётр Пацешкін.

— А хто ён такі? — выгукнуў нехта з залы.

На сцэну ўзняўся высокі чарнявы хлопец, у сініх штанах, [illegible] вай кашулі пад гальштукам, у расшпіленым шэрым піджаку. Ён [illegible] падобны не на будучага старшыню, а на спартсмена.

— Пытанні да Калінкіна будуць? — звярнуўся да прысутных [illegible] стаўнік райкама партыі.

— Вядома, ёсць,— выдыхнуў дзядуля, які сядзеў у першым [illegible] зале.— А скажы, сынок, а колькі табе гадкоў? Ці служыў у арміі [illegible] вучыўся?

— Мне дваццаць пяць. Скончыў агранамічны факультэт Бе- рускай сельскагаспадарчай акадэміі. Служыў у групе савецкіх войск Германіі.

— А ці жанаты? А то будзеш бегаць па дзеўках, а пра калгас [illegible] дешся.

— Я сваё ўжо адбегаў,— ні то жартам, ні то ўсур'ёз [illegible] Калінкін.— Чатыры гады як ажаніўся. Мая жонка вельмі стро- распусты не пацерпіць.

— Гэта добра. А хто ж яна па спецыяльнасці?

— Заатэхнік. Разам вучыліся ў акадэміі.

— Во-во! Нам такіх якраз і не хапае.

З лавы ўстала калгасніца Марыя Бярозка і засакатала:

— Гляджу я на цябе, галубчык, і плакаць хочацца. Такі [illegible] зялёны. Яшчэ матчына малако на губах не абсохла. А ты хочаш [illegible] дзець на шыю хамут, ад якога хутка згорбішся. Бо ў нас [illegible] цяжкія. Развучыліся працаваць у калгасе. Шмат вопытных [illegible] паўцякала з Васількоў. Доўга не затрымаешся і ты.

Зала прыціхла — чакала, што скажа гэты камсамолец. [illegible] Калінкін кашлянуў раз-другі ў кулак, каб сабрацца з думкамі і [illegible] нуць лішняга, усхвалявана загаварыў:

— Вядома, я малады, і вас гэта насцярожвае. Але ў мяне ёсць [illegible] вопыт работы з людзьмі, які набыў, працуючы галоўным агрономам [illegible] саўгасе «Высокае». Залатых гор не абяцаю, але пастараюся паставіць [illegible] гаспадарку на ногі. Для гэтага мы павінны працаваць дружна, [illegible] адной сям'ёй. Без п'яніц, хапуг і лайдакоў.

— А куды іх дзець? Хіба на Салаўкі адправіць? — выпаліў [illegible] ваты мужчына.

— Будзем перавыхоўваць! Гэта ж нашы людзі.

Больш пытанняў не было. Сакратар райкама маўчаў. Думаў. Нарэшце ён звярнуўся да калгаснікаў:

— Хто за тое, каб выбраць старшынёй калгаса «Новае жыццё» Васіля Калінкіна, прашу галасаваць. Хто за? Хто супраць? Хто ўстрымаўся? Выбіраецца аднагалосна. Давайце павіншуем маладога кіраўніка з высокай пасадай і пажадаем яму плёну ў працы.

У зале пачуліся дружныя апладысменты.

4

Пасля справаздачнага сходу малады старшыня ўсю ноч не звёў вачэй. Некалькі разоў уставаў з пасцелі, з цыгарэтай ў руках сноўдаўся з кута ў кут. Думаў, так хутчэй зморыць яго сон. Але нешта балючае, што цяжкім камнем ляжала на душы, не давала спакою. Тады Васіль нацягнуў на плечы паношаную куртку і выйшаў на вуліцу. Калючы вецер холадам дыхнуў у твар. Каб сагрэцца, таропка пакрочыў па дарозе, зацярушанай снегам. Сіні ў перадранішнім сутонні, ён сляпіў вочы некранутай белізной.

На Васількоўскай ферме ўжо завіхаліся даяркі. Згледзеўшы Калінкіна, яны са слязамі на вачах пачалі скардзіцца:

— Добра, што прыйшоў ты, Васіль Васільевіч. Амаль суткі каровам нічога не даём. Не падвезлі корму. Запіў трактарыст.

— Чаму раней маўчалі?

— А каму гаварыць? Стары старшыня сюды вачэй не паказваў — баяўся абцяжарыцца лішнімі клопатамі.

— Трэба неяк жывёлу ратаваць. А коні на ферме ёсць?

— Ага. Нават два.

— Запрагайце іх у сані.

— А навошта?

— Саломы ці сіласу прывязём. Я вам дапамагу.

— Васільевіч, мы самі ўправімся. А ты займайся сваімі справамі. У цябе іх хоць адбаўляй. Як летам каларадскіх жукоў на бульбе...

І сапраўды, незайздросная спадчына дасталася Васілю Калінкіну. Не шанцавала гаспадарцы на кіраўнікоў. Мяняліся яны амаль кожны год.

Людзі паверылі новаму старшыні, закасаўшы рукавы ўзяліся за нялёгкую хлебаробскую справу. Праз тры гады ў гаспадарцы ўжо сталі збіраць з гектара ў два разы больш збожжа і бульбы, чым атрымлівалі раней. Значна ўзраслі і надоі малака.

6

Спякота не спадала, хоць сонца схавалася за хмару. Старшыня калгаса, вярнуўшыся з поля, паставіў УАЗ-469 ля канторы і накіраваўся ў кабінет, каб азнаёміцца з сёняшняй поштай. Толькі ўткнуўся носам у паперы, як зазвінеў званок.

— Я вас слухаю,— сказаў у трубку ён.

— Васіль Васільевіч, добры дзень! — пачуўся голас старшыні райвыканкама Арцёма Пацука.— Як ідзе жніво?

— Нармальна. Праз два-тры дні закончым убіраць раннія збожжавыя.

— Па тэмпах ты маладзец! — пахваліў кіраўнік раёна і дадаў: — А вось па ўраджайнасці падводзіш. Трэба выпраўляць памылку.

— Няпраўда! — не пагадзіўся Калінкін.— З кожнага гектара збіраем па 42 цэнтнеры збожжа. А гэта ў два разы больш, чым па раёне. Хаця сёлета да нас далучылі гаспадарку, якая адстае. Думаю, што тут няма аніякай трагедыі.

— Трагедыя ёсць! — павысіў голас Арцём Адамавіч.— Па ўраджайнасці наш раён пляцецца ў хвасце ў вобласці. Значыць, выручай. Дадаў яшчэ 8 цэнтнераў.

— А як? — насцярожыўся Калінкін.

— Ты не маленькі. Сам ведаеш. І з неба не зваліўся.

— На што намякаеце? Прыпісаць? Не змагу! Сумленне не дазваляе.

— Тады пішы заяву! Будуць іншыя рабіць!..

Старшыня калгаса хацеў сказаць штосьці калючае, крыўднае, але стрымаўся, не стаў падліваць алею ў агонь. У такіх складаных сітуацыях ён дзейнічаў, як раіў вялікі філосаф Сакрат: «Ты людзей слухай і не слухайся. Калі кажуць нешта разумнае, то матай на вус. А калі дурное,— прапускай міма вушэй».

7

Пакутліва доўга цягнулася ноч. Не спалася Васілю. І на гэта была прычына. Калі ён збіраўся наведаць жывёлагадоўчы комплекс, пазваніў інструктар абкама партыі і перадаў тэлеграму: «Заўтра ў 8 гадзін раніцы вас чакае сакратар абкама партыі Барыс Паўлавіч Мурашка. Просьба не спазняцца».

Спрабаваў удакладніць, па якім пытанні яго выклікаюць, але інструктар адмахнуўся: маўляў, не спяшайся лезці ў пекла раней за бацьку — заўтра даведаешся. Прамільгнула ў галаве і секанула па сэрцы жахлівая думка: «Відаць, нехта з вялікіх «кручкоў» пабываў у гаспадарцы, назбіраў «жукоў», а цяпер хочуць даць добрую прачуханку».

З Калінкіным сакратар сустракаўся шмат разоў, таму прывіталіся яны, як старыя знаёмыя, моцна паціснулі адзін аднаму рукі.

— Сядай за стол, пагаворым,— прапанаваў Барыс Паўлавіч і дадаў: — Ёсць адна ідэя.

— А якая? — не ўтрымаўся Васіль Васільевіч.

— Мы тут, у абкаме партыі, параіліся і вырашылі рэкамендаваць цябе намеснікам загадчыка арганізацыйнага аддзела Магілёўскага абкама партыі. Ну як?

— А чаго мяне? — здзівіўся старшыня.

— Гаспадар ты талковы. За пяць гадоў калгас паставіў на ногі. Малады, ініцыятыўны, прынцыповы. Умееш з людзьмі знаходзіць агульную мову. На жаль, вось гэтых якасцей не хапае многім партыйным работнікам... Спадзяюся ў цябе больш пытанняў няма. Значыць, будзем афармляць дакументы. Рыхтуйся на бюро абкама партыі.

Толькі цяпер Калінкіну стала зразумела, чаго яго выклікалі сюды, і, цяжка ўздыхнуўшы, ён прамовіў:

— Прабачце, Барыс Паўлавіч, я не магу...

— Пачакай, пачакай! — перабіў яго сакратар.— Не гарачыся. Ад такой пасады адмаўляешся? Ты што, з катушак зляцеў? Уключы мазгі! І не брыкайся! Зарубі сабе на носе: адмовішся цяпер — лічы, што паставіў на сабе крыж. А можа, хвалюе пытанне, дзе жыць? Хоць сёння забірай ключ ад трохпакаёўкі. Элітны дом, у цэнтры горада. І аб тваёй жонцы паклапаціліся: будзе працаваць у аблсельгасхарчы.

Сакратар нахмурыўся, паглядзеў на Калінкіна, устаў з-за стала, падышоў да яго і крануў за плячо.

— Слухай, Васіль Васільевіч, згаджайся. У цябе ўсё яшчэ наперадзе. Не псуй сваю біяграфію. Не спадабаецца ў нас — у любы час адпусцім у калгас. Ну, як? Па руках?

Старшыня выцер далонню лоб і залысіны, паглядзеў на сакратара сумнымі вачыма і выдыхнуў:

— Барыс Паўлавіч, зразумейце правільна. І не крыўдуйце. Не атрымаецца з мяне партыйнага работніка.

— Чаму?

— Як дрэва не можа расці на асфальце, так і я жыць у горадзе. Без пары завяну.

Мурашка нічога не адказаў, быццам не пачуў, пра што гаварыў старшыня, толькі ўсміхнуўся сам сабе.

Наступіла паўза. Парушыў яе гаспадар кабінета:

— Вельмі шкада. Але, як кажуць, сілаю мілы не будзеш. У цябе ёсць яшчэ два дні. Добра падумай, парайся з жонкай і пазвані мне, каб паведаміць аб сваім рашэнні. Жадаю поспехаў!

Калінкін выйшаў з кабінета, уздыхнуў з палёгкай, нібы з яго скаціўся цяжкі камень.

9 Зак 2368

На гэтым не скончылися цікавыя прапановы. Яго не раз хацелі ве раманіць у Мінск. І давалі высокую пасаду. І зноў атрымалася ...ск Васіль Васільевіч не клюнуў на сталічнае жыццё. Яго як магнітам пр цягнуў калгас «Новае жыццё» — працавітыя, шчырыя людзі, з імі ён параднёся, і дзе глыбока пусціў карані.

8

...Стаяла позняя восень. Полых не ніклай свой вецер-ўборы аб так вецер-свавольнік зрываў з дрэў апошнія барвовыя лісты і кідаў на дол. Квяцістай кодрай на зіму ўкрывалася зямля.

Дзень хіліўся да вечара, а хата Калінкіных гудзела, як пчаліны рой. Сюды на юбілей Васіля Мікітавіча сабралося столькі людзей, што не хапала сталоў. Давялося прынесці ад суседзяў.

Праз адчыненыя вокны вырывалася на волю чароўная музыка і задушэўныя песні. А калі госці добра «падагрэліся» віном і гарэлкай, пачалі з прысутных аб'яўлялі танцы.

Васіль Мікітавіч выйшаў з хаты і накіраваўся ў сад. Прысеў на лаўку і задумаўся: у памяці гартаў старонкі жыцця. А ўспамінаць было што. Нарадзіўся ён у Малінаўцы 7 лістапада 1917 года. Равесник Кастрычніцкай рэвалюцыі. Рана пайшоў на свой хлеб. Ад знаёмага да знаёмага ваяваў у Вялікую Айчынную. Мужна змагаўся з ворагамі, выконваў свой абавязак перад Радзімай. Два разы трапіў у шпіталь з цяжкімі раненнямі. Дабітаючую Перамогу сустрэў у Берліне. Пра гераізм аўтаматчыка Калінкіна свядчыць орден Чырвонай зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі» і іншыя.

Калі закончылася вайна, вярнуўся ў родную вёску. Ажаніўся з мясцовай прыгажуняй Галяй. Арай, сеяй, збірай ураджай...

Васіль Мікітавіч, пакуль мелася сіла, не абходзіў увагай ні дзяцей, ні сям'ю без бацькі, якая адчувала патрэбу ў дапамозе ў агародзе, у доме ці на лузе. А каб пракарміць сваіх дзевяць дзяцей, паставіць іх на ногі, разам з жонкай дагледзеў цялят на сучаснай ферме. Сыны і дочкі выраслі добрымі людзьмі: працавітымі, сумленнымі. Амаль усе жывуць вынікаючы адкуль...

— Тата, ты што тут робіш? — парушыў нечакана цішыню Васіля. Госці селі за стол, а цябе няма. Ніхто не хоча ні піць, ні есці. Без юбіляра. А можа, матор забарахліў? То «хутко» выклічу.

— Не трэба, сынок, не трэба. Лепш пасядзім яшчэ крышачку.

— Нагонт чаго?

— Сілы ў нас на заходзе. Перакідайце да нас, у Васількі. Месца ў доме ўсім хопіць. І Алёна не супраць. Дагледзім.

Васіль Мікітавіч паглядзеў на сына, сумна ўсміхнуўся і сказаў:

— Вася, не крыўдуй на нас. Мы з роднай хаты нікуды не паедзем.

— А чаму?

— Прызвычайвацца да новага месца позна ўжо. Вось калі зусім занядужаем, то тады... А цяпер пойдзем, а то госці разбягуцца.

Насустрач ім з хаты, нібы на крылах, ляцела песня:

Бьется в тесной печурке огонь.
На поленьях смола, как слеза.
И поет мне в землянке гармонь
Про улыбку твою и глаза...

Васіль Мікітавіч спыніўся, быццам зачараваны, слухаў яе. На вачах выступілі слёзы. Гэта песня вельмі кранула душу ветэрана вайны, і ён прамовіў:

— Мая любімая песня. Ой, як хораша спяваюць! Малайцы! Добры падарунак зрабілі мне. І ў цябе, Вася, цудоўны голас. Давай дапаможам ім.

9

Па вёсцы ён ішоў больш павольна і сцішана: дзённая стома зараз нагадвала аб сабе.

— Васіль Васільевіч! — хтосьці аклікнуў яго.

Павярнуўся і ўбачыў сярэдняга росту мужчыну, гадоў сарака. Прывіталіся. Ігар Міхайлаў, механізатар, адразу паспешна загаварыў:

— Ездзіў я сёння ў ашчадбанк. Там абяцалі выдзеліць крэдыт толькі ў наступным годзе. А мая хата, як той грыб, у зямлю ўрасла. Самі бачылі. Можа, дапамаглі б?..

— Добра, падумаю, як лепш зрабіць...

Неяк напрадвесні заглянуў Васіль Калінкін да Міхайлава. Гаспадар якраз быў дома — рыхтаваўся «ляпіць» дах. Разгаварыліся. Вось тады і падаў старшыня думку: не займацца рамонтам, а праўленне калгаса выдзеліць яму новую кватэру.

— Не-е-е, я не згодны,— скрывіўся, быццам ад зубнога болю, Ігар Васільевіч.— Не магу пераехаць на новае месца. Тут жылі мой дзед, бацька, а цяпер — я. Прыкіпеў душою.— Вось каб каля старой хаты ды новую паставіць...

Нямала клопатаў прынесла старшыні новая хата механізатара. На праўленні калгаса прынялі рашэнне аб выдзяленні беспрацэнтнага крэдыту. А будаўнічая брыгада гаспадаркі прывезла бярвенне з лесу і

паставіла новы зруб. Нарэшце, усім гэтым турботам настаў радасны канец – непадалёку ад старой, падслепаватай хаты вырасла новая, прасторная пяцісценка.

10

У той вечар Алёна Цімафееўна позна вярнулася дадому з работы. Нячутна адчыніла дзверы сваёй кватэры, павесіла на вешалку цёплае паліто, шапку і накіравалася ў залу – там гарэла святло. На канапе з газетай у руках сядзеў Васіль. Убачыўшы жонку, ён узрадваўся:

– Нарэшце дачакаўся. Дзе так доўга была?

– У Сасноўцы. На жывёлагадоўчым комплексе.

– А якія там праблемы?

– Якасць малака пагоршылася.

– Ці ўстанавіла прычыну?

– А як жа! З раніцы да позняга вечара была там. Прааналізавала работу аператараў машыннага даення кароў. На жаль, не ўсе яны з адказнасцю ставіліся да сваіх абавязкаў. Давялося прыняць строгія меры. Думаю, цяпер якасць малака палепшыцца.

– Алёнка, нялёгкая ў цябе работа,– уздыхнуў Васіль.– А што б я рабіў без цябе? Жывёлагадоўчая галіна не развівалася б такімі шпаркімі тэмпамі. Ты сама гарыш і сваім агнём запальваеш людзей на добрыя справы. Ой, адной гаворкаю сыты не будзеш. Сядзіся за стол – ты ж галодная. Вячэру я згатаваў. Толькі зараз пагрэю.

Яна абняла мужа рукамі за шыю і зазірнула ў вочы. І падумала: як гэта ўсё вельмі важна, калі той, з кім ты жывеш, хто цябе моцна кахае, хто для цябе стаў самым блізкім і дарагім чалавекам, разумее з паўслова.

– Як мне пашанцавала ў жыцці...– зашаптаў ёй на вуха Васіль.– Такая прыгожая і добрая жонка...

– І мне таксама,– ціха прамовіла Алёна.

Яны змоўклі, нібы баяліся спалохаць сваё шчасце. На душы ў іх было светла і лёгка.

...З года ў год у гаспадарцы дынамічна, эфектыўна развіваецца жывёлагадоўчая галіна. І вялікая заслуга ў гэтым галоўнага заатэхніка Алёны Калінкінай, якая больш за трыццаць гадоў працуе на гэтай неспакойнай пасадзе.

А турбот ў яе хапае. На 11 жывёлагадоўчых і малочнатаварных фермах і комплексах утрымліваецца 7 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку больш за 2 тысячы кароў. Ад іх штодзённа рэалізуецца 40 тон малака. Ёсць тут і свінаферма, дзе па замежнай тэхналогіі

гадуюцца паўтары тысячы свіней. Не за гарамі той час, калі гэтае паголоўе павялічыцца ў тры разы.

Рост жывёлагадоўчай прадукцыі адбываецца за кошт тэхналагічнага пераўзбраення ферм, укаранення найноўшых тэхналогій, яднання навукі з практыкай. Удзельная вага жывёлагадоўчай галіны ў агульнай структуры вытворчасці прадукцыі цяпер займае 80 працэнтаў. І ва ўсіх гэтых добрых справах запявалай з'яўляецца Алёна Калінкіна, якая сама працуе, не шкадуючы сіл, і ад іншых патрабуе працаваць з поўнай аддачай, з агеньчыкам.

...Павячэралі, памылі посуд. Васіль і кажа жонцы:

— Заўтра нядзеля, чым займацца будзеш?

— А што? — пытаннем на пытанне адказала яна.

— Можа, махнём у Магілёў?

— А чаго?

— Адведаем унука Сцёпку. Яму ўжо год, а я даўно яго не бачыў. Учора званіла Вераніка. Прасіла, каб прыехалі.

— З вялікай радасцю прымаю тваю прапанову. А то нашы дзеці выраслі самі па сабе, так цяпер і ўнукі... Усё з-за работы часу не хапае. Рана ці позна, але трэба аддаваць даўгі.

У адказ Васіль усміхнуўся.

11

Васіль ачомаўся ў рэанімацыйным пакоі, калі вячэрнія прыцемкі шэрым крылом апусціліся на зямлю. Расплюснуўшы вочы, убачыў медсястру і ледзь чутна выдыхнуў:

— Пі-іць...

— Давядзецца пацярпець. Пасля цяжкай аперацыі піць пакуль нельга.

— Хоць кры-ша-чку.

Медсястра хуценька ўзяла вільготны бінт, змачыла хвораму вусны і ласкава спытала:

— Ну, як? Цяпер лягчэй стала?

Васіль хітнуў галавой.

На чацвёртыя суткі Калінкіна перавялі ў агульную палату. Тут ля яго па чарзе дзяжурылі самыя блізкія людзі: жонка Алёна, дачка Вераніка і сын Сяргей. Яны сваім цяплом і клопатамі стараліся сагрэць ягонае сэрца, зменшыць боль і загаіць раны.

Сумаваць у бальніцы Васілю не давалі сябры. Аднойчы следам за медсястрой у палату зазірнуў Валерый Кісель.

— Добры дзень, Васіль Васільевіч! — павітаўся ён.— Як справы, даражэнькі?

– Горш і не бывае.

– Чаму?

– Без нагі застаўся. Хіба ж гэта жыццё?

– Вядома, табе вельмі не пашанцавала. Але гэта не канец свету. Галава ёсць? Ёсць. Рукі ёсць? Ёсць. Значыць, жыць і працаваць будзеш. Вунь праслаўлены лётчык Аляксей Марэсьеў без дзвюх ног застаўся. І не раскіс, за жыццё змагаўся. Таму зноў сеў за штурвал самалёта і даваў фрыцам такога перцу, што тыя баяліся яго, як чорт крыжа. І танцаваў. Ды яшчэ як! За ім дзеўкі гужам бегалі. Не верыш? Вось я прынёс кнігу Барыса Палявога «Повесть о настоящем человеке». Вазьмі і пачытай. Яна дапаможа табе стаць на ногі.

– Дзякуй, браток, за кнігу! – Калінкін абняў сябра і моцна прыціснуў да сябе.– Вялікі дзякуй!

– Няма за што. Папраўляйся. Бывай! А калі цябе выпішуць?

– Хутка. Як адрасце нага.

– Ну і гумарыст ты, Васільевіч. Я рад, што ты не страціў пачуцця гумару. Мацуйся, і да новай сустрэчы!

Старшыня калгаса ніколі не думаў, што ў яго столькі сяброў.

...Праўду кажуць, што ў роднай хаце і сцены дапамагаюць. Як толькі з нагі знялі бінты, Васіль Васільевіч папрасіўся, каб яго выпісалі дадому. Урачы спрабавалі адгаварыць: маўляў, трэба пабыць пад нашым прыглядам, але ён і слухаць не хацеў. Цяпер у яго была адна мэта – вярнуцца да работы, стаць паўнацэнным чалавекам. Выйсце было адно: трэніравацца, трэніравацца і трэніравацца, а потым, калі набудзе пратэз, навучыцца на ім хадзіць. Для гэтага Калінкін распрацаваў комплекс практыкаванняў. І чатыры разы ў дзень выконваў іх.

Гімнастыка выклікала востры боль. Але ён не адступаў: з кожным днём павялічваў працягласць практыкаванняў, прымушаў сябе пераадольваць боль і цяжкасці.

Першы крок пасля аперацыі Васіль Васільевіч зрабіў ля свайго ложка, калі нікога не было дома, каб ніхто не бачыў яго пакут. Як толькі націснуў на пратэз, закрычаў ад болю і шмякнуўся на падлогу. Па шчаках каціліся слёзы. Ад болю і крыўды. З цяжкасцю падняўся, узяў мыліцы і асцярожна патупаў. Цяпер ён нагадваў немаўля, якое вучыцца хадзіць. Зрабіўшы некалькі крокаў, Васіль адчуў, што яго пакідаюць сілы. Твар пакрыўся потам. Ледзь дабраўся да ложка і паваліўся на яго.

А калі крыху адпачыў і супакоіўся, зноў узяўся за мыліцы... І так трэніраваўся на працягу трох месяцаў, пакуль не стала слухацца штучная нага.

12

Агульны сход сельгаскааператыва праходзіў ажыўлена: многія вяскоўцы хацелі выказацца, падаць прапанову па матэрыяльным заахвочванні людзей за адсутнасць шкодных звычак, добрыя паводзіны ў быце, актыўны ўдзел у мастацкай самадзейнасці і спорце... Гэтае пытанне нарадзілася ва ўнісон патрабаванням часу. Бо сёння аднымі адміністрацыйнымі мерамі нельга дабіцца высокіх вытворчых паказчыкаў.

— Можна мне? — першая папрасіла слова ў Васіля Калінкіна дырэктар Васількоўскай сярэдняй школы Галіна Мурашка.

— Калі ласка. Што ў вас? — спытаў старшыня.

— Я прапаную плаціць стыпендыі вучням, якія добра вучацца, а таксама іх бацькам і настаўнікам. Многія выпускнікі нашай школы паспяхова працуюць на палях і жывёлагадоўчых комплексах. А сённяшнія школьнікі — гэта заўтрашні дзень гаспадаркі.

— Ясна! Слушная прапанова. У каго яшчэ ёсць што сказаць?

— Дазвольце! — звярнулася да кіраўніка сельгаспрадпрыемства дырэктар мясцовага вакальнага ансамбля «Белыя ночы» Надзея Салавейчык.

— Гаварыце. Слухаю.

— Васількоўскія артысты вельмі часта выступаюць з канцэртамі перад вяскоўцамі, на раённых і абласных фестывалях мастацкай самадзейнасці. На рэпетыцыі і паездкі трацяць нямала часу. На жаль, іх творчая праца матэрыяльна не заахвочваецца.

Нехта з прысутных не вытрымаў, хіхікнуў:

— Плаціць за песні? Гэта занадта крута.

Але на яго ніхто не звярнуў увагу.

— Песні нам жыць і працаваць дапамагаюць,— заўважыў старшыня.— Яны прыносяць людзям радасць, натхняюць на добрыя справы. Таму падумаю, як лепш зрабіць.

— У нашай вёсцы ёсць усё: школа, бальніца, Дом культуры, пошта,— заявіла пенсіянерка Лідзія Варабей.— А вось царквы няма. Вельмі шкада. Бо храм — крыніца духоўнасці. А яе нам не хапае. Прашу пабудаваць царкву.

— Бач, чаго захацела! — пакпіў механізатар Алесь Гарбулька.— У маладосці награшыла, а ў старасці хочаш замаліць грахі. Позна спахапілася. Ці так?

Жанчына адказала яму не адразу, нібы раздумвала, ці варта, звязвацца з такім. Але не вытрымала, узарвалася:

— Ах, бязбожнік! Ах, сабака пракляты! Што за лухту нясеш? Каб на тваім языку ды скула села! Трэба словы прапускаць не толькі праз рот, але і праз мазгі. А калі іх прапіў, то пазыч у суседа.

Ала спінылася. Усе паіраці на старшыню: што скажа ён?

Калінкін акінуў вачыма людзей, якія сабраліся і прамовіў:

Калісьці мы думалі толькі аб надоях малака, ураджайнасці палёў, палянішчаў быту і жыцця людзей. А сёння ў нас ёсць магчымасць выдзеліць грошы для Савядзення царквы.

Апошнія словы Васіля Васільевіча патанулі ў апладысментах.

18

Зімовы дзень кароткі. Хутка стала змяркацца. Як толькі Алёна зачыніла на ключ дзверы, пачуўся «Тук-тук-тук...» Спрытна павярнула яго назад і ласкава запрасіла:

– Праходзь, родненькі! Нешта запазніўся.

Але перад ёй стаяла суседка Марыя.

– Ты што, дарагуша, ужо спаць уляглася? – засакатала яна.– Рана ж яшчэ...

– Во прыдумала! Упраўляюся. Позна прыйшла з комплексу. Прывезлі кароў з Галандыі. Пакуль расставілі жывёлу – сцямнела. А ты нагуляць завітала? То прысядзь на крэсла, а я хуценька закончу...

– Ды не... Я да Васіля Васільевіча...

– А ён яшчэ з работы не вярнуўся. Калі не сакрэт, па якой справе?

У гэты момант рыпнулі дзверы і на парозе з'явіўся Калінкін.

– Добры вечар! – коратка кінуў ён.– У нас госці? А чаго, Алёнка, не запрашаеш суседку за стол?

– Ой, я на адну хвіліначку,– нясмела запярэчыла Марыя Пятроўна.– Я прыйшла вас папрасіць, Васіль Васільевіч, каб дапамаглі мне...

І змоўкла. Заплакала...

– Мо хто пакрыўдзіў? – устрывожыўся гаспадар дома.– Супакойцеся і раскажыце... Пастараюся вырашыць вашу праблему.

– Ой, прабачце за бабскія слёзы. Не ўтрымалася. У мінулую суботу прыязджаў Віктар з жонкаю. Пагасцявалі. Паблукалі па аграгарадку, сустрэліся са сваімі знаёмымі... А дома сын заявіў: «Хочам, мама, вярнуцца ў Васількі. Тут усё ёсць для таго, каб звіць сямейнае гняздо і жыць шчасліва. Пагавары са страшынёю, ці можна ўладкавацца на работу па спецыяльнасці... А то мы за двухпакаёвую кватэру аддаём гаспадару амаль паўзарплаты. А самі ледзь канцы з канцамі зводзім».

Калінкін спакойна выслухаў суседку, задумаўся, пацёр рукою лоб, а потым звярнуўся да яе:

– Марыя Пятроўна, чаго плачаце? Радавацца трэба. Віктар зрабіў правільны выбар. Ён – талковы хлопец. Універсітэт закончыў з чырвоным дыпломам. А працуе дзе?

– На заводзе. Праграмістам.

— А яго жонка?

— У паліклініцы ўрачом.

— Пашанцавала вашым дзецям. Гаспадарцы якраз патрэбны такія спецыялісты. Няхай прыязджаюць. Будзе дзе жыць — выдзелім новы катэдж. Бясплатна. Непадалёку рэчка, сад. Ну, проста райскі куток! І да вас — рукой падаць. Не засумуеце. А то адна, як у полі вярба...

— Ой, вялікі дзякуй, Васіль Васільевіч! Узрадавалі. Зараз пазваню ім. Каб доўга не бавіліся. Спакойнай ночы! — Жанчына таропка павярнулася і паспяшалася да дзвярэй. А Калінкін паглядзеў ёй услед і паківаў галавою: «Эх, малыя дзеці спаць не даюць, а дарослыя дзеці не даюць спакойна жыць...»

Праз месяц маладая сям'я справіла наваселле ў Васільках.

14

Ужо прыхапіліся прыцемкі, калі Васіль Калінкін падышоў да легкавіка і звярнуўся да вадзіцеля:

— Сцёпка, паганяй!

— Адну хвіліначку.

— Што-небудзь здарылася?

— Усё ў парадку. Прасілі мяне васількоўцы павіншаваць вас з днём нараджэння і ўручыць вось гэты букет кветак.

— О, які шыкоўны! Дзякуй, браток, дзякуй!

Калінкін сеў у машыну і паглыбіўся ў думкі-развагі.

У памяці пачаў гартаць старонкі са свайго жыцця...

Зусім нядаўна, здаецца, было, як яго, камсамольца-агранома, выбралі старшынёй адстаючага калгаса «Новае жыццё». І ўжо амаль сорак гадоў на капітанскім мосціку сельгаспрадпрыемства. Ой, не салодкі хлеб кіраўніка! Дзясяткі праблем трэба вырашаць штодзённа. Таму даводзіцца ўставаць раней сонца, а ісці адпачываць, калі на небе загараюцца зоркі. І так дзень за днём.

У калгасе ніколі не было лёгка, асабліва — спачатку. Нямала цяжкасцей давялося перажыць. Але з часам разам з аднавяскоўцамі наладзілі вытворчасць, падрыхтавалі, выхавалі новыя кадры спецыялістаў, умацавалі дысцыпліну і парадак. З гэтым у Калінкіна вельмі строга, але — справядліва.

Год ад года раслі ўраджаі, радавалі вынікі жывёлагадоўлі. Сёння эканоміка гаспадаркі, як ніколі стабільная. Усе галіны працуюць з прыбыткам, ёсць свае грошы на развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы, будаўніцтва і рэканструкцыю вытворчых і сацыяльных аб'ектаў. Сярэдняя зарплата тут больш за тысячу рублёў, а чысты прыбытак сельгаспрадпрыемства па выніках 2017 года каля 3 мільёнаў рублёў.

10 Зак 2368

Рэнтабельнасць сельгасвытворчасці склала 23 працэнты. Гаспадарка фармірує палову валавога прадукту ў раёне.

У калгасе «Новае жыццё» і жывуць, і працуюць адзінай сям'ёй – з двума выхаднымі на тыдзень, праводзяць традыцыйныя святы, на якіх моладзь, перадавікі, ветэраны атрымліваюць падарункі і ад душы весяляцца. Лепшым навучэнцам школ, іх настаўнікам і бацькам ужо шмат гадоў плацяць стыпендыі. Таму многія выпускнікі застаюцца на малой радзіме.

Петрапаўлаўская царква, амфітэатр для святочных мерапрыемстваў, музей, магазін – усё ўзведзена сваімі сіламі і ў асноўным па сваіх праектах.

...У мінулым годзе падчас святкавання Дня Перамогі пасадзілі Сад Міру. Працягваецца будаўніцтва алеі Славы – там неўзабаве ўсталююць помнік, дзе будуць увекавечаны славутыя імёны ўраджэнцаў мясцовых краёў.

...За гэты час у Калінкіных выраслі дзеці, пажаніліся, з'ехалі з дому. Ды і яны самі пастарэлі, сталі не тыя, што раней... Асабліва цяжкія выпрабаванні выпалі на долю Васіля Васільевіча. У апошні час прычапіліся да яго хваробы, як п'яўкі. Тры разы выратоўвалі хірургі ад смерці. Нават абласная камісія МРЭК устанавіла яму першую групу інваліднасці. Але ён і слухаць пра гэта не хацеў. Адмовіўся. Маўляў, спакойнае, бестурботнае жыццё – страшней, чым смерць. І не адступаў ад свайго – пасля лячэння вяртаўся ў гаспадарку. Перад мужнасцю, кіпучай энергіяй і ініцыятывай адступалі хваробы. Яны не зламалі старшыню, а загартавалі. Кожны раз, калі выпісваўся з бальніцы, заўзята, з любоўю і настойлівасцю браўся за нялёгкую справу. Разам са сваёй камандай...

Шафёр лёгка тузануў за плячо шэфа і паведаміў:

– Васіль Васільевіч, мы ўжо ў Васільках. Вас куды?

– Вядома, дадому. А я, браток, задумаўся і не заўважыў, як хутка праляцеў час. Заўтра чакаю цябе ў шэсць гадзін раніцы. Трэба пабываць на жывёлагадоўчых комплексах. Бо мароз узмацніўся.

– Не беражаце вы сябе,– цяжка ўздыхнуў той.– Не падвяду, прыеду. Добрай ночы вам!

Падышоўшы да веснічак, старшыня прыпыніўся. Хацелася падыхаць свежым паветрам – разагнаць дзённую стому. Ноч была светлая, ціхмяна-задуменная. Ніводнага гуку – нямая цішыня. Мякка падаў сняжок. На небе мігцелі, нібы залатыя гарошыны, зоркі.

Васіль ціха адчыніў дзверы і толькі наважыўся шмыгнуць у спальны пакой, як раздаўся ласкавы голас жонкі:

– Вася, гэта ты?

– Я... А ты чаго не спіш?

– Чакаю цябе.

Алёнка заглянула ў прыхожую, паправіла халат, змахнула з ілба пасмачку валасоў, глянула на мужа і цёпла ўсміхнулася:

— Хваліся, даражэнькі, ці ўдачная паездка?

— Вельмі. У Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання вырашыў усе пытанні. А самае галоўнае — там адобрылі праект на ўзвядзенне новага комплексу на тысячу кароў. Праз два гады павінны здаць яго ў эксплуатацыю.

— Сваімі сіламі?

— Так. Гэта абыдзецца гаспадарцы ў шэсць разоў танней.

— Здорава! Ой, загаварылася! Распранайся, а я вячэру згатую. Трэба ж адзначыць твой дзень нараджэння.

Вочы яе свяціліся радасцю. Ён абняў жонку за плечы і ціха сказаў:

— Лепш давай, міленькая, заўтра. Прыедуць дзеці, унукі... А цяпер будзем адпачываць. Бо здарожыўся.

Доўгае жыццё разам навучыла іх разумець адно аднаго з паўслова. Абое змоўклі — бы і гаварыць не было што — і так да драбнічкі было кожнаму вядома.

Васіль патушыў святло, павесіў на крэсла святочны пінжак, на якім ззялі дзяржаўныя ўзнагароды, ад чаго стала святлей, нібы ў дом старшыні сярод ночы заглянула сонца.

10*. Зак. 2368

Рыгор Сарока

* * *

Утомленная за день, седая,
Спит спокойно деревня моя.
Петухи, петухов окликая,
Еще затемно будят меня.

И как в детстве когда-то, я, нежась,
Протираю глаза, а затем
Открываю окно и пью свежесть,
Несравнимую в жизни ни с чем.

А вокруг тишина штилевая...
Тихий стук у колодца ведра.
Лай собак – перебранка незлая,
Звездность неба и легкость утра.

И такая на сердце отрада,
Что поверить и сам я готов,
Что совсем я здоров и не надо
Мне уже никаких докторов.

Здравствуй, милая сторонка!

То березки, то сосенки
Машут мне со всех сторон.
Здравствуй, милая сторонка,
Мой Белыничский район!

На душе моей отрада,
Вновь в твоих пределах я.
Без тебя нет в жизни ладу,
Нет покоя и житья.

И нигде роднее неба
Нет над синью ивняка.
И нигде вкуснее хлеба
Я не пробовал пока.

Здесь, в обители родимой,
Сделал я свой первый шаг,
Повзрослевший, шел к любимой
С ясной радостью в очах.

Здесь меня встречала мама,
Ждал отец издалека
И звала к себе упрямо
Друть – красивая река.

Там, за мятными лугами,
Есть селение одно,
Где и я бродил часами,
Пил там воздух, как вино.

И, хоть все сейчас не просто,
А приеду – в сердце май,
Потому и до погоста
Не забыть мне родной край,

Где березки, где сосенки
Машут мне со всех сторон,
Здравствуй, милая сторонка,
Мой Белыничский район!

Друть

Приехав в деревню родную,
Стою на твоих берегах
И вместе с тобою тоскую
О наших далеких мечтах...

Оттоками рек ты полнела,
Луга заливая водой,
А нынче совсем обмелела
И стала почти что сухой.

Бежишь торопливо, сужаясь,
Без гордости давней и сна,
Как будто чего-то пугаясь,
По травам зеленым у дна.

И плачешь ночами в осоках,
На каждой знакомой версте
О чистых криничных притоках,
О теплой болотной воде.

Безумство – болот осушенье,
Великие наши грехи...
И боли твои, и волненья
Вошли в мою жизнь и стихи...

Віктар Хаўратовіч (1934—1991)

Радзіме

Ты – той разлог і тое неба,
Куды лячу, куды іду.
Ты – той ручнік, той бохан хлеба,
Што кожны дзень на стол кладу.

Ты – тая гонкая бярозка,
Што стала песняй і святлом.
Ты – тое поле, што за вёскай
Ільном у сэрцы зацвіло.

Ты – тая музыка, якою
Звініць ручай і гром грыміць...
Тваю бяду з маёй бядою
І радасць нашу – не размыць.

Са слоў тваіх радкі складаю,
З тваіх крыніц натхненне п'ю
І тваім голасам спяваю
Я песню шчырую маю.

Ключы

Не зачыняйце дзверы на замкі,
Не захінайце вокны шторамі,—
Няхай часцей заходзяць дружбакі,
Глядзяць у шыбы месяц з зорамі.

Няхай да вас, як промень, ідучы,
Заўсёды дабрыня ў сэрцы селіцца.
Ад шчасця вам перадаю ключы,
Што выкаваў я ў вогненнай мяцеліцы.

Дзеці вайны

Лёгкіх мы шляхоў не выбіралі,
Ды, напэўна, іх і не было.
Мы жыццё не з кніжак пазнавалі —
Нас яно па вогнішчы вяло.

Галадалі, мерзлі і хавалі
У рукаў сірочую слязу...
Дзесяць год, а з пеўнямі ўставалі
І кляпалі бацькаву касу.

Дзесяць год — мы за плугі ўзяліся,
Спасцігалі мудрасць баразён...
Каласы тугія наліліся
Важкім зернем першых працадзён.

На бялюткіх скрутачках бяросты
Мы не горш пісалі, чым цяпер...
Нам было нялёгка і няпроста
Весніць зрубы грукатам сякер.

За бацькоў — і сейбіты, і цеслі,
Толькі сёння нам як адкрыццё:
На плячах худзенькіх столькі неслі,
Што хапіла б іншым на жыццё.

* * *

А жыта ўжо не палавее –
Зноў асыпаюцца лісты.
Іду ў барвяную завею,
У шум бярозак залатых.

Іду праз непагадзь і слоту
У бедны ўжо на сонца дзень.
...Яшчэ не скончана работа,
Зямныя клопаты людзей.

А дождж у лужынах забулькаў,
Расплыўся золкім раўчуком...
Сама ў капцы не ляжа бульба,
Сам лён не стане ручніком.

Вятры на досвітку дыхнулі
Не летняй свежасцю – зімой.
Час неўзабаве падагуліць
Здабытак рупнасці маёй.

* * *

Ледзь неба зоймецца на дзень
І певень крыкне з ганку,
Сцяжынка зноўку павядзе
У шум вясёлы ранку.

Прамень успыхнуў на акне,
У лужынах палае...
Іду насустрач я вясне
І новы дзень вітаю.

На голым голлі сіняву
Вышэй бярозка ўзносіць.
Трапеча жаўранак:
– Жыву...
І поўніць песняй просінь.

І цэлы дзень гудзе шапа
І паласа для ўзлёту,
І шчасцем поўніцца душа,
І поўны дзень турботаў.

З нядаўніх выбегны завей,
Звініць ручай ля плота,
І жыць захочацца лацвей
І ўсё рабіць з ахвотай.

Друць

Ой ты, Друць-рака,
У якую даль
Праз лугі, лясы
Паплыла?
І пяе душа
Песню вольных хваль,
Што з тугі маёй
І святла.

Нада мной зара,
Неба яснае,
Дзень, як сонейка,
Дарагі.
Свецяць славаю
Непагаснаю
І легендамі
Берагі.

Ой ты, Друць-рака,
Плынь празрыстая,
Лодку дзён маіх
Панясла...
А любоў мая,
Радасць чыстая,
Даражэйшая,
Чым была.

Мікола Целеш

(1900–1975)

Твор

Урывак з аповесці «Курылка»

Вучыўся я лёгка.

Але часта і маўчаў на ўроках. І не таму, што не ведаў. Не! Я быў нясмелы і вельмі баяўся Курылкі. А вось ды не тое, ды не так, што тады будзе? Ну і дасць!

Аднаго разу, неяк перад нядзеляй, Курылка загадаў кожнаму вучню трэцяга класа, у якім быў у той час і я, напісаць свой уласны твор. Кожны павінен быў апісаць якое-небудзь здарэнне.

У той дзень я ішоў са школы ў задуменні. Жартачкі, напісаць твор! Увечары, як звычайна, на комінку трашчэлі смольныя карчы. Бацька плёў лапці. Маці прала кудзелю. Я сядзеў перад сшыткам на ўслончыку, часта падымаў галаву, паглядаючы на палаючы агонь, і запісваў свае думкі. Так нарадзіўся мой твор.

Назаўтра Курылка прышоў у школу, кульгаючы.

Курылка вельмі любіў пагулянкі. Бывала, перад святам пойдзе ён у мястэчка, дзе была воласць, двухкласная школа,— загуляе. Дзень няма, другі няма, на трэці – прыходзіць з сіняком пад вачмі, з перабітай рукой, рассечанымі вуснамі ці яшчэ з якой-небудзь адзнакай. У такія дні быў ён маўклівы і вельмі сярдзіты. Часцяком без ніякай віны ён збіваў тады вучня да страты прытомнасці.

Сёння Курылка быў у такім самым настроі. Пачаліся заняткі. Ён сядзеў ля свайго стала, паклаўшы нагу на нагу. Адна была ў боце, а другая ў тоўстай ваўнянай панчосе, паверх быў надзеты галош. Спачатку была арыфметыка. Потым чытанне ў іншым класе, потым гісторыя ў нашым, а потым Курылка пазяхнуў і патрабаваў сшыткі па пісьме. Мы падалі. Мусіць, у кожнага з нас, як і ў мяне, мацней, чым заўсёды, дрыжала ў гэты момант сэрца. Я адчуваў, што твор напісаў я складна, і таму яшчэ больш хваляваўся. Хутка Курылка паклікаў мяне. Я падышоў.

— Гэта ты пісаў? — запытаў.

Я заўважыў у яго вачах нейкія нядобрыя агеньчыкі і, ціха заікаючыся, адказаў:

— Я-я...

Настаўнік зірнуў мне у твар. Я схаваў вочы.

— Адкуль ты спісаў?

— Ніадкуль.

Я бачыў, як па твары Курылкі распаўзлася фарба.

— Ніадкуль?

Курылку, як відаць, мой адказ паказаўся абразай. Яго вочы ўтаропіліся ў мяне. Рукі задрыжалі. Кульгавая нага закалыхалася, як калода. Як так? Колькі разоў біў ён мяне, каб я адказваў яму ўрок, біў за пісьмо, за нескладнасць пры пераказе прачытаных твораў, а тут... сам пісаў! Хлусіць! Спісаў аднекуль! Але адкуль ён спісаў? Курылка не мог ведаць.

— Хлусіш! Ты спісаў! — крыкнуў ён на ўсю школу.

Я маўчаў, і стаяў перад ім, як на агні. Я не ведаў, што сказаць. Усе думкі павыляталі ў мяне з галавы.

Курылка схапіў мяне за вуха, моцна, як нажом, сціснуў пазногцямі. Я зморшчыўся, але не прараніў ні гуку, закусіўшы губу. Я ведаў, што, калі не сцярплю, будзе горш. Курылка рвануў вуха да сябе, сагнуў маю галаву.

— Глядзі, як дрэнна перапісаў! Дзве памылкі зрабіў на старонцы!.. Ну, гавары!

Закруціў маё вуха ўверх, зноў нахіліў галаву і стукнуў ілбом у тое месца стала, дзе ляжаў мой сшытак.

— Кажы, калода, адкуль спісаў?

Я зрабіў крок назад.

– Уцякаць?! – з жахам у голасе крыкнуў Курылка і, схапіўшы лінейку, стукнуў ёю аб стол. З-пад лінейкі ад удару пасыпаўся пыл. Аловак, што ляжаў на стале, падскочыў уверх і пакаціўся па падлозе.

Вучні скурчыліся, і, мусіць, у кожнага з іх заняло дух. Толькі Коля хіхікаў. Я сцяў зубы і яшчэ адступіў, адступіў інстынктыўна. Гэта, як відаць, яшчэ больш раззлавала Курылку.

– Ну?!

Я спалохаўся і вырашыў зманіць: хай не я напісаў! Хай спісаў, абы толькі не біў. Я ціха прашаптаў:

– Я ... пан настаўнік, спісаў...

– Ага, спісаў, пень! Адкуль спісаў?..

Я папаўся! Адкуль спісаў? Сэрца, я чуў, разрывалася. Слёзы душылі мяне. Адкуль я спісаў? Хто дапаможа сказаць, адкуль я мог бы спісаць? Што рабіць? У вачах пацямнела. У галаве зрабілася пуста. Толькі рукі Курылкі, яго твар, яго чырвоныя, недаспаўшыя вочы я бачыў да падрабязнасці.

– З кніжкі спісаў, пан настаўнік! З кніжкі...

– З кніжкі? А адкуль ты хацеў – са сценкі? Пень! З якой кніжкі?..

Курылка яшчэ раз стукнуў лінейкай па парце, а потым па маёй галаве. У вушах зазвінела, пацямнела ў вачах. Я захістаўся. Курылка рвануў мяне да сябе, закруціў вуха, але я ўжо нічога не чуў.

– Усё роўна! – мільганула адзіная думка.– Хай б'е.

Ногі аслаблі, гнуліся ў каленях. Курылка крычаў:

– Ах ты... Ах вы... Свінні! У свінушнік вас, у свінушнік...

Праз гадзіну я ішоў дамоў. Вушы гарэлі. Было крыўдна і сорамна за сябе. Мацвей сустрэў мяне ля сваёй хаты.

– Прыходзь увечары, будзем пускаць ваўчка.

І ён выняў з кішэні і паказаў мне гэтую цацку.

– Сам зрабіў?

– Сам!

Я здзівіўся і ахвотна згадзіўся прыйсці.

Васілёва ўдача

Я і хлопчык Васіль праводзілі выхадны дзень каля рэчкі. Дзень выдаўся цёплым, ясным. На дрэвах спявалі птушкі. У паветры, пераляўтаючы з краскі на краску, гудзелі чмялі і пчолы. Мітусіліся матылькі – белыя, жоўтыя, цёмнакрылыя.

Я ждаў на мху, наверх вады, яльчыкаў і дробных галавеньчыкаў, а Васіль дастаўляў мне мух, бегаючы па лузе і накрываючы іх лёгкай прадрыстай сетачкай. У абодвух быў занятак. І абодвум было прыемна.

Раптам Васіль, які лічыў сябе таксама рыбаловам і ўвесь час гаварыў: «Мы ловім рыбу»,— закрычаў:

— Тата, тата, а матыль табе не трэба?

Матыль? Лаві сам на матыля,— адказаў я, каб адчапіцца. Мне нельга было адвярнуцца: рыба дужа мітусілася каля мухі.

Васіль так і зрабіў. У яго была свая вудачка. На вудачцы быў лёгкі тонкі шнур з невялічкім кручком. Зачапіўшы сяк-так матыля на кручок, Васіль закінуў сваю вуду. Матыль паплыў па вадзе, варушачы крыллямі і лахматымі ножкамі. І ўслед затым каля яго з'явіліся касякі рыб. Тут былі ўклейкі, яльцы, плоткі, галавеньчыкі і пад'язікі. Усе яны сновалі ўзад і ўперад, падплывалі пад матыля, штурхалі яго насамі і зноў знікалі. Вада, здавалася, аж кіпела кругом.

А Васіль, прысеўшы на дыбачкі, глядзіць і чакае, калі яму трэба цягнуць. Раптам матыль знік. Няма матыля. Адарваўся ён ці што? І толькі Васіль хацеў спытаць у мяне, што за штука, як я паклікаў яго самога да сябе. Васіль уваткнуў сваё вудзільна ў бераг і прыбег да мяне. Потым, зрабіўшы тое, што я хацеў, ён зноў вярнуўся да сваёй вудачкі.

Але не паспеў Васіль узяцца за вудачку, як яе моцна шмарганула ў ваду. Што такое? Васіль аж спужаўся. Аглянуўся кругом. «Хаця б вудачку вярнуць»,— падумаў ён. Узяўшыся ямчэй, ён падцягнуў вудачку да сябе. І тады шнур яшчэ мацней пабег пад ваду. Потым неяк закруціўся, памчаўся пад бераг. Кончык вудзільна сагнуўся. Нібы гіра цяжкая да вудзільна падвешана; яна коціцца некуды ўніз і цягне за сабою шнур. Васіль ухапіўся за вуду абедзвюма рукамі.

— Тата, нешта цягне вуду ў ваду! — крыкнуў ён.

— Глядзі, не ўскоч хаця ў рэчку,— сказаў я, перасцерагаючы малога, і потым дадаў: — А ты цягні да сябе, да сябе...

Васіль, мусіць, добра паднатужыўся і пацягнуў вуду з вады, бо ў гэты момант пачуўся яго лямант:

— Тата, тата! Рыба вялікая... Ай, яй, ай... Вялікая!

Я кінуў сваіх мух, сваю вуду і яльчыкаў з галавеньчыкамі і пабег да Васіля. Калі я прыбег, па траве падскокваў уверх вялікі, прыгожы акунь. А Васіль, захоплены ўдачай, стараўся схапіць яго рукамі, але не мог. Рыбіна падскоквала, вырывалася, біла Васіля шырокім хвастом па носе і калола яго сваімі вострымі шыпамі, што на грэбні і ў плаўніках.

Калі я пачаў знімаць з кручка акуня, дык убачыў, што ў яго з пашчы відаць хвост другой рыбы. Як гэта магло здарыцца? Я дастаў гэтую рыбіну. У яе пашчы быў кручок з матылём.

Тады мне ўсё стала ясна. У той час, як я паклікаў да сябе Васіля, уклейка схапіла матыля. Трэба было цягнуць, але Васіль пабег да мяне. Уклейка засталася на кручку. У гэты момант блізка тут важна прагульваўся вялікі акунь. Убачыўшы ўклейку, ён праглынуў яе разам з кручком.

Вось так у Васіля ўзялася рыба і на матыля.

Над возерам

Скарочаны варыянт

Яны сядзелі пад магутнай разгалістай хвояй. Дзед Габрусь плёў з лазовых пруцікаў кошык, глядзеў у задуменні на зыбкую сінь возера, трымаючы на каленях разгорнутую кніжку, з якой ён рэдка калі расставаўся. Непадалёк ад іх дыміў невялікі касцёр, на вуголлі якога варылася ў чыгунку бульба. Калі агонь у касцёрчыку малеў, дзед Габрусь папраўляў галавешкі і падкладваў новае паленца.

Дзень быў не сцюдзёны, але дужа ветраны. Возера шумела і грукала хвалямі ў бераг. Над ім кружылі нейкія птахі, то ўзлятаючы высока ўгару, то стромка несучыся над самай вадой. Возера было апавіта зялёнай рамай маладога алешніку, ляшчыны, крушыны і чаромхі і з таго боку, дзе сядзелі дзед Габрусь і Сымонка, выглядала, як вялікае — на дзясяткі кіламетраў — люстэрка. За гэтай рамай, з супрацьлеглага боку ад дзеда і Сымонкі, віднелася пясчаная гара, якая не абраблялася пад якія-колечы сельскагаспадарчыя культуры, бо на ёй нічога не расло. Яна называлася ў народзе Ніжні Гарадзец. Такая ж гара, можа, праўда, крыху вышэйшая, была і на гэтым баку, недалёка ад сядзеўшых пад хвояй. Гэтая гара мела назоў Верхні Гарадзец. Возера было нібы схаванае паміж гэтых гор і яго нельга было ўбачыць ні з той дарогі, якая праходзіла недалёка ад Ніжняга Гарадца, ні з другой, якая ішла каля Верхняга. З трэцяга боку, крыху наводдаль ад возера, таксама на ўзвышшы, быў вялікі лес, магутныя сосны якога ўздымаліся, здавалася, аж пад самае неба...

— А яшчэ кажуць,— апавядае дзед Габрусь унуку,— што ўначы перад Вялікаднем на возера выплываюць царскія дзверы патануўшай тут царквы і на іх ярка гарыць безліч свеч, і анёлы прыгожа спяваюць «алілуя»,— так прыгожа, што хто пачуе, не можа крануцца з месца аж пакуль сонца не ўзыдзе...

Шмат чаго кажуць людзі пра былое, бо кніг тады пісалі мала — людзей такіх адукаваных амаль не было. Ну, можа, на тысячу вёрстаў

адзін, дык яно так і перадавалася ад аднаго да другога. Хадзілі па зямлі і такія спецыяльныя апавядальнікі, што трымалі ў сваёй памяці шмат вялікіх падзей, а як паміралі, перадавалі свае аповеды іншым...

Сымонка задумаўся і нейкі час маўчаў.

– Але вось яшчэ цікава, дзядуся. У Літні на ўзгорку каля страшэнных багнаў, глыбіню якіх зведаць ніхто не можа, час ад часу людзі знаходзяць кавалкі жалеза. І я адзін такі кавалак знайшоў, як коней там пасвіў.

– Гэта ты кажаш пра Печышча?

– Ну, пра Ліцень і пра Печышча. Дык што гэта там такое было?

Дзед задумаўся.

– Гэта сцвярджае, што наша сяло некалі было важным месцам: тут гналі з багнавай руды жалеза і лілі з яго зброю для абароны. Таму і доступ сюды з усходу быў загароджаны Гарадцом у тым месцы, дзе можна было перабрацца цераз возера, бо ў іншых багна не дазваляла...

...Бульба зварылася. Дзед зняў чыгунок з агню. Адцадзіў бульбу. Вымыў рукі, стаўшы над вадой, разгладзіў бараду і прамовіў:

– Ну, хадзем есці!

Але Сымонка быццам і не чуў – так быў узрушаны гаворкай з дзедам.

– Хадзі-хадзі! А то астыне, нясмачная будзе.

...Рыбу, разам з кошыкамі, дзед панёс прадаваць у мястэчка, загадаўшы Сымонку нарэзаць добрых пруцікаў на кошыкі і ні ў якім разе не браць човен. Пруцікаў Сымонка нарэзаў, але другога загаду дзеда не выканаў: сеў у човен і забраўся ў тыя ж сітнікі, дзе лавіў рыбу ўчора з дзедам. Плоткі, акуні і падлешчыкі браліся адзін за адным, і Сымонка не заўважыў, як бяжыць час і што робіцца наўкола. Раптам грукнуў гром, ды так блізка, што Сымонка аж уздрыгнуў. Узняў галаву. Хмара! Але невялікая. «Нічога, хутка пройдзе, яшчэ павуджу трохі»,– падумаў.

Але потым хмара неяк расплылася, выцягнулася, як гумавая, ва ўсе бакі, і аднекуль наляцеў вецер.

Трэба ўцякаць! Гарнуў ваду вяслом, раз-пораз пазіраючы ўгару. Хмара не разыходзілася, завалакла чорнымі гарбамі ўсё неба. Паліў такі дождж, што за пяць крокаў нічога не было відаць. Сэрца ў Сымонкі застукала моцна-моцна. І ў гэты момант ён успомніў пра патануўшы горад з царквой і пра царскія дзверы, што выплываюць на ваду перад Вялікаднем.

Раптам ударыў страшэнны пярун. Неба нібы захісталася і паехала ўніз. Сымонка ўвесь задрыжаў і страціў прытомнасць...

...Гарэлі кругом свечы – шмат свечак! Суровыя твары святых пазіралі з абразоў. Спявалі анёлы. І тут жа стаяў дзед Габрусь –ягоная сівая барада закрывала яму грудзі. І твар ягоны быў падобны на твары святых...

...Дзед Габрусь вярнуўся з мястэчка апоўдні. Сымонкі дома не было. Не было на месцы і вудаў.

Ад дому да возера было кіламетры два. Нягледзячы на старасць і стомленасць, дзед прайшоў іх хутка. ...І ў гэты час загрукацела над галавой. Наліў страшэнны дождж, які засланіў усё перад вачамі. Лавіна дажджу працягвалася хвілін пяць. Раптам у паўдзённай частцы неба хмара рассунулася і выбліснула сонца. І тады дзед угледзеў човен: ён плыў павольна да гэтага берага.

Сашчапіўшы далоні рупарам, дзед закрычаў:

–Го-го! Сымонка!

І тады хлопец узняўся над чоўнам і замахаў вяслом.

Янка Шарахоўскі

(1908—1973)

Першы заробак

Першай прыкметай вясны для нас, падлеткаў, быў прылёт гракоў на стары цвінтар. Крылатых гасцей мы з меншай сястрой Стаськай заўважалі адразу. Даволі было зірнуць з нашага двара цераз папоў агарод на празрыстыя верхавіны плакучых бяроз, дзе ўсю зіму чарнеліся маўклівыя грачыныя гнёзды.

Як толькі на цвінтары з'яўлялася крыклівае птаства, якое з надыходам цёплых дзён пачынала папраўляць і нанава будаваць жыллё, мы ўжо не маглі ўседзець у пракураных за зіму лучынаю хатах. З некалькіх суседніх двароў збіраліся вясёлай гурмой каля Нупрэевай прызбы, якая была на самым санцапёку і каля якой перш за ўсё раставаў вясной снег і падсыхала зямля. Яшчэ ў цяньку пад сценамі шарэў бруднымі лапікамі зляжалы снег і лёд і пасярод вуліцы яшчэ струменіў іскрысты ручаёк, а мы ўжо каля прызбы басанож скакалі ў класы, гулялі ў чыжыка і адсюль па некалькі разоў на

ні бегалі на цвінтар паглядзець, ці намнога павялічыліся пратаіны.

А калі на цвінтары прасыхаў парыжэлы дзёран, наша неўтаймоўная дзейнасць пераносілася туды. На цвінтары даўно ўжо не было магіл — яны зраўняліся з зямлёй. Цяжка было знайсці лепшае месца для нашых гульняў, чым вялікая паляна перад старой капліцай. Казалі, што даўнія часы тут стаяла драўляная царква, але за маёй памяццю ад яе засталося толькі некалькі камянёў з падмурка. Яна згарэла ў адзін з вялікіх пажараў. На змену ёй была пабудавана новая цагляная царква ў цэнтры мястэчка, а на цвінтары толькі паставілі невялікую капліцу. Паляна на месцы былой царквы была роўная, як ток. І не дзіва — яе дратавала кожную вясну не адно пакаленне такіх падшыванцаў, як мы.

На цвінтары было чым заняцца. Хто-небудзь цішком выцягваў з-пад лавы сякеру, і ёю мы рабілі на бярозах засечкі, праз саломіны піл з іх салодкі бярозавы сок. Лазілі на бярозы аж да грачыных гнёздаў, каб дастаць некалькі плямістых яечак. Бывала, дабярэшся да гнязда — а яно ж пад самай верхавінай, дзе ствол бярозы тонкі і ненадзейны, ды яшчэ і хістаецца ад ветру,— ашчаперыш гэты дубец нагамі, адной рукой улепішся за сук, а другой дацягнешся да гнязда і мацаеш у ім. а сам з вялікім гонарам і заміраннем сэрца пазіраеш уніз, на сваіх сябрукоў, якія глядзяць на цябе з захапленнем і зайздрасцю. А гракі налятаюць і крычаць гвалту: «Ратуйце, рабуюць!»

Тут мы гулялі і ў лапту, і ў палачку-стукалачку, і ў ворана, і ў таго ж чыжыка. Адны гульні мы лічылі толькі хлапецкімі, у другіх паблажліва дазвалялі ўдзельнічаць і нашым сястрычкам. Абы не крыўдзіліся. Прыдумлялі і гульню ў салдаты. Перанялі мы яе яшчэ ў немцаў, калі яны ў падкаваных галавастымі цвікамі ботах маршыравалі каля могілак. Мы прыбягалі глядзець, як яны аднолькава ходзяць, раптоўна паварочваюць, лажацца, устаюць. Але яны нас праганялі, і ад крыўды мы вельмі хутка злаўчыліся вытвараць тое самае, што і яны.

Час і цяпер быў неспакойны, усё яшчэ не сціхала грамадзянская вайна. Асабліва памятаецца, як Чырвоная Армія ішла супроць белапалякаў. Мы не раз бегалі цікаваць, як па галоўнай вуліцы мястэчка, спускаючыся з манастырскай гары, грознай плынню ішла за Друць пяхота — хто ў шынялі, хто ў паддзёўцы, хто ў чаравіках з абмоткамі, а хто і ў лапцях. Ішла з чырвонымі сцягамі, з музыкай, з песнямі, з воклічамі: «Даё-ош Варшаву!» Бывала, да таго наглядзімся, што і сну нам не было, усю ноч перад вачыма мільгацелі салдацкія ногі ды кацілісся двухколкі.

А яшчэ большае дзіва нам было, калі ў мястэчка наехала поўна мадзьяраў-камунараў у шырокіх сініх галіфэ і чырвоных мундзірах з жоўтымі шнуркамі. Гэта былі бравыя, часта рабаціністыя хлопцы, і коні ў іх былі прыгожыя, кавалерыйскія. Гаварылі яны тлумна, задзірыста, але што — мы аніяк не маглі зразумець. Таму, паразяўляўшы раты, з

вялікім здзіўленнем больш за ўсё слухалі іх вычварную, мудрагелістую лаянку. І як жа нам было шкада, калі праз які тыдзень пасля таго, як яны пайшлі на Бярэзіну, іх пачалі прывозіць назад забітых і параненых.

Не абмінулі ваенныя падзеі і наш цвінтар. Аднаго разу мы, малыя, гулялі ў палачку-стукалачку, а за капліцай вялікія хлопцы рэзаліся ў карты. Раптам з вуліцы на цвінтар з двума чырвонаармейцамі і з нагамі у руцэ ўзбег фарсісты ваенны камісар Гуліда — і ўсе ўтрох кінуліся лавіць карцёжнікаў. А тыя, не доўга думаючы, гайсанулі цераз паркан — ды хто куды ў жыта! А мы стаім, як ачмурэлыя: і вельмі цікава, і ад страху аж слёзы на вачах. Аказалася, гэта лавілі дэзерціраў.

Як толькі ўсё сціхла, мы зноў заняліся той самай гульнёй. Хаваючыся, я ўскочыў у капліцу, па кутняй сцяне ўскарабкаўся наверх і хуценька заваліўся ў застрэшша, якое было падшыта дошкамі. Думаў — вось знайшоў надзейную схованку, каб не застукалі. Заваліўся і адразу адчуў, што пада мной нехта ляжыць. З пакутлівым сполахам прыгледзеўся ў прыцемку і разабраў, што гэты нехта ў вайсковай гімнасцёрцы.

Тут мне ўжо было не да гульні. Я гоцнуў са сцяны ўніз ды пусціўся дадому. Хлопцы нешта крычалі мне ўслед, але я нічога не чуў. Прыбег ні жывы ні мёртвы, а маці пытаецца:

— Што з табой, дзетачка?

А дзетачка і сказаць нічога не можа — язык адняўся. Маці дала выпіць вады, і толькі тады я стаў адыходзіць. Нарэшце, заікаючыся, шэптам расказаў маці, як я лёг некаму на жывот, мусіць, дэзерціру. А хлопцам я толькі назаўтра прызнаўся, што са мною здарылася.

Для нашых продкаў цвінтар быў апошнім прыпынкам, яны сюды прыходзілі пасля жыццёвай дарогі. Для нас цвінтар быў перадатачнай станцыяй з маленства ў юнацкую сталасць. Як толькі хто з хлопцаў пачынаў прыкметна падрастаць, дык яму ўжо не было часу забаўляцца на цвінтары. Трэба было лезці на сталюгу, дапамагаць бацьку якую капейчыну зарабіць — пілаваць дошкі або, як толькі падсыхала зямля, станавіцца за плуг.

Але ж гэта прыходзіла пазней, гэта была ўжо заключная стадыя. Такі маладзён ужо і прычоску заводзіў, і стараўся юхтовыя боты займець, бо яму ж дазвалялася ў нядзелю ці ў іншае свята ўрачыста, як на абедню, прайсціся па вуліцы побач з дзяўчынай.

А да гэтага будзь шчаслівы, калі табе даверацъ несамавітую долю пастушка ці начлежніка. У пастушкі падацца — гэта было амаль што нічога. Паклаў у торбу акраец хлеба, а калі ёсць, дык і лустачку сала, пугу ў рукі — і айда. Ды і спакусы аніякай. Сядзі цэлы дзень дзе-небудзь на выгане пад плотам, і толькі ўсяго.

А начлежнікам стаць не так проста. Ты яшчэ толькі збіраешся ступіць на парог гэтага захапляльнага занятку, а цябе ўжо на ўсе лады палохаюць:

– Першы раз прыедзеш, дык мы табе пакажам. Пастарнак заб'ём і «каравую бабу» дамо.

Ну, пастарнак – гэта яшчэ туды-сюды, неяк перажыць можна. Усяго і страху, што знячэўку спатыкнешся ці бразнешся вобзем, як, прахапіўшыся ўначы, будзеш спяшацца да агню пагрэцца, не ведаючы, што цябе соннага за аборы ад лапця навязалі на вялікі калок, які потым увагналі ў зямлю. А вось як «каравую бабу» дадуць, дык гэта ўжо, мусіць, нікуды не варта. Ды і што гэта за ліха такое – «каравая баба»? Мабыць, нешта вельмі страшнае і брыдкае. Пачнеш выведваць, а з табой дражняцца:

– Яшчэ пытаецца, шчанюк. Вось прыедзеш, тады пабачыш.

Калі ты і не надта баязлівы, дык усё роўна пачынаюць мучыць сумненні: «А што, як і сапраўды не злітуюцца і па ўсіх правілах правядуць праз начлежніцкія цырымоніі?»

І кожны небарака ўжо думае: «Хай яно згарыць! Не буду начлежнікам». І амаль кожнаму не ўдавалася мінуць гэтае долі. Кажу «амаль кожнаму», бо толькі сынкам некаторых вясковых багатыроў не даводзілася вадзіць на начлег. Іхнія бацькі, шкадуючы сваіх хлопцаў, аддавалі вадзіць коней такім вось нішчымнікам, якім быў я.

Здарылася так, што я сам напрасіўся быць начлежнікам.

Я яшчэ быў малаваты, і ў тым годзе, пра які расказваю, бацькі не збіраліся выпраўляць мяне на начлег. Але з грачыным тлумам прыйшла вясна, сонейка сагнала снег, і ажыў наш дзіцячы клуб – цвінтар. Аднаго разу, неяк нагуляўшыся ўволю, прыбег я дадому і адразу да маці, якая сядзела каля печы за самапрадкай.

– Мама, дай хлеба, хочацца есці.

Маці спыніла самапрадку, замілавана паглядзела на мяне і са смуткам у вачах сказала?

– Няма, сынок, хлеба. Вунь на паліцы кавалак бульбяніка застаўся. Вазьмі з'еш.

Я ўзяўся есці той бульбянік і задумаўся. І былі мае думкі вось пра што: «А ці не мог бы я чым дапамагчы, ці не мог бы як-небудзь зрабіць так, каб быў хлеб і каб маці не смуткавала?»

Маці ўсё гудзела самапрадкай і час ад часу пазірала на мой наморшчаны лоб. Пасля запыталася:

– Ну, што ты сцішыўся? Можа, галава баліць?

Галава, праўда, у мяне балела, але не так, як думала маці. Яна балела за нашу беднасць, за тое, што ў нас нават аўсянага хлеба да новага не хапала. І, набраўшыся адвагі, я сказаў маці:

– Ведаеш, мама, я ў гэтым годзе павяду на начлег. І яшчэ чыйго-небудзь каня вазьму. За лета зараблю два пуды жыта. І яшчэ ляда ўзару, пасеем яравога. Тады нам, можа, да новага хлеба хопіць.

– Добра, сынок,– не стала спрачацца маці,– павядзеш і ляда ўзарэш.– А ў самой па шчацэ пакацілася сляза.

А вось, калі вясна з яе звонкімі жаўруковымі трэлямі ўжо ўсталявалася як мае быць і на лугах зазеляпела трава, я аднойчы прыцемкам разам з хлопцамі з нашае вуліцы так званай Шырокай дарогай першы раз схаў у стайню начлежнікаў — на Антонаў курган. Гэта быў кавалак кулі'ватай сенажаці, якая клінам удавалася ў мора хмызняку. З вясны ўтулі «занявольваліся», гэта значыць, ставілі на іх лазовыя віткі, каб адначыць, што тут забараняецца пасвіць скаціну. А на Антонавым кургане коні тайкліся ўсё лета і ўрэшце да таго яго здратоўвалі, што ён рабіўся голы, як бубен. Напрацаваўшыся за дзень, коні тут больш грызлі зямлю, чым траву. У гэтым я, уласна кажучы, разабраўся пасля.

А пакуль што з паленам дроў пад пахай, апрануты ў стары бацькаў кажух, я ганарыста сядзеў на рослым гнядым жарабцы Сымона Сінькевіча, а нашага шэранькага коніка вёў у повадзе. Падганяючы пяткамі каня, я стараўся трымацца адважна, але пра «каравую бабу» на ўсякі выпадак не забываў.

Прыехалі мы, папуталі і пусцілі коней, з прывезеных плашак раскладзі сярод куп'я агонь.

Адразу спаць ніхто не клаўся, балакалі пра ўсякую ўсячыну. Я слухаў розныя гісторыі і насцярожана дзівіўся, чаму мне ніхто нічым не пагражае. Так я слухаў, слухаў, а пасля сцішыўся і заснуў. Не паспеў уснацца, як раптам адчуваю, што нейкая неймаверная сіла некуды мяне валачэ. Я схапіўся за аброць, якая была прывязана за мае ногі, і спрасонку закрычаў:

— Т-пру, т-пру!

У адказ пачуўся рогат, і язда мая спынілася. Я працёр вочы і зразумеў, што сяджу сярод куп'я, далёка ад кастра. Сяджу і адчуваю: пасля праездкі па расе ўся вопратка мокрая. Што ты будзеш рабіць?

Пайшоў да кастра грэцца ды сушыцца.

Абсушыўшыся, пасядзеў пры агні і зноў лёг. Толькі мяне ўзяў сон, як чую — нехта таўчэ пад бок і злавесна шэпча:

— Ваўкі! Пабяжым ратаваць коней!

Я падхапіўся, кінуўся за цёмнай постаццю, што маячыла наперадзе, і раптам з усіх капытоў — бразь аб зямлю! Аказваецца — новая прыгода: забілі-такі мне пастарнак. З разгону я і зарыў носам.

Хапіла клопату, пакуль падкапаў ды выцягнуў той пастарнак. Зямля цвёрдая, хоць ты яе зубамі ўгрызі.

Нарэшце вярнуўся да вогнішча, грэюся. І тут мне таямніча паказваюць на майго аднагодка Сцёпку Пласконнага. Я гляджу, і смех мяне разбірае: яму вугалем намалявалі шляхоцкія вусы і клінаватую бародку, а ён і не шманае. Шматзначна пераглядаюся з прадымленымі начлежнікамі і радуюся, што не толькі з мяне пакпілі. Ажно потым заўважаю, што і на мяне неяк дзіўна пазіраюць. І той жа Сцёпка нешта загадкава ўсміхаецца. Тут я сцяміў, што і з мяне зрабілі дзедаў партрэт. Тады ўжо

адкрыта паказваю на Сцёпку пальцам і заліваюся рогатам, а ён у адказ
махае доўгім рукавом у мой бок і таксама смяецца. Пасмяяўся крывы
з пысага. На гэтым спектакль канчаецца. Мы са Сцёпкам заключаем
далюбоўнае пагаднение, і я яму сціраю з твару сажу, а ён – мне.

Спаць ужо не хочацца. Дзе там будзеш спаць, калі начлежнікі вунь
як расхадзіліся, і цяпер толькі сцеражыся, што яшчэ адпаляць якую-не-
будзь штучку. Трэба дацягнуць да раніцы, а заўтра ўжо можна будзе
спаць спакойна. Заўтра я ўжо не буду навічком, дзве ночы запар мяне
не будуць мітрэнжыць.

Вось так я і стаў начлежнікам.

Удзень дапамагаў бацьку ў полі, а ўвечары – на начлег. Улетку яно
нішто – ночы не халодныя, кароткія. Ды ёсць у начлежніцтве і сваё
хараство. Звечара, пакуль заснеш, прыслухоўваешся, як парыпвае ў
балоце дзяркач ці бубніць бугай, а раніцай, калі твая чарга глядзець,
каб коні не ўбіліся ў шкоду, радуешся трэлям салаўя або пераліўчатым
песням жаваранкаў. Увогуле, пакуль вадзілі на Антонаў курган, я не
меў вялікага клопату. А як выбілі ўшчэнт гэты папас ды пачалі ездзіць
за раку, тады для мяне настала сапраўднае гора. Сымонаў жарабец
быў няйначай, панскае пароды. Як толькі ўедзеш у брод, дык яму аба-
вязкова трэба прыняць ванну. Ляжа, падла, на самай сярэдзіне ракі,
а я тады, хапаючыся за грыву, усплываю ў кажусе ды армяку. Я ўжо
спрабаваў перад бродам перасаджвацца на свайго каня, хоць ён і быў
маленькі, а брод глыбокі. Дык жарабец, як лажыцца ў вадзе, мяне ўсё
роўна сцягне. Пусціць аброць няма як, тады гэтага шайтана няспута-
нага не зловіш – ляціць за кабыламі.

Да таго мне гэтае купанне абрыдла, што я ўжо і не ведаў, што рабіць.
Вялікая прыемнасць усю ноч прадаваць дрыжыкі, лежачы ў макроцці!
Я ўжо спрабаваў і з разгону пераязджаць брод, і лупцаваць шляхетнага
жаніха – нічога не дапамагала. Лажыцца, ды і годзе. А тут яшчэ Сымо-
ну пераказалі, што я каня б'ю, дык ён неўзабаве прыйшоў да нас дадому
сварыцца. Мне і перад ім няёмка, а перад бацькамі яшчэ болей: узяўся
за гуж, дык не кажы, што не дуж. Сам жа начлежнічаць напрасіўся.

Сымон не толькі насварыўся, ён выкарыстаў свой прыход, каб
даць мне дадатковую работу. А бацькі, паколькі я правінаваціўся, не ма-
глі яму адмовіць. Трасучы касмыляватай барадой, ён з уедлівай ласка-
васцю папрасіў, каб мяне адпусцілі дапамагчы яму забаранаваць бульбу.

У маці пачырванелі вочы, але ж пры нашым бясхлеб'і ёй удалечы
мірсціліся два пуды жыта, і яна сказала:

– Едзь з дзядзькам, сынок, паходзіш за бараной. Гэта ж, можа, не
так цяжка.

Я пацінуў плячыма ды падумаў: «Мне нічога няцяжка, але на-
вошта на чорта лысага працаваць? Ён і так багаты». А сказаць усяго
толькі і сказаў:

Добра, мама, паеду.

А яно і сапраўды Сымон Сінькевіч быў гаспадар багаты. Два надзелы зямлі ды яшчэ панаўшчыны добры кавалак адгарадзіў.

Нездарма, калі ў яго гады за два перад тым памерла жонка, дык неўзабаве знайшлася другая. Дваццацігадовая бежанка Марыся, чарнявая, прыгожая, не доўга думаючы, пайшла за яго, шасцідзесяцігадовага. Памрэ, дык гаспадарка застанецца, а з такім пасагам пару падабраць няцяжка.

Вось пяхай бы ўзяў з сабой Марысю, хіба яна зломак за бараной пратрэсціся? А то, хлопцы кажуць, як ідзе па вуліцы, дык толькі вачыма і стрыжэ.

Гэта ж аднаго разу я прыйшоў увечары жарабца браць; заходжу ў двор – ды пад адчыненыя ў хату дзверы. Зірнуў усярэдзіну, у прыцемкі, і не разабраць, ці ёсць хто там. На ўсякі выпадак пытаюся:

– Дзядзька Сымон, ужо можна браць каня?

Аж чую – ляціць стары казёл з ложка цераз усю хату пад лаўку. Гэта яна, мусіць, яго шыбанула. Я захінуўся за вушак, бо неяк няёмка было. Чакаю, што будзе далей. Ён, крэкчучы, устаў, падышоў у белых споднiках да парога, пацірае калені ды кажа:

– Бяры, сынок, я ўжо нікуды не паеду.

...Ну што ж, пабараную, калі ён дужа шануе сваю цацу. Няхай яна ўжо ўсмешкамі пабліскваe. Назаўтра прывёў я коней на досвітку, і паехалі мы ў поле. Сымон кошык пляце, а я бараную. Праходзіць паўдня, бульбу я забаранаваў, а рабоце не відаць канца.

Тут жа, за некалькі палос, ён, пасля таго як адсеяў ярыну, рэшткі гною вывез на Міцулішыну аблогу і ўзараў яе пад азімае жыта. Узараў, можна сказаць, без пары, баючыся, каб не перахапіў хто. А цяпер, балазе, я натрапіўся, і забаранаваць, хоць і занадта рана, захацелася.

Я адмаўляцца не стаў, але што мне крыўдна было: не дасць ні толкам паесці, ні перадыхнуць. Стараецца як найболей духоў выняць, не было б то хлапчанё чужое. І конь ідзе – аж селязёнка квокча, мне ўжо трэба за ім подбегам.

Ужо стала цямнець, а Сымон стаіць каля мяжы ды, калі я праязджаю каля яго, падахвочвае:

– Яшчэ трошку – цяпер, халадком, ён спакайней хадзіць будзе.

А я сабе думаю: «Сам ты такая ж ваўкарэзіна, як твой конь. Ці ты не бачыш, што мяне ўжо ногі не трымаюць, што я хістаюся, як бадылінка пад ветрам?» Гэтак спацыраваў якіх гадзін шаснаццаць узпар. А ўсё роўна намагаюся не паказаць, што ўжо ногі ўкарчанелі. І нанач не паехаў Сымон дадому, абы мяне не адпускаць. Бацькі ж маглі заўпарціцца і не даць мяне яшчэ дзень мардаваць. Заначавалі мы каля вогнішча, балазе, Сымон і армяк з кажухом не забыўся ўзяць.

Сымон, седзячы пры агні, смажыў надзетае на лазовы дубец сала і пры гэтым нешта бубніў мне, можа, што спагадлівае, але я не слухаў.

Мне лезлі ў галаву непрыязныя да яго думкі. Памятаю, я падумаў: «Чорнаў жмот, сала смажыць, а я слінамі сыт буду?» І я ўжо марыў, каб хто ўначы загнаў яму пастарнак, хоць бы я пасмяяўся. Але доўга марыць мне не прыйшлося. Умяўшы акраец хлеба з тоненькай лустачкай прэжанага сала, я неўзабаве заснуў. А як толькі пачало світаць, Сымон мяне ўспароў, бо, бач, зранку мала аваднёў. Трэба зноў было брацца за работу.

І зноў я хадзіў за бараной, як заведзены.

Я быў рад, калі Сымон надумаўся з'ездзіць дадому, праведаць жонку. Ён знік, а я сеў каля бараны на мяжы і толькі цяпер заўважыў, што сонца ўжо звярнула з паўдня і што дзень, па сутнасці, вельмі радасны і прыгожы, набліжаецца да вечара.

...Праз нейкі час на ўдзірванелай паміж каляінамі і добра ўезджанай палявой дарозе замаячыла пад высокай дугой калматая галава Сымонавага жарабца. Самога гаспадара і большай часткі калёс яшчэ не было відаць. Абапал каня толькі падтрэсваліся на гужах канцы аглабель ды пылілі ў каляінах пярэднія колы. Конь бег размашыстай рыссю, высока ўскідваючы грузныя капыты. У грывастай конскай постаці адчувалася прыгожая моц, і я мімаволі залюбаваўся імклівай яздой.

Толькі Сымон пад'ехаў да мяне і злез з калёс, як з мястэчка далятеў удар звона. Гэта было так неспадзявана, што мы з дзядзькам Сымонам трывожна пераглянуліся, сталі глядзець у бок мястэчка і прыслухоўвацца. Мы ўжо думалі, ці не прычулася нам, аж услед за першым ударам звон зноў скалануў паветра і зазваніў не сціхаючы. Жудаснае набатнае бумканне пакацілася над полем. Гэта званіў вялікі манастырскі звон, у які званілі толькі ў гадавыя святы. За гарой нам не было відаць мястэчка, але ў тым баку ў неба паплыла чорная хмара дыму.

– Пажар! – раптам здагадаўшыся, крыкнуў я і аж прысеў ад сполаху.

Сымон ураз зачырванеўся і зверавата зірнуў на мяне. Вопрамеццю кінуўся да калёс, азірнуўся і, вылупіўшы вочы, закрычаў на мяне:

– Чаго стаіш, ёлуп!

Сам, абапёршыся нагой на ступіцу, молада ўскочыў у перадок. Я схапіў сваю торбу і ўскаціўся на калёсы ззаду. Сымон апантана прашыпеў:

– Паш-шоў! – і мы памчалі. Конь нёс так, што калёсы не каціліся, а ішлі штуршкамі, ледзь датыкаючыся да зямлі. А Сымон у бяспамяцці ўсё паганяў канцамі лейцаў разгарачанага жарабца. І калі мы ў канцы поля выскачылі на ўзгорак, дык убачылі, што пад густой хмарай дыму, сярод чорных драбаў крокваў, доўгім радам гараць яркія агні. Палала цэлая вуліца, і якраз там, дзе стаяў наш дом.

З торбай у руках я прыскочыў з загумення ў дзедаў сад. Наша хата ўжо апала. Толькі сцірта дроў, якая ад саду займала ўсю сцяну, яшчэ стаяла.

11 Зак 2368

Бацька і маці, як непрытомныя, блукалі па садзе, збіраючы па-раскіданыя пажыткі. Усё, што засталося ад пажару, яны зносілі ў гумно, якое цяпер павінна было замяніць нам хату. Тут жа мітусіла-ся і замурзаная ў жар Стаська. Я ўзяўся дапамагаць ім, бо пачынала цямнець.

Праз нейкі час наша сям'я сабралася на прыгуменні, стомленая і прыгнечаная горам. Цяпер свет для нас быў вялікі і пусты.

Жыццё пасля пажару стала нецікавае. Прасіцца ў кватаранты да каго-небудзь не хацелася, і, карыстаючыся летнім часам, мы жылі ў гумне, як цыганы. Пакуль бацька выходжваў бясплатнага лесу на хату, якую трэба было паспець паставіць да зімы, дык быў злосны і часта сварыўся на мяне або маці.

Аднак у мяне ўсё ж была ўцеха. Як на прыгуменні ўзнімецца сварка, дык я цішком папрашуся ў маці, каб дазволіла збегаць паглядзець у лесе жыта.

Справа ў тым, што я выканаў і другое абяцанне, якое даў вясной маці. Разам са Стаськай, як толькі растаў снег і адтала зямля, мы ўзяліся расчышчаць нагледжанае ў лесе ляда. У бары было зацішна, цёпла, і мы дзень у дзень працавалі заўзята. Але якая маці ўтрымаецца, каб не дапамагчы дзецям? Праз некалькі дзён і яна была з намі. І пакуль да пачатку веснавых работ у полі бацька быў у заработках на руме, мы ўтраіх паскладалі галлё ў лаўжы і спалілі іх.

Больш за тыдзень мы, можна сказаць, жылі на лядзе. Пасля таго як прыбралі і спалілі ламачча, я ўзараў ляда. Спачатку справа не ладзілася, бо я першы раз узяўся за плуг. Але паступова ўцягнуўся, налаўчыўся і ўжо даволі роўна праганяў барозны.

Калі ляда было гатова, неяк раніцай бацька і я са Стаськай паехалі ў лес, і бацька пасеяў яравое жыта. Забаранаваць яго — гэта быў ужо мой клопат.

Жыта на лядзе ўрадзілася небывалае, дарма, што яравое. Высокае і ядранае, як кукуруза. Намалацілі мы яго ўвосень поўны засек. І колькі ж мне было радасці, што ў ім ёсць значная частка і маёй працы! Неаднойчы я крадком хадзіў у кладоўку і замілавана глядзеў на яго, перасыпаў у жмені.

У гэты час мы ўжо былі ў новай хаце, скласці якую нам дапамагла талака.

Час ішоў, і трэба было расплачвацца з пільшчыкам, які на пару з бацькам пілаваў дошкі на столь і падлогу, і са сталяром за вокны і дзверы, і з печкуром за складзеную ў хаце печ, і за шкло, і за шмат што іншае. Як расплаціліся з усімі даўгамі, дык зусім апусцеў засек, ды яшчэ і дзвюх апошніх авечак давялося прадаць. Засталося толькі тое, што знялі з паўнадзела. Перад зімой мы зноў згалелі так, што кожны пуд збожжа быў для нас вялікім скарбам.

...Ужо даўно скончылася начлежніцтва, і быў выпаў снег, але растаў, нарабіўшы гразі. Сымон, сустракаючыся з бацькам на рынку, упарта маўчаў пра аддачу майго начлежніцкага заробку, не зважаючы на тое, што мы былі пагарэльцамі. А ні маці, ні бацька не хацелі ісці да яго прасіць. Ёнар не дазваляў. Яно і праўда, хіба ён сам не ведаў, што трэба аддаць? Давялося мне ісці па заробленае, хоць і не вельмі хацелася.

Сустрэў мяне Сымон незадаволена, пачаў выгаворваць, нібыта я дрэнна вадзіў на начлег. Але, памуштраваўшы, усё ж пайшоў у клець. Там я паставіў прынесеную торбу, і ён насыпаў мне скупы пуд самага пазаднага жыта — напалову з пустазеллем. Я спачатку не хацеў браць, але ўспомніў нашу апусцелую кладоўку, а наперадзе ж была зіма, доўгая і халодная.

Ускінуўшы клунак за плечы, як прыбіты, падаўся з двара. Не сказаў Сымону ні дзякуй, ні бывайце. Ужо вельмі шкадаваў, што пайшоў сам спаганяць доўг. Хай бы лепей ішоў бацька. Можа, яму Сымон пасаромеўся б так аддзячыць і за начлегі, і за баранаванне.

Я ішоў вузкай сцежкай, нацянькі, па дне яра, каб мяне ніхто і не бачыў, а то яшчэ пачнуць распытваць, што такое нясу. Ногі мае слізгаліся ў бакі, і не таму, што торба з жытам такая ўжо была цяжкая, а таму, што мне сорамна было несці яе дадому. Хацелася кінуць у якую калдобіну.

Тая жабрацкая падачка ўсю дарогу муляла мне плечы, бо я нёс у сабе вялікую крыўду за нялюдскую скнарнасць і прагнасць.

11*. Зак. 2368

Рыгор

ЯЎСЕЕЎ

(1942—2004)

Незалежны Яўмен

Ура! Ура! Ура! Ура!
Прыйшла Яўменава пара!
Ура!
Яўменаў час прабіў,
І незалежнасць ён здабыў.
Яўмен развёўся,
І ўжо ён
Не сыдзецца да скону дзён.
Асобны ён заняў пакой,
І піва там
    цячэ ракой.
І хоць купайся ў віне —
Ніхто цябе не папракне.
Сядзіць вясёленькі Яўмен
Пасля жыццёвых перамен,
У гастраном яшчэ карціць...
Ну, як яму ў мазгі ўвінціць,
Што там жыццё бурліць спаўна,
Дзе ёсць жанчына хоць адна...

Сны

Кума Ліса,
Праныра-прахіндзейка,
Адпетая махлярка
і зладзейка,
Сустрэлася з кумком
Ваўком,
Што сябраваў са сквапнасцю,
Маною...
— Бяда са мною,
Мой кумок...
— Хіба ўжо новы
На куратніку замок?
Ці іншы вартаўнік
Са стрэльбай новай?
Не разумею,
Што з табой, кума?
— Ніякай радасці няма,
Сон бачыла я надта лапуховы:
Забралася ў куратнік,
Так вярзлося.
І што тут пачалося!..
Цыбаты,
Тлусты певень наляцеў,
Ён зматлашыць мяне хацеў.
А куры заклявалі,
Засмяялі...
Прачнулася —
Ляжу,
Дрыжу...
Мой гэты сон
Не к добраму, скажу...
— Бяда чакае, кумка, і мяне:
Авечка хвост мне
Адгрызла ў сне...
Грызе-грызе,
Есць — не наесца...
На месцы ж хвост!
Дык сэрца ж не на месцы.
Прачнуўся —
Рады,

Што жывы,
А страхі
Не выходзяць з галавы.
Куды сябе ад іх утоіш?..
Хто думае пра што —
Таму і сніцца тое ж.

Б'юцца пеўнікі

Б'юцца пеўнікі,
Б'юцца нягеглыя:
Маюць погляды
Процілеглыя.

Петушыцца адзін:
— Я — заслужаны!
Голас мой,
Куры ведаюць,
Луджаны.

Выступае другі
Фанабэрысты:
— Голас мой ляціць
Аж за тры вярсты...
Недарослікі пеўнікі —
Ворагі,
Гонар,
Слава ўласная
Дорагі.

Хай у пеўняў
Жыве задавацтва,
А навошта
На ніве мастацтва?

Свіснуў рак

Па-над рэчкаю гара
Строма вісне,
На гару забраўся рак,
Ды як свісне!..
Стала ўсё наадварот –
Аж разявіў скептык рот.

Паімчаў на працу бэйбус,
Перагнаў трамвай,
Тралейбус,
Абібок абліўся потам,
Сорам знішчыў абармота,
А ўчарашні бюракрат
Чулым стаў,
Нібыта брат.
Не азмрочыў радасці
Брак са знакам якасці.
Між увішных гандляроў
Не сустрэнеш махляроў.
Крытыкуе шэфа хто –
На курорты ездіць той...

Па-над рэчкаю гара
Строма вісне,
На гару забраўся рак,
Ды як свісне!..

Кепска толькі,
Што не рак,
Што я сам
Прысвіснуў так.

Цар-пажар

Ёсць у свеце цар-пажар,
Ненасытны гэты цар,
Дужа злосны,
Ён страшэнны,
Ён разбойнік,
Ён машэннік.
Добра ведаем яго мы.
Гэты цар усім вядомы.
Біўся з ім я
Сам не раз,
Пра яго тут
Мой расказ.

Пляшку пейкае бурды
Хлебануў Пілін,
гады
Лёг з цыгаркай на тахту.
Цар-пажар быў тут як тут.
А Пілін?
Храпе Пілін.
На хаўтурах мы былі б...
Хтось дымок з акна углядзеў
Хутка збеглася суседзі,
Аблілі вадой Піліна,
Зацягнулі ў краніву,
А Пілін вачыма лыпаў,
Мацаў нос і галаву.
Так Пілін застаўся цэлы,
Хоць парткі на ім згарэлі.

Вось Пілін падаўся ў лес.
Вось у лесе.
Вось палез
На запалкі...
Вось касцёр...
Вось ярчэй ад зыркіх зор
Іскры сыплюцца на мох,
На іглінку,
На былінёк...
Цар-пажар сюды з'явіўся,

Дым густы да неба ўзвіўся,
Цар дужэў,
Гуляў,
Шалеў,
Бор зялёны ўсюды млеў.
Млелі дрэвы,
Млелі травы,
Цар спраўляў свае забавы.
Сыты быў тут люты шкоднік,
І разбойнік,
І нягоднік.

Бульбу,
Чай варыў Піліп,
Еў бы, піў,
І мы пілі б,
Ды з'явіўся цар-пажар
Да Піліпа твар у твар.
Газ Піліп не адключыў,
Цар яго і правучыў.

Прасаваў Піліп штаны,
Каб глядзеліся яны,
Прас не выключыў
і зноў
Ён застаўся без штаноў.

Зазлаваў Піліп на жонку:
— Дзе схавала ты скарбонку?
Ведай, сквапных не люблю,
Хату, шэльма ты, спалю!
Плача бедная кабета:
— Піліпок, зіма ж — не лета,
Не палі, Піліпка, хату,
Хоць усю бяры зарплату.

Мне не верыш,
дык у Ганны
Запытай, мой паважаны,
Скажа вам яна,
што дзетак,
Дураслівых малалетак,
Нам адных пакінуць нельга:

12. Зак. 2368

Цар-пажар прымчыцца мельгам,
Праглыне і двор, і хату
Прагны, злосны цар пракляты.
І дзяцей ён, гэты злыдзень,
Не шкадуе, калі прыйдзе.
І кароўнік,
І авечнік
Хіжы цар бесчалавечны
Языком чырвоным зліжа
І пакіне попел рыжы.

А Піліп?
Ці ж ён цвярозы?
Хіба ж мае дзядзька розум?
Ён – слуга цара-пажара,
Хоць яго страчала кара.
Трэба біць яго па карку,
Як закурыць ён цыгарку
Ля бензакалонкі дзе,
Бо няшчасце прывядзе.
Хто ўсумніцца?
Пастаянна
Так сцвярджае
Цётка Ганна.

Голасам сэрца

12*. Зак. 2368

ВІТОЛЬД БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ

(1872—1957)

Над вечным спакоем

Кожны народ мае асоб, якія, быццам зоркі, асвятляюць шлях нашчадкам і напаўняюць іх жыццё духоўнай энергіяй. Для беларусаў такім чалавекам-зоркай з'яўляецца народны мастак Беларусі і Расіі, акадэмік жывапісу Вітольд Каэтанавіч Бялыніцкі-Біруля.

Нарадзіўшыся ў сям'і небагатага шляхціца ў бялыніцкіх Крынках, Вітольд Каэтанавіч надзвычай арганічна паяднаў у сваім сэрцы і бацькаў рэалізм, што найперш адпавядаў высокім прынцыпам справядлівасці, праўдзівасці, і матчыну летуценна ўзнёслую, песенную рамантыку. Спалучыў у сваёй чулай душы любоў да зямлі і любоў да неба. І з трапяткой далікатнасцю і святасцю пранёс яе праз усе перыпетыі свайго нялёгкага жыцця, захаваўшы ў сэрцы сваім і ва ўчынках сваіх да апошняга ўздыху.

Чыстае святло энергіі душы ніколі не памірае і не згасае, не знікае ў касмічнай прасторы. Яно ўвесь час з намі і вакол нас. Як

нябачнае паветра, што шалясціць лістотай маладзенькіх бярозак на непаўторных пейзажах Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Юнаком ён выбірае шлях вайскоўцы і паступае ва Уладзімірскі (г. Кіеў) кадэцкі корпус. Там жа шчаслівая зорка (думаецца, зусім не выпадкова) зводзіць яго з мясцовымі жывапісцамі. Ацаніўшы здольнасці юнага кадэта, разгледзеўшы ў яго вучнёўскіх малюнках сапраўдны талент, яны знаёмяць Вітольда з кіраўніком вядомай ва Украіне малявальнай школы Мікалаем Мурашкам, дзе будучы акадэмік і атрымлівае пачатковыя ўрокі жывапісу.

Як чалавек дэмакратычных поглядаў, Мікалай Мурашка блізка сышоўся з членамі найвядомейшага тады Таварыства перасоўных выстаў. Асабліва цесныя сувязі са школай устанавілі маскоўскія перадзвіжнікі. Уплыў апошніх на вучняў гэтай школы вызначаўся яшчэ і тым, што многія з іх працягвалі сваё далейшае навучанне ў Маскве, адразу ж патрапіўшы там у духоўна блізкі асяродак. Заўважым, што такім самым шляхам і пад такім уплывам уваходзіў у вялікае мастацтва і Вітольд Бялыніцкі-Біруля, які пасля малявальнай школы прадоўжыў адукацыю ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства.

У час свайго станаўлення як творцы і асобы, а гэта перыяд вучобы ў вышэйназваным вучылішчы (1889–1896), Вітольд Бялыніцкі-Біруля блізка сышоўся з перадзвіжнікамі Мікалаем Неўравым, Сяргеем Каровіным, Іванам Пранішнікавым, Ісакам Левітанам. Засваенне іх багатага мастакоўскага і жыццёвага досведу адметна паўплывала на фарміраванне густу, стылю і светапогляду Вітольда Каятанавіча. Пад іх уплывам ён зразумеў, што пейзаж, эцюд, карціна толькі тады становяцца сапраўдным творам мастацтва і набываюць высокае гучанне, толькі тады глыбока кранаюць душу чалавека, хвалююць яго розум і душу, калі колерам і тонам фарбаў перадаюць праўду жыцця і само жыццё. Менавіта перадзвіжнікі дапамаглі яму стаць паслядоўным рэалістам, прывілі пачуццё адказнасці за сваё мастацтва.

Карціны Вітольда Бялыніцкага-Бірулі звярнулі на сябе ўвагу яшчэ з традыцыйных штогадовых вучнёўскіх выстаў. Невыпадкова адну з яго вучнёўскіх работ – пейзаж «З ваколіц Пяцігорска» – набыў для сваёй славутай ужо тады галерэі Павел Траццякоў.

Першы значны поспех у творчай біяграфіі маладога мастака прыпадае на 1901 год, калі яго пейзаж «Вечныя снягі» адзначаецца залатым медалём Каўказскай выставы. На замежных мастацкіх выставах 1911 года карціна «У час цішыні» атрымлівае залаты медаль у Мюнхене, а пейзаж «Перад вясной» – бронзавы ў Барселоне.

Пасля заканчэння вучылішча В. Бялыніцкі-Біруля вяртаецца ў Беларусь, дзе пражыве восем гадоў. А яшчэ праз восем гадоў ён набудзе ўчастак зямлі на беразе возера Удомля, што ў Цвярской губерні, і там пабудуе сваё славутае лецішча Чайка, з якім будуць непарыўна звязаны ўсе наступныя гады жыцця мастака да самай яго смерці.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі мастак імкнецца ўвяўляць сваю творчую працу з грамадска значнымі падзеямі, што адбываліся ў жыцці савецкай краіны: заснаўвае Свабодныя дзяржаўныя мастацкія майстэрні на сваім лецішчы Чайка, удзельнічае ў рабоце аб'яднання мастакоў «Ізограф», уваходзіць у Асацыяцыю мастакоў рэвалюцыйнай Расіі.

В. К. Бялыніцкі-Біруля з'яўляецца і пачынальнікам савецкага мемарыяльнага пейзажа. Цыклы пейзажаў «Горкі Ленінскія», «Пушкінскія мясціны», «Дом Чайкоўскага ў Кліне», краявіды Яснай Паляны ствараліся ім на працягу ўсяго яго творчага жыцця.

Адметная старонка біяграфіі выбітнага мастака — шматлікія падарожжы (1930-я гады). Ён наведвае Запаляр'е, Данбас, рэгіёны Цэнтральнай Расіі, дзе стварае серыі пейзажаў, у тым ліку і індустрыяльных, што экспанаваліся на яго юбілейнай выставе і Усесаюзнай выстаўцы «Індустрыя сацыялізму».

У гады Вялікай Айчыннай вайны Вітольд Каэтанавіч з групай мастакоў працуе над стварэннем патрыятычнай панарамы «Абарона Царыцына», з'яўляецца кіраўніком «Салона» мастацкага фонду, прымае ўдзел у дзвюх значных выставах: «Сямі старэйшых савецкіх мастакоў» і «Вялікая Айчынная вайна».

Знамянальным для яго стаў і 1947 год, калі 75-гадовы юбілей жывапісца шырока адзначаўся грамадскасцю савецкай краіны. У Маскве з гэтай нагоды прайшла выстава, на якой быў шырока прадстаўлены ўвесь творчы шлях майстра лірычнага пейзажа. Вітольду Каэтанавічу прысвоілі званне народнага мастака Расіі, ён быў выбраны правадзейным членам Акадэміі мастацтваў СССР, узнагароджаны другім ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Значнай падзеяй для яго была і паездка на радзіму, што здзейснілася ў тым жа 1947 годзе. З вялікім натхненнем ён стварае цыкл кранальных пейзажаў «Беларусь».

«Я шчаслівы, што ў канцы жыцця хадзіў па роднай зямлі ўласнымі нагамі...» — узгадваў крыху пазней Вітольд Бялыніцкі-Біруля ў лісце да свайго малодшага сябра і вучня, маладога беларускага мастака Антона Бархаткова.

Вітольд Каэтанавіч меў дадзены Богам талент пейзажыста-лірыка. Мы глядзім на яго карціны і не можам не захапіцца іх падзвычай тонкім, прачулым лірызмам, таямнічым святлом, нябесным колерам... Здаецца, чуем саму цішыню прыроды, слухаем пранікліваю паэзію вясны ці восені, захапляемся гімнам жыццю і маладосці, які спявае кожнае дрэўца, кожны кусцік і кожная кветачка.

Інтымна-лірычнае ўспрыманне прыроды як жывой субстанцыі, з усімі найтанчэйшымі яе адценнямі, музычнай складанасцю тональнай гамы, і ёсць насамрэч выразная адметнасць мастакоўскага стылю В. К. Бялыніцкага-Бірулі.

«Прырода абуджае ў чалавека розныя па сваім характары пачуцці і перажыванні,— падкрэсліваў Вітольд Бялыніцкі-Біруля.— Розны стан у жыцці яе па-рознаму адгукаецца ў душы».

На яго думку, сапраўдны мастак павінен валодаць здольнасцю «зразумець, адчуць прыроду, здолець падслухаць яе гаворку...».

І яшчэ адна цытата. «Мы, мастакі,— любіў паўтараць Вітольд Каэтанавіч,— павінны даражыць кожнай гадзінай, праведзенай на прыродзе, на эцюдзе. Калі нават эцюд застаўся няскончаны, праца над ім не была марнай для мастака... Надзвычай важна першае ўражанне ад мясціны, якую збіраешся пісаць. Гэтае ўражанне неабходна захаваць, утрымаць на час усёй работы над эцюдам».

Вітольд Каэтанавіч пісаў прыроду ва ўсе поры года. Але найбольшая колькасць яго твораў прысвечана адлюстраванню пераходных перыядаў, калі ўсё зменліва, рухома, дынамічна. Вясна і восень ці не самыя любімыя поры года мастака. І асабліва – раннія...

У 1950-я гады, ужо цяжка хворы, Вітольд Каэтанавіч напіша напоўненыя аптымізмам, паэзіяй і хараством пейзажы-роздумы, пейзажы-ўспаміны: «Дні юнага мая», «Дні майскіх навальніц», «Поўдзень палярнай восені»...

Ён вельмі любіў жыццё і даў людзям вялікае шчасце глядзець на прыроду яго вачыма, бачыць у ёй тое непаўторна-зменлівае, што хвалюе і прымушае мацней любіць Радзіму. Яго творчая спадчына з'яўляецца каштоўнай школай патрабавальнага і глыбокага майстэрства, а кожная карціна – гэта пранікнёная лірычная навела аб роднай прыродзе, на ўлонні якой пастаянна адбываюцца цуды незлічоных пераўтварэнняў, што дораць гледачу новыя пачуцці і перажыванні.

Нястомны працаўнік, натхнёны мастак Вітольд Каэтанавіч пакінуў у спадчыну (памёр 18 чэрвеня 1957 года) больш за тысячу карцін і эцюдаў. Яго цудоўныя творы знаходзяцца ў многіх музеях Беларусі, краін СНД. У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі калекцыю эцюдаў і завершаных карцін Вітольда Бялыніцкага-Бірулі складаюць больш за 460 твораў, якія адлюстроўваюць усе перыяды яго мастакоўскай дзейнасці. У раённым мастацкім музеі, які носіць імя знакамітага земляка-пейзажыста, знаходзяцца 27 работ, напісаных Вітольдам Каэтанавічам.

Памяць выдатнага мастака XIX–XX стагоддзяў ушанавана ў назвах Бялыніцкага раённага мастацкага музея, мясцовай дзіцячай школы мастацтваў, Цяхцінскай школы, вуліц аграгарадка Цяхцін, Бялынічаў, Магілёва і іншых населеных пунктаў. У Магілёве дзейнічае музей В. К. Бялыніцкага-Бірулі, у экспазіцыях якога найбольш шырока і поўна прадстаўлена жыццё і творчая спадчына нашага земляка. У цяхцінскіх Крынках на стромкім беразе Друці ўстаноўлены мемарыяльны знак.

Таленавіты чалавек, як правільна заўважаюць, таленавіты ва ўсім. Вітольд Бялыніцкі-Біруля, апрача карцін, пісаў апавяданні і вершы.

Некаторыя з іх друкаваліся на старонках тагачасных расійскіх часопісаў. Адно з апавяданняў і прапаноўваецца ўвазе чытача.

Міхась КАРПЕЧАНКА

Лисья охота

Тихо в избе. Лунный свет сквозь переплет оконца ложится на пол, скользит по печке, тараканы шуршат по стенам, кое-кто храпит. Яков кашляет, Шмель, проснувшись, а вернее и не засыпая, ворочается, вздыхает – наконец говорит:

— Яков, а Яков, мотри, не пора ль будить охотников, пока самовар, а там покуль справятся, да покуль доедем, и время; аль нам раньше, а ни апосля, как думаешь?

— Братец ты мой, неужели нам оттуда за охотниками ехать, нам только, аккурат, управиться обложить, а вот буде им к Кобыльему мосту приехать, ну то ладно будет.

— А братец ты мой. Ну, что ты баешь? Ну, что ты ее привязал у Кобыльего моста? Эка чудак, прости господи, она со вчерашнего гону не знамо куда дунула.

— Ну, куда же она, окромя мха,— сказал Яков.

— А я те говорю, вздумает и ляжет на чистом пустыре, ты ей не указ.

— А я те говорю – на чистом не ляжет, стрелена она, – поднял палец, сказал Яков. Шмель соскочил с лавки.

— Тьфу ты, неча, брат, меня учить, ляжет, где вздумает.

В это время отворилась дверь, и вошел сын Якова, Иван.

— Иван,– сказал Яков,– я баю, что вечерошняя лисица ляжет во мху у Кобыльего моста.

— Ей только там и должно лечь,– ответил Иван. Это Шмеля окончательно вывело из себя. Он плюнул на пол, обул валенки и вышел из избы. Недолго он отсутствовал, дверь отворилась, и волны морозного воздуха ворвались в избу.

— Охотники, неча спать, сон что богатство: чем больше спишь, тем больше хотишь.

Шмель начал зажигать лампу. Я не спал, Степаныч (художник-анималист А. С. Степанов) отрывисто покашливал и закуривал папиросу.

— Шмель, нá папироску да успокойся, где найдете, там и будет лисица,– сказал успокаивающим голосом Степаныч.

— Знамо, там будет,– ответил Шмель.– Я говорю, флаги все собирать надо, а Яков говорит – много, неча зря таскать.

– Ну ладно, берите все,– согласился Яков.

Самовар кипит, Алена принесла молока, яиц, простокваши, уселись со Степанычем и всей братией, пьем чай. Шмель озабоченно вслух думает: «Ехать через деревню Киселиху аль через пустошь Соснуху?»

– Я бы ладил через Соснуху,– сказал Яков.

– Во, я про то и баю. А то в Киселихе оглядят.

– Эка, братец ты мой, а я флаги окурил в бане и в мешки положил, никто их и не увидит глазами. А через Киселиху нам как рукой подать до Кобыльего моста.

– Я не поеду через Киселиху, я там от длинной межи прямо пройду,– решительно сказал Шмель. Потребовалось мое примиряющее вмешательство.

– Едем все через Соснуху,– решительно сказал я.

Чай допит. Утро, светло. Медленно большими хлопьями падает снег.

– Вороны грают, будет непогода,– сказал Яков.

– Знамо, будет, всю ночь поясницу так и резало. Все равно, как лубятил кто спину,– молвил Шмель.

Итак, едем к Соснухе, у Белоховского болота перерезаем вчерашний след лисицы.

– Во яна, леший ее дери,– кивнул Шмель,– где дунула... Тихонько пошла, глянь, так задом и путает. Верно, Степаныч ей вчера подсыпал.

Въезжаем на Соснуху. Заросли. Снегу много, лошади бодро бегут и фыркают. Доезжаем до Кобыльего моста – выхода нет. Яков многозначительно кивает Шмелю, что лисица здесь.

– Что там баить,– замечает Шмель.– Ты постой еще, она еще, черт ведает, куда своротит.

Решено охотникам посидеть у Кобыльего моста, у лесного сарая Шмеля, а Яков, Шмель, Иван, Петька пойдут на лыжах и возьмут по катушке флагов. Тронулись, зашуршали мягко лыжи. Впереди Шмель, сняв саржаник, в пестрой домотканой рубахе с красным шарфом на шее. Яков закуривает трубку и показывает Ивану, где резать оклад. Иван жует черный хлеб и, улыбаясь, показывает на Шмеля. С глаз исчезают окладчики. Мы уселись в розвальнях со Степанычем. Он молчит, наблюдает лошадок, охотников.

– Мне перевидать все нужно,– говорит он.– Очень интересно, эта буланенькая лошадка, дуга зелененькая, так мягко и гармонично на фоне снега.

Вынимает альбомчик и зарисовывает. Проходит час, другой. Наконец, тяжело дыша, бежит на лыжах Иван.

– Зафлажили вчерашнюю во мху, у Кобыльего моста. Ну, надо сряжаться, а то очень оклад велик, боялись, чтобы не подшуметь. А когда станете на номера, тогда и срезать можно будет.

Едем, — горошинно Иван поглощает. Подали вижу злую ленту леса, ярко выделяющуюся на сером фоне леса и на белом пухлом снегу. Степаныч, свою шапку, покачивается в нее, чтобы не спутать. Подбегает Шмель, сгибаемся и перрыли, второй Степаныч.

Ну, Петька, а Петька, смотри, жди свой край, — сказал деловито Шмель, высморкался перстами и начал приводить в порядок свой гуалет. Закончив это, подошел ко мне и шепотом сказал:

Ну, как думали, ладно помера, аль нет? Ведь леший ее знает, надо быть ей туда, а там пойди, иди, куда дует. Знаешь, как в Кинопшие того раз дунула, и флагами не удержать было. Ну ладно, будет, так не упустите, не шерной.

Подошел к Степанычу, что-то шепотом сказал ему, отчего Степаныч начал капелять в шапку, едва сдерживая смех.

Ну, поглядывайте, я, как выйду, так и погоню, тетонько пойдем, пусть тихонько средет, а на этой шестине ты со Степанычем ее и смыкаете.

Шмель пошел шерсвалку, оправляя бечеву лапеса, ярко маячившую на одинковой лещине хвойного подсада елей. Тишина, тишина, только попискивает синичка.

Белка перепрыгнула с ветки на ветку, обронила комья снега и скрылась в дупле большой ели. Как прекрасно, томительно ожидание гона зверя! Воображение рисует появление то у того, то у другого дерева, сердце радостно замирает, глаза жадно смотрят в глубь леса.

Яков, — улавливает слух. — Гон, пошел, а та, та, та...

Вижу, мелькнула лисица, подняв трубу, и тихонько пошла обратно в оклад. Признак плохой.

Вот она, Петька, не пускай, та, та, та... держи, прорвет.

Замешательство, сплошь отборная ругань, и слух улавливает: «Упла, проклятая...»

Начинают собирать флаги. Шмель нечестово ругается, плюет; Петька молча переносит, чувствуя свою невольную вину.

Эка ты, братец, — говорит Шмелю дядя Яков, — не привяжешь. Уж на что я соблюдал свой край, а ведь проклятая проскользнула, и не воротишь, да, братец ты мой. Петька ее шапкой так и тронул, а ведь стерва, знать не знает, бежит, куда надумала.

Тьфу ты, прости господи, чего там бать, аль я не вижу, что тут вышло, — сказал Шмель и, злобно чмокнув, сплюнул.

Никак я не мог успокоить бушевавшие страсти Шмеля, он был грозен и неумолим.

Ну, ладно, братец ты мой, — сказал Яков, — и лисица-то махонькая, вот что ты третьего дня в Кинопшие упустил, вот то лисица была большущая, вот ту жаль до страсти.

Последняя укоризна вывела Шмеля окончательно из себя.

– Ты и во сне столько лисиц не видел,– сказал Шмель, гордо взглянув на Якова,– сколько мы с Виталием третьего года убили. Неча, братец ты мой, срамить, без меня, брат, толку ни разу не было. Неча ляскать зубами зря.

Степаныча душил смех.

– Петька, наматывай флаги на катушку,– подавленным голосом сказал Шмель.

– А что, еще не поедем к Киселихе? – спросил Петька.

– Неча зря ездить,– сказал Шмель,– толку не будет.

Яков заявил, что флаги надо окурить вересячком в бане, без этого веры нет. Ну, флаги смотаны, садимся все и едем лесом. Пахнет хвоей, лошади бойко бегут по наезженной дороге, фыркают, бренчит кольцо дуги. Въезжаем в пустошь. Мелколесье. На березках видны силуэты тетеревей. Как ни старались, но сшибить не удалось – все благополучно улетели.

Наконец подъезжаем к деревне Киселихе. Остановились у избы Пантелея. Шмель зашел воды попить.

– Эка,– выйдя из избы, сказал Шмель.– Пантюшка сядни у Долгих Логов видел лисий след, говорит, свежохонький.

Вышел и сам Пантюшка.

– Правда, что видел свежий след? – спрашиваю я.

– Сейчас, на месте мне помереть, свежохонький, поезжайте – недалеко от дороги на Пучашно прошедши.

Итак, едем в Долгие Лога. Мысленно рисуем себе крупную лисицу. Приезжаем в Долгие Лога, подъезжаем к Пучашнинской дороге. След, указанный Пантюшкой, вне всяких сомнений, собачий. Это обстоятельство вывело Шмеля из себя.

– Дурак ты, Пантюшка, холодная башка,– сказал обозлившийся Шмель.

– Ну, ладно, погода хорошая, не замерзли,– сказал я.

– Да что же, нам дома места нет, а мотаться день зря надоть,– ответил Шмель.

Наконец приехали в деревню Качалово к дяде Якову. Тепло в избе. Кот забрался на печку – к морозу чувствует.

– Ишь, братец ты мой, сколь понимает животина погоду,– мудро изрек Яков.

– Мишка, а Мишка, перепряги кобылу да свези Виталия домой,– властно распорядился Яков.

Через четверть часа, миновав занесенные снегом избы, я ехал перелесками к дому, и образы Шмеля и Якова, этих простых людей и страстных охотников, знающих тайны природы, не отходили от меня.

Алег

Плиндоў

Осколок

Шинель моя не сохранилась.
И не сберегу я вещмешок.
А сколько с ними приходилось
Мне колесить в войну дорог!

Мне возвращает это память:
Она ведь прошлому верна.
Война до гроба будет с нами
Осколком в памяти она!

Васіль Дзеравяшка

* * *

Не баюся ні звягі, ні крыку,
Абміну траекторыю кулі...
Калі ж некалі змоўкну і знікну,
То шукайце мяне ў Запакуллі.

Сэрцам чую радню без сумневу,
Успамінаў нахлынулі хвалі.
Пакланюся тут кожнаму дрэву,
Дзе буслы буслянят калыхалі.

На дзяжу з партызанскай зямлянкі
Вышываны ручнік засцілаю,
Прад вачыма – маленства прысмакі:
Чорны хлеб ды з цыбуляю сала.

На дэсерт з нестарэючых вулляў
Дастаю залацістыя соты,
Каб хапіла ўсяму Запакуллю
Шанавання, любві і пяшчоты.

Размова з выраем

Што ўстрывожыла ключ жураўліны?
Кліч завоблачны сэрцам лаўлю.
Самалёты, суцішце турбіны,
Дайце птушкам паслухаць зямлю.

Адклікаюцца дрэвы і хаты,
Водар пожні і подых агню.
Парушаюць раўненне салдаты,
Позірк кідаючы ў вышыню.

Немаўлятка з утульнай калыскі
Усміхаецца іх галасам.
...Толькі строгія абеліскі
Не адказваюць журавам.

Чаўны лотаці

Халадам вясну не запалохаць:
Беларусь любуецца з сяла,
Як у лузе, між кустамі, лотаць
Жоўтымі чаўнамі паплыла.

Гэта значыць, зноўку лета будзе!
Над Радзімай, нібы над Царквой,
Пахрысціў крыламі божы бусел
Неба дабравешчанскі сувой.

Раніцы святочнае дзівацтва...
Ведаю, мой вольны, мілы птах,
Адцвіло далёкае юнацтва
Лотаццю на весніх паплавах.

Некалі заплачуць воскам свечкі
У ячмень халодны і буйны,
Поп-экзарх памоліцца пад вечар
На сухія лотаці чаўны.

Папараць-кветка

Не спыніць, не суняць, не стрыножыць –
Менш на ўдачу, а больш на бяду
Мяне мчыць па жыцця бездарожжы
Апантанасці дзікі табун.

Падуладны высокім нябёсам,
Ён маўклівы і верны, як цень:
Мо таму над скапычаным лёсам
Сціпла папараць-кветка цвіце.

Я зрываю яе асцярожна
Загрубелай, халоднай рукой...
Не спыніць, не суняць, не стрыножыць
Што было і што будзе са мной.

Абуджэнне

Над маўкліваю вёскай аблокі
Абяцаюць грыбныя дажджы...
Дом бацькоўскі, такі адзінокі,
Спахмурнеў на апошняй мяжы.

Яшчэ чэпка аконныя рамы
Абдымаюць халоднае шкло,
У якім ад вачэй маёй мамы
Засталося святое святло.

Без яе – занядбаныя градкі
Ўжо не рады цяплу і дажджу...
Паспяшаю сюды без аглядкі
І з рыдлёўкі ачышчу іржу.

Дарагія, пяшчотныя, мілыя,
Хлебасольныя назаўжды,
Вы, вясковыя хаты маўклівыя,
Абуджаеце гарады.

* * *

Дом пад лінамі. Маці сівая.
Сцяг чырвоны сцяну агулій:
Гэта бацькава памяць жывая,
Асвятляюць кумач медалі.
У пару залатога цвіцення
Не пустой уступае зямля:
Ёсць глыбокая праўда насення,
Ёсць нягучная песня мая.

Ала
Войлакава

Чырвоны васілёк

Нібы сама вясёлка
Уплецена ў вянок.
Свет роднага прасёлка
Наўкол у красках лёг.
Спявала ціха жыта,
Таіў вякі быльнёг...
Адкуль такое дзіва –
Чырвоны васілёк?
Ля кветкі ў захапленні
Спынілася далонь.
І не было здзіўлення –
Яно пазней прыйшло.
Ці сон прыгожы гэта,
Ці явы даўняй плён?
Чаму агеньчык-кветка
Мне шле цяпло з тых дзён?
...Яму не паўтарыцца,
Хоць і заве здалёк
Мяне маё дзяцінства –
Чырвоны васілёк.

Крынкі

Бялыніцкі-Біруля...
У Прыдруцкіх Крынках.
Дзе кожны краявід
Сутчны з цішынёй.
Адчуеш сэрцам.
Кожнаю крывінкай
Святую еднасць
З роднаю зямлёй.

Сюды, толькі сюды
З далёкае Удомлі
Душа ляцела
Кнігаўкай заўжды.
Каб толькі тут
З крыніцы жывацворнай
Глыток зрабіць
Гаючае вады.

І над мальбертам
Схіленая постаць
Перад чым адтаць
Свае таленты пакаіў.
Зладзе Крынкі
Заняўшае лотань,
Вітаючы
Блакітную вясну.

Размова пра мову

— Ганна, ты ж у сына
У горадзе жыла,
Чаму па-гарадскому
Казаць не пачала?
— Людзі, я ж чужога
Зроду не ўзяла:
Сваю гаворку маю,
Што маці мне дала.

Бялынічане, бялынічанкі!

З той легенды часоў,
Што пра белыя ночы,
Ёсць куток дарагі
Нашай белай Русі,
З якім сэрца маё
Расставацца не хоча,
І ад шчырай душы
Вам жадаю я ўсім:
Бялынічане, бялынічанкі –
Мае сябры вы і землякі!
Няхай вам шчасце
Нясуць світанкі
На бераг мілы Друці-ракі.

Будзе вечна дарыць
Радасць талент прачулы –
Кожны твор мастака
Захапляе людзей.
Над Удомляй гарыць
Зорка ярка Бірулі –
На палотнах яго
Лотаць наша цвіце.

Веру ў заўтрашні дзень,
Што нягоды, як хмары,
Па-над роднай зямлёй
Больш не будуць кружыць.
Хачу з вамі дзяліць
І трывогі, і мары,
Разам з вамі жыццё
Недарэмна пражыць.

Міхась Радоўскі

(1948—2011)

* * *

Ступішы за парог радзімай хаты,
Бяры сынок, усе, чым дом багаты:
Пяшчоту, добрыню любімай маці,
Мужчынскую разважлівасць ад бацькі
Спатрэбяцца ў дарозе, як ніадзе,
Адданасць і павага да людзей.
Бяры, сынок, усе, чым дом багаты,
Ступішы за парог радзімай хаты,
Каб праз гады сваяго ты сына змог
Праводзіць — не справадзіць — за парог.

Восеньскія пажары

На балотах журавінавы пажар –
Восеньскі апошні шчыры дар.
Паўз дарог пасля дажджоў рабых
Не згасае полымя рабін.
І нічым ужо не затушыць
У лясах прыдруцкіх верасы.

* * *

Стары калодзеж,
Ты сваёй вадзіцы
За доўгі век свой
Многім даў напіцца,
Але прыйшла пара
Зусім другая,
І вёска, дзе стаіш ты,
Адмірае.
І хто адкажа:
Год ці дваццаць пяць
Табе, калодзеж,
Смагу наталяць?

Антон Шчырыца

* * *

Ранцой сцюдзёнаю вадзіцай
Гвар абдам і выйду за гарод
Небаскіт, асветлены зарніцай,
Завіхурыць думак карагод.

Загарланіць певень галасісты,
Зарыпіць калодзеж-працаўнік,
Пошчак пуг, пастуховы свісты,
Да якіх з маленства я прывык.

Гаспадар з касой ідзе павольна.
Праглынуў яго туман рачны.
Песня сталі зрэжа навакольле
Ападуць крышталікі расы.

Удыхну празрыстае паветра,
Развяду я рукі ў бакі,
І падхопіць радасць подых ветру,
Радасць у абуджанай душы.

* * *

Пакідае наш край чарада журавоў,
Шэрым клінам пранізвае даль.
Адлятаюць ад нас да чужых берагоў,
Бо наладжвае восень свой баль.

Залатым канфеці раскідала лістоту,
Гучны джаз барабаняць дажджы.
Горкі кліч журавоў, што навеяў самоту,
Пакідае наш край аж да самай вясны!

* * *

З усіх бакоў, дзе плёскат чуўся,
Бягуць кругі у небыццё.
Чарот ля берага хіснуўся
І шэпча пра сваё жыццё.

Рачная даль, залітая туманам,
Мяне прыцягвае загадкай таямніц.
Сухое лісце дружным караванам
Плыве насустрач полымю зарніц.

ВОЛЬГА ДАНІЛАВА

Трыялет

[illegible]

* * *

Жнівень. Вечар. Зорка
Горкі смак рабіны.
Ліры летуценні
Сэрца паланіні.
Загарэўся месяц
У святліцы ночы
Жнівень. Вечар. Зорка
За зямлёю сочаць.

Пралескі

Вясна на зямлі крывічоў...
Разводдзе. Раздолле. Крык чаек.
У ціхім лясочку я зноў
Пралескі, пралескі шукаю.

Па травеньскіх травах бяжыш ты,
У зёлках купальскіх блукаеш,
Рвеш стомлена спелыя вішні,
А я ўсё пралескі шукаю.

Пакрыецца снегам зямелька,
Ты будзеш адчайна гукаць
Мяне сярод снежнай завеі –
Я ж буду пралескі шукаць.

13. Зак. 2368

Павел Данілаў

* * *

Да вясны схаваны фарбы
Чорна-бялы зімы.
Толькі ты мінаюць марны,
Ноч — дзіўная турма.

І на небе хуткапыннае
Хмары гоніць вецер.
А маёй душы настылай
Марыцца аб лете.

Зімовая ідылія

Лёгка падаюць сняжынкі,
Апускаюцца на дол.
Белай пудраю сцяжынкі
Зацярушаны вакол.

Апранулі срэбра дрэвы,
Дахі снегам замяло.

Полых белай каралевы
Размалёўвае акно.

І пад промнямі усходу
Ты зімовы бачыш сад.
Цуды вечныя прыроды,
Як і шмат гадоў назад.

Уладзімір Серыкаў
(1929—2011)

* * *

На фото я смотрю через года,
На друзей, ушедших навсегда.
Детства друг — рыжеволосый Петя —
Разорвало бомбой в сорок третьем.
На опушке, за деревней Стайки,
Схоронили мы его останки.
Юности дружище — Глеб,
Поэт кудрявый,
Пал в бою за Днепр при переправе.
Над высоким берегом немым
Схоронили лиру вместе с ним.
В вихрях жизни с новыми годами
Довелось прощаться вновь с друзьями.
И у каждой горестной могилы
Их надежды вместе хоронили.
Но о них, ушедших навсегда,
Не хороним память никогда.

13*. Зак. 2368

Тишина

Солнце закатилось за [illegible]
В звонкой роще начало [illegible]
Задремала хитрая [illegible]
Спрятались под [illegible]

Все чернее неба [illegible].
Смолкли птицы, речка [illegible]
Заблудилась в роще тишина.
Не найдет ни тропок, ни [illegible]

Віктар Сухараў

(1936—2018)

Вабіч

Не абдымай лун чужыя,
Мая спакойная рака
Не абяцай вялікай шыры,
Ні паўдушы, ні палыгка.

Не заглушай у птушак родных
Пявучых звонкіх галасоў.
Не аднімай ад шчок халодных
Далоняў цёплых берагоў.

Прымі маё ад сэрца слова,
Пяючны вабіцкі паток.
... Цябе праславіў роднай мовай
Настолькі я, наколькі змог.

У гаі

Выйду ў гай зялёны
Раняю вясной.
І стаю ўзлюбёны
Пад густой сасной.

Тут гамоняць шумна
Вершаліны дрэў.
І наводзіць думы
Мне птушыны спеў.

Слухаю бясконца
Пошчак салаўя.
Гай з усходам сонца
Пакідаю я.

Аляксандр Караленка

(1927—1999)

* * *

Не оставлю я в наследство
Своим детям крупных сумм.
Пусть им светит солнце детства
Да пытливым будет ум.

Чтоб они воспринимали
Мир таким, каков он есть.
В жизни чтоб не растеряли
Правду, гордость, совесть, честь.

Чтобы Родину любили,
Как свою родную мать,
И чтоб счастливо все жили
Я хочу им пожелать.

Святлана Магілеўчык

Народжаны ў аўторак

Аўторак, 16 снежня

— Значыць так,— словы загадчыка гематалагічнага аддзялення падалі, як цяжкія камяні.— Спіртнога — ні-ні! І піва, і цыгарэты пад забаронай! Нічога нельга,— звярнуўся ён да мужчыны гадоў каля пяцідзесяці, які сядзеў, уцяўшы галаву ў плечы, і ціха бубніў сабе пад нос:

— Як жыць? Як жа мне жыць?

— Як і ўсе жывуць,— падавіў лёгкую насмешку ўрач.

— А сэнс, доктар? У чым сэнс такога існавання? — узняў на яго цяжкі позірк пацыент.— Раптам мяне чэрві з'ядуць?

— Не гавары глупстваў! Цемрашальства нейкае,— сурова спыніў яго доктар.— У цябе рак, даражэнькі. Ан-ка-ло-гі-я! І аперацыю рабіць позна.

Мужчына цяжка задыхаў. Выцер спацелы лоб.

— Будзем рабіць усё магчымае, каб працягнуць табе, Васіль, жыццё. Шпіталізуем. Хімія-

гэрапію — абавязкова! — Доктар пераклаў некалькі паперак.— Ай-яй! Вось ты, здаровы мужык, а так папаў. Праўду кажуць, ад лёсу не схавешся.

— Колькі я пражыву, Анатоль Сцяпанавіч? — з надзеяй у голасе спытаў пацыент.— Праўду мне скажыце.

— Невядома, як будзе паводзіць сябе твая хвароба,— адказаў доктар.— Можа, месяц, можа — тры, можа — паўгода. Зараз я паклічу медсястру, яна адвядзе цябе ў палату.

— Не хачу паміраць! — З мужчынам раптам здарылася істэрыка. Ён падскочыў да доктара, ухапіў яго за грудкі.— Я хачу жыць, разумееш, доктар? Ты павінен вылечыць мяне! — ліхаманкава затрос чалавека ў белым халаце.— Я ж нікому нічога не зрабіў! За што ўсё гэта?

У пакой забеглі санітары, прыціснулі мужчыну да падлогі, зрабілі ўкол. Доктар спакойна, нібы нічога не адбылося, паправіў адзенне, павольна паслабіў гальштук.

— Яму жыць засталося максімум два тыдні,— ціха сказаў ён прысутным.— Аналізы не падманваюць.

Серада, 17 снежня

Каб не празрыстая трубачка кропельніцы, прымацаваная да левай рукі, то можна было падумаць, што Васіль патрапіў у бальніцу выпадкова. Пасля ўчарашняга ва ўсім целе панавала незразумелая слабасць. А тут яшчэ жонка прыйшла, галосіць, як па нябожчыку. Налаяўся на яе апошнімі словамі. Прагнаў. Каб мог падняцца, дык яшчэ б і кухталя «выпісаў». Гэтая кропельніца, здаецца, намёртва была да яго прымацавана, таму сцішыўся, паляжаў крыху, потым агледзеўся па баках. Палата, куды яго размясцілі, была невялікай, на два месцы. Суседні ложак займаў малады чалавек. Ён пільна глядзеў на Васіля, і той аж ніякавеў ад яго позіркаў.

— Вось... Ляжу тут... Прывязаны...— пачаў ён нясмелую размову.

— Навошта вы так са сваёй жонкай? — спытаў сусед.— Ці заслужыла яна такія словы? Вы ж чалавек, а размаўляеце з ёй як са скацінай.

— Табе якая справа? — агрызнуўся Васіль.— Яна — баба, ёй не зашкодзіць.

Сусед не адказаў нічога, адвярнуўся да сцяны. Як мужчына ні спрабаваў завязаць гутарку, малады чалавек не адклікаўся і не паварочваў галавы.

— Ат, няхай сабе крыўдзіцца,— падумаў Васіль.— На пакрыўджаных ваду возяць...

14. Зак. 2368

Чацвер, 18 снежня

Суседа зранку некуды вывезлі. Пахмурная санітарка збірала яго немудрагелістыя рэчы і ўпічувала Васіля:

— Адной нагой на тым свеце, а падманваць не развучыўся. Хлопец не размаўляў зусім, хаця анеранцыю зрабілі. Рак горла. Не жылец адразу было відаць.

Васіль мог набажыцца, што ўчора яны размаўлялі. Ну, не прысніла ся ж...

Санітарка выйшла, а мужчына пачаў напружана думаць, што пара рабіць ногі з гэтай «шарашкі». Ён яшчэ здаровы, а адлежвае бакі на казённай пасцелі. Пераадольваючы слабасць, падняўся, але не зноў прайсці і пару крокаў, з цяжкасцю апусціўся на суседні ложак. Гэта стан арганізма насцярожваў і страшыў. Апошні раз ён ляжаў у бальніцы... Ды ніколі не ляжаў. Рэдкі кашаль або тэмпературу лячыў проста — гарэлкай. Ды ці ж ён п'яніца? На карачках не качаўся, заўсёды прыходзіў на сваіх дваіх. З жонкай, і праўда, не пашанцавала: плача баба па любой прычыне. Раней за гэта кухталёў мог надаваць. А цяпер сын за мамку заступацца стаў. Вырас, шчанюк. Няхай, вось памрэ ён, тады не будзе перад кім свой спрыт паказваць. Штосьці замуліла пад бокам. Ён выцягнуў нейкую брашурку, што, пэўна, засталася ад суседа, разгарнуў, пачаў чытаць. Цьфу! Нейкая брыдота напісана! Што жыццё — Божы падарунак і яго трэба берагчы. Дабярогся. У грудзях мошна зашчымела, дыхаць стала цяжка. Навошта яно, такое жыццё? Нашто мучыцца?

Васіль неяк дасунуўся да акна. Там, за бальнічнай агароджай, некуды спяшаліся людзі, бегалі, перакідваючыся снежкамі, дзеці. Жыццё працягвалася, бурліла шумлівым ручаём. Ад бездапаможнасці, ад жалю да сябе Васіль заплакаў.

Пятніца, 19 снежня

Зранку самаадчуванне стала зусім дрэнным. Акрамя слабасці і млявасці, пачала ныць спіна, ногі сталі нейкімі чужымі, ледзь падняўся. Затое ўвесь дзень быў адзін. Ніхто, акрамя маўклівай санітаркі, якая прыносіла яму паесці, не адчыніў дзвярэй у палату.

— Дарма насварыўся на жонку,— падумаў Васіль.— Так хаця б яна прыйшла. А цяпер і падзецца некуды. Падохнуць ад суму можна.

На вочы папалася ўчарашняя «боская» кніжка. Разгарнуў яе і пачаў чытаць першае, што патрапіла на вочы.

— Ты задуманы па маім жаданні, ты — унікальны. Ты — любімае маё дзіця! — гаварылася ў кнізе.

— Любімае, а як жа,— з'едліва ўсміхнуўся Васіль. І раптам падумаў: а ці любіў ён каго-небудзь сам? Бацькоў? Яны працавалі ад цямна да

цямна і на яго мала звярталі ўвагі. Жонку? Яшчэ каго? Сына за што любіць? За тое, што на бацьку руку падняў? А хто яго, Васіля, любіў? Маці, хіба што. Калі ў армію адпраўляла, то плакала. Грошы на вяселле цішком усунула. І хату яны з бацькам набудавалі ім добрую, а самі ў халупцы прагаравалі. А калі не стала бацькі, то з пенсіі капейку не-не, дый падкіне яму. Жонка любіла. На святы, хоць і набярэцца ён пад завязку, а ўсё адно падарунак зробіць, дробязь нейкую, але ж прыемна было. Сын і той, калі малым быў, прыносіў яму адзнакі ў дзённіку, паказваў. На працы сябры паважалі... Канешне, было за што... Хто, як не ён, мог адной левай прыўзняць машыну або перагнаць на іншае месца цяжкія плугі.

З вачэй зноў градам пакаціліся слёзы.

Субота, 21 снежня

Васілю было вельмі дрэнна. Учарашні вечар і ноч прайшлі як у кашмары. Боль быў нясцерпны. Здавалася, што нехта разрывае яго цела знутры. Ён паспрабаваў выклікаць медсястру, каб укалола яму што-небудзь, але з горла вырваўся толькі хрып. На Васіля нахлынула цэлая хваля невясёлых думак. Няўжо так проста ўсё скончыцца? Няўжо ён такі слабы чалавек, што дзьмухні — і рассыплецца як пыл. А родныя? Паплачуць крыху, а потым будуць жыць далей, як жылі. І ніхто не ўспомніць. Таму што не зрабіў нічога добрага. Увогуле нічога не зрабіў, проста праіснаваў. Васіль праглынуў даўкі камяк.

— Рана мне яшчэ паміраць,— курчачыся ад болю, падумаў ён.— Я не дрыжачы асінавы ліст, а чалавек. Бог, калі ты ёсць там, на небе, дапамажы! Ты ж сам казаў, што маё жыццё — найвялікшая каштоўнасць. Я глядзеў толькі сябе і нічога не бачыў навокал. Мне няма больш на каго спадзявацца.

Нешта цяжкае і чорнае навалілася на яго. Ён адпіхваў гэта рукамі, змагаўся, пакуль зусім не выбіўся з сіл. У вачах стала цёмна-цёмна. Раптам усё скончылася, боль некуды знік, усталявалася проста аглушальная цішыня. У палату зазірнула нясмелае зімовае сонейка. Яго прамені пабеглі па Васілёвым твары, па сценах... Чалавек заўсміхаўся. Жывы!

Аўторак, 30 снежня

Спалатнелая медсястра сядзела ў кабінеце загадчыка аддзялення і нервова выцірала слёзы.

— Не ведаю, як гэта здарылася,— апраўдвалася маладая жанчына.— Тамара Францаўна, наша санітарка, дагэтуль у шоку.

— Я і сам, прызнацца, не магу прыйсці ў сябе,— сказаў доктар.— Усе былі ўпэўнены, што яго забралі дадому. Памятаеце, як ён страсянуў мяне тут, калі даведаўся, што ў яго анкалогія?

"4" Зак 2368

Такі жорсткі чалавек,– ціха прамовіла медсястра.– Нашы дзяўчаты на змене ў палату да яго заходзіць баяліся. Твар проста звярыны. Вось яно і атрымалася, што на цэлы тыдзень пра яго забыліся. І палата крайняя. Вы ж самі бачыце, проста нашэсце нейкае – столькі хворых! Я даручыла Францаўне «генералку» зрабіць у тым крыле. Яна ў палату заходзіць, упэўненая, што там нікога няма, а гэты чалавек ляжыць на ложку і ўсміхаецца.

– І праўда, выключны выпадак. Як ён сябе адчувае? – запытаў доктар.

– Аналізы толькі прыйшлі, не бачыла яшчэ.– Медсястра працягнула некалькі лісткоў. Доктар перагледзеў іх і са злосцю шпурнуў на стол.

– Вы проста здзекуецеся,– твар яго стаў пунсовым.– Спачатку на цэлы тыдзень забыліся на цяжкахворага пацыента, а зараз падробленыя аналізы падсунулі мне. Не трымаецеся за сваё месца? Дык вельмі лёгка вам яго замяню. Вам і без таго паніжэнне пасады «свеціць», гэта ў тым выпадку, калі родныя не засудзяць.

Медсястра зазірнула ў паперкі.

– Гэта яго аналізы, я ўпэўнена,– рукі жанчыны дрыжалі.– Цукар у крыві падвышаны, і... Божа, гэтага проста не можа быць!!!

– Дзе вы ўзялі гэтыя вынікі? – спытаў доктар.– Я бачыў яго паперы два тыдні таму. А зараз вы мне гаворыце, што ён абсалютна здаровы.

– Ён і сапраўды здаровы! Аналізы не падманваюць!

– Тады рыхтуйце паперы на выпіску. Паспрабуем як-небудзь замяць гэтую справу,– падвёў вынікі доктар.– Зрабіў нам Васіль падаруначак пад Новы год, падкузьміў...

Серада, 31 снежня

На вуліцы кружыў лёгкі сняжок. Людзі, хто з елкамі, хто з пакункамі, беглі па справах, заходзілі ў магазіны, рыхтаваліся да свята...

Васіль нікуды не спяшаўся. Ён прагна ўдыхаў халоднае свежае паветра і не мог надыхацца. Самаадчуванне было такое, нібы нарадзіўся нанава. Ад шчасця хацелася спяваць. Цяпер ён зажыве... Ён абавязкова зажыве добра, памірыцца з жонкай, ніколі больш не аблае яе, паправіць веснічкі, наведае бацькоўскія могілкі, а потым будзе калупацца з сынам у машыне... Урачы нешта казалі, а ён і не слухаў іх, нават паперак не забраў, адмахнуўся. Жонка паспрабавала было затрымацца, але ён схапіў яе за руку і амаль што сілай вывалак на вуліцу.

– Калі мы з табой хадзілі вось так, удваіх? – сказаў ёй зусім нязлосна, змахнуўшы сняжынкі з яе перапалоханага твару.– Мы прапусцілі цэлае жыццё...

Леанід Бекарэвіч
(1937—2017)

* * *

О Кубе знаю я не по рассказам.
Ее я видел: там три года жил.
По долгу дружбы, а не по приказам
Там в армии я с гордостью служил.

В делах и в дружбе не было барьера,
Мы были просто «не разлей вода».
Звучало гордо слово «компаньеро».
И верилось, что будет так всегда.

И никогда я в жизни не забуду
Тех удивительных счастливых дней,
Когда ловил акулу-барракуду
Там, где рыбачил сам Хемингуэй.

Пусть там всегда смеются звонко дети,
Проходят карнавалы пусть игриво,
А мы стране, особой на планете,
Воскликнем дружно: «Viva, Cuba, viva»!

Валерый Палуда

* * *

Холм стоит над долиною чистою,
Где шумят воды тихой реки.
Это место горою Ильинскою
Наши предки давно нарекли.

В белой ночи святое сияние.
Я не верю, но все же молюсь.
В наши дни, как и в древнем предании,
Есть в Белыничах Белая Русь.

Генадзь Выбарнаў

* * *

Звезда в ночную Друть упала,
Мерцает рядышком с луной.
А Друть течет себе устало,
Забыв про отдых и покой.

Река немало повидала –
Того, что было, не вернуть –
И стала нашим идеалом:
Недаром песнь поют про Друть.

Ее не трогали невзгоды,
Ей не страшна была жара.
Несет спокойно свои воды
Сестра великого Днепра.

Тамара Ракіцкая

* * *

Сиреневый вечер спускается
На белые крыши домов.
Деревья ветвями сплетаются,
Черненым застыв серебром.

Февральское тонкое кружево
Лежит за оконным стеклом.
Струится, зимой не остуженный,
Снегами укрытый покой.

В преддверье вечернего сумрака,
В таинственный призрачный час
Плывет молчаливая музыка,
Ложится на зимний пейзаж...

И день, суетой замороченный,
Не хочет клониться в закат.
Стоит, тишиной завороженный,
В весеннем преддверии сад...

Фёдар Ігнатовіч
(1936—2015)

Осеннее

Озимь радует запахом хлеба,
Дремлет в копнах душистый прокос,
И глядятся в зеркальное небо
С позолотою кроны берез.

Паутинкою сосны повиты,
И рябины краснеют слегка,
Я прилягу, туманом укрытый,
На пружинистый снопа вереска.

Под окошком моим в георгинах
Даже куры грустят о тепле,
И янтарные гроздья рябины
С тонких веток склонились к земле.

Сяргей
Скамейка

* * *

Цягнік прыбывае. Цярусіць імжака.
Пранізлівы восеньскі вечар.
На ўскраі перона кудлаты сабака
Задумаўся ціха аб нечым.

Усе разышліся, а ён не скранецца,
Хоць ныюць ад холаду косці,
Бо ёсць спадзяванне у стомленым сэрцы:
Ён проста чакае кагосьці.

...Цягнік адыходзіць. Пранізлівы вецер.
Маўклівая постаць вакзала.
Калі разабрацца, у гэтым Сусвеце
Для шчасця патрэбна так мала...

Уладзімір Скамейка

* * *

Однажды мне приснился сон:
Как будто летним утром
Иду по лугу. Горизонт
Сияет перламутром.

Вдруг вижу: средь травы цветок
Ввысь робко тянет лепесток.
Такой веселый, молодой,
Весь дышит свежестью живой.

Сорвал мечту – и дрожь прошла –
Прервал я жизни стройный бег,
Цветок завял и враз поблек.
Росинка руку обожгла...

Нашы аўтары

Наталля Батракова нарадзілася ў 1964 годзе ў Бялынічах. Скончыла Белдзяржуніверсітэт транспарту. Працавала на розных пасадах у сістэме беларускай чыгункі, страхавой кампаніі «ТАСК», кіраўніком прадстаўніцтва транспартнай кампаніі Hansa Grand у Беларусі. Аўтар кніг «Состояние души», «Территория души», «Сто сорок жизненных мгновений», «Площадь согласия», «Я играю не по правилам...», «Миг бесконечности» і інш.

Леанід Бекарэвіч (1937–2017) нарадзіўся ў вёсцы Галоўчын Бялыніцкага раёна. Скончыў Львоўскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча, Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна. Творы друкаваліся ў газетах «Піянер Беларусі», «Магілёўская праўда», «Зара над Друццю», перыядычных ваенных выданнях. Аўтар кнігі вершаў «Память сердца».

Вітольд Бялыніцкі-Біруля (1872–1957) нарадзіўся ў маёнтку Крынкі, што на Бялыніччыне. Народны мастак БССР (1944) і Расіі (1947), правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР, ганаровы акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук БССР (1947). Скончыў Маскоўскае вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства, член Таварыства перасоўных мастацкіх выставак (1904), Таварыства імя А. Куінджы (1909), адзін з заснавальнікаў Асацыяцыі мастакоў рэвалюцыйнай Расіі. Развіваў традыцыі рускага рэалістычнага пейзажа. Яго карціна «У час цішыні» (1909) адзначана залатым медалём выставы ў Мюнхене, «Перад вясной» (1919) – бронзавым у Барселоне. У Бялынічах адкрыты (1970) раённы мастацкі музей імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі. Яго прозвішчам таксама названы Магілёўскі мастацкі музей, Бялыніцкая дзіцячая раённая школа мастацтваў, Цяхцінская агульнаадукацыйная школа, а таксама вуліцы ў Бялынічах, Магілёве, іншых населеных пунктаў Беларусі.

Пісаў вершы, апавяданні.

Ала Войлакава нарадзілася ў 1953 годзе ў вёсцы Гарадзішча Магілёўскага раёна. Скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя А. С. Пушкіна. Працавала ва ўстановах культуры Бялыніцкага раёна. Творы друкаваліся ў калектыўных зборніках «Галасы Прыдняпроўя», «Праменьчык сонца ў маёй душы», у перыядычных выданнях.

Генадзь Выбарнаў нарадзіўся ў 1945 годзе ў расійскім горадзе Альмецьеўск. Скончыў Вышэйшую камсамольскую школу, Маскоўскі інстытут культуры. Працаваў сакратаром райкама камсамола Цалінаградскага чыгуначнага вузла, на Бялыніцкім крухмальным заводзе, у бялыніцкай СШ № 1 імя М. І. Пашкоўскага. Вершы друкуюцца ў райгазеце «Зара над Друццю».

Вольга Данілава нарадзілася ў 1985 годзе ў вёсцы Навасёлкі Бялыніцкага раёна. Скончыла МДУ імя А. А. Куляшова. Працуе ў рэдакцыі Шклоўскай райгазеты «Ударны фронт». Творы друкаваліся ў раённых і рэспубліканскіх СМІ. Аўтар кнігі паэзіі «Вечная вясна».

Павел Данілаў нарадзіўся ў 1989 годзе ў вёсцы Бракаўшчына Бялыніцкага раёна. Скончыў МДУ імя А. А. Куляшова. Працаваў у Магілёўскай мытні, школах. Творы друкаваліся ў перыядычных выданнях Беларусі. Выдаў кнігі вершаў «Спрадвечны шлях», «Крыгаход душы».

Васіль Дзеравяшка нарадзіўся ў 1948 годзе ў вёсцы Запакулле Бялыніцкага раёна. Скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі. Працаваў галоўным інжынерам калгаса «Ленінскі заклік», дырэктарам вытворча-гандлёвай фірмы «Меліса», у рэдакцыі райгазеты «Зара над Друццю». Творы надрукаваны ў калектыўных зборніках «Анталогія беларускай байкі», «Галасы Прыдняпроўя», «Праменьчык сонца ў маёй душы», у газетах і часопісах.

Васіль Жудро (1849–1917) служыў (1905–1913) у манастыры пры Бялыніцкай Раства Багародзіцкай царкве, адначасова выкладаў у прыманастырскай двухкласнай царкоўнапрыходскай школе. Аўтар кнігі ў дзвюх частках «Белыничский Рождество-Богородицкий монастырь», іншых царкоўных выданняў, а таксама трох зборнікаў вершаў «Стихотворения иеромонаха Василия Жудро».

Фёдар Ігнатовіч (1936–2015) нарадзіўся ў вёсцы Пражэктар Бялыніцкага раёна. Працаваў жывёлаводам у мясцовым саўгасе «Падзевічы». Творы друкаваліся ў газетах «Магілёўская праўда», «Зара над Друццю», зборніку «Праменьчык сонца ў душы маёй».

Вячаслаў Казакевіч нарадзіўся ў 1951 годзе ў Бялынічах. Скончыў Ленінградскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча, філалагічны факультэт МДУ імя М. В. Ламаносава. З 1993 года жыве ў Японіі, дзе працаваў выкладчыкам універсітэта горада Таяма. Аўтар кніг «Праздник в провинции», «Кто назавет меня братом?», «Лунат», «Ползи, улитка», «Прославление заката» (у перакладзе на японскую мову), «За мной придёт единорог» і інш.

Аляксандр Караленка (1927–1999) нарадзіўся ў Бялынічах. Працаваў у лясной гаспадарцы. Друкаваўся ў райгазеце «Зара над Друццю».

Уладзімір Кароль нарадзіўся ў 1935 годзе ў вёсцы Макаўка Бялыніцкага раёна. Скончыў Ленінградскі дзяржуніверсітэт. Служыў у ваеннай авіяцыі, працаваў на Пецярбургскім авіяпрадпрыемстве «Пулкавец». Першыя публікацыі з'явіліся ў 1972 годзе ў часопісах «Нева», «Гражданская авиация», «Военно-исторический журнал», у Бялыніцкай райгазеце «Зара над Друццю». Аўтар кніг «В небе России», «Крылья Петербурга», «Воздушная гавань Петербурга», «Земля и небо генерала А. М. Кованько», «Река времени» і інш.

Міхась Карпечанка нарадзіўся ў 1959 годзе ў вёсцы Болін Краснапольскага раёна. Скончыў Барысаўскае ГПТВ № 62 будаўнікоў, філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Працаваў на будоўлях Маладзечна і Мінска, у рэдакцыі Чэрыкаўскай райгазеты, цяпер — галоўны рэдактар раённай газеты «Зара над Друццю».

Аўтар кніг «Дачка волі», «На скрыжаванні болю і надзеі», «Узлётная стромы», «Іржа» і інш.

Яраслаў Клімуць нарадзіўся ў 1940 годзе ў вёсцы Вострава Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт БДУ. Працаваў у МДУ імя А. А. Куляшова, кандыдат філалагічных навук. З'яўляецца аўтарам больш за 150 навуковых і вучэбна-метадычных публікацый, у тым ліку манаграфіі «Жыццёвасць традыцый: Якуб Колас і руская савецкая паэзія», «Шляхі літаратурнага яднання» і інш.

Мікола Козыраў (1936–1991) нарадзіўся ў вёсцы Забалоцце Бялыніцкага раёна. Скончыў Мінскі педінстытут, настаўнічаў у родных мясцінах. Вершы друкаваліся ў рэспубліканскіх СМІ, райгазеце «Зара над Друццю», зборніку «Праменьчык сонца ў душы маёй».

Віктар Кунцэвіч нарадзіўся ў 1957 годзе ў вёсцы Чырвоны Бор Бялыніцкага раёна. Скончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Працаваў зваршчыкам, вадзіцелем таксі ў Магілёве, уласным карэспандэнтам газеты «Чырвоная змена», у рэдакцыях газет «Прыдняпроўская ніва», «Веснік Магілёва», прыватным прадпрымальнікам па перавозцы пасажыраў. Аўтар кніг «Зваротныя масты», «Горкая спакуса», «Гул у звоне», «Одинокий дождь» і інш.

Оскар Курганаў (сапр. Оскар Эстэркін) (1907–1997) нарадзіўся ў Бялынічах. Скончыў Ленінградскі дзяржуніверсітэт. Працаваў спецыяльным і ваенным карэспандэнтам газеты «Правда», у рэдакцыях газет «Комсомольская правда», «Строительная газета», «Литературная газета». Лаўрэат Ленінскай прэміі (1971). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З'яўляецца аўтарам сцэнарыяў шэрагу гульнявых, дакументальных і навукова-папулярных фільмаў. Разам з рэжысёрам Юрыем Озеравым напісаў сцэнарый 4-серыйнага кінафільма «Солдаты свободы», з Юрыем Озеравым і Юрыем Бондаравым стварыў сцэнарый 5-серыйнай эпапеі «Освобождение». Аўтар кніг «Настенька», «Американцы в Японии», «Челюскинская эпопея», «Оставшиеся в живых», «Три дня и три ночи», «Тайна песчинки», «Пурга», «Сердца и камни», «Годы странствий», «Дело Хинта. Ночь у Сталина. Навстречу гибели» і інш.

Леанід Лужанкоў (1938–2009) нарадзіўся ў вёсцы Нежкаў Бялыніцкага раёна. Скончыў юрыдычны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў членам ваенных трыбуналаў Туркестанскай, Беларускай, Прыкарпацкай ваенных акрут, Групы савецкіх войск у Германіі, служыў на Сяміпалацінскім выпрабавальным ядзерным палігоне. Творы змяшчаліся ў часопісах «Советская юстиция», «Неман», у спецыяльных выданнях. Аўтар дакументальнага нарыса пра Галоўчын «Праз сотні гадоў».

Святлана Магілеўчык нарадзілася ў 1980 годзе ў вёсцы Васількі Бялыніцкага раёна. Скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя А. С. Пушкіна. Працавала ў бібліятэцы Вішоўскай ПМК № 83, зараз – у рэдакцыі райгазеты «Зара над Друццю». Творы змешчаны ў рэспубліканскіх, абласных перыядычных выданнях, райгазеце «Зара над Друццю».

Змітрок Марозаў нарадзіўся ў 1954 годзе ў пасёлку Язбы Крупскага раёна. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў галоўным аграномам у бялыніцкім калгасе імя Энгельса, райкаме камсамола, ЦК ЛКСМБ, міністэрствах сельскай гаспадаркі, гандлю. Напісаў больш за 30 кніг паэзіі і прозы для дарослых і дзяцей, стварыў (1991) першы ў еўрапейскай літаратуры вянок вянкоў санетаў «Апакаліпсіс душы». Шэраг яго кніг адзначаны рэспубліканскімі прэміямі: Ленінскага камсамола Беларусі; Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі; Рэспубліканскай літаратурнай прэміяй «Залаты Купідон»; Міжнароднай прэміяй «Семья – Единение – Отечество». Аўтар кніг «Пад небам буслiным», «Хлебны верасень», «Огонь и жито», «Апакаліпсіс душы», «Ачышчэнне сяўбой», «Гронкі зорных суквецяў», «Мне Богам дадзена Радзіма», «Вяртанне да шішыні», «Вачыма сэрца», «Храм», «Малітоўнаю матчынай мовай» і інш.

Аляксандр Мельнікаў (1936–1999) нарадзіўся ў вёсцы Васількі Бялыніцкага раёна. Скончыў Ленінградскі дзяржмедінстытут. Працаваў урачом Магілёўскай абласной санстанцыі, начальнікам аддзела радыяцыйнай бяспекі. Аўтар кніг «Спасибо, жизнь», «Три слова», «Земля надеется», «Избранное», «В поэзии рядовой и рядовой в медицине».

Васіль Найдзін нарадзіўся ў 1944 годзе ў вёсцы Бярозаўка, што каля Бялынічаў. Скончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут і Мінскую вышэйшую партыйную школу. Працаваў у рэдакцыі газеты «Мінская праўда»; райгазеты «Зара камунізму», часопіса «Вожык». З 1991 г.– намеснік загадчыка, а з 1993 г.– загадчык рэдакцыйна-выдавецкага аддзела Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. З 1997 г.– начальнік Рэдакцыйнага ўпраўлення Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Аўтар кніг «Мужчынскія сакрэты», «Аддаю вам», «Сустрэнемся ў Барселоне», «Анюціны вочкі», «Мільён руж» і інш.

Юрый Несцярэнка нарадзіўся ў 1965 годзе ў вёсцы Прыбар Быхаўскага раёна. Скончыў Бялыніцкае ПТВ № 217, Мінскі дзяржаўны ўніверсітэт культуры. Удзельнік абласных, рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў рок-музыкі. Аўтар кніг «Звычайны шоу-бізнес», «Маё мястэчка ў часе і прасторы» і інш.

Мікола Падабед нарадзіўся ў 1937 годзе ў вёсцы Пожар Клімавіцкага раёна. Скончыў Мінскую вышэйшую партыйную школу, Магілёўскі дзяржаўны педінстытут. Працаваў у Клімавіцкай райгазеце «Новае жыццё», рэдагаваў бялыніцкую райгазету «Зара над Друццю». Аўтар кніг «Мазалі мядовага месяца», «Мільён за ўсмешку», «Жонка напракат», «Іду на сустрэчу з навальніцай» і інш.

Валерый Палуда нарадзіўся ў 1970 годзе ў вёсцы Міхайлоў Бялыніцкага раёна. Скончыў Віцебскі педінстытут, працаваў вадзіцелем, кавалём, настаўнікам, служыў у Бялыніцкім РАУС.

Алег Пліндоў нарадзіўся ў 1923 годзе ў г. п. Круглае. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Больш за 50 гадоў адпрацаваў у школах Бялыніцкага раёна і Расіі. Творы надрукаваны ў райгазеце «Зара над Друццю», «Гомельскай праўдзе», калектыўным зборніку «Праменьчык сонца ў душы маёй». Выдаў кнігі вершаў «Я бы мог погибнуть в сорок третьем», «Рукопожатие», «Отставший от стаи».

Міхась Радоўскі (1948–2011) нарадзіўся ў Бялынічах. З 1974 года працаваў у рэдакцыі газеты «Зара над Друццю». Творы надрукаваны ў калектыўных зборніках «Галасы Прыдняпроўя», «Праменьчык сонца ў душы маёй», газетах і часопісах.

Тамара Ракіцкая нарадзілася ў 1958 годзе на Брэстчыне. Скончыла юрыдычны факультэт БДУ. Працавала ў Бялыніцкім райаддзеле міліцыі, намеснікам раённага пракурора. Вершы друкуюцца ў райгазеце «Зара над Друццю».

Рыгор Сарока нарадзіўся ў 1936 годзе ў вёсцы Мокравічы Бялыніцкага раёна. Скончыў Трэцяе зенітна-артылерыйскае вучылішча войск СПА, Ваенную акадэмію імя Г. К. Жукава. Аўтар кніг «Остановитесь, люди, на минуту», «Нежность и грусть», «Глубокий берег», «Ветер жизни» і інш.

Уладзімір Серыкаў (1929–2011) нарадзіўся ў вёсцы Норкі Чэрыкаўскага раёна. Працаваў настаўнікам, інспектарам Бялыніцкага райаддзела адукацыі, у райкаме партыі. Творы друкаваліся ў калектыўным зборніку «Праменьчык сонца ў душы маёй», рэспубліканскай, абласной і раённай перыёдыцы.

Віктар Сухараў (1936–2018) нарадзіўся ў вёсцы Галоўчын Бялыніцкакоўшчынскай і Мёрскай раённых газет Віцебскай вобласці, Бялыніцкай райгазеты «Зара над Друццю». Творы змешчаны ў калектыўным зборніку «Праменьчык сонца ў душы маёй», перыядычных выданнях.

Сяргей Скамейка нарадзіўся ў 1989 годзе ў Бялынічах. Скончыў СШ № 1 імя М. І. Пашкоўскага, БНТУ. Працуе ў роднай школе. Вершы друкаваліся ў райгазеце «Зара над Друццю», зборніку «Праменьчык сонца ў душы маёй».

Уладзімір Скамейка нарадзіўся ў 1985 годзе ў Бялынічах. Скончыў МДУ імя А. А. Куляшова. Працуе настаўнікам. Вершы друкуюцца ў райгазеце «Зара над Друццю».

Зянон Фіш (Тадэвуш Падаліца) (1820–1870) нарадзіўся ў маёнтку Ключыкі, што на Бялыніччыне. Пачатковую адукацыю атрымаў у школах Забілочы і Камянца (Украіна). Літаратурны дэбют адбыўся ў 1841 годзе, калі на старонках часопіса «Ateneum» былі надрукаваны некалькі яго вершаў. Супрацоўнічаў з такімі выданнямі, як «Dziennik Warszawski», «Biblioteka warszawska», «Gazeta warszawska», «Киевский телеграф», «Вести», «Gwiazda», «Тыднёвік Пецярбургскі», «Газета Варшаўская», «Кур'ер Віленскі» і інш. Аўтар кніг «Opowiadania i krajobrazy», трохтомніка «Listy z podrozy».

Віктар Хаўратовіч (1934–1991) нарадзіўся ў вёсцы Стары Сінін Магілёўскага раёна. Скончыў Магілёўскі будаўнічы тэхнікум. Працаваў на розных пасадах у галіне будаўніцтва ў Дрыбіне, Крычаве, Магілёве. З 1972 года жыў і працаваў у Бялынічах.

Аўтар кніг «Сонца на кельме», «Зямныя колеры і гукі».

Віктар Хурсік нарадзіўся ў 1953 годзе на чыгуначнай станцыі Уборак Асіповіцкага раёна. Скончыў БПІ. Працаваў на станкабудаўнічым заводзе імя Кірава, у Мінскім спецыяльным канструктарскім бюро працяжных станкоў, навукова-вытворчым аб'яднанні «Цэнтр», газеце «Звязда». Аўтар кніг «Белы лебедзь у промнях славы. Магдаліна Радзівіл», «Трагедыя белай гвардыі. Беларускія дваране ў паўстанні 1863–1864 гг.», «Vale!» і інш. Пераклаў з польскай мовы і выдаў кнігі: «Успаміны Крыштафа Завішы, ваяводы Мінскага. 1666–1721», «Маскоўская ўлада на Літве, «Мінскія абразкі. 1850–1863».

Мікола Целеш (1900–1975) нарадзіўся ў вёсцы Заазер'е Бялыніцкага раёна. Працаваў на шахтах Данбаса, у Інстытуце беларускай культуры, рэдакцыі часопіса «Паляўнічы Беларусі».

У час Вялікай Айчыннай вайны выехаў з сям'ёй у Германію, жыў у ЗША. Аўтар кніг «Буська», «Апавяданні паляўнічага», «Са стрэльбай і сабакам», «Курылка», «Знаходка», «Дзесяць апавяданняў», «Хмары над Бацькаўшчынай» і інш.

Янка Шарахоўскі (1908–1973) нарадзіўся ў Бялынічах. Скончыў Магілёўскі педтэхнікум, Ленінградскі гісторыка-лінгвістычны інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх газет і часопісаў, галоўным рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР, намеснікам міністра культуры БССР, дырэктарам Літаратурнага музея Янкі Купалы. Аўтар кніг «Срэбная раніца», «Сплочаны доўг», «Сердалікавая бухта», «Янка Купала», «Пясняр народных дум» і інш. Пераклаў на беларускую мову раманы «Белая бяроза» М. Бубеннава, «Чэсць змоладу» А. Первенцава, «Рудзін», «Напярэдадні» І. Тургенева, аповесць «Сляпы музыка» У. Караленкі, «Аповесць пра дзяцінства» Ф. Гладкова, «Казкі» М. Салтыкова-Шчадрына, «Апавяданні» І. Франка і інш.

Антон Шчырыца нарадзіўся ў 1979 годзе ў Магілёве. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Працаваў у рэдакцыі райгазеты «Зара над Друццю», зараз – на

дзяржаўнай службе. Вершы друкаваліся ў газеце «Зара над Друццю», зборніку «Праменьчык сонца ў душы маёй».

Рыгор Яўсееў (1942–2004) нарадзіўся ў вёсцы Барок Бяльніцкага раёна. Скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут, Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ. Працаваў у калгасе, рэдакцыях раённай газеты «Зара над Друццю», часопісаў «Полымя», «Вожык», у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Аўтар кніг «Верабей пад воблакамі», «Гатовая рэпка», «Вялікая лыжка», «Мох на бярвенні», «Дзядзькавы памочнікі» і інш. З'яўляецца аўтарам слоўніка гаворак жыхароў Лебядзянкаўскага сельсавета «Маці казала так...». Перакладаў на беларускую мову вершы расійскіх, украінскіх, малдаўскіх, французскіх, чэшскіх паэтаў.

Змест

А свет прыгожы і бязмежны... 3

ПАЧЫНАЛЬНІКІ

Зянон (Зянон-Леанард) ФІШ (Тадэвуш Падаліца)

Зянон Фіш — унікальная з'ява славянскай літаратуры 12
Зянон Фіш (Тадэвуш Падаліца) 15
Фінляндыя 27
Ноч на моры 28
Разбіты карабель 28
Адказ пану Кастамараву 29

Васіль ЖУДРО

«Тайну пахарь совершает...» 32
Душе 36
Осень 37
* * * Счастья люди все желают... 37
* * * Смотри, пшеничное зерно... 38
* * * Посмотри на сирот... 38

НА СКРЫЖАЛЯХ ІМКЛІВЫХ ГАДОЎ

Наталля БАТРАКОВА 40

Яблоки 48

Вячаслаў КАЗАКЕВІЧ

* * * В небе туча плывет нехорошая... 49
Одуванчики 49
Семья 50
Марсиане 50
* * * Кирпичная дорожка... 51

Міхась КАРПЕЧАНКА

Разганяйлавы будні 219

Уладзімір КАРОЛЬ 59
Родные названия 60
Односельчане 62
Переселенцы 63
Плач одинокого журавля 64
Вядомыя і невядомыя старонкі вайны 64

Віктар КУНЦЭВІЧ 71
Жураўлі 72
Маё сэрца 72
Храм 73
Зімовым ранкам 74
* * * А Друць-рака цячэ... 74
Чырвоны Бор 75
Думаць вершы 75

Оскар КУРГАНАЎ
Мать 76
От Днепра до Буга «Царица побед» 81

Змітрок МАРОЗАЎ
Анкета паходжання 86
* * * Нашу ў сабе я свет і антысвет... 87
Салавецкая балада 87
* * * Мне Богам дадзена Радзіма... 88
* * * Мы будзем жыць! Мінуць нягоды... 88
* * * Хаты. Жытняя палоска... 89
* * * Аляксандры, Марылі, Домны... 89
* * * Жыццё не раз мяне ламала... 90
* * * Сад забыты... 90
* * * Сіні-сіні сон асін... 90
* * * Калі размаўляюць вочы 91
Бялынічане 91
* * * Хутка восень. Бярозы лістотай пяюць... 92
* * * Мелюць веку жудасныя жорны... 92
* * * Пасеяна д'яблам распаду насенне... 93
Паэт 93
Храм 94
Санет маці 95

Аляксандр МЕЛЬНІКАЎ
* * * Спасибо, жизнь, что я рожден... 96
* * * Вот и родимая изба... 97
Ручная мельница 97
В лес войду... 98
Баллада о Беседи 99
Чайка 99

На другом берегу 100

Васіль НАЙДЗІН

Анюціны вочкі 101

Юрый НЕСЦЯРЭНКА

Адно пытанне 114
Рок-каранацыя пад знакам 223L 117
Апошні шанц выйсці ў людзі 119

Мікола ПАДАБЕД

Іду на сустрэчу з навальніцай 123

Рыгор САРОКА

* * * Утомленная за день, седая... 140
Здравствуй, милая сторонка! 141
Друть 142

Віктар ХАЎРАТОВІЧ

Радзіме 143
Ключы 144
Дзеці вайны 144
* * * А жыта ўжо не палавее... 145
* * * Ледзь неба зоймецца на дзень... 145
Друць 146

Мікола ЦЕЛЕШ

Твор 147
Васілёва ўдача 149
Над возерам 151

Янка ШАРАХОЎСКІ

Першы заробак 154

Рыгор ЯЎСЕЕЎ

Незалежны Яўмен 164
Сны 165
Б'юцца пеўнікі 166
Свіснуў рак 167
Цар-пажар 168

ГОЛАСАМ СЭРЦА

Вітольд БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ

Над вечным спакоем 172
Лисья охота 176

Алег ПЛІНДОЎ

Осколок 180

221

Васіль ДЗЕРАВЯШКА

* * * Не баюся ні звягі, ні крыку... 181
Размова з выраем 182
Чаўны лотаці 182
Папараць-кветка 183
Абуджэнне 183
* * * Дом пад ліпамі. Маці сівая... 184

Ала ВОЙЛАКАВА

Чырвоны васілёк 185
Крынкі 186
Размова пра мову 186
Бялынічане, бялынічанкі! 187

Міхась РАДОЎСКІ

* * * Ступіўшы за парог радзімай хаты... 188
Восеньскія пажары 188
* * * Стары калодзеж... 189

Антон ШЧЫРЫЦА

* * * Раніцой сцюдзёнаю вадзіцай... 190
* * * Пакідае наш край чарада журавоў... 191
* * * З усіх бакоў, дзе плёскат чуўся... 191

Вольга ДАНІЛАВА

Трыялет 192
* * * Жнівень. Вечар. Зоркі... 192
Пралескі 193

Павел ДАНІЛАЎ

* * * Да вясны схавала фарбы... 194
Зімовая ідылія 194

Уладзімір СЕРЫКАЎ

* * * На фото я смотрю через года... 195
Тишина 196

Віктар СУХАРАЎ

Вабіч 197
У гаі 198

Аляксандр КАРАЛЕНКА

* * * Не оставлю я в наследство... 199

Святлана МАГІЛЕЎЧЫК

Народжаны ў аўторак 200

Леанід БЕКАРЭВІЧ

* * * О Кубе знаю я не по рассказам... 205

Валерый ПАЛУДА

* * * Холм стоит над долиною чистою... 206

Генадзь ВЫБАРНАЎ

* * * Звезда в ночную Друть упала... 207

Тамара РАКІЦКАЯ

* * * Сиреневый вечер спускается... 208

Фёдар ІГНАТОВІЧ

Осеннее 209

Сяргей СКАМЕЙКА

* * * Цягнік прыбывае. Цярусіць імжака... 210

Уладзімір СКАМЕЙКА

* * * Однажды мне приснился сон... 211

Нашы аўтары 212

Васільковае поле Айчыны : Бялыніччына літаратурная : паэзія, проза, публіцыстыка / уклад. Міхаіла Карпечанкі.– Мінск : Мастацкая літаратура, 2020.– 223 с., [8] л. : іл.– (Беларусь літаратурная).

В19

ISBN 978-985-02-2007-3.

У зборнік «Васільковае поле Айчыны» ўвайшлі літаратурныя творы аўтараў, жыццё і дзейнасць якіх звязаны з Бялыніччынай.– З. Фіша, В. Жудро, В. Бялыніцкага-Бірулі, Я. Шарахоўскага, Р. Яўсеева, М. Целеша, М. Падабеда, О. Курганава і іншых.

Кніга працягвае выдавецкую серыю «Беларусь літаратурная» і разлічана на шырокае кола чытачоў.

УДК [821.161.3+821.161.1(476)]-822

ББК 84(4Бел)я43

Літаратурна-мастацкае выданне

Беларусь літаратурная

ВАСІЛЬКОВАЕ ПОЛЕ АЙЧЫНЫ

Бялыніччына літаратурная

Паэзія, проза, публіцыстыка

Укладальнік
КАРПЕЧАНКА Міхаіл Аляксеевіч

У кнізе выкарыстаны фотаздымкі М. Падабеда
і з архіва рэдакцыі раённай газеты «Зара над Друццю»

Рэдактар *Д. Л. Пятровіч*
Мастацкі рэдактар *М. Ю. Дайлідаў*
Тэхнічны рэдактар *Т. В. Свірыдзенка*
Стылістычныя рэдактары *Ю. В. Тыркіч, Н. В. Філіповіч*

16+

Падпісана да друку 09.07.2020. Фармат 70×100 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура NewBaskervilleC. Друк афсетны. Умоўн. друк. арк. 18,2 + 1,3 вкл.
Улік.-выд. арк. 13,07. Тыраж 300 экз. Заказ 2368.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/5 ад 09.07.2013.
Пр-т Пераможцаў, 11, 220004, Мінск. www.mastlit.by; email: mail@mastlit.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Друкарня "Перамога"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/38 ад 29.01.2014.
Вул. Таўлая, 11, 222310, Маладзечна.

ISBN 978-985-02-2007-3
9 789850 220073

ЕАС 16+

БЕЛАРУСЬ
літаратурная